ARCHE Зьмест № 2’03 ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ

1. Зьмест / Уводзіны
2. Апытаньне ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ". "…"
3. Кантрасты падабенства: біскупы Трой у Ірландыі і Лісоўскі ў Беларусі ў эпоху Вялікай французскай рэвалюцыі. Джэймс Флін у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
4. Апалогія Рэчы Паспалітай. Генадзь Прыбытка ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
5. "Між айчынным чытачом і замежным калегам". Круглы стол па праблемах беларускай гістарыяграфіі ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
6. Чаму беларусы не апанавалі літоўскай спадчыны. Андрэй Катлярчук у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
7. Жарсьці па Львове. Яраслаў Грыцак у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
8. Антыэўрапейскасьць амэрыканцаў. Цімаці Гартан Эш у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
9. Новае ў лукашэнкаўскай ідэалёгіі. Валер Булгакаў у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
10. Гаючая нянавісьць. Ева Вежнавец у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
11. Мая зялёная паляна. Гюнтэр Грас у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
12. Беларусь: ні дыктатура, ні дэмакратыя. Вера Рыч у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
13. Савецкая экзотыка, расейская правінцыя ці эўрапейская дзяржава? Віталь Сіліцкі ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
14. Ці можа крыніца "опіюму для народу" быць крыніцаю

веды? Мікола Нікалаеў у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
15. Кельцкі тыгр, Гінэс і "Nothing Compares to You". Аляксандар Батура ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
16. Аркестар вядомы і невядомы. Юлія Андрэева ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ". "…"
17. Пераадоленьне гамафобіі. Уладзіслаў Гарбацкі ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
18. Правобраз Акту 25 Сакавіка. Анатоль Сідарэвіч у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ". "…"
19. Наталка. Усевалад Гарачка ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
20. Лісты ў Нямеччыну да Васіля Быкава. Рыгор Барадулін у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
21. Малітва. Людка Сільнова ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
22. Песня. Анатоль Трафімчык у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
23. Мая Ўкраіна. Андрусь Храпавіцкі ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
24. Начныя праспэкты. Аляксей Бацюкоў у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
25. Госьць з будучага, альбо фэномэн Хадановіча. Макс Шчур у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
26. Таварышу Шчуру — паэту й вэрсыфікатару. Андрэй Хадановіч у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
27. Сапармурат Туркмэнбашы супраць Іскандэра Бульбашы. Аляксандар Фядута ў ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"
28. Gloriosae Memoriae: Памяці Аляксандра Мыльнікава. Андрэй Катлярчук, Мікола Нікалаеў у ARCHE 2(25)-2003. "ТУМАННАСЬЦІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ"."…"

Зьмест

апытаньне «Arche»
З чаго, на Вашую думку, пачалася (пачынаецца) нацыянальная гісторыя Беларусі й чым яна скончыцца?
праблема
Джэймс Флін. **Біскупы Трой у Ірляндыі і Лісоўскі ў Беларусі ў эпоху Вялікай французскай рэвалюцыі**
Генадзь Прыбытка. **Апалёгія Рэчы Паспалітай**
Круглы стол па праблемах беларускай гістарыяграфіі
рэцэнзія
Андрэй Катлярчук. **Чаму беларусы не апанавалі літоўскай спадчыны**
гуманістыка
Яраслаў Грыцак. **Жарсьці па Львове**
Цімаці Гартан Эш. **Антыэўрапейскасьць амэрыканцаў**
Беларусь сёньня
Валер Булгакаў. **Новае ў лукашэнкаўскай ідэалёгіі**
гісторыі
Ева Вежнавец. **Гаючая нянавісьць**
Гюнтэр Грас. **Мая зялёная паляна**
спавешчаньні
Вера Рыч. **Беларусь: ні дыктатура, ні дэмакратыя**
Віталь Сіліцкі. **Савецкая экзотыка, расейская правінцыя ці эўрапейская дзяржава?**
Мікола Нікалаеў. **Ці можа крыніца “опіюму для народу” быць крыніцаю веды?**
запісы

Аляксандар Батура. **Кельцкі тыгр, Гінэс і “Nothing Compares to You”**
гісторыя музыкі
Юлія Андрэева. **Аркестар вядомы і невядомы**
беларуская думка
Уладзіслаў Гарбацкі. **Пераадоленьне гамафобіі**
архіў
Анатоль Сідарэвіч. **Правобраз Акту 25 Сакавіка**
імпрэсія
Усевалад Гарачка. **Наталка**
лірыка
Рыгор Барадулін. **Лісты ў Нямеччыну да Васіля Быкава**
Людка Сільнова. **Малітва**
Анатоль Трафімчык. **Песьня**
Андрусь Храпавіцкі. **Мая Ўкраіна**
п’еса
Аляксей Бацюкоў. **Начныя праспэкты**
водгукі-рэакцыі
Макс Шчур. **Госьць з будучага, альбо фэномэн Хадановіча**
Андрэй Хадановіч. **Таварышу Шчуру — паэту й вэрсыфікатару**
Аляксандар Фядута. **Сапармурат Туркмэнбашы супраць Іскандэра Бульбашы**
Gloriosae Memoriae
Андрэй Катлярчук, Мікола Нікалаеў. **Памяці Аляксандра Мыльнікава**

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн і майстраваньне: **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/05/02
[image]

З чаго, на Вашую думку, пачалася (пачынаецца) нацыянальная гісторыя Беларусі й чым яна скончыцца?

Валянцін Акудовіч,
філёзаф, куратар аддзяленьня філязофіі Беларускага калегіюму;
Менск, Беларусь

“Калісь яшчэ сьвет толькі зачынаўся, дык нічога нідзе не было. Усюды стаяла мёртвая вада, а пасярод вады тырчэў нібы камень, нібы што...”

Гэта пачатак аднаго зь беларускіх мітаў. Я яго нагадаў, каб далей разрозьніць гісторыю Беларусі (абмінаючы тут праблему самога этноніму “Беларусь”) і нацыянальную гісторыю. Дык вось, гісторыя Беларусі пачынаецца з таго моманту, калі Пярун ударыў у гэты “нібы камень, нібы што...”, іншымі словамі — з стварэньня сьвету. І яна будзе доўжыцца, пакуль сьвету наканавана існаваць, незалежна ад таго, якімі яшчэ словамі стане пазначацца нашая зямля ў наступныя эпохі і як сябе будуць тады называць насельнікі гэтай зямлі.

Зусім іншая рэч — нацыянальная гісторыя... Нацыянальны

чалавек паўстаў з крызысу рэлігійнага чалавека і, шырэй, з крызысу цывілізацыі рэлігійнага тыпу. Калі гэткае здарылася, тады на цэнтрапалеглае месца, якое раней займала ідэалягема Бога, была пакліканая ідэалягема Нацыі. Як вядома, згаданы тут акт радыкальнай мадэрнізацыі сьветаўладкаваньня адбыўся зусім нядаўна, ад роду яму ўсяго некалькі стагодзьдзяў. Таму бывае дзіўна чуць пра “старыя” й “маладыя” нацыі: прынамсі ў гістарычным вымярэньні мы, скажам, зь немцамі, лічы што пагодкі. (Паміж сьмерцю Фіхтэ і нараджэньнем Багушэвіча ўсяго некалькі дзесяцігодзьдзяў.)

Ясная рэч, што Багушэвіч кагадзе згадаўся не выпадкова.

З майго гледзішча, менавіта Багушэвіч найбольш паўплываў на расчын нашай нацыянальнай гісторыі, геніяльна сфастрыгаваўшы паэтычны міт з назваю “Беларусь”. Наступная роўнавялікая Багушэвічу падзея — газэта «Наша Ніва»...

Зь іншага боку, у канцэптуальным пляне мы мелі б прыблізна тое самае, што маем, і без Багушэвіча, і бяз «Нашай Нівы». Было б залішне рамантычна (ці містычна) зьвязваць такія анталягічныя падзеі, як нараджэньне нацыі, зь несыстэмнымі выпадкамі прыватнага кшталту. Сувязь тут хутчэй цалкам адваротная: і Багушэвіч, і «Наша Ніва» — гэта ўсяго толькі адметныя моманты фармалізацыі новай нацыі, якая ўжо сасьпела, каб выйсьці з лятэнтнага стану ў сытуацыю культурнай і геапалітычнай рэальнасьці.

Што да эсхаталягічнага пытаньня пра канец нацыянальнай гісторыі, то адказ на яго ляжыць ня ў сфэры геапалітыкі. Гэтаксама ён не залежыць і ад унутранага развою нацыякультурнага патэнцыялу. І вонкавыя, і ўласныя антынацыянальныя чыньнікі могуць замаруджваць нацыянальную гісторыю, замінаць ёй, татальна прэсынгаваць яе, але яны ніколі ня здолеюць перапыніць яе канчаткова да тае пары, пакуль ня зьменіцца тып цывілізацыі, у якой нацыянальнае ёсьць актуальным.

Мяркуючы з таго, што чалавек тысячагодзьдзямі жыў без праблемы нацыянальнага, лягічна выснаваць, што рана ці позна гэткая пара зноў надарыцца і людзі стануць сябе ідэнтыфікаваць (ведаць і разрозьніваць) не паводле нацыянальнага коду, а неяк інакш. Ужо ж напэўна калісьці так яно й будзе.

Але прынамсі я не хацеў бы жыць у тую пару.

Лявон Вольскі,
рок-сьпявак, паэт і мастак;
Менск, Беларусь

На маю некампэтэнтную думку, беларуская нацыянальная гісторыя пачалася зь беларускае нацыянальнае ідэі. Ідэя ж гэтая перадаецца з пакаленьня ў пакаленьне нібыта вірус: дастаткова падыхаць адным паветрам з носьбітам ідэі, і захварэеш на яе. Вірус гэты вельмі небясьпечны. Ён падпарадкоўвае сабе ўвесь арганізм хворага, і ў пэўны момант чалавек глядзіць на гэтую краіну і ўвесь сьвет зусім іншымі вачыма. Вірус гэты вельмі магутны, бо цягам стагодзьдзяў “найлепшыя розумы” вялікіх дзяржаваў займаліся ягоным вынішчэньнем, наладжвалі нават масавае зьнішчэньне ягоных носьбітаў, а выніку няма. З году ў год, зь дзесяцігодзьдзя ў дзесяцігодзьдзе зьяўляюцца новыя й новыя носьбіты беларускае нацыянальнае ідэі. Яны незгуртаваныя, разарганізаваныя, лаюцца, абвінавачваюць адно аднаго ў розных грахах і хібах, але гэта таму, што вірус мае больш творчы, чымся прагматычны характар. Захварэўшы, чалавек пачуваецца творцам, а некалькім творцам, як вядома, цяжка прыйсьці да аднае высновы. Бо кожную сваю думку хворы лічыць эксклюзіўнаю і адстойвае яе, нягледзячы на тысячы іншых падобных, але крыху іначай сфармуляваных думак іншых адстойваньнікаў. Ды гэта нішто. Нас шмат, мы актыўныя й ведаем, што ў нас пад нагамі, на што мы абапіраемся, што маем у падмурку.

Нацыянальная гісторыя скончыцца, калі скончацца носьбіты нацыянальнае ідэі. Гэта будзе зусім не неўзабаве. Зважаючы на тое, што носьбіты гэтыя расьселеныя па ўсёй зямной кулі, варта меркаваць, што скон нацыянальнае гісторыі Беларусі будзе наўпрост зьвязаны з сконам гэтае самае кулі.

Юры Дракахруст,
аналітык радыё «Свабода»;
Прага, Чэхія

Бэнэдыкт Андэрсан у свой час адзначаў парадаксальную прыроду нацыяў: рэальная гістарычная маладосьць

спалучаецца ў іх зь мітам аб спрадвечнасьці. Час нараджэньня ўсіх без выключэньня нацыяў — XVII—XX стагодзьдзі. “Дык гэта ў сучасным сэнсе”, — запярэчаць людзі, якія вядуць свой нацыянальны радавод з Полацкага княства, Каралеўства франкаў ці Маскоўскага княства. Але гэта супярэчнасьць у вызначэньні; нацыя і ёсьць адно зь яскравых спараджэньняў сучаснасьці, мадэрну. Этнасы стагодзьдзямі ўтульна існавалі ў межах унівэрсальных імпэрыяў кшталту Сьвятой Рымскай, змагаючыся адзін з адным толькі з прычыны рознай веры ці легітымнасьці манарха. Калі стала няўтульна, тады і пачаліся нацыянальныя гісторыі.

З улікам зробленых заўвагаў пачатак беларускай нацыі — 25 сакавіка 1918 году. Пазьней за адных, раней за іншых. І выйшла ў прынцыпе ня з горшых.

Дзіўнае з гледзішча стандартных мадэляў нацыятварэньня становішча нацыянальнай мовы на тле ўсясьветнага досьведу ня ёсьць нечым унікальным: уся Амэрыка гаворыць на мовах былых калянізатараў, у Ірляндыі й Бэльгіі мова былых акупантаў суіснуе з аўтахтоннымі мовамі.

Скаргі на недаробленасьць беларускай нацыі на самай справе хутчэй за ўсё ёсьць скаргамі на слабасьць, неўкаранёнасьць нацыянальнага міту.

Нацыі калісьці нарадзіліся, калісьці, магчыма, і сыдуць. Але і тут, здаецца, беларусы ня будуць ані першымі, ані апошнімі. Да таго ж, шлях гэтага ператварэньня можа быць неабавязкова такім, які цяпер падаецца адным асабліва небясьпечным, а іншым — асабліва жаданым. Пляны стварэньня франка-нямецкай дзяржавы, праекты эўрапейскай Канстытуцыі, сёлетні крызыс Эўразьвязу паказваюць, што і ЭЗ, і беларуска-расейскі саюз, пры ўсіх адрозьненьнях, сутыкаюцца на пэўным этапе з жорсткаю дылемай — ці ператварэньне ў адзіную дзяржаву, ці распад. Нездарма летась падчас хвалі запрашэньня ў ЭЗ новых сяброў загаварылі пра новую Сьвятую Рымскую імпэрыю. Можа, гэта і ёсьць пэрспэктыва Эўропы, і Беларусі ў тым ліку? Пагроза (ці шанец) заўтрашняга дня заўсёды важнейшая за пагрозу (ці шанец) дня ўчорашняга. І пры ўсёй вонкавай небясьпецы пагроза (шанец) распушчэньня Беларусі ў Расеі выглядае зьявай учорашняю. “Чысты” экспэрымэнт, пастаўлены ў апошнія 9 гадоў, паказаў, што Беларусь немагчыма далучыць да Расеі нават у самых спрыяльных умовах. А калі глядзець

зусім ужо цынічна, то падаецца, што хітрыя беларусы здолелі скарыстаць сваіх усходніх братоў у якасьці камбінацыі парасона, цыцкі і мыліцы для пабудовы сваёй дзяржавы. Выглядае гэта, магчыма, ня надта прыгожа, але, як казаў Карл Юнг, “нацыя ня мае гонару, гэта чарвяк, які паўзе немавед куды, кіраваны лёсам”. Сказана не дзеля таго, каб абразіць беларусаў, гэта пра ўсіх. З чаго, скажам, амэрыканцаў панесла ў Ірак? Калі паглядзець па-філязофску, то зразумела, што “рухавік” — ня Буш, а лёс.
Вяртаючыся да беларусаў, варта прыгадаць, што выбары 1994 году і ўвесь час праўленьня Лукашэнкі адкрылі беларускай інтэлігэнцыі такую праўду пра беларускую нацыю, якой, можа, ня варта было б і ведаць. Высьветлілася, што нацыя й інтэлігенцкая тусоўка — гэта істоты рознай пароды і прыроды. Хацелі нацыю — атрымалі ўва ўсёй прыгажосьці й жудасьці (не хацелі — таксама атрымалі).

Аляксандар Лукашук,
дырэктар беларускай службы радыё «Свабода»;
Прага, Чэхія

Гісторыя Беларусі для мяне пачалася ў сакавіку, кажучы словамі аўтара, “лета па народжаньні нашага Збаўцы Ісуса Хрыста, Сына Божыя, тысешчнага пяцьсотага і двадзесят пятага”, калі ў слаўным месьце Віленскім пільны доктар Францішак Скарына выціснуў сваю апошнюю кнігу “Апостал”. Тут дарагая завершанасьць справы, гэтак рэдкая для беларусаў. Магчыма, маюць рацыю гісторыкі, калі гавораць пра тысячу гадоў Беларусі, але мне здаецца, што там пераважалі не нацыяльныя, а іншыя чыньнікі — рэлігійныя, уладныя, ваенныя, тэрытарыяльныя і да т.п. Жыцьцё ўсіх дзяржаваў, нацыяў калі-небудзь у гэтым сьвеце сканчалася. Аднак гісторыя Беларусі ўжо ня скончыцца: мы дажылі да інфармацыйнага веку і культура ў такой цывілізацыі ёсьць катэгорыяй вечнасьці.

Аляксандар Надсан,
апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў замежжа;
Лёндан, Вялікая Брытанія

Гэтае пытаньне вельмі шырокае. Мне здаецца, тут можна казаць толькі пра сучасную, новую гісторыю. Гісторыя

беларускай, як і кожнай, нацыі пачынаецца тады, калі вялікая колькасьць людзей усьведамляе, што яны ёсьць нацыяй — нечым асобным ад суседзяў; што іх яднае нешта супольнае — мова, традыцыі, імкненьні, усё разам.
Нацыі ў сучасным значэньні — гэта новае зьявішча. Нават іншыя эўрапейскія нацыі — напрыклад, нямецкая, італьянская ці французская — пачалі паўставаць у канцы XVIII — пачатку XIX стагодзьдзя. Таму беларусы толькі крыху спазьніліся.
У нас нацыянальная гісторыя пачалася з канца XIX — пачатку XX стагодзьдзя. Мне здаецца, што самым вызначальным пунктам была «Наша Ніва» і людзі, якія вакол яе згуртаваліся. Усё іншае было меншым, а гэта было самае галоўнае. Там ужо было ўсьведамленьне, што беларусы ёсьць асобнай нацыяй, што яны мелі сваю гістарычную традыцыю, што яны хацелі мець сваю будучыню як беларусы. Магчыма, яшчэ ня выкрышталізавалася ідэя поўнай незалежнасьці, але гэта быў пачатак. Для мяне тут пачалася Беларусь як нацыя ў сучасным сэнсе слова.
Калі гаворка пра будучыню, дык ідэя нацыі мела вялікія цяжкасьці ў пашырэньні, але мне здаецца, што ў сьвядомасьць людзей ужо ўвайшло разуменьне Беларусі як асобнай нацыі — нават сярод тых, хто не размаўляе па-беларуску, нават пры сучаснай гэтак званай “незалежнай” Беларусі. Таму, хоць цяжкасьці вялікія, я застаюся аптымістам, лічу, што Беларусь выжыве і атрымае ўсе належныя прэрагатывы — незалежнасьць, поўнае прызнаньне беларускай мовы ды ўсё іншае. Ня ведаю, ці дажывуць да гэтага людзі майго пакаленьня, але думаю, што малодшае пакаленьне гэта ўбачыць.

Івонка Сурвілла,
старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі;
Атава, Канада

Працэс, якім зьяўляецца нацыянальная гісторыя, трывае так доўга, колькі жыве сама нацыя. Ёсьць у гэтым працэсе, праўда, сьветлыя моманты, і ёсьць менш сьветлыя…
Наш народ змагаўся за свае вартасьці ды нацыянальныя атрыбуты ўжо ў Полацкім княстве, у Грунвальдзе, у Воршы, у “невядомай вайне” XVII стагодзьдзя, у шматлікіх паўстаньнях

XIX і праз усё XX стагодзьдзе. Гэта ўсё я ўважаю часткаю нашае нацыянальнае гісторыі. Дай Божа, каб перажылі мы й цяперашнія выпрабаваньні.

Аляксандар Фядута,
палітычны камэнтатар, старшыня грамадзкага аб'яднаньня "Сацыяльныя тэхналёгіі";
Менск, Беларусь

Гісторыя Беларусі пачалася ў той момант, калі Вітаўт усьвядоміў, што інтарэсы Вялікага Княства Літоўскага адрозьніваюцца ад інтарэсаў кароннай Польшчы, на чале якой стаяў яго сваяк Ягайла. Гэта прынцыповы момант: у аснове любога нацыянальнага разьвіцьця стаіць усьведамленьне не адзінства вашага народу зь нейкім іншым, а менавіта ўсьведамленьне адрозьненьняў. З гэтага пункту гледжаньня, напрыклад, стары гімн на вершы Міхася Клімковіча быў гімнам антынацыянальным: у ім дэкляравалася не адрознасьць, а падабенства і нават другасортнасьць: "Мы — беларусы, з братняю Русьсю…" Ну, калі ня самі па сабе, а абавязкова з старэйшым братам, значыць, уласным домам жыць проста бессэнсоўна. Бо ўласны дом, уласная дзяржава, уласныя інтарэсы прадугледжваюць і адказнасьць за прынятыя рашэньні. Датуль, пакуль лёс ВКЛ вырашаўся ў Вільні, дзяржава існавала. Цэнтар прыняцьця рашэньняў перамясьціўся ў Варшаву або Кракаў, у Пецярбург або ў Маскву — і дзяржава зьнікла, распусьцілася, зьлілася зь іншай, больш моцнай і больш адказнай.

Гэта не азначае, што любое супрацьстаяньне зьяўляецца праявай пачатку дзяржаўнай гісторыі. Спаленьне Полацку і забойства Рагвалода Ўладзімерам Сьвятым (наагул, парадаксальная сьвятасьць забойцы й спусташальніка гарадоў і вёсак) ёсьць вынікам барацьбы прыватных інтарэсаў асобна ўзятага князя за перадзел спадчыны. Вітаўт, пазбаўлены дзяцей, несумненна, дбаў не пра ўласную дынастыю, а пра дзяржаву. Магчыма, думаў і пра гісторыю, калі ў той час існаваў панятак, абазначаны гэтым тэрмінам. Значыцца, ягоныя інтарэсы не былі прыватнымі інтарэсамі асобы, надзеленай уладай.

Як ні дзіўна, камусьці можа здавацца, што гісторыя Беларусі ўжо завершаная. Акурат таму, што палітыка цяперашняе ўлады

ёсьць адмаўленьнем старой палітыкі Вітаўта, палітыкі Радзівіла Чорнага і Лява Сапегі, палітыкі Тызэнгаўза. Асабліва апошняга — калі гаворка ідзе пра эканамічныя пачаткі. Пры Тызэнгаўзу на нашых землях разьвівалася прамысловасьць і прадпрымальніцтва (не на шкоду польскіх, але на карысьць нашых, “ліцьвінскіх”, беларускіх купцоў). Пры Тызэнгаўзу красавала культура, адчыняліся тэатры й друкарні. Мы адсталі ад мінулага нават у параўнаньні з канцом XVIII стагодзьдзя. І калі кіраўнік дзяржавы адмаўляе беларускі характар Вялікага Княства Літоўскага, узьнікае пытаньне: а зь якога часу ён адлічвае гісторыю Беларусі? З моманту фактычнай ліквідацыі яе дзяржаўнасьці — ад падзелаў Рэчы Паспалітай? Але ж Тызэнгаўз насьмеліўся ўступіць у палеміку з Кацярынай Вялікай, паколькі ўсьведамляў сваю гістарычную й юрыдычную праўду. І Кацярына — стрывала.

Я — такі ж савецкі беларус, як і Лукашэнка. Гісторыю Беларусі адкрыў для мяне Караткевіч, чые “Каласы” я прачытаў упершыню яшчэ ў школе, у 1981 годзе. І калі ў 1984 годзе, студэнтам, я прыехаў у Новасібірск, мой новы сібірскі сябар Лёша Мусорын папрасіў мяне сказаць колькі словаў па-беларуску. Я прачытаў яму адзіны верш, вывучаны мною ў школе, — “Паміж пяскоў эгіпецкай зямлі...”, знакаміты “Санэт” Багдановіча (ну не чытаць жа філёлягу “Быў сьмешны дзядзька той часінай...”?). Мы ліставаліся зь Лёшам з 1984 году, прычым ён дасылаў мне лісты на беларускай мове, я перасылаў яму пасылкі з падручнікамі й кнігамі (зборы твораў Караткевіча, Гарэцкага, Багдановіча). Сёньня мой сібірскі сябар ведае беларускую мову лепей за мяне (як ні сорамна ў гэтым прызнацца), піша вершы па-беларуску (выдатныя хоку, што прызнае нават Міхась Скобла) і чытае спэцкурс з гісторыі беларускай літаратуры.

Мусорын змусіў мяне зразумець, што я — не такі, як ён. Ня тое каб лепшы або горшы: чым, скажам, француз лепшы або горшы за немца? Проста — не такі. У мяне ёсьць свая мова, свая гісторыя, свая зямля. Сібіракі гэта тонка адчуваюць, у іх рэгіянальны, але патрыятызм, яны ведаюць, чым адрозьніваюцца ад масквічоў або піцерцаў. Але пры гэтым яны памятаюць, што гісторыя Сібіры не пачынаецца зь Ермака. Для іх вытокі “сібірыяды” — у дакучумоўскай яшчэ гісторыі. Таму Сібір — бясконцая, як і беспачатная.

У Менску вывучэньне гісторыі Беларусі для мяне працягнулася пасьля знаёмства з Валянцінай Трыгубовіч і Валянцінам Голубевым. Гэта было важна — праз павагу да іх як да людзей прыйсьці да павагі іх ідэалёгіі, зразумець, што менавіта яны бароняць. Я ўбачыў, што нацыяналізм бывае не агрэсіўны, а цалкам талерантны, прымальны. І хаця я быў і застаюся надзвычай русіфікаваным беларусам, чалавекам расійскае культуры і дасьледчыкам расійскае літаратуры, я лётаю, бы ўчадзелы, па менскіх “букіністах”, купляючы старыя кнігі Мальдзіса й Кісялёва, Каханоўскага й Майхровіча, каб зразумець, хто такія беларусы і ў чым сутнасьць нашай супольнай Гісторыі.

Наша Гісторыя бясконцая паводле азначэньня датуль, дакуль ёсьць чалавек, што адчувае настальгію пры чытаньні кнігаў Мальдзіса. Я яе адчуваю. І ня толькі я. Мой навуковы кіраўнік, ураджэнец Самары, дацэнт Гарадзенскага ўнівэрсытэту Ігар Вячаслававіч Ягораў сказаў неяк, што Лукашэнка стварыў чытача беларускіх кнігаў: у людзей зьявілася перасьцярога, што кнігі на іх роднай мове больш ня будуць выдавацца. Каюся, што такі страх сядзіць і ў маёй душы. І кожная новая кніга на беларускай мове, як кожная новая сьцежка скрозь гістарычныя нетразі, аслабляе гэты страх.

І пазіраючы на сыноў Валянціны Трыгубовіч і Валянціна Голубева (не супольных, рэч ясная, у іх свае радзіны), я дакладна ведаю, што гісторыя Беларусі ня скончыцца. Таму што ёсьць моладзь, якая ўсё яшчэ жыве пад гербам “Пагоня”, а не пад цяперашнім нашым надгробным вянком з сылюэтам высахлай калюгі. Ёсьць «Малады Фронт». Хай я не гавару ў побыце па-беларуску — яны гавораць. І гэта найлепшая зарука адраджэньня Беларусі.

Калі ж нехта думае, што інтэграцыя будзе смутным фіналам нашай дзяржаўнасьці, хай не адчайваецца. Трыста гадоў вытрымалі, захаваўшы гістарычную памяць, вытрываем яшчэ адну пяцігодку.

Станіслаў Шушкевіч,
былы Старшыня Вярхоўнага Савету;
Менск, Беларусь

З майго гледзішча, нацыянальная гісторыя Беларусі пачалася

25 сьнежня 1991 году. У гэты дзень найбольш уплывовыя
й наймагутнейшыя краіны сьвету афіцыйна аб'явілі аб
прызнаньні незалежнай краіны — Рэспублікі Беларусі.
У суб'екта былога СССР Беларускай Савецкай Сацыялістычнай
Рэспублікі такога прызнаньня не было, хаця яна мела
прадстаўніцтва ў ААН за важкі ўклад у перамогу над
фашызмам у другой сусьветнай вайне (як і Ўкраінская ССР).
Такому рашэньню спрычынілася перш за ўсё зноў жа афіцыйнае
прызнаньне незалежнасьці Беларусі Вярхоўным Саветам
Расійскай Фэдэрацыі 11 сьнежня таго ж 1991 году ў выніку
ратыфікацыі падпісаных 8 сьнежня Белавескіх пагадненьняў.
Ні адна з гэтых падзеяў ня мела б шанцаў зьдзейсьніцца, каб не
шматпакутныя намаганьні многіх пакаленьняў беларусаў —
тых, хто шчыра любіў Радзіму й перадаваў гэтае пачуцьцё
дзецям, хто ўдасканаліў мову да ўзроўню літаратурнай,
самаахвярна бараніў Бацькаўшчыну ад іншаземцаў, выжываў
пад прыгнётам акупантаў з захаду і з усходу, тых, хто меў
мужнасьць стварыць Беларускую Народную Рэспубліку
ў 1918 годзе й не адрокся ад беларускасьці ў гулагах, турмах,
спрыяў станаўленьню беларускай дзяржаўнасьці з замежжа.
Найвышэйшая форма самасьцьверджаньня нацыі —
нацыянальная дзяржава. Зь яе, паўтараю, пачынаецца
нацыянальная гісторыя. Тыя, хто сьцьвярджае, што
незалежнасьць нам проста звалілася зь неба і што мы
да яе не падрыхтаваныя, — найбольш небясьпечныя ворагі
Беларусі. Яны хочуць, каб працягвалася каляніяльная гісторыя
Беларусі ў стане падпарадкаваньня маскоўскай мэтраполіі,
якая па-ранейшаму хоча тут уладарыць, хоча палажыць канец
тутэйшай нацыянальнай гісторыі. Каб нашая гісторыя мела
будучыню, неабходна дзяржаўнасьць дэ-юрэ, якую мы маем,
ператварыць у дэ-факта. І мы гэта зробім, бо мы ня зломкі,
а эўрапейская нацыя. Мы адны з самых усходніх, з гэтай
нагоды мы крыху спазьняемся з уласнай дзяржаўнасьцю,
бо нам больш, чым іншым, перашкаджаюць, сёньня — з Усходу.
Але з нас не зрабіць качэўнікаў, якім усюды можа быць добра.
Лепш за ўсё нам у Беларусі, і мы зробім яе цывілізаванаю
эўрапейскаю краінай. І зробім мы гэта разам з расійцамі
і іншай нацыянальнасьці грамадзянамі Беларусі, бо яны добра
разумеюць, што тут, у Беларусі, у грамадзянаў больш шанцаў
наладзіць заможнае жыцьцё для ўсіх.

Вось так гэта і скончыцца.

Запісаў Аляксей Знаткевіч

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/04/28
[image]

Джэймс Флін

Кантрасты падабенства: біскупы Трой у Ірландыі і Лісоўскі ў Беларусі ў эпоху Вялікай французскай рэвалюцыі

ДЖЭЙМС ФЛІН — прафэсар гісторыі Каледжу Сьвятога Крыжа (Ворчэстэр, штат Масачусэтс), асацыяваны супрацоўнік Дэвісаўскага цэнтру расійскіх дасьледаваньняў пры Гарвардзкім унівэрсытэце. Артыкул друкуецца з ласкавае згоды The Catholic Historical Review, дзе ён быў апублікаваны ўпершыню.

У верасні 1809 году Кабінет міністраў Расійскай імпэрыі абмяркоўваў пагрозлівую сітуацыю, якая ўзнікла на заходняй мяжы дзяржавы — на тэрыторыях, якія Расія захапіла падчас падзелаў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII стагоддзя. Напалеон захапіў тую частку Рэчы Паспалітай, што была адышла да Прусіі, і пры ягонай падтрымцы стваралася новая польская дзяржава пад назвай “Герцагства Варшаўскае”. Новая дзяржава кіравалася парламентам, у ёй было ўведзена ўсесагульнае грамадзянскае права, скасаваны прыгон, а царква аддзеленая ад дзяржавы. Гэтая новая Польшча, якую падтрымлівалі французы, несла пагрозу кіраўнічай эліце самадзяржаўнай Расіі, якая баялася перспектывы ўзнікнення

моцнай незалежнай польскай дзяржавы, асабліва такой — з парламентам, роўнасцю грамадзянаў ды царквой, аддзеленай ад дзяржавы. Новы польскі палітычны лад рэзка кантраставаў з расійскім; шмат хто ў расійскім урадзе лічыў Польшчу небяспечнай суседкай, бо яе прыклад абуджаў надзеі тых, хто лічыў палітычны лад Расіі дэспатычным.

Сябар Кабінету міністраў і адзін з найбольш уплывовых расійскіх арыстакратаў Сяргей Галіцын парадзіў адказаць на гэтую пагрозу канчатковай анексіяй заходніх правінцый — Беларусі і Заходняй Украіны — з адначасовым даданнем да царскіх тытулаў яшчэ й “Караля Польскага”. Але цар Аляксандр I быў супраць такога кроку: “Вазьміце прыклад Ірландыі, — казаў ён, — гэта абшар, вельмі адрозны ад Англіі… і ў выніку — саюз між гэтымі краінамі вельмі нетрывалы”[1]. Грунтуючыся на прыкладзе Англіі і Ірландыі, ён прыходзіў да высновы, што ўключэнне ў Расію беларускіх правінцый не прынесла б Расіі карысці.

1 Дубровин Н. “Русская жизнь в начале XIX века” // *Русская старина.* 1902. №3. С.16-17.

Айчынная вайна 1812 году змяніла думку Аляксандра I. Пасля паразы Напалеона ў 1815 годзе расійскі імператар прыняў тытул “Караля Польскага”, а далучэнне беларускіх правінцый было афармленае канчаткова. Аднак ягонае меркаванне, што параўнанне Беларусі з Ірландыяй магло б дапамагчы зразумець

логіку развіцця падзеяў на пачатку XIX стагоддзя, вартае ўвагі. Параўнанне сведчыла: у дзвюх гэтых нацыях, што жывуць на супрацьлеглых канцах Еўропы і маюць розную гісторыю, цэрквы, да якіх належала большасць сялянства, знаходзіліся ў амаль аднолькавым становішчы і стаялі перад амаль аднолькавым выбарам. Абедзве царквы зрабілі выбар на карысць супрацоўніцтва з імперскімі ўладамі, абедзве насцярожана ставіліся да нацыяналістаў, натхнёных ідэямі Французскай рэвалюцыі. Прычыны такога выбару і ягоныя вынікі добра ілюструюць дынаміку фактараў, што спрыялі або замінялі развіццю нацыяналізму на пачатку XIX стагоддзя. Гэтымі цэрквамі кіравалі прэлаты, не зацікаўленыя ў развіцці нацыяналізму; затое гэтыя прэлаты ўпарта адстойвалі самастойнасць сваіх цэркваў. Зразумела, што такая аўтаномія не магла не паспрыяць паўстанню інстытутаў, здольных з часам стаць базаю нацыяналізму. Але ў часы Вялікай французскай рэвалюцыі і Напалеона тыя, хто шукаў аўтаноміі для рыма-каталіцкага касцёлу ў Ірландыі і ўніяцкай (грэка-каталіцкай) царквы ў Расійскай імперыі, кіраваліся тым прынцыпам, што ў веры — галоўны сэнс іхняга жыцця, а якая менавіта свецкая ўлада пануе над імі, не надта істотна.

У 1790-х гадах і рыма-каталіцкі касцёл у Ірландыі, і ўніяцкая царква ў Беларусі сутыкнуліся з хуткімі зменамі ў палітычнай сітуацыі. У 1782 годзе Парламент Гратана здабыў вялікую ступень незалежнасці для пратэстанцкага насельніцтва Ірландыі. “Біль пра вызваленне” 1793 году быў спробай пашырыць дасягненні Парламенту Гратана на каталікоў і тым самым скасаваць дзеянне Крымінальнага Кодэксу, складанага ў часы захопу Ірландыі ў XVII стагоддзі выключаў каталікоў з грамадскага жыцця. У выніку прыняцця гэтага біля каталікі атрымалі столькі правоў, на колькі спадзяваліся грамадзяне каго напужаў. Грунтам і для спадзяванняў, і для насцярожанасці былі сялянскія бунты, што здарыліся часцей, дэфендэрызм ды ўсё больш агрэсіўная свецкага Каталіцкага камітэту, які абараняў інтарэсы класу. Уздым радыкальнага руху “Аб’яднаная Ірландыя” і, урэшце, прызначэнне лордам-намеснікам Ірландыі ў 1795 годзе лорда Фіцвілма, які здаваўся праканстанцыйна настроеным дзеячом, станавілі рэальную пагрозу “Пратэстанцкай спадчыны”, статусу земляўласнікаў

2. Складанасці сацыяльнага руху

Thomas Bartlett “The Fall and Rise of the Irish Nation: The Catholic Question, 1690–1830”

нашчадкаў ангельскіх заваёўнікаў, якія канчаткова падпарадкавалі каталіцкую Ірландыю ў 1690 годзе[2]. Не дзіва, што ірландскі клас Ірландыі лічыў такія тэндэнцыі вельмі небяспечнымі. Яны выклікалі заклапочанасць і ў Джона Томаса Троя, арцыбіскупа Дубліна.

У выніку пакрокавага прыпынення дзеяння Крымінальнага Кодэксу на працягу XVIII стагоддзя колькасць каталіцкіх біскупаў у Ірландыі паступова расла: калі ў першым дзесяцігоддзі іх было не больш за тры, дык у апошнім — больш за два дзесяткі. Аднак агульнанацыянальная каталіцкая іерархія не паўстала; кожны біскуп кіраваў сваёй епархіяй. На большасці з біскупскіх пасадаў сядзелі неманахі, а арцыбіскупам Дубліна ў 1787 годзе стаў дамініканец Трой[3]. Ён паходзіў з роду заваёўнікаў-пратэстантаў, якія пасяліліся ў Ірландыю ў XVII стагоддзі, з таго ягонага адгалінавання, што прыняло каталіцтва. Троеў бацька, паспяховы бізнэсмэн, перадаў патрапіў даць сыну, што нарадзіўся ў 1739 годзе, добрую адукацыі ў Ірландыі. Тагачаснае заканадаўства забараняла каталікам атрымліваць вышэйшую асвету.

У шаснаццацігадовым веку Трой пераехаў у Рым і ўступіў у Дамініканскі ордэн. Кар'ера ягоная была паспяховай, і праз дваццаць гадоў яго ўзвялі ў ранг біскупа і адправілі ў Ірландыю. Трой прыйшоў да думкі, што для пераадолення ірландскага касцёлу патрэбнае стварэнне ягонае агульнанацыянальнай іерархіі, якая б узначальвала і выступала ад ягонага імя; тым больш што астатнія біскупы — асабліва свецкі грамадскі Каталіцкі камітэт — выступалі ад імя ўсіх каталікоў краіны. У якасці дублінскага біскупа Трою часта даводзілася выступаць ад імя ірландскага каталіцтва пры гэтым ён неаднаразова сутыкаўся з сітуацыямі, калі біскупы рабілі процілеглае таму, што заяўляў ён. Трой хацеў дабіцца ўзгодненасці ў дзеяннях біскупаў царкоўнай палітыкі[4].

У 1782 годзе, яшчэ да таго, як Трой з'явіўся ў Дублін, ірландскі парламент разглядаў прапанову аб перадачы каталікам статусу ірландскага касцёлу. Меркавалася ўстанавіць для ксяндзоў дзяржаўны заробак, але пры гэтым перадаць дзяржаве права выбару біскупаў[5]. Трою ўдалося пераканаць парламент адхіліць праекту адклікаць яго, але тое самае пытанне неаднаразова ўзнікала цягам наступных дзесяцігоддзяў[6].

(Savage, Marland, 1992), pp. 121-202.

Таксама ў R. Foster "Modern Ireland 1600-1972" (London, 1988), pp. 255-277.

Гэта дазволіла яму стаць адным з самых заможных каталікоў краіны.

Ён быў вялікім прыхільнікам дэцэнтралізацыі і супраціўляўся ірландскі рух, бо ён быў перакананы, што ірландскія біскупы, меў складаную і даволі канфліктную адносіны з Дэніэлам О'Конэлам, лідэрам ірландскага каталіцкага руху.

3. Дэйвід Кэлі, "Трой, Джон Томас (1739—1823)", у Оксфардскім слоўніку нацыянальнага жыцця, 2004.

The pattern of the flock: John Thomas Troy, 1786—1823" і "History of the Catholic Diocese of Dublin",

У 1795-м зраўнаваць каталікоў у правах праз перад. James Kelly and Daire Keogh (Dublin, 2000), pp. 215–236. Vincent J. McNally “Reform, Revolution and Reaction: Archbishop John Thomas Troy and the Catholic church in Ireland, 1787–1817” (Catholic University of America, 1995). Дасягненні Рыма неаднаразова спрабаваў пераканаць яго ў неабходнасці заняць больш “абачлівую” пазіцыю (іншымі словамі, прыняць субсідыі і дазволіць ураду ўжываць права вета), **Трой** здолеў настаяць на сваім.

Адначасова арцыбіскуп намагаўся пераканаць уладу ў тым, што ягоны касцёл абсалютна лаяльны да дзяржавы, нягледзячы на імкненне да самастойнасці, нежаданне абмяжоўваць свае правы на самакіраванне і распараджэнне ўласнай маёмасцю. Пры канцы 1793 году Трой звярнуўся да лорда-намесніка, імя царкоўнай іерархіі, падзякаваўшы за “Біль пра выкараненне”, паабяцаў падтрымку ў барацьбе з “дэфендэрыстамі” і “найлепшае з заканадаўстваў” — Брытанскае, у адпаведнасці з нормамі якога яны жылі. У лісце да сваёй паствы ад 1793 году “Пра абавязкі грамадзяніна-хрысціяніна” Трой заклікаў вернікаў “быць дастойнымі рэформаў” — г.зн. скасавання частак Крымінальнага Кодэксу, якія дагэтуль абмяжоўвалі грамадзянскія правы каталікоў[8]. Трой, безумоўна, супраціўляўся Французскую рэвалюцыю бедствам і пагрозай, а ірландскага для царквы, а імкненне да свабоды і роўнасці праз знішчэнне сацыяльнай іерархіі і станавага падзелу супярэчыла ўласнаму досведу і здароваму сэнсу. Трой падкрэсліваў, што

4. Воля, якую ад прыхільнікаў Трой у пачатку 1790-х, **добравалення**, **ўсяго** **Daire Keogh** 1793 году **The French Disease: The Catholic Church and Irish Radicalism, 1790–1800” (Dublin, 1993);**

нягледзячы на абарону самастойнасці касцёлу, мэтоніна царквы не маюць анічога супольнага з палітычнымі і сацыяльнымі мэтамі Каталіцкага камітэту і дэфармуюць кажучы ўжо пра “Аб’яднаную Ірландыю”[9]. Безумоўна, гэткая пазіцыя вельмі паспрыяла найбольшаму поспеху Трося — заснаванню семінарыі ў Мэйнуце ў 1795 годзе. З часоў каралевы Елізаветы I ірландскія ксяндзы атрымлівалі адукацыю за мяжой. Ірландскія калегіумы за мяжой знаходзіліся галоўным чынам у Францыі, зачынілі падчас рэвалюцыі. Таму шмат хто з дзвюх тысячаў святароў, што служылі ў Ірландыі ў 1790-х, добрай адукацыі не мелі. Многія ксяндзы толькі й мелі навукі, што прыслугоўванне ля алтароў пры святарах. Іх высвячалі ў сан, бо ксяндзоў бракавала, асабліва ў дыяцэзіях заходніх графстваў, і на адсутнасць семінарскае адукацыі ніхто не зважаў. Не раз прапановы, а двойчы нават рабіліся спробы адчыніць каталіцкія семінарыі ў самой Ірландыі. Трой, які атрымаў адукацыю ў Рыме, выступаў супраць такіх прапановаў, асабліва калі яны зыходзілі ад Парламенту. Хаця ён добра ўсведамляў цяжкасці, звязаныя з існаваннем ірландскіх калегіумаў у Францыі, аж да 1793 году ён спадзяваўся, што пагроза міне і ірландскай царкве давядзецца самой выдаткоўвацца на семінарыю.

кароткі выклад таго

Kenrick, Archbishop

The Catholic Church and Irish Radicalism: 1791-1793”

The United Irishmen: Republicanism, Radicalism and Rebellion”, ed. David Dickson et al. (Dublin, 1993), pp.124-134.

5 McNally, op. cit., p.16.

6 McNally цытуе шмат выказванняў Троя супраць надання дзяржаўным органам права вета на выбар каталіцкіх біскупаў у абмен на ўстанаўленне дзяржаўных заробкаў для святароў. Тым

не менш, ён робіць выснову (с.140), што Трой выказваўся супраць прапановы “няшчыра”, а на самай справе яе падтрымліваў (напрыклад, у McNally, op. cit., pp.78-79, 93-94, 114-115, 139-140, 153). Больш верагодным падаецца меркаванне, што Трой “намагаўся прадстаўляць каталікоў як верных падданых, аднак раўніва адстойваў незалежнасць царквы і права яе іерархаў адзінаўладна распараджацца яе справамі”. Daire Keogh “The French Disease”, p.18.

7 З ліста Троя да кардынала Антанэлі, прэфекта папскае кангрэгацыі прапаганды веры (Prefect of Propaganda Fide), працытаванага ў Vincent J.McNally “John Thomas Troy, Archbishop of Dublin, and the Establishment of Saint Patric’s College, Maynooth, 1791-1795”, Catholic historical Review, LXVII (1981), 578. C.D. У артыкуле A.Leighton “Gallicanism and the Veto Controversy: Church, State and the Catholic Community in Early Nineteenth-Century

Ireland” у “Religion, Conflict, and Coexistence in Ireland. Essays presented to Monsignor Patric J.Corish, ed. R.V.Comerford” (Dublin, 1990), pp.135-158, Трой не згадваецца, але затое артыкул утрымлівае цікавы агляд праблематыкі, звязанай з правам вета і субсідыямі ад сярэдзіны XVIII да сярэдзіны XIX стагоддзя.

8 S.J.Connoly “Priests and People in Pre-Famine Ireland 1780-1845” (London, 1982), pp.223-225. Безумоўна, Трой меў на ўвазе прымірэнне і заклікаў каталікоў

быць вернымі падданымі кароны, але ўжыванне слова “грамадзянін” замест “падданы” шмат каго прывяло да думкі, што Трой выступае за рэспубліканскую форму кіравання. Крытыка ягонага звароту гучала з парламенцкай трыбуны, дзе яго ліст да паствы быў названы “палітычным памфлетам, напоўненым аргументамі, надта варожымі існаму ладу царквы і дзяржавы”. Keogh “Troy”, United Irishmen, pp.132-133.

9 Хаця Трой

паслядоўна займаў ясную пазіцыю, ягоныя запэўніванні ў лаяльнасці не задаволілі лорда-намесніка, які абвінаваціў Троя ў тым, што той недастаткова выразна выступае супраць рэвалюцыі. Daire Keogh “The Battle for Affection: The Catholic Church and Radical Politics 1790-1800” Bullan, 2 (1995), p.41.

Трою асабліва не падабаўся варыянт, пры якім ірландскія семінарыя была б уфундаваная на дзяржаўныя цэнтральныя грошы, бо гэта дало б магчымасць уплываць на яе дзейнасць ўладам. Рым яшчэ ў 1791 годзе радзіў Трою прасоўваць магчымасці дзяржаўнага фінансавання ірландскай семінарыі. На пачатку 1793 году Каталіцкі камітэт здолеў уключыць у парламенцкі праект “Білю пра вызваленне” дадатковы пункт пра неабходнасць адкрыцця каталіцкага “каледжу, ці ўніверсітэту”. Трой удзельнічаў у нарадах школьнага падкамітэту Каталіцкага камітэту, бо ні Трой, ні Камітэт былі зацікаўленыя ў разрыве адносінаў. Але Трой выступаў ўрад з контрпрапановай, якая супярэчыла самой ідэі прапановы Каталіцкага камітэту (прапазіцыя Камітэта заключалася ў тым, што калегіум павінен быць

10. Patrick J. Corish “Maynooth College, 1795-1995” (Dublin, 1995), pp. 6-25, дзе больш падрабязна, чым у іншых крыніцах, апісана гісторыя заснавання Мэйнуцкага

даступны ўсім, незалежна ад веравызнання, а кіраваць ім павінна апякунская рада, якая б складалася з дужанаў і свецкіх асобаў[10]). Трой рэзка крытыкаваў “фракцыйнае вар’яцтва… шмат каго з нашых цёмных самазванцаў-англікоў” ды неаднаразова называў Каталіцкі камітэт і “Асацыяцыю” Ірландыю” “дэмакратамі”, што баламуцяць краіну “вальнадумствам”. Але Трой стаяў у апазіцыі не толькі да свецкага камітэту, але і да Ватыкану, да ўраду. Ён настойваў на тым, каб у калегіум прымалі толькі студэнтаў-каталікоў, кандыдатаў у святары. Ён таксама лічыў, што каталіцкім калегіумам павінны кіраваць біскупы і што адкрыццё калегіума павінна ўвязвацца з увядзеннем права вета. Дзве дыяцэзіяльныя семінарыі былі заснаваныя ў Ірландыі біскупамі, але іх такія малыя, а ўзровень падрыхтоўкі давалі такія толькі пацвярджалі рацыю Троя: пасля знікнення ірландскіх калегіумаў, у якіх навучалася сотні чатыры студэнтаў, сітуацыю мог выратаваць толькі нацыянальны калегіум.

калегіуму. Ён таксама: Kay Wareste “England’s Statesmund Kirchenpolitik in Irland 1795-1869. Dargestellt an der Entwicklung des irischen Nationalseminars Maynooth College” (Frankfurt am Main, 1980), pp.26-37 — дэталёва распісаная гісторыя, прыведзеныя шматлікія цікавыя дакументы. Цікавыя дакументы можна знайсці таксама ў надзвычай падрабязнай працы John Healy “Maynooth College: Its Centenary History” (Dublin, 1895).

Сваёй мэты Трой дасягнуў у чэрвені 1795-га, калі парламент

санкцыянаваў адкрыццё калегіуму Святога Патрыка. Гэты “Каралеўскі калегіум” быў прыватнай установай, якою кіравала абраная біскупамі рада. Хаця і было прадугледжанае аддзяленне для студэнтаў, што не збіраліся прысвяціць сябе святарству, фактычна калегіум прызначаўся толькі для свецкія каталікоў, што рыхтаваліся ў святары[11]. У апякунскую раду калегіуму ўваходзілі і пратэстанты. Аднак, папрасіўшы іх на першым паседжанні, у далейшым яны не адыгрывалі ніякай ролі. Сярод свецкіх асобаў у раду ўваходзілі толькі былыя сябры Каталіцкага камітэту, што пакінулі яго, нездавольваючыся з меркаваннем большасці пра абавязковасць знаходжання ў кіраванні калегіумам свецкіх асобаў. Такім чынам, толькі ў раду ўваходзілі і асобы некаталіцкага веравызнання. Такім асобы, Трой дасягнуў галоўнае свае мэты: калегіумам кіравалі выключна біскупы. Увосень 1795-га калегіум прымаў 40 студэнтаў. 16 з іх ужо былі святарамі. Праз 10 гадоў калегіум рэгулярна прымаў дзве сотні студэнтаў. Ён забяспечваў ірландскі каталіцкі касцёл добра, калі не сказаць выдатна падрыхтаванымі святарамі.

Але ж рэсурсы калегіуму былі вельмі абмежаваныя. Трой спадзяваўся, што біскупам удасца фінансаваць калегіум кошт прыватных ахвяраванняў, але вельмі хутка ён зразумеў, што знаходзіць іх немагчыма. З гэтай прычыны Трою даводзілася штогод прасіць на ўтрыманне калегіуму ўрадавую субсідыю. Але не толькі неабходнасць у грошах на калегіум турбавала Троя супрацоўнічаць з урадам. Ён вёў барацьбу з Каталіцкім камітэтам і дэфендэрыстамі і больш чым энергічна выступаў з “Аб’яднанай Ірландыяй” не толькі таму, што не жадаў вынікаць адносінаў з урадам, але і таму, што не прымаў метадаў арганізацый і тых шляхоў, якімі яны намагаліся дасягнуць. Паўстанне “Аб’яднанай Ірландыі” ў 1798-м было не толькі змаганнем за незалежнасць, але таксама сацыяльныя і палітычныя рэформы. У графстве Кілдар, дзе знаходзіўся Мэйнуцкі калегіум, насельніцтва адносіна энтузіязмам прыняло рэформы. Біль пра вызваленне каталікам права засядаць у судах. У той жа час Каталіцкага камітэту і “Аб’яднанай Ірландыі” прыняць дзейнічаць[12]. У 1798-м горад Кілдар быў практычна ў жорсткіх баях, арэнаю якіх графства было некалькі Трой і падначаленыя яму біскупы асудзілі паўстанне.

11 Свецкія студэнты былі неабавязковымі, але віталіся.

Свецкія былыя каталіцкія камітэтчыкі і пратэстанты ўваходзілі ў раду калегіуму.

Трой дасягнуў галоўнае свае мэты: калегіумам кіравалі выключна біскупы.

Праз 10 гадоў калегіум рэгулярна прымаў дзве сотні студэнтаў.

Трой забяспечваў ірландскі каталіцкі касцёл добра, калі не сказаць выдатна падрыхтаванымі святарамі.

Але ж рэсурсы калегіуму былі вельмі абмежаваныя.

Трой спадзяваўся, што біскупам удасца фінансаваць калегіум кошт прыватных ахвяраванняў, але вельмі хутка ён зразумеў, што знаходзіць іх немагчыма.

З гэтай прычыны Трою даводзілася штогод прасіць на ўтрыманне калегіуму ўрадавую субсідыю.

Але не толькі неабходнасць у грошах на калегіум турбавала Троя супрацоўнічаць з урадам.

Ён вёў барацьбу з Каталіцкім камітэтам і дэфендэрыстамі і больш чым энергічна выступаў з “Аб’яднанай Ірландыяй” не толькі таму, што не жадаў вынікаць адносінаў з урадам, але і таму, што не прымаў метадаў арганізацый і тых шляхоў, якімі яны намагаліся дасягнуць.

Паўстанне “Аб’яднанай Ірландыі” ў 1798-м было не толькі змаганнем за незалежнасць, але таксама сацыяльныя і палітычныя рэформы.

У графстве Кілдар, дзе знаходзіўся Мэйнуцкі калегіум, насельніцтва адносіна энтузіязмам прыняло рэформы.

Біль пра вызваленне каталікам права засядаць у судах.

У той жа час Каталіцкага камітэту і “Аб’яднанай Ірландыі” прыняць дзейнічаць[12].

У 1798-м горад Кілдар быў практычна ў жорсткіх баях, арэнаю якіх графства было некалькі

Трой і падначаленыя яму біскупы асудзілі паўстанне.

Для студэнтаў-святароў, фінансаваная Мэйнуцкага калегіуму, прымешчаная ў вёсцы Ніколстаўн, была ізаляваная ад свету.

Тут студэнты праводзілі амаль увесь час, за выключэннем нядзельных імшаў, калі яны наведвалі парафіяльную царкву.

Ніякіх кантактаў з навакольным светам, акрамя кантактаў з выкладчыкамі і кіраўніцтвам калегіуму, студэнты не мелі.

Зносіны з родным домам таксама былі вельмі абмежаваныя.

Трой лічыў, што студэнтам трэба ведаць толькі тое, што ім неабходна ведаць, каб стаць добрымі святарамі.

Таму ён не дазваляў студэнтам чытаць газеты, бо лічыў, што ведаць пра тое, што адбываецца ў свеце, ім не трэба.

**Трой лічыў, што ведаць пра тое, што адбываецца ў свеце, ім не трэба

“Аб’яднанай Ірландыі” і запатрабавалі, каб семінарыя і выкладчыкі калегіуму далі прысягу на вернасць Уніі. У 1798 годзе 19 студэнтаў былі абвінавачаныя ў ўдзеле ў паўстанцаў, і, хаця доказаў гэтага было вобмаль, праз гэта навучальнай установы выключылі. Пасля паўстання Уніі не толькі пагадзіўся з Актам злучэння, паводле якога Парламент Ірландыі ліквідаваўся, але нават ухваліў гэты дакумент[12]. У той жа час арцыбіскуп працягваў адстойваць аўтаномію свайго касцёлу. Найбольш выразна, нават радыкальна, права на рэлігійную аўтаномію ў сваім пастырскім пасланні (у 1797 годзе) абгрунтаваў першы рэктар калегіуму Томас Хасі. Пасля прызначэння біскупам Уэксфарду ён захаваў за сабой рэктарскую пасаду. Ён падкрэсліваў, што каталікі “абавязаныя падпарадкоўвацца” каралеўскай уладзе “ва ўсім, што тычыцца каралеўскай службы”. Але ж “рэлігійнае пачуццё асобы… гэта яе натуральнае, неад’емнае права”, “непадуладнае” каралеўскаму ўраду[13]. Пасланне Хасі выклікала немалое раздражненне ў пратэстанцкіх і ўрадавых колах і, хутчэй за ўсё, трохі напалохала Троя, бо з’явілася ў момант, калі напружанасць у краіне відавочна ўзрастала (што ўрэшце вылілася ў паўстанне 1798 году). Аднак Трой крытыкаваў стыль, а не змест пастырскага паслання Хасі. У прыватным лісце калегу-біскупу Трой пісаў, што Хасі “даў зашмат воцту… трэ было засмачыць алеем”[14]. Калі неўзабаве Хасі пакінуў пасаду рэктара Мэйнуцкага калегіуму, ні ён, ні Трой не выступілі з абвяржэннем ранейшае заявы.

Трой і ягоныя калегі-біскупы не толькі намагаліся абараніць аўтаномію сваёй царквы ад брытанскага ўраду, але імкнуліся парады Ватыкану, і пагатоў страхаваліся ад уплываў свецкіх асобаў. Калегіум быў заснаваны менавіта не толькі праз жаданне ўнікнуць уздзеяння Дубліна, але і каб пазбегнуць акадэмічнага ўплыву Трынітаскага каледжу[15]. Першымі выкладчыкамі ў калегіуме сталі ўрэшце настаўнікі зачыненых у Францыі семінарый. За малымі выключэннем, гэта былі ірландскія святары, што раней атрымалі адукацыю за межамі Ірландыі і былі добра падрыхтаваны для выкладання курсу, ужо даўно вядомага ў ірландскіх калегіумах за мяжой. У далейшым выкладчыкамі ў Мэйнуце станавіліся ягоныя ж выпускнікі. Мэйнут і ірландскі касцёл, які ён

надзвычайнае можна прачытаць у Corish, op. cit., pp. 10–13, 41–42.

12 Liam Chambers, “Rebellion and Kildare, 1791–1803” (Dublin, 1998), unpublished PhD thesis, pp. 24–27, 92–97, дзе можна прачытаць пра Трой і каледж.

абслугоўваў, доўгі час заставаліся самадастатковымі, залежачы толькі самі ад сябе. У гэтую эпоху акадэмічная рэформа Хасі, азначала пераход на сістэму навучання, што грунтаваны ідэях Асветніцтва, — так было з рэформамі Ёзафа Пеналуны, заснаваннем Французскага ўніверсітэту. У Ірландыі Трой ўдалося заснаваць новы калегіум, унікнуўшы ўрадавага кантролю, уплыву Ватыкану, а таксама ўздзеяння Асветніцтва, Французскай рэвалюцыі і перш за ўсё з новапаўсталым нацыяналізмам, прадуктам рэвалюцыі.

13 Томас Хасі, **нарадзіўся ў Ірландыі, атрымаў адукацыю ў Іспаніі, служыў святаром пры іспанскай амбасадзе ў Лондане. Тады ён адыграў значную ролю ў перамовах, вынікам якіх і стала заснаванне Мэйнуту. Daire Keogh “The French Disease”, pp.106-118, даволі пераканаўча аргументуе, што погляды Хасі падзяляў і Трой, хаця апошні лічыў разумнейшым троху іх змякчаць. Пра падтрымку Троем**

працягнаны пр.175-176. Хасі

і біскупамі Акту злучэння гл. у Bartlett, op. cit., pp.249-251, і Keogh, “The French Disease”, pp.213-217. Corish, op. cit., p.26, робіць выснову, што для Хасі і Мэйнут, і Ўотэрфорд здаліся надта правінцыйнымі і глухімі, каб па-сапраўднаму зацікавіць. Ён вярнуўся ў Лондан на іспанскую дыпламатычную службу ў 1798 годзе.

14 Трой да T.Bray, 15 красавіка 1797, цыт. паводле: Daire Keogh “Edmund Rice, 1762-1844” (Dublin, 1996), p.40. +

15 У парламенце

меркавалі,
што калегіум
паўстане недзе
“ў наваколлі
Дубліна”.
Рэктар
Трыніці-
каледжу яшчэ
ў 1782 годзе
прапаноўваў,
каб
кандыдаты
ў ксяндзы
навучаліся на
факультэце
каталіцкай
тэалогіі
ягонай
навучальнай
установы.
Трой баяўся не
толькі
наступстваў
абавязковай
у гэтым
выпадку
дзяржаўнай
апекі, але
і інтэлектуальнага
ўплыву з боку
ўніверсітэцкіх
колаў, сярод
якіх шырока
распаўсюдзіліся
ідэі
Асветніцтва.
Ён быў бы
непазбежны
ў выпадку
супрацоўніцтва

з Трыніці-каледжам Дублінскага ўніверсітэту (Keogh “French Disease”, pp.22-23, 71-83). Corish, op. cit., p.13, падкрэслівае, што ў 1795 годзе Мэйнут ваколіцай Дубліна не лічыў ніхто.

Уніяцкая царква ў Беларусі ў 1790-х гадах таксама адчувала патрэбу ў стварэнні новай кузні кадраў, каб адпавядаць сітуацыі, што імкліва мянялася. Амаль 2000 жанатых святароў-уніятаў абслугоўвалі вясковыя парафіі — гэта было так званае “белае духавенства”. Акрамя іх, налічвалася каля 800 манахаў-базыльянцаў — гэтак званае “чорнае духавенства”. Пры шматлікіх, хаця далёка не ва ўсіх, базыльянскіх кляштарах існавалі школы, большасць навучэнцаў якіх з’яўляліся кандыдатамі ў манахі. Большасць святароў мелі хатнюю адукацыю, сыны змянялі бацькоў, атрымліваючы парафію ў спадчыну. Уніяцкая царква, прыхаджанамі якой была большасць беларускага сялянства, выкарыстоўвала праваслаўную літургію і абрады, але з канца XVI стагоддзя была “злучаная” з каталіцкім касцёлам “уніяй”, заключанай у Берасці ў 1596 годзе. Тады некаторыя праваслаўныя іерархі Рэчы Паспалітай адрэагавалі на ўзрастанне расійскіх уплываў просьбай да Ватыкану і караля прызнаць самастойнасць царквы, праваслаўнай па сваёй літургіі і абрадах, але ў злучэнні, уніі з рыма-каталіцкім касцёлам. Са спыненнем існавання Рэчы Паспалітай прыйшоў канец і самакіраванню ды самастойнасці ўніяцкай царквы. Спачатку яна аказалася падзеленая на тры часткі. Але ў 1807 годзе тыя тэрыторыі, якія былі заселеныя ўніятамі і апынуліся ў Прусіі, адышлі да Расіі. Тая частка царквы, што дзейнічала на тэрыторыі, якая ў Габсбургскай

да Габсбургаў, атрымала ад імператрыцы Марыі Тэрэзіі назву “грэка-каталіцкая царква”[16]. Яна мела ўласную ієрархію, заснаваную ў Львове ў 1784 годзе. Гэтая царква хутка мацнела і паступова ператварылася ў нацыянальную царкву Заходняй Украіны, сучасную Ўкраінскую грэка-каталіцкую царкву. Царква ў Беларусі, у складзе Расійскай імперыі, таксама магла б зрабіцца нацыянальнай царквой у Беларусі. Але ж царскі ўрад спыніў такое развіццё падзеяў у 1839 годзе[17].

Аднак у 1773 годзе Кацярына Вялікая абяцала сваім новым падданым права на свабодны выбар веравызнання. Акрамя таго, яна аб’яднала пяць епархій уніяцкай царквы ў Польшчы, прызначыўшы аднаго біскупа кіраваць царквой з цэнтрам ў Полацку. Астатнія ієрархі атрымалі, фактычна, загад пакінуць свае кафедры, пераехаць у Санкт-Пецярбург і задаволіцца атрыманнем дзяржаўнай пенсіі, не маючы больш аніякіх рэлігійных функцый. На пасаду архібіскупа полацкага Кацярына паставіла Іраклія Лісоўскага, знаёмага Рыгора Пацёмкіна, аднаго з найбольш прыхільных дзеячоў кацярынінскага двара. Лісоўскі, хаця і быў хрышчаны ў рыма-каталіцтва, з маладосці захапляўся абрадамі ўніяцкай царквы (ягоны дзядзька быў уніяцкім біскупам). Ён атрымаў адукацыю ў школе пры базыльянскім манастыры ў Полацку, зрабіў хуткую кар’еру, стаў добра вядомым выдатны знаўца праваслаўнай літургіі і пробашчам адной з найвялікшых уніяцкіх кляштароў[18].

Пасля першага падзелу Польшчы ў 1773 годзе большасць прыходаў уніяцкай царквы апынуліся на тэрыторыі Расійскай імперыі і імперыі Габсбургаў. Галоўны ієрарх царквы, мітрапаліт, які лічыўся прамым наступнікам мітрапалітаў старое праваслаўнай царквы часоў Кіеўскай Русі, жыў ў неакупаванай частцы Польшчы, у Варшаве. Лісоўскі стаў на чале трохасабовага камітэту, які кіраваў уніяцкай царквой у Расіі, пакуль Кацярына ў 1784 годзе не зрабіла яго арцыбіскупам. Ягоныя паўнамоцтвы прызналі і Расійская праваслаўная царква. А самае галоўнае — яго падтрымліваў Пацёмкін. Ягонае становішча здавалася надзвычай трывалым[19]. У 1780-я Лісоўскі ўпарта намагаўся захаваць арганізацыйную самастойнасць сваёй царквы, але і зберагчы ды выкарыстоўваць усё літургічнае багацце,

Імперыі ідэя ніяк не ўпісвалася ў тагачасную рэальнасць. Добрыя адносіны Беларусі з Расіяй прапануе, напрыклад, Wasyl Lencyk у “The Ukrainian Catholic Church since 1800”, The Ukrainian Encyclopedia, II (Toronto, 1971), pp. 182–195.

17. Гісторыя ўніяцкай царквы ў Беларусі вывучана адносна слаба. Для агульнага азнаямлення можна звярнуцца: James Flynn “The Uniate Church in Belorussia: A Case of Nation-Building?” у “Faith, Compromise,

ўсходняга абраду — у той жа час прызнаючы рэальнае першынство Папы Рымскага, якога рэгулярна ўзгадвалі ў малітвах. Ва ўсіх гэтых справах Лісоўскі абапіраўся на каноны, зацверджаныя Замойскім сінодам у 1720 годзе, і пастановы папы Бенедыкта XIV, прынятыя ў сярэдзіне XVIII стагоддзя. Лісоўскі выдатна ведаў і адны, і другія. Ён паспяхова выкарыстоўваў свае веды, каб абараніць ад мітрапаліта расійскіх рыма-каталікоў, што заклікаў перайсці ў рыма-каталіцтва, і ад базыльянаў, якія прымалі рыма-каталікоў у свае вучэльні. З рымарымлянамі, на думку Лісоўскага, не выходзілі настолькі ж зацятыя спрэчкі, як з нашчадкаў уніяцкіх сем'яў.

Лісоўскі, як і Трой, сутыкнуўся з трыма праблемамі, з якімі давялося змагацца за права самому прадстаўляць інтарэсы ўніяцкай царквы, бо часта гэтае права прысвойвалі сабе і рыма-каталіцкі мітрапаліт. Перад Лісоўскім стаяла задача дабіцца рэальнае аўтаноміі сваёй царквы. Нарэшце, ён паклапаціцца пра падрытоўку новага пакалення ўніяцкіх святароў. Ніводная з гэтых задачаў не была вырашаная на момант яго смерці ў выніку смерці Пацёмкіна ў 1791 годзе і другога падзелу Польшчы ў 1792 годзе ўзнік крызіс, што паставіў пад пагрозу самое існаванне ўніяцкай царквы ў Расійскай імперыі. Трэці падзел Польшчы другому падзелу выклікаў трэці. Трэці падзел, 1795-м паставіў крыж на незалежнасці Рэчы Паспалітай. Трэці падзел адбыўся ў выніку вайны палякаў за рэформу, абвешчаныя Канстытуцыяй 3 траўня 1791 году, — незалежнасць, так і за сацыяльныя і палітычныя. У Беларусі выбухнулі шматлікія сялянскія бунты, і, можна сказаць, каб насельніцтва цалкам падтрымала паўстанне, кацярынінскі ўрад вырашыў, што гэткая бунтоўная настрояванасць сведчыць аб тым, што адстойваны Пацёмкіным курс на падтрымку аўтаноміі ўніяцкай царквы быў памылковым. Такім была распачатая кампанія па далучэнні ўніятаў да праваслаўнай царквы. Па-першае, зачыняліся клашторы, па другое, манахаў і вясковых святароў пераводзілі ў праваслаўе. Кацярынінскаму ўраду ўдалося скараціць колькасць уніятаў з прыблізна трох мільёнаў удвая.

in Survival: The Greek Catholic Church and Nation-Building in Eastern Europe”, ed. J. Neiss (Pittsburgh, 1993), pp. 27–46; Уводзіны ў новую гісторыю Беларусі Jan Zaprudnik “Belarus: At a Crossroads in History” (Boulder, 1993), pp. 45–74; Зразумела, Беларусь і Ірландыя — краіны як за XVIII стагоддзя значна адрозніваліся. Напрыклад, колькасці насельніцтва Беларусі была ў дзесяць разы большая за Ірландыю па плошчы; апроч таго,

эканоміка і адукацыйная сістэма Беларусі былі развітыя значна слабей, у Беларусі не было ніводнага гораду памерам хаця б з чвэрць Дубліна, не было і навучальных установаў, падобных да Трыніці-каледжу.

18 Пра кар'еру Лісоўскага гл.: James T.Flynn "Iraklii Lisovski, Metropolitan of the Uniate Church (1806-1809) and Reform in the Russian Empire", "The Slavonic and East European Review", 77 (1999), pp.93-116. Біяграфій

Лісоўскага кніжнага фармату пакуль што няма. Асноўныя факты можна знайсці ў I.I.Назарка “Київські і галицькі митрополіти: біографічні нариси” (Rome, 1962), pp.122-127; Leonid Żytkowicz “Lisowski” у “Polski Słownik Biograficny XVII” (Warsaw, 1972), pp.473-474.

19 Дзейнасць Лісоўскага ў 1780-я гады была апісаная M.M.Solowij “De Reformatione Liturgiae Heraclii Lisowskyj Archiepiscopi Polocensis (1784-1809)” (Rome, 1950). Лісоўскі

выказаў свае погляды ў 1786-1788 гадах у серыі лістоў да мітрапаліта, папскага нунцыя ў Варшаве і Кангрэгацыі прапаганды веры Ватыкану. Гл. Athanasius G.Welykyj (ed.) “Epistolae Metropolitarum Kioviensium Catholicorum. … 1788-1838” (Rome, 1980), pp.161—184.

У Лісоўскага было няшмат магчымасцяў для манеўру, але, калі яму паведамілі, што ён павінен зрабіць сваю царкву праваслаўнай, ён склікаў сабор уніяцкіх святароў. Сабор звярнуўся да ўраду з палымянай просьбай дазволіць застацца вернымі уніі з Рымам[20]. Уратавалі царкву Лісоўскага, не ягоныя намаганні, а тое, што расійскі ўрад па нейкіх сваіх прычынах змяніў пазіцыю. Пасля смерці Кацярыны ІІ пачатай у 1796 годзе ў выніку прыдворных інтрыг яе спадчыннікам спыніў ціск на ўніятаў з мэтай пераводу іх у праваслаўе. Такім чынам доўгага царавання Кацярыны Лісоўскі не атрымаў ніякае дапамогі ад калегаў — рыма-каталікоў. Адзінай прапановай з боку рыма-каталіцкага мітрапаліта была прапанова атруціць уніяцкую царкву з рыма-каталіцкай. Калі новы пачынальнік прыбыў у 1802 годзе ў Санкт-Пецярбург, Лісоўскага ўжо не было ў жывых. Ён памёр у 1801 годзе, так і не дабраўшыся ў Іерусалім, і ён ад’ехаў, не сустрэўшыся з легатам.

Падчас свайго падарожжа Лісоўскі пісаў у Рым доўгія лісты, у якіх выказваў сваю непарушную веру ў унію з Рымам. У іх ён

20. Стэфан Вуйцік, Мітрапаліт Кіеўскі Іерусалімскі. Жыццё і дзейнасць у 1793-1832 гадах. Санкт-Пецярбург, 1893. С.261.

таксама тлумачыў, як важна для ўніяцкай царквы трымацца ўласнай літургічнай традыцыі і не аб'ядноўвацца з царквой лацінскага абраду. Ён заяўляў, што ягонай царкве неабходная аўтаномія, каб цвёрда трымацца "старажытнага грэцкага абраду ў традыцыі Святых Айцоў, ад якіх народ рускі атрымаў веру"[21]. Пасля вяртання ў Расію Лісоўскі здолеў пераканаць цара Аляксандра Першага ў тым, што, нягледзячы на сваю каталіцкасць, уніяты маюць асобную царкву, якой трэба самакіраванне. У 1804 годзе цар зацвердзіў самастойную адміністрацыю ўніяцкай царквы на чале з Лісоўскім. Уніяцкая адміністрацыя была аддзелам Галоўнага ўпраўлення ў справах замежных рэлігіяў. Кіраўнік гэтага аддзелу быў аднаасобна падначалены обер-пракурорам Свяшчэннага Сіноду, галоўнага кіруючага органу праваслаўнай царквы. Царква мусіла стаць часткай афіцыйнай дзяржаўнай структуры, іншага варыянту не было. У 1806 годзе памёр апошні ўніяцкі біскуп, які лічыўся мітрапалітам кіеўскім, і Лісоўскі прыняў (а верагодна, і сам паклапаціўся аб тым, каб яму прапанавалі) тытул мітрапаліта ўніяцкай царквы Расійскай імперыі. Зразумела, гэты мітрапаліт быў прызначаны царом, ніхто не аспрэчваў царовага права на такое прызначэнне[22].

Лісоўскі дамогся аўтаноміі ў той меры, у якой гэта дазваляла палітычная культура Расійскай імперыі. Ён ведаў: каб гэтая аўтаномія стала рэальнасцю, царкве трэ было забяспечваць сябе новымі святарамі. Яшчэ ў 1788-м ён паспрабаваў стварыць епархіяльную семінарыю, але не здолеў сабраць грошай для гэтага сродкаў. Больш за тое, Лісоўскі, як і многія, баяўся, што ўплыў Асветніцтва — яшчэ адна пагроза самастойнасці, а магчыма, і самому існаванню царквы. Ён добра ведаў, што шматлікія святары ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, рыхтуючы новае пакаленне духоўных прадстаўнікоў, намагаліся выхаваць не толькі паслядоўных абаронцаў традыцыйнай веры, але таксама прыхільнікаў пэўных пераменаў у сваіх парафіях[23]. Лісоўскі баяўся, што такая адукацыя будзе больш спрыяць рэалізацыі намераў рэфарматараў ці нават рэвалюцыянераў-нацыяналістаў, чым абароне традыцыйнай веры. Без кансультацый з [illegible], рэфарматары пераканалі цара Аляксандра ў тым, што склад новых універсітэтаў, заснаваных царскім указам 1803 года, павінны ўваходзіць семінарыі для навучання новых

21. **Welykyj, op. cit., p. 169.**

22. **Беспамяць пробкоўных і падрабязны разгляд прабелаў Лісоўскі рэлігійнай царквы ў Alexy Petrasiy "Kolegium Duchowne w Petersburgu" (Lublin, 1950), pp. 39-48, 129-136, і M. Sokolowij**

святароў. Расійская праваслаўная царква ўрэшце здолела давесці цару немэтазгоднасць уключэння сваіх семінарыяў у склад універсітэтаў, і ў склад новага Віленскага універсітэту ўвайшлі толькі рыма-каталіцкая і ўніяцкая семінарыі[24]. Дзейнасць новай навучальнай установы кантралявала імперскае Міністэрства адукацыі, выкладчыкаў зацвярджаў рэфармаваных Ёзафам II універсітэтаў Габсбургаў і Аляксандры I[25]. Зразумела, выкладанне ішло па новай "асветніцкай" праграме. У апякунскую раду семінарыі ўваходзілі два біскупы, адзін уніят, другі рыма-каталік, але ж яны не адыгрывалі ў ёй вялікае ролі. Лісоўскі вельмі рэзка крытыкаваў ужо і самога біскупа, які супрацоўнічаў з новай семінарыяй. Ён пісаў, што ў 1806 годзе Лісоўскі стварыў сваю ўласную семінарыю ў Полацку, з праграмай, скапіяванай з праграмы Віленскага калегіумаў, і ўласнаручна падабраным выкладчыцкім складам. Усе выкладчыкі новай семінарыі былі выпускнікамі віленскіх базыльянскіх школ. Не было ніводнага з вучонай ступенню, атрыманай у "асветніцкім" заходнім універсітэце, і ні полацкая семінарыі да смерці Лісоўскага ў 1897 годзе асаблівых вынікаў не дасягнулі. Аднак адказ Лісоўскага на заснаванне семінарыі дзяржавай паказваў, што ён надаваў жадае абараніць аўтаномію ўніяцкай царквы, але ў канцы важным, каб ягоная царква магла цалкам самастойна рыхтаваць сваіх святароў.

І Трой, і Лісоўскі ўзначальвалі цэрквы, што трымаліся традыцыйнай хрысціянскай веры ў час, калі яе пачала пад сумнеў інтэлектуальнае і культурнае Асветніцтва, а грамадствы, у якіх гэтыя цэрквы дзейнічалі, сутыкаліся з гвалтам і хаосам палітычнай і сацыяльнай рэвалюцыі, і другі намагаліся дасягнуць сваіх мэтаў, спрабуючы вызваліцца з-пад кантролю цэнтральнага ўраду, нават насупраць волі Ватыкану. Адначасова яны імкнуліся абмежаваць уплыў асветнікаў, якія часта з'яўляліся таксама нацыянальнымі рэвалюцыянераў-нацыяналістаў правесці рэформы.

У 1830-х сітуацыя змянілася. Каталіцкая царква "забыла", ператварылася ў апірышча маладога ірландскага

"De Restitutione Metropoliae Kioviensis in Imperio Rossiaco sub Imperatore Alexandro I (anno 1806)". Analecta Ordinis S. Basilii Magni, 3 (Rome, 1950), pp. 228–248.

23 Гісторыка каталіцкім Асветніцтвам ўсходняй Еўропе дае Jan Skarbek "Kościół katolicki w dobie Oświecenia" (Zarys dziejów Kościoła katolickiego w Polsce, ed. Jerzy Kłoczowski (Kraków, 1986), pp. 165–177. Скарбек пісьмае

нацыяналізму, а ўніяцкая царква ў Беларусі перайшла ў нелегальную, амаль падпольную арганізацыю. Падтрымлівам ў палітычнай арганізацыі ірландскіх масаў, якіх Дэніэл О'Конэл, сталі ў значнай ступені плёнам сваёй дабілася ў краіне каталіцкая царква. Падтрымка Першым дактрыны "самаўладдзе, праваслаўе, прывяла да скасавання аўтаноміі ўніяцкай царквы яе да дзяржаўнай праваслаўнай царквы. Супрацьлегласць эвалюцыі цэркваў, аднак, не азначаюць непадабенства шляхоў. І царква, якая зрабілася апірышчам ірландскага нацыяналізму, і царква, знішчэнне якой уладамі развіццю шырокамаштабнага народнага нацыянальнага руху ў Беларусі, рыхтавалі сябе да роляў рухавіка нацыянальнага руху, дабіваючыся аўтаноміі і канстытуцыі, сваімі святарамі і маёмасцю, прычым абедзве раблі кіруючыся не нацыяналістычнамі, а рэлігійнымі Фактычна, яны імкнуліся як мага далей развесці і дзяржаву дзеля абароны сваёй рэлігіі.

Падтрымліваў Асветніцтва ў Еўропе і Расіі, якой дабілася ў краіне каталіцкая царква. Падтрымка Першым дактрыны "самаўладдзе, праваслаўе, прывяла да скасавання яе да дзяржаўнай праваслаўнай царквы. Супрацьлегласць эвалюцыі цэркваў, аднак, не азначаюць непадабенства шляхоў. І царква, якая зрабілася апірышчам ірландскага нацыяналізму, і царква, знішчэнне якой уладамі развіццю шырокамаштабнага народнага нацыянальнага руху ў Беларусі, рыхтавалі сябе да роляў рухавіка нацыянальнага руху, дабіваючыся аўтаноміі і канстытуцыі, сваімі святарамі і маёмасцю, прычым абедзве раблі кіруючыся не нацыяналістычнамі, а рэлігійнымі Фактычна, яны імкнуліся як мага далей развесці і дзяржаву дзеля абароны сваёй рэлігіі.

Ён дакументальна пацвердзіў, што Асветніцтва адыгрывала станоўчую ролю ў развіцці нацыянальнага руху, а каталіцкае святарства ў Беларусі, якое ўзначаліла барацьбу за свае правы, выступала ў ролі абаронцы народа і сялянаў.

Роля ўніятаў у Каталіцкім Асветніцтве нядрэнна разглядаецца ў працы Daniel Beauvois "Les Lumières au carrefour de l'orthodoxie et du catholicisme: Le cas des uniates de l'Empire russe au début du XIXe siècle" у "Cahiers du monde russe et soviétique, XIX" (1978),

pp.423-441.
Бавуа засяроджваецца пераважна на дзейнасці манаскіх ордэнаў, якія займаліся рэлігійнай адукацыяй, г.зн. на езуітах ды базыльянах. Французскі гісторык прыйшоў да высновы, што яны не былі зацікаўленыя ў развіцці сучаснай, прагрэсіўнай сістэмы адукацыі. Аднак царква абараняла ўстоі традыцыйнай сялянскай веры шляхам развіцця новай сістэмы школаў, якія неслі ў вёску пісьменнасць, і тым самым выгадавала новае пакаленне святароў,

здольных да абароны веры. У той жа час з гэтых шэрагаў вырасла першае пакаленне тагачасных нацыянальных лідэраў. Такое развіццё царквы добра апісанае ў працах John-Paul Himka "Priests and Peasants: The Greek-Catholic Pastor and the Ukrainian National Movement in Austria 1867-1900" у "Canadian Slavonic Papers", 21 (1979) pp.1-14; Keith Hitchins "An East European Elite in the Eighteenth Century: The Romanian Uniate Hierarchy" у "The Rich, the Well Born,

and the Powerful", ed. F.C.Jaher (Urbana, 1973), pp.139-153.

24 Рэформа расійскай універсітэцкай сістэмы ў пачатку XIX стагоддзя апісаная ў James T.Flynn "The University Reform of Tsar Alexander I" (Washington D.C., 1988). У складзе новага ўніверсітэту ў Тарту (Дэрпце), на тэрыторыі Інгерманландыі, адваяванай у шведаў Пятром Вялікім, існавала семінарыя для падрыхтоўкі лютэранскіх святароў.

25 Найбольш падрабязна пра

заснаванне Віленскай семінарыі распавядаецца ў Wiktor Worotynski, “Seminarjum Główne w Wilnie: powstanie i pierwszy okres dziejów (1803-1816)” (Wilno, 1935). Віленская і Полацкая семінарыі апісаныя ў Чистович И.А. Состояние униатской церкви в России в царствование императора Александра Первого // Православное обозрение. 1879. II. С.657-675.

З пункту гледжання інтарэсаў расійскага самадзяржаўя Аляксандр I, безумоўна, меў рацыю, калі пасля 1815 году вырашыў праігнараваць сваё ж ранейшае меркаванне, у якім ён параўноўваў Беларусь з Ірландыяй. Зразумела, было б неймаверна, каб нейкі расійскі самаўладца пагадзіўся ў доўгатэрміновым плане на правядзенне такой палітыкі, якая магла б прывесці да паўтарэння ірландскіх падзей у Беларусі. Гэтаксама зразумела, што падобны вынік і Троем, і Лісоўскім не прадугледжваўся ў якасці мэты і нават не прымаўся ў якасці

варыянту развіцця. Ні адзін, ні другі не разглядалі нацыяналізм як вартасць і не імкнуліся да аддзялення царквы ад дзяржавы. Праз гэта абодва здаюцца рэакцыянерамі, а то і ўвогуле ворагамі сваіх народаў. “Аб’яднаная Ірландыя”, у прыватнасці, рэзка адмоўна ставілася да Троя[26]. Натуральна, погляды “Аб’яднанай Ірландыі” на Троя і працу ягонага жыцця (Wolfe Tone) развіццё ў большай частцы ірландскіх гістарычных назіраўцаў. Гістарыяграфічны лёс Лісоўскага быў больш складаным. Ён застаўся ў памяці як вельмі пабожны чалавек, а таксама польскія гісторыкі скептычна ацэньвалі дзейнасць “Айца Лісоўскага” з прычыны таго, што ён не перайшоў на бок паўстанцаў і не выступіў супраць царскае адміністрацыі. З іншага боку, расійскія гісторыкі часта ўхвалялі ягонае супрацоўніцтва з расійскай дзяржавай. Нават іх заходзілі настолькі далёка, што, насуперак усім сведчылі адваротнае, заяўлялі, што Лісоўскі толькі выгляд, нібыта дабіваецца аўтаноміі для сваёй царквы, насамрэч планаваў злучэнне з праваслаўнай царквой. нарэшце адбылося праз трыццаць гадоў пасля яго смерці. Дзейнасць і Троя, і Лісоўскага ацэньвалася адназначна памылкова з аднолькавай прычыны. Гісторыкі, якія ў перспектыве нацыяналізму, ягоных спадзяванняў і памкненняў, зразумела, былі схільныя бачыць галоўнае пытанне. Аднак ні для Троя, ні для Лісоўскага нацыяналізм не быў прыярытэтнай праблемай. Яны дамагаліся для сваіх цэркваў самастойнасці, імкнучыся абараніць сваю традыцыйную рэлігійную веру ад таго, што ім здавалася небяспекамі рэвалюцыйнага часу. І ў гэтым іх дзейнасць, прынамсі, адбівала памкненні іх паствы, якая складала большасць іх народаў.

Пераклад з англійскай

З. Магілеўцава, К. Курчанковай, Н. Бракар

26 Вудф Тан (Wolfe Tone) – ірландскі палітычны дзяяч, лідэр “Аб’яднанай Ірландыі”, які ў 1798 г. узняў паўстанне супраць англійскага панавання. Пасля паражэння паўстання скончыў жыццё самагубствам у турэмнай камеры ў Дубліне.

(Кеоgh “Троу”, Дублін, р.216).

Грунтоўнае абмеркаванне гістарыяграфіі Троя, якія ўжываюць, прадстаўлена ў працы Ніколаса Грына “Троу і Лісоўскі”, Дублін, 1982, с.215-220.

Гістарычна аб Лісоўскім можна пракаўвацца ў Hynes, “Fraklii Lisovskii”, Dublin, 1936, с.96-98.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/05/02
[image]

ГЕНАДЗЬ ПРЫБЫТКА (нар. 1963 г. у Янаве) — гісторык. Скончыў філялягічны факультэт Маскоўскага абласнога пэдагагічнага ўніверсытэту імя Н.Крупскай. Працаваў выкладчыкам беларускай мовы у Берасьцейскім дзяржаўным універсытэце. Апошняя публікацыя — «Сьвятло і цені Вара. Варская канфэдэрацыя на Беларусі. Перадумовы і ход (гістарычная

Генадзь Прыбытка

Апалогія Рэчы Паспалітай

Res publica communis est parens omnium nostru[1]

Немагчыма аспрэчваць той факт, што за апошнія дзесяцігоддзе адбылася сапраўдная рэвалюцыя ў асэнсаванні гісторыі Беларусі перыяду Сярэднявечча і Новага часу. Аднак некаторыя погляды, якія засталіся ў спадчыну ад расійскай імперскай і савецкай (не ў меншай ступені імперскай) гістарыяграфіі, падтрыманыя рознымі “фобіямі” нашых сучаснікаў, дагэтуль працягваюць паспяхова дамінаваць у гістарыяграфіі незалежнай Беларусі. Да такіх трывала замацаваных у свядомасці многіх беларускіх гісторыкаў штампаў перш за ўсё належыць ацэнка Люблінскай уніі і, адпаведна, усяго перыяду Рэчы Паспалітай у гісторыі нашага народу. Безумоўна, цяпер погляд М.Любаўскага на падзеі 1569 году, як на тую мяжу, пасля якой “скончылася самастойнае існаванне Літоўска-Рускай дзяржавы і адбылося “ўцелаўленне яго ў Карону Польскую”[2], не знаходзіць шырокага кола прыхільнікаў. Аднак у цэлым негатыўнае стаўленне да Люблінскай уніі і да перыяду

знаходжання Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў працягвае панаваць у беларускай гістарыяграфіі. Падобны погляд на гэты акт у адносінах да беларуска-літоўскай дзяржавы падтрымліваюць і польскія гісторыкі. Так, вядомы даследчык прававых адзначае: “Страты ў выніку асіміляцыі найвышэйшых сацыяльных слаёў мелі, бясспрэчна, негатыўныя наступствы для народаў Літвы і Заходняй Русі, пазбаўляючы іх кіруючых для таго часу лідэраў”[3]. Хаця ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі і пачалі назірацца пэўныя тэндэнцыі да перагляду ўсталяванай раней традыцыі ў трактоўцы гэтай праблемы, аднак яны яшчэ не вызначаюць агульнай карціны. Наспеў час ацаніць усе тыя плюсы і мінусы, якія прынесла Вялікаму Княству Літоўскаму Люблінская унія, а таксама разгледзець тыя абвінавачанні, якія традыцыйна выстаўляюцца на адрас федэратыўнай дзяржавы ў адносінах да беларускага народу. Безумоўна, праблема існавання Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай патрабуе спецыяльнага капітальнага даследавання і карэннага перагляду падыходаў. Дадзеныя зацемкі ставяць мэтаю толькі акрэсліць тыя кірункі, якія патрабуюць больш грунтоўнай распрацоўкі, і выказаць погляд, адрозны ад паноўнага ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі.

* * *

брама Рэчы Паспалітай як аснова для сучаснай канцэпцыі ўзаемаадносін Беларусі і Польшчы

Рэч Паспалітая ёсць сумесным набыткам усіх (славянскіх) народаў Літвы і Заходняй Русі, пазбаўляючы іх кіруючых для таго часу лідэраў”[3].

2 Любавский М. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. — Москва, 1915. — С.312.

3 Bardach J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego

Księstwa Litewskiego XIV—XVII w. — Warszawa, 1970. — S.62—63.

У беларускай гістарыяграфіі стала замацаваўся погляд на XVI стагоддзе як на “залаты век” нашай дзяржаўнасці. Насамрэч такі эпітэт правамерна ўжываць толькі ў адносінах да старабеларускай культуры. Менавіта ў гэты час разгортваецца дзейнасць Ф. Скарыны і С. Буднага, М. Гусоўскага і В. Цяпінскага… Але ж для дзяржаўна-палітычнага жыцця Вялікага Княства Літоўскага XVI стагоддзе стала векам катастрофы. Гэта было абумоўлена ў першую чаргу неадпаведнасцю дзяржаўнага ладу краіны надзённым патрабаванням часу.

Суседства з жорстка цэнтралізаванымі краінамі — Масковіяй і Крымскім ханствам, якія маглі ў кароткі тэрмін перавесці на ваенныя рэйкі ўсе свае матэрыяльныя, чалавечыя і эканамічныя рэсурсы, вымагала дзеля дзейснага супраціву іх экспансіі ўзмацнення апарату кіравання Вялікага Княства Літоўскага. Аднак, нягледзячы на тое, што дзяржаўная сістэма ВКЛ і характарызавалася шырокаразгалінаванай сістэмай органаў дзяржаўнага кіравання, іх дзейнасць была малаэфектыўнай. У вялікай ступені слабасць краіны была абумоўленая і фактычнай аўтаномнасцю складовых яе частак. Сітуацыя пагаршалася таксама сталай адсутнасцю вялікага князя, які з’яўляўся адначасова і каралём польскім (вось ужо і сапраўды: бадай, менавіта Крэўская, а не Люблінская унія заклала падмурак у працэс заняпаду краіны!). Рост прывілеяў шляхты паступова прыводзіў да страты ёю сваёй галоўнай функцыі — абароны межаў дзяржавы. З цягам часу асноўная збройная сіла краіны — паспалітае рушанне — станавілася ўсё больш архаічнай і неэфектыўнай. Дастаткова згадаць, што часта скліканае перад вайсковымі выправамі рыцарства, адбыўшы “попіс” (агляд паспалітага рушання), велізарнымі масамі ад’язджала не ў лагеры, а дадому. Збіранне ж грошай на выплату найманаму войску было праблематычным з прычыны недасканаласці выканаўчай улады. Характэрна, што ў гэтых умовах Вялікае Княства вельмі часта проста не мела сродкаў

для паспяховага вядзення ваенных дзеянняў. Часам (як у вайне з Маскоўскай дзяржавай 1534—1537 гадоў) нашая дзяржава была вымушаная спыняць паспяховыя ваенныя дзеянні на варожай тэрыторыі праз адсутнасць грошай у скарбе… І гэта адбывалася ў часе імклівага ўзмацнення Масковіі.

Маскоўскія валадары па меры росту магутнасці сваёй дзяржавы выказвалі ўсё большыя прэтэнзіі на землі Вялікага Княства. Калі Васіль III не хаваў імкнення далучыць да сваёй краіны Кіеўшчыну, Смаленшчыну і Полаччыну, ягоны сын Іван IV Жахлівы жывіў планы далучэння да Масковіі ўжо ўсяго Вялікага Княства Літоўскага. Баяры першага маскоўскага цара на перамовах з пасламі Жыгімонта Аўгуста проста заяўлялі: “Не толькі што Руская зямля ўся, але і Літоўская зямля ўся — бацькаўшчына гаспадара нашага…” Нядзіўна, што войны за набыццё гэтай “бацькаўшчыны” набылі перманентны характар. У перыяд з 1492 да 1569 году адбылося шэсць “маскоўскіх” войнаў (разам з Інфлянцкай). На 79 год прыйшлося ажно 36 ваенных…

Мілітарныя магчымасці Масковіі дазволілі ёй, нягледзячы на шэраг паразаў ад велікакняскага войска, паступова рухацца да сваёй мэты — поўнага падпарадкавання земляў Вялікага Княства Літоўскага. Ужо з 1494 году ўсходняя мяжа дзяржавы (за некаторымі невялікімі выключэннямі) няўхільна пасоўвалася на захад. У той год Вялікае Княства Літоўскае страціла землі ў вярхоўях Акі і Вязьмы. У 1503 годзе да Масковіі перайшлі Чарнігаў, Старадуб, Ноўгарад-Северскі, Пуцівель, Рыльск, Гомель, Любеч, Бранск і іншыя — агульным лікам 29 гарадоў і 70 валасцей[4] . У 1514 годзе быў страчаны Смаленск… У выніку маскоўскіх войнаў плошча Вялікага Княства Літоўскага зменшылася прыблізна з 900 тыс. кв. км да 520—550 тыс. кв. км, гэта значыць на 39%…

Краіна імкліва набліжалася да страты незалежнасці, якая ішла нешчасліва для нашай дзяржавы. Дарма што ў асобных бітвах велікакняскія войскі дасягалі перамогі (пры Оршы, як правіла, над большымі сіламі непрыяцеля), кампанія імкліва набліжалася. У лютым 1563 году войскі Івана Жахлівага ўзялі Полацак, што фактычна адкрыла ворагу дарогу на сталіцу Вялікага Княства — Вільню.

4 Праўда, гэтай лічбе (на момант пачатку Інфлянцкай вайны 1558—1583 гг.) Полацк і Гомель былі ўжо страчаны, але за кошт часткі польскіх земляў, якія

авалодаць становішчам патрабавалі ад краіны вялізных
высілкаў. Так, большая частка велікакняскіх маёнткаў была
аддадзеная пад заклад; гарады, корчмы, яўрэі і інш. былі
абкладзена новымі падаткамі; была ўведзена манаполія на
соль, на памол мукі і на гандаль лясны мі таварамі; павялічаны
мыты… У некаторых гарадах прыбыткі ад акцызаў і мытаў
і ўнутраных мытных выплатаў выраслі больш як на 1000%.
У галіне простых падаткаў збор серабшчызны вырас у многа
разоў. Калі ў 1542 годзе збіралася ўсяго каля 22 тыс. коп.
грошаў, то ў 1567 годзе — ужо 105,5 тыс. коп. І гэта нягледзячы на тое,
што ўсходнія землі краіны былі спустошаныя вайной,
войскамі й абязлюдзелі.
Дзяржава высілілася да рэшты. Аднак сілаў для перамогі ў
барацьбы ўсё роўна не ставала. Дапамогі трэба было шукаць
у суседзяў — Кароны Польскай, якая згадзілася дапамагчы
пры ўмове уніі. І сапраўды, пасля Любліна чаканая дапамога
надышла. Так, Карона Польская выдзеліла на маскоўскую
кампанію 1 300 000 злотых (прыкладна 528,5 тыс. коп. грошаў),
пры тым што яе гадавы бюджэт складаў усяго каля
600 000 злотых. У 1579 годзе каля 20 тысяч жаўнераў (сярод
якіх былі значная колькасць завербаваных на каронныя грошы
іншаземных наймітаў) была накіраваныя Польшчай на
дапамогу велікакняскаму войску. І, хацелася б нам таго ці не,
мусім прызнаць, што вяртання Полацку і перамогі
ў Інфлянцкай вайне ўдалося дамагчыся толькі дзякуючы
заключэнню Люблінскай уніі.

Быў зроблены
спробы
вярнуць
страчаныя
землі
Вялікага
Княства
Літоўскага.
Маскве:
набудаваныя
ўмацаванні
узарваны,
гарматы
вывезены
у Расію.
Смаленск
захоплены
і стаў
добрым
плацдармам
для
далейшых
экспансіянісцкіх
дзеянняў
усходняга
суседа —
Расіі.
Полацак
і Віцебск

Варта задумацца над тым, што адбылося б з беларускім
народам у выпадку пераходу Вялікага Княства Літоўскага пад
уладу Масковіі. Думаецца, цалкам можна згадзіцца з поглядам
А. Трусава: “Можна па-рознаму ставіцца да ўмоў, падпісаных
у Любліне, але нельга забываць аднаго. Ці існавала б цяпер
наагул беларуская нацыя, калі б Масковія захапіла Вялікае
Княства Літоўскае ў XVI стагоддзі? Дастаткова толькі згадаць
лёс самабытнай наўгародскай культуры. Што засталося
ад “Господина Великого Новгорода” пасля “этнічных чыстак”,
зробленых Іванам Грозным і яго папярэднікамі? Быў знішчаны
самабытны ўсходнеславянскі этнас, які меў сваю архітэктуру,
жывапіс, летапісанне, устойлівыя рэспубліканскія традыцыі
грамадскага і палітычнага жыцця…”
І сапраўды, дзякуючы менавіта Люблінскай уніі Вялікаму

Княству Літоўскаму наканавана было праіснаваць яшчэ два стагоддзі. Два стагоддзі, якія далі магчымасць беларусам захаваць сваю тоеснасць і сфармавацца ў нацыю.

* * *

Негатыўная ацэнка Люблінскага акту, які нібыта значна абмежаваў незалежнасць нашай краіны, назіраецца ў многіх працах[5]. І сапраўды, Люблінская унія задумвалася Кароннай шляхтай як акт інкарпарацыі Вялікага Княства Літоўскага ў склад Польшчы. Аднак гэта зусім не азначае, што планы і намеры былі ажыццёўленыя. А як вядома, у гісторыі ацэньваецца не тое, што мелася б быць, а тое, што адбылася ў рэчаіснасці.

Між тым, пры заключэнні Люблінскай уніі Княства захавала свой суверэнітэт, фактычна аб'яднаўшыся з Каронай у дзяржаўны саюз.

Паводле Люблінскай уніі 1569 году "Карона Польская і Вялікае Княства Літоўскае ёсць адным непадзельным і аднародным целам, а таксама не розная, а адзіная Рэч Паспалітая, якая з дзвюх дзяржаваў і народаў у адзіны народ злучылася і звязалася". Трываласць гэтай уніі павінны былі забяспечыць ліквідацыя спадчыннасці велікакняскага пасаду ў ВКЛ, супольны манарх і найвышэйшы заканадаўчы орган у выглядзе супольнага сойму Кароны і Вялікага Княства Літоўскага з забаронаю правядзення асобных соймаў.

Аднак ужо ў самім акце Люблінскай уніі былі закладзеныя і асновы дзяржаўнай адасобленасці Вялікага Княства Літоўскага, якое заставалася "пры тытуле, дастоінствах і ўрадах усіх шляхетных станаў". Існаванне ж асобных урадаў і органаў у Кароне і ў Княстве, кампетэнцыя якіх абмяжоўвалася тэрыторыяй толькі адной з гэтых дзяржаваў, стварала вакуум цэнтральнай выканаўчай улады ў РП. Такім чынам, "была створаная адзіная заканадаўчая ўлада сумеснага сойму пры захаванні падвойнай выканаўчай улады ў асобных урадах"[6]. Захоўваўся свой звод законаў у выглядзе Статуту Вялікага Княства Літоўскага. Абедзве часткі навастворанай дзяржавы павінны былі мець уласныя войскі, што падпарадкоўваліся асобным гетманам. Прадугледжвалася ўвядзенне адзінай манеты для Рэчы Паспалітай, але кожная з дзяржаваў мелася яе біць пад уласнымі сімваламі...

5 Гл. напрыклад, Ермаловіч М. Беларуская дзяржава. Вялікае княства Літоўскае. — Менск, 2000. С. 322.

Трэба адзначыць, што межы суверэнітэту Вялікага Княства Літоўскага з цягам часу значна пашырыліся. Нягледзячы на забарону акту Люблінскай уніі, з 70—80-х гадоў XVI ст. тут збіраюцца асобныя соймы, а ў 1581 годзе ствараецца Галоўны трыбунал Вялікага Княства Літоўскага.

Ужо 27 студзеня 1588 году Жыгімонт Ваза, жадаючы схіліць на свой бок ліцвінаў, што не ўзялі ўдзелу ў ягонай ваенна-палітычнай і каранацыі, зацвердзіў новы Статут, які юрыдычна замацаваў асобнасць Княства ад Кароны Польскай. У прыватнасці, паводле гэтага Статуту кароль абавязваўся, што “ў том паньстве Вялікам Князстве Літоўскім і ва ўсіх землях, яму прыслухаючых, дастойнасцей духоўных і свецкіх гарадоў, двароў, грунтоў, староств, урадаў земскіх і дворных пасэсій або ў дзяржанне і пажыванне і векчнасцей жадных чужаземцам і загранічніком, ані сусядом таго паньства даваці не маем... Родзічам Вялікага Князства Літоўскага, дастоенства і ўрады ўсякія маюць быці даваці добра значным і праўдзіве незмышлене ў том ваяводзтве або павеце аселым”. Між тым, акт Люблінскай уніі прадугледжваў, “каб вольна было заўседы як паляку ў Літве, так і ліцвіну ў Польшчы ўсялякім слушным спосабам набываць маёнткі”.

Мала таго, у гэтым найвышэйшым прававым зводзе Карона, з якой Вялікае Княства Літоўскае звязвалася ў 1569 годзе “ў адно цэлае”, нават і не згадваецца, чым фактычна адмаўляецца Люблінскі акт.

Ужо з 1581 году ў пастановах, якія прымаліся на соймах, тыя артыкулы, што тычыліся Вялікага Княства Літоўскага, былі сабраныя ў асобныя “Канстытуцыі Вялікага Княства Літоўскага” (напачатку [1581 г.] — “Артыкулы да права Вялікага Княства Літоўскага”, затым [1590 г.] — “Справы Вялікага Княства Літоўскага”), што відавочна падкрэслівала самастойнасць Княства ў складзе Рэчы Паспалітай.

Пачынаючы з 1628 году неаднаразова забаранялася войскам абедзвюх частак Рэчы Паспалітай парушаць межы сваіх дзяржаў. “Пастанаўляем, — казала канстытуцыя 1628 году, — каб жаўнер літоўскі... за межы, да Кароны, не прыходзіў і ў Кароне не спыняўся, ані таксама жаўнер каронны ў Вялікім Княстве Літоўскім”.

Вялікае Княства Літоўскае праводзіла адносна самастойную замежную палітыку і неаднаразова падпісвала міждзяржаўныя

6. Halecki O. Dzieje unii Jagiellońskiej: W 2 t. T. 1. Warszawa, 1919. S. 340.

пагадненні без уліку меркавання Кароны.
Такім чынам, Рэч Паспалітую можна разглядаць як федэратыўную дзяржаву з элементамі канфедэрацыі, у якой Вялікае Княства Літоўскае валодала асноўнымі атрыбутамі дзяржаўнасці. Таму пра поўнае падпарадкаванне нашай краіны Польшчы не можа быць і гаворкі. Прынамсі, да часоў Канстытуцыі 3 траўня 1791 году, якая абвясціла Рэч Паспалітую адзінай унітарнай дзяржавай. Хаця… хто ведае, як бы рэалізавалася на практыцы гэтае палажэнне, калі б гісторыя адпусціла федэратыўнай дзяржаве яшчэ колькі часу існавання. Маецца ж досвед Люблінскай уніі, якая прадугледжвала тое самае…
* * *

Сярод асноўных абвінавачанняў у адрас Рэчы Паспалітай — перадача Кароне земляў Украіны, якія раней належалі беларуска-літоўскай дзяржаве. “…Тэрыторыя дзяржавы змяншалася больш чым у два разы. А з гэтым траціліся вялікія багацці і вайсковая магутнасць”[7]. “…Вялізныя і ўрадлівыя землі Вялікага Княства былі ўключаныя ў склад Польскай дзяржавы, што, канечне, аслабіла і без таго падарваную Лівонскай вайной эканоміку Княства… Тэрыторыя Княства звузілася за кошт асноўным да літоўскіх і беларускіх земляў”[8].
Што ж прынесла Вялікаму Княству страта Ўкраіны? Ці сапраўды гэта спрычынілася да далейшага аслабення дзяржавы і яе заняпаду? Ёсць усе падставы меркаваць, што гэта не так ці не зусім так.
Па-першае, слабасць цэнтральнай улады ў Вялікім Княстве Літоўскім рабіла велізарную тэрыторыю, якой яна валодала, фактарам не станоўчым, а адмоўным: дзяржава, якая вяла бесперапынныя войны на ўсходзе, проста не была ў стане абараняць свае слабазаселеныя паўднёвыя тэрыторыі, якім пагражала пастаянная небяспека з боку Крымскага ханства, саюзнага Маскве. Барацьбы на два фронты Вялікае Княства не вытрымала б. Ды, фактычна, такой барацьбы яно ўнікала ўсімі сродкамі. Ужо з другой паловы XV стагоддзя нашая дзяржава пачала плаціць Бахчысараю вялікую штогадовую даніну. Так, у пачатку XVI стагоддзя хан Мехмет Гірэй хваліўся маскоўскаму паслу, што яму з Вялікага Княства Літоўскага плыве “летам і зімою… золата струменямі”. Аднак гэта

7 Ермалович, Беларуская дзяржава… — С.322.

8 Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 частках — Ч.1. — Мінск, 1994. — С.135.

не гарантавала вызвалення Вялікага Княства ад небяспекі з поўдня. Штогод татары рабілі набегі на Валынь, Кіеўшчыну, дабіраючыся часам ажно да беларускіх земляў. Вядома, што да Люблінскай уніі Крымскае ханства нападала на Вялікае Княства Літоўскае не менш за 75 разоў. Такім чынам, Вялікае Княства, з аднаго боку, плацячы даніну і, з другога боку, “плацячы” разрабаванымі гарадамі і вёскамі, угнанымі ясырам і быдлам, стала надзейнай даходнай крыніцай крымскага хана. Між тым, занятае бесперапыннымі войнамі з Масковіяй, Вялікае Княства не магло даць адпор агрэсару. Украіна фактычна была пакінутая на волю лёсу. Паводле рэвізіяў замкаў сярэдзіны XVI стагоддзя, на ўкраінскіх землях існавала толькі 12 гаспадарскіх замкаў, прычым толькі чатыры з іх — канеўскі, чаркаскі, брацлаўскі і вінніцкі — знаходзіліся непасрэдна каля небяспечнай стэпавай зоны. Астатнія месціліся ў басейне Прыпяці, што дае падставу сцвярджаць, што лінія абароны Вялікага Княства Літоўскага ад татарскіх нападаў праходзіла менавіта тут. Неабходна адзначыць, што і гэтыя замкі не былі забяспечаныя належнай залогай. Увесь цяжар абароны Ўкраіны ад татараў амаль цалкам лёг на плечы тамтэйшага насельніцтва і, у асноўным, на магнатаў, якія вымушаныя былі трымаць дзеля гэтага шматлікую надворную міліцыю. Але без дзейснай дапамогі з Вільні, якую тая не магла даць, далейшы лёс гэтых земляў быў даволі праблематычным. Такім чынам, перадача Ўкраіны Кароне пазбавіла Вялікае Княства Літоўскае велізарных цяжкасцяў, звязаных з абаронай паўднёвых межаў, пераклаўшы гэты невыносны цяжар на Польшчу.

Па-другое, мяжа паміж Вялікім Княствам і Каронай прайшла менавіта па паўднёвых межах беларускай этнічнай тэрыторыі. Асноўная частка Вялікага Княства, яе метраполія, а менавіта беларускія і літоўскія землі, пазбавілася велізарных праблемаў, звязаных з наяўнасцю ў межах дзяржавы розных этнасаў, што, безумоўна, з’яўляецца адным з найгалоўнейшых фактараў аслаблення дзяржавы. Варта згадаць, што ў гісторыі Еўропы з XVI стагоддзя назіралася тэндэнцыя да ўзвышэння монанацыянальных краін. Так, галоўную ролю ў еўрапейскай палітыцы паступова пачалі адыгрываць Францыя, Англія, Швецыя. У той жа час назіралася прыкметнае аслабленне полінацыянальных “універсальных” краінаў. У першую чаргу

гэта тычыцца, безумоўна, Святой Рымскай Імперыі, якая паступова ператваралася ў кангламерат фактычна незалежных адно ад аднаго дзяржаўных утварэнняў. Бясспрэчна, што для эпохі позняга сярэднявечча характэрнай з'яўлялася і іншая тэндэнцыя: існавалі прыклады росту магутнасці і шматнацыянальных дзяржаваў, такіх як Масковія і Асманская імперыя. Аднак міжэтнічныя праблемы, якія з неабходнасцю ўзнікалі ў такога роду краінах, паспяхова нейтралізоўваліся моцнай, часцей за ўсё абсалютысцкай цэнтральнай уладай, якая забяспечвала падаўленне слабейшых, менш шматлікіх народаў і падпарадкаванне іх большым, дамінантным. Такой улады ў Вялікім Княстве Літоўскім не існавала, таму раней ці пазней міжнацыянальныя канфлікты тут павінны былі праявіцца ва ўсёй сваёй разбуральнай сіле.

Па-трэцяе, пераход Украіны ў склад Польшчы дазволіў Вялікаму Княству пазбавіцца такой пякучай праблемы, якой з'яўлялася праблема казацтва.

Казацкую супольнасць, якая была выхаваная ў духу поўнага адмаўлення дзяржавы, з поўным правам можна назваць найяскравейшым прыкладам панавання ахлакратыі. Прызвычаеныя да гранічнай сваволі, нават да анархіі, казакі "не хацелі слухаць нікога: ні гарадской улады, ні ўлады гаспадара, ні ўлады дзяржаўнай ці старастаў каралеўскіх. Не плацілі падаткаў, адмаўляліся выконваць дзяржаўныя павіннасці. Не былі ні мяшчанамі, ні гарадской галотай, ні халопамі, ні шляхтай. Карацей кажучы, не змяшчаліся ў рамкі тагачаснага феадальнага грамадства"[9]. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што казацтва з'яўлялася самым няўжыўчывым элементам у тых дзяржавах, з якімі звязваў іх гістарычны лёс. Цалкам зразумелым з'яўляецца і той факт, што казацтва ніколі, нават у сярэдзіне XVII стагоддзя, калі для гэтага склаліся выключна спрыяльныя ўмовы, так і не здолела стварыць уласнай дзяржавы. Выхаванае ў духу адмаўлення любой формы ўлады, яно не ўспрымала і ўлады ўласных гетманаў, якіх ставіла і скідала паводле свайго капрызу, часта пазбаўляючы жыцця. На засілле свавольнага натоўпу скардзіліся ўсе гетманы. Так, напрыклад, Дзям'ян Мнагагрэшны прызнаваўся: "Жадаю перад смерцю здаць гетманства. Калі я памру, то ў казакаў такі звычай — гетманскія пажыткі ўсе разнясуць, жонку, дзяцей і ўнукаў змаіх

жабракамі зробяць; дый тое ў казакаў бывае, што і сваёй смерцю не паміраюць…”[10]. Мазепа скардзіцца на казацтва “ніколі ніякай улады і кіраўніцтва над сабою не хоча”[11].

Асноўнай крыніцай існавання казакоў былі рабаўніцкія паходы на татараў і туркаў, што істотна ўскладняла стасункі з Турцыяй і пагражала выбухам збройнага канфлікту. Турэцкі султан ужо ў лістах да Жыгімонта Старога і Жыгімонта Аўгуста неаднаразова скардзіліся на казацкае свавольства, але, нягледзячы на шматлікія забароны, падобныя выправы працягваліся. Так, ужо ў 1606 годзе ў адказ на чарговы пратэст туркаў урад Рэчы Паспалітай паведамляў, што не можа нічога зрабіць з казакамі, бо гэта “племя неаселае, непаслухмянае, разбэшчанае, складзенае з уцекачоў маскоўскіх, татарскіх, турэцкіх, рускіх, валошскіх, без айчыны і веры, якое жыве з рабункаў і злодзейства, бяспечнае ў сваіх сховішчах над Дняпром і над іншымі рэкамі, не мае свайго маёнтку, небяспечнае для чужога, не прызнае і не трывае ніякай улады…”[12]. Такім чынам, краіна жыла пастаяннай пагрозай вайны з адной з найбольш магутных тагачасных дзяржаваў, якую ўвесь час правакавалі рабаўнічыя набегі з тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

Непавага да якіх-кольвек інстытутаў улады рабіла краіну небяспечным выбуховым матэрыялам у складзе Еўропы. І сутыкненне з дзяржавай раней ці пазней павінна было адбыцца. Яно і адбылося ў XVII стагоддзі. Форма гэтага сутыкнення, у прынцыпе, магла быць любой. Але выбар, не без інспірацыі з Масквы, набыло рысы барацьбы за веру. Раней абыякавыя да рэлігійных пытанняў, казакі ўключаюцца ў барацьбітамі з уніяй і каталіцтвам, пастаянна шукаюць пратэкцыі то ў праваслаўнай Масквы, то ў мусульманскіх Турцыі і Крымскага ханства…

Можна сцвярджаць, што менавіта казаччына сваімі шматлікімі паўстаннямі і прывяла Рэч Паспалітую ў сярэдзіне XVII стагоддзя да жаху “гістарычнага хаосу” — да крывавага “Патопу”.

Але асноўны цяжар вайны на Ўкраіне цяпер ужо несла Польшча…

* * *

Dzieje pola dzikiego czyli o Kozaczyźnie w dawnej Rzeczypospolitej. — Warszawa, 1961. — S.17.

10. Соловьёв С. История России с древнейших времён // Сочинения. — Москва, 1991. — Кн.VI. — С.107–108.

11. Утехин Н. Происхождение украинского сепаратизма. — Москва, 1996. — С.22.

Нарэшце, адным з найбольш сур'ёзных абвінавачанняў у адрас Рэчы Паспалітай з'яўляецца тэза пра Люблінскую унію як пра зыходны пункт, ад якога пачалася паланізацыя беларускага народу. Якраз з моманту ўкладанняў гэтага акту, на думку шматлікіх аўтараў, беларуская мова "пачала выцясняцца з усіх сфераў дзяржаўнага жыцця, усяляк ганьбіцца і прыніжацца. Менавіта з гэтага часу і бярэ пачатак заўзятая беларусафобія, зневажанне ўсяго беларускага з боку польска-каталіцкага асяроддзя, што і прывяло ў 1696 годзе да забароны беларускай мовы ў афіцыйнай сферы"[13].

Сапраўды, бясспрэчным з'яўляецца той факт, што ў канцы XVI і на працягу XVII стагоддзя паланізацыя найвышэйшых слаёў грамадства ўзмацнілася. Безумоўна, Люблінская унія адыграла тут сваю ролю. Аднак паспрабуем паглядзець на гэтую праблему шырэй.

Масавая паланізацыя вярхоў беларускага грамадства пачалася значна раней за падпісанне Люблінскага акту і была звязаная найперш з імклівым пашырэннем кальвінізму на землях Вялікага Княства Літоўскага. Пра памеры кальвінізацыі шляхты можна меркаваць нават паводле таго, што на тэрыторыі дзяржавы адным толькі Мікалаем Радзівілам Чорным былі заснаваныя 162 кальвінскія зборы. Так, у Наваградскім павеце з больш чым 600 шляхецкіх сем'яў не далучыліся да пратэстанцтва ўсяго толькі 16. Дзіўная з'ява: той працэс, які меў запачаткаваць стварэнне нацыянальнай беларускай царквы, адасобленай і ад каталіцкай Варшавы, і ад праваслаўнай Масквы, і тым самым садзейнічаць умацаванню незалежнасці Вялікага Княства, спрыяў пашырэнню на тэрыторыі краіны пальшчызны, бо абсалютная большасць твораў выдавалася беларускімі пратэстантамі на польскай мове.

12 Wyjcik Z. Dzikie pola w ogniu… — S.87.

13 Ермаловіч М. Беларуская дзяржава… — С.324.

Аднак гэты феномен падаецца дзіўным толькі на першы погляд: у перыяд Сярэднявечча і ранняга Новага часу паняцця нацыянальнасці ў сучасным разуменні гэтага слова проста не існавала. Ягонае месца займалі паняцці веравызнання і дзяржаўнай прыналежнасці. Таму выкарыстанне польскай мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім, злучаным з часоў Крэўскай уніі шчыльнымі сувязямі з Каронай, уяўляецца цалкам натуральным: яно забяспечвала еднасць пратэстантаў Вялікага Княства з іх кароннымі адзінаверцамі. У тую эпоху, калі лаціна пачала паступова саступаць свае пазіцыі на карысць нацыянальных моваў, у нашай дзяржаве польская мова набывала статус мовы міжнацыянальных зносінаў, якая выгадна адрознівалася ад лацінскай тым, што была зразумелая беларусам.

Такім чынам, зусім не Люблінская унія паклала пачатак паланізацыі найвышэйшых колаў грамадства Вялікага Княства Літоўскага. Вытокі яе ляжаць нашмат глыбей. Працэс паланізацыі, шырока распачаты рэфармацыяй, працягваўся і пад сцягам контррэфармацыі. Да сярэдзіны XVII стагоддзя гэты працэс дайшоў да такой мяжы, калі канстытуцыйнае, рэгламентаванае Статутам ВКЛ 1588 году патрабаванне выкарыстання ў афіцыйным справаводстве беларускай мовы фактычна не выконвалася. Яно звялося да афармлення кірыліцай у дакументах уступаў і заканчэнняў, якія ўяўлялі сабою абавязковыя формы, сам жа змест, як правіла, пісаўся польскаю моваю з вялікім дамешкам лаціны. Да канца XVII стагоддзя такая практыка набыла ўсёабдымны характар. Таму нельга пагадзіцца з цверджаннем, быццам пастанова ўсеагульнай канфедэрацыі станаў Рэчы Паспалітай ад 29 жніўня 1696 году, паводле якой афіцыйнае справаводства мелася быць пераведзенае на польскую мову, была інспіраваная каралеўскай уладай “у мэтах канчатковага адарвання мас ад роднай духоўнай спадчыны і поўнага апалячвання”[14]. Тая пастанова сталася толькі канстатацыяй становішча, якое рэальна склалася на землях ВКЛ. Неабходна таксама памятаць, што ініцыятыва прыняцця гэтага акту зыходзіла менавіта ад шляхты ВКЛ, якая ў барацьбе з Львом магнацкага роду Сапегаў дамагалася “каэквацыі правоў” з кароннай шляхтай. А правы гэтыя, нашмат шырэйшыя ў кароннай шляхты, у масавай свядомасці часта

[14] Лыч Л. Нарысы **Гісторыя культуры**

атаясамліваліся і з мовай, на якой вялося справаводства. Аднак сам факт прыняцця тае пастановы зусім недастаткова, бо ёю было “забароненае выкарыстанне беларускай мовы ў дзяржаўным жыцці”[15]. У тых умовах, калі прававая сістэма Вялікага Княства Літоўскага грунтавалася на раней прынятых актах і на прэцэдэнтах, дзяржаўныя службоўцы былі абавязаныя ведаць старабеларускую мову.

Паланізацыя адміністрацыйнага і судовага справаводства, як і мастацкай літаратуры, урэшце, закранула невялікі працэнт насельніцтва: сялянства, найбяднейшае мяшчанства і шляхта фактычна не сутыкаліся з пісьмовай мовай, таму пра паланізацыю пераважнай большасці насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага праз пасярэдніцтва пісьмовых крыніц не можа нават ісці гаворка.

Беларусі. — Мінск, 1996. — С. 62.

15 Тамсама. — С. 63.

Іншая справа — рэлігія, якая працінала ўсе галіны жыцця тагачаснага грамадства. Сапраўды, з пачаткам контррэфармацыі абсалютная большасць беларускай шляхты пачала вызнаваць каталіцкую веру. А ў сувязі з тым, што каталіцкі касцёл паслядоўна ўжываў у набажэнстве польскую мову, шырыў сетку адукацыйных установаў, у якіх “руская” мова не выкладалася і працэс навучання адбываўся на польскай мове, працэс паланізацыі працякаў у даволі буйных маштабах.

Аднак вельмі памыляюцца тыя, хто абвінавачвае ў гэтым толькі каталіцкі касцёл, супрацьпастаўляючы яму праваслаўную царкву, у дзейнасці якой яны бачаць “справу аховы народнасці, мовы, культуры…”[16]. Паланізацыйныя працэсы ў асяроддзі праваслаўнага духавенства пусцілі глыбокія карані яшчэ ў перыяд да Берасцейскай уніі 1596 году. Асабліва ж яны ўзмацніліся ў пачатку XVII стагоддзя. Цікава, што тагачасныя апалагеты праваслаўя, якія ў сучаснай гістарыяграфіі нярэдка паказваюцца барацьбітамі за нацыянальную беларускую ідэю, палемічныя творы першай паловы XVII стагоддзя пісалі ў асноўным па-польску (у той час як “здраднікі”-ўніяты — часцей за ўсё па-беларуску).

16 Нарысы… — С. 178.

Гэтаксама даволі сумнеўную ролю ў патрыятычнай адукацыі беларускага народу адыгралі і праваслаўныя брацтвы, нягледзячы на тое што, паводле меркавання некаторых сучасных даследчыкаў, менавіта ў іх заснаванні праваслаўная

царква мае самую “вялікую заслугу”[17]. У шматлікіх брацкіх школах студэнтам было забаронена гаварыць між сабою “простай” мовай, дазвалялася размаўляць толькі па-старославянску, па-грэцку або па-польску. Жывая беларуская мова ў гэтых праваслаўных навучальных установах выкаранялася зусім не з меншым імпэтам, чым у каталіцкіх калегіумах. Таму сапраўды, паводле словаў В. Лысёўскага, “саўсім няслушна прыпісуюць віну спольшчаньня нашай шляхты адзіна езуітам і ўніятам ды прапагандзе каталіцтва. Духавенства праваслаўнае і брацкія праваслаўныя школы налажылі нічуць ня менш сваіх высілкаў у гэтым кірунку”[18]. Аднак гэтым не вычэрпваецца тая роля, якую адыгрывала праваслаўная царква на беларускіх землях у XVI—XVIII стагоддзях. Культурная паланізатарская роля спалучалася ў ёй з палітычнай русіфікатарскай. Уласна, падпісанне Берасцейскай уніі ў 1596 годзе было выкліканае перш за ўсё чаргу той небяспекай з боку праваслаўнай Масквы, якая здаўна, яшчэ з часоў Івана III, падмацоўвала імперскія анексіянісцкія планы ў адносінах да земляў Вялікага Княства Літоўскага рэлігійнымі лозунгамі абароны адзінавернага “каталіцкага прыгнёту”. А ў сувязі з утварэннем у 1589 годзе Маскоўскага патрыярхату прэтэнзіі Масквы на ўсе праваслаўныя землі нашай дзяржавы сталі выключна небяспечнымі. Падпісанне Берасцейскай царкоўнай уніі — гэта акт у абарону не толькі духоўнай, але і палітычнай незалежнасці краіны. Арыентацыя ж “непрымірымых” праваслаўных на Маскву прынесла незлічоныя бедствы Вялікаму Княству Літоўскаму. Гэта — і сцяг, які быў дадзены ў рукі анархічнаму казацтву; гэта — і падстава як для адкрытых ваенных дзеянняў, так і для ўсё большага ўмяшальніцтва Масковіі ва ўнутраныя справы дзяржавы…[19] Між тым, унія, якую ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі нярэдка кваліфікуюць як сродак каталізацыі і паланізацыі беларусаў, адыграла ў цэлым станоўчую ролю ў лёсе нашай дзяржавы. Ва ўмовах паланізацыі грамадства менавіта яна сталася тым апірышчам беларускасці, якому ў вялікай ступені мы абавязаныя захаваннем беларускай тоеснасці. У канцы XVI — пачатку XVII стагоддзяў беларуская мова панавала ўва ўсіх сферах дзейнасці уніяцкай царквы, апроч літургічнай. Нават у другой палове XVII і на працягу XVIII стагоддзя, калі

17. **Лыч Л., Набівацкі Р. Гісторыя культуры. — С.68.**

18. **Грыгор’еў І. Гісторыя беларускай (крыўскай) мовы. — С.498.**

паланізацыя Вялікага Княства Літоўскага ішла павольнымі тэмпамі, уніяцкая царква не толькі не ператварыцца ў масавай паланізацыі, а, наадварот, стала моцным захавання нацыянальнай адметнасці.

Калі прыняць пад увагу той факт, што напрыканцы XVIII стагоддзя каля 80% сельскага насельніцтва Беларусі належала да ўніяцтва, цяжка пераацаніць ролю ў ўмацаванні ў станаўленні самаідэнтыфікацыі беларусаў.

А між тым, без Любліна не было б Берасця… Безумоўна, да ўніяцтва належалі пераважна нізы грамадства. Большасць арыстакратыі і сярэдняй шляхты вызнавалі каталіцтва і, адпаведна, амаль цалкам паланізавалася. Але менавіта ўніяцтва спрыяла захаванню той нацыянальнай глебы, на якой пазней адбыўся працэс нацыянальнага адраджэння. Хаця і сама шляхта зусім не спяшалася станавіцца палякамі. На працягу ўсяго існавання Рэчы Паспалітай назіраецца найцікавейшы феномен: у свядомасці тагачаснага грамадства трывала ўсведамляецца дзяржаўнасць Вялікага Княства Літоўскага (што, аднак, не замінала тутэйшай шляхце лічыць сябе часткаю адзінай шляхецкай нацыі Рэчы Паспалітай, але гэта ўжо станавая, карпарацыйная свядомасць). Менавіта гэтае ўсведамленне і дало магчымасць здзейсніць такія акты, як, напрыклад, падпісанне Крыштапам Радзівілам замірэнняў з шведамі (1626, 1627 гады) у той час, калі Карона працягвала праводзіць ваенныя дзеянні (што многімі “караняжамі” было расцэненае як фактычнае скасаванне уніі)… Яно ж прывяло да разарвання уніі з Польшчай і да падпісання яе шматлікімі прадстаўнікамі Княства са Швецыяй (1655 год)… Менавіта яно спрычынілася да падпісання шляхтаю ад імя Вялікага Княства Літоўскага (“Рэчы Паспалітай Літоўскай”) у 1702 годзе — без ведама кароннай шляхты — саюзу з Расіяй…

Гэтае ўсведамленне асобнасці дзвюх краінаў, аб’яднаных Люблінскай уніяй, падмацоўвалася і ўзаемнай непрыязнасцю паміж абывацелямі кожнае з іх, чаму існуе безліч прыкладаў. Нават польскія даследчыкі прызнаюць, што “паняцце Рэчы Паспалітай уключае ў сябе адну шляхецкую нацыю і дзве ўзаемна непрыязныя ці, як найменш, недаверлівыя адна да адной дзяржавы”[20].

Гэтае пачуццё асобнасці і не дазволіла б шляхце канчаткова зліцца з польскім этнасам. І адраджэнне беларускасці ў яе

19. Зрадзіем, напэўна, будзе лічыцца і той факт, што архіяпіскап Гнезенскі ўпершыню ў гісторыі Польшчы і Літвы ўзначаліў Праваслаўную царкву.

асяроддзі прырэчанае было адбыцца. Не магло не адбыцца. Што, урэшце, і здзейснілася ў XIX стагоддзі, калі менавіта прадстаўнікі шляхецкага стану запачаткавалі працэс беларускага нацыянальнага адраджэння.

Згадаем, што працэс дэнацыяналізацыі нацыянальнай эліты адбываўся не толькі на беларускай зямлі. Тое самае мы бачым і ў Нарвегіі, дзе паноўны клас фактычна цалкам успрыняў дацкую культуру, і ў германізаванай Чэхіі… Аднак, калі наспелі гістарычныя ўмовы, калі ў Еўропе запанавала ідэалогія рамантызму з ягоным зваротам да нацыянальных вытокаў, адбылося вяртанне асіміляваных вярхоў грамадства да сваіх каранёў. Не была тут выключэннем і Беларусь.

Характэрна, што працэс адраджэння беларускасці ў XIX стагоддзі адбываўся ў нашмат больш складаных умовах, чым у перыяд існавання Рэчы Паспалітай. Агульнавядомым з'яўляецца факт, што паланізацыя беларусаў асабліва вялікія памеры набыла менавіта ў складзе Расійскай імперыі, калі гэты працэс пачаў спалучацца з русіфікацыяй. Ні забарона ўніяцтва, ні скасаванне дзеяння Статуту 1588 году, ні насаджэнне расійскага чынавенства, ні перашкоды ў выданні беларускіх кніг, ні замена назваў "Беларусь" і "Літва" на "Северо-Западный край" не здолелі зрабіць гэты край расійскім. Але і польскім ён не стаў: паводле перапісу 1897 года, 73% тутэйшых дваранаў назвалі роднай мовай беларускую…

* * *

Рэч Паспалітая стала неабходным фактарам захавання толькі дзяржаўнасці Вялікага Княства Літоўскага, але і беларускага этнасу ў найскладанейшы перыяд яго існавання. Таму безаглядная крытыка Люблінскай уніі ўяўляецца неканструктыўнай. Рэч Паспалітая прадоўжыла заклады Полацкім княствам і Вялікім Княствам Літоўскім традыцыі беларускай дзяржаўнасці. Таму без перабольшання можна сцвярджаць, што Полацкае княства, Вялікае Княства Літоўскае і Рэч Паспалітая — гэта тры калыскі, у якіх адбывалася станаўленне нашага народу.

20. **Wisner H. Wielkie Księstwo Litewskie — Korona Polska Rzeczpospolita** // **Przegląd Historyczny** 1976. **T. LXVII, zesz.4.** **S. 587–588.**

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/05/02**
[image]

Між айчынным чытачом і замежным калегам

Круглы стол па праблемах беларускай гістарыяграфіі

***6** сакавіка ў Беларускім ПЭН-цэнтры адбыўся “круглы стол” на тэму “Беларуская гістарыяграфія на шляху да эўрапейскасьці”. Удзел у ім узялі рэдактар “Беларускага гістарычнага агляду” **Генадзь Сагановіч**, куратар аддзяленьня гісторыі Беларускага калегіюму **Захар Шыбека**, Міжнародны сакратар Беларускага Шуманаўскага таварыства палітоляг **Юрась Ліхтаровіч**, кіраўнік ініцыятывы “Культурны кантакт” **Вацлаў Арэшка**, сябра рады Беларускага гістарычнага таварыства і супрацоўнік “Гістарычнага альманаху” **Алесь Смалянчук**, загадчык катэдры этналёгіі Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту **Павал Церашковіч**, галоўны рэдактар часопісу “Спадчына” **Аляксей Хадыка**, былы дэпутат Вярхоўнага Савету **Валянцін Голубеў**, дырэктар Навукова-дасьледчага цэнтру навуковай дакумэнтацыі і сябра Навуковай рады па падрыхтоўцы “Гістарычнага атлясу Беларусі” **Вячаслаў Насевіч**, пісьменьнік **Уладзімер Арлоў**, старшыня Беларускага Шуманаўскага таварыства **Ігар Лялькоў**, рэдактар “Нашае*

Нівы” ***Андрэй Дынько****, рэдактар часопісу “ARCHE”* ***Валер Булгакаў****.*

Андрэй Дынько: За апошні год рэзка зьменшылася колькасьць пэрыядычных выданьняў гістарычнае тэматыкі. У разы зьменшыўся сукупны наклад гістарычных кніг. Але попыт на іх застаецца высокім. Сярод папулярнае літаратуры гістарычныя кнігі па-ранейшаму займаюць першыя пазыцыі, сьпісы навуковых бэстсэлераў узначальваюць таксама яны. Таму зьмяншэньне колькасьці выданьняў, якое адбылося, балюча б’е па нацыянальным руху.

Юрась Ліхтаровіч: Беларускія гісторыкі не вядомыя ня толькі заходняму чытачу. Яны не вядомыя нават заходнім гісторыкам. Нядаўна ў Францыі выйшла “Энцыкляпэдыя Вялікага Княства Літоўскага”, дзе сярод бібліяграфічных спасылак амаль няма працаў беларускіх гісторыкаў. Вядома, той бок мае свае нейкія стэрэатыпы, але пытаньне ёсьць і да нас, беларусаў.

Валер Булгакаў: Прафэсійныя гісторыкі, якія жывуць на Захадзе і сустракаюцца з прадуктам беларускай гістарыяграфіі, часта абвінавачваюць беларускіх гісторыкаў у нацыяналістычнай заангажаванасьці. Для мяне была пацьвярджэньнем такой думкі нядаўняя рэцэнзія ў “ARCHE” Ўладзімера Сакалоўскага на “Handbuch der Geschichte Weißrußlands” — “Даведнік з гісторыі Беларусі” пад рэдакцыяй Дытэра Байраў і Райнэра Ліндэра. Там апісваліся моманты, характэрныя для супрацы беларускіх і замежных гісторыкаў. Немцы пастулявалі, што праца мэтадалягічна мусіць адыходзіць ад нацыяналістычнай заангажаванасьці, нібыта характэрнай для беларускіх дасьледчыкаў. Наколькі гэты закід адпавядае праўдзе?

Генадзь Сагановіч: Нашыя гісторыкі, якія маглі працаваць з заходняй літаратурай, бачылі, што ў Беларусі сапраўды ёсьць адрозьненьні ад поглядаў нашых калег на Захадзе. Але адкуль заходнім выдаўцам ведаць пра беларускія погляды на гісторыю Вялікага Княства? І праблема ня толькі ў гэтым. Выйшла сусьветная “Энцыкляпэдыя гісторыяпісаньня”, дзе таксама няма ні слова пра беларускую гістарыяграфію, хаця прэзэнтуюцца ўсе гісторыі сьвету.

Па чым можна меркаваць пра веданьне беларускай гістарыяграфіі ў Эўропе? Па бібліяграфіі, па эўрапейскіх

часопісах, па выкарыстаньні працаў беларускіх гісторыкаў у напісаньні нейкіх сынтэтычных працаў, па агульнаэўрапейскіх форумах, у якіх бы ўдзельнічалі беларускія гісторыкі. Усе гэтыя пазыцыі для нас застаюцца недасягнутымі. Я спэцыяльна праглядаю нямецкія часопісы па ўсходнеэўрапейскай — не ўнівэрсальнай! — гісторыі, і ў іх няма аглядаў, рэцэнзіяў беларускіх кніжак нават апошняга дзесяцігодзьдзя. Але ці зрабілі мы такую прадукцыю, якая б успрымалася бяз скепсысу на Захадзе, і, галоўнае, ці даслалі? Вось гэта да таго, што ад нас магло б залежаць.

Што да згаданага “Даведніку”, дык ён ствараўся як супольная праца беларускіх і нямецкіх гісторыкаў. Мы адчувалі розьніцу, але яна палягае хутчэй ня ў стане разьвіцьця навукі, а ў стане разьвіцьця грамадзтва. У Беларусі стаіць задача нацыянальнага разьвіцьця, гэты этап у нас ня пройдзены. Таму пры наяўнасьці сутыкненьняў на гэтай глебе ў нашых гісторыкаў заставалася пачуцьцё крыўды і непаразуменьня: наш патрыятызм яны прымалі за нацыяналізм. На ўзроўні лексыкі, тэрміналёгіі нашыя паняцьцевыя апараты адрозьніваліся.

В. Б.: А ўва ўзаемадзеяньні зь якой гістарычнай традыцыяй гартуецца беларуская гістарыяграфія? Ці яна разьвіваецца сама па сабе, незалежна ад суседніх? Ці ня ёсьць нацыянальная гістарыяграфія адной з частак нацыянальнага праекту па выбудове беларускай нацыі: літаратура, гістарыяграфія, мастацтва?..

Вячаслаў Насевіч: Беларуская нацыянальная гістарыяграфія ў значнай ступені зьяўляецца працягам беларускай эмігранцкай гістарыяграфіі, якая была дастаткова ізаляваная там. З другога боку, ёсьць постсавецкая гістарыяграфія ў шырокім сэнсе гэтага слова. У ёй пэўную нішу займаюць працы беларускіх гісторыкаў (неабавязкова на беларускай мове). У такім сэнсе яна зьяўляецца пераемніцай савецкай гістарыяграфіі — часам з усімі горшымі яе ўвасабленьнямі. Яшчэ адным падсілкаваньнем была польская гістарыяграфія: палякі яшчэ з XIX стагодзьдзя пра беларускую гісторыю напісалі вельмі шмат. І часам тое, што пішуць беларусы, у значнай ступені грунтуецца на падмурку таго, што было зроблена палякамі. Тое, што па гістарычнай геаграфіі Вялікага Княства Літоўскага было зроблена Лаўмяньскім, Ахманьскім, — і па сёньня не дасягнуты ўзровень для беларускай

гістарыяграфіі. Адсутнасьць школы — галоўная гэтаму прычына, як выглядае. Польская гістарычная школа была вельмі моцнай у свой час, і савецкая (у дасьледаваньнях не найноўшай гісторыі, а таго, што марксізм абмяжоўваў пытаньнямі клясавае барацьбы) значна саступала нават працам таго ж Лаўмяньскага. Калі б зьявілася работа на ўзроўні, які германскай, французскай, польскай навуковымі школамі прызнаны як *minimum minimorum*, яна была б там заўважаная. У апошні час мэтадалягічным падыходам прыемна вызначылася праца Алеся Белага пра Белую Русь. Але гэта нешта адзінкавае, а ў асноўным узровень у нас публіцыстычны. Для грунтоўных навуковых дасьледаваньняў не хапае падмурку.

Што тычыцца ўступнай заўвагі наконт высокага попыту на гістарычную літаратуру, то я маю такое ўражаньне. Калі я абмяркоўваў пэрспэктывы выданьня сваёй кнігі ў выдавецтве “Тэхналёгія” зь Зьмітром Саньком, ён мне сказаў: 10 гадоў таму можна было б абмяркоўваць наклад у 10 разоў вышэйшы, чым сёньня. Гэта ўражаньне прафэсійнага выдаўца пра кнігі на гістарычную тэматыку.

Г. С.: Але ж зьмянілася сыстэма дыстрыбуцыі. Тады быў распаўсюд па цэлай Беларусі: і ў Гомелі, і ў Віцебску, і на раёны. Цяпер такога няма.

Уладзімер Арлоў: Зьмянілася палітыка дзяржавы да такой літаратуры. Усе гэтыя кнігі выходзяць пераважна ў недзяржаўных выдавецтвах, маюць праблемы з фундатарамі. Структуры “Белкнігі”, якая застаецца манапалістам у Беларусі, шмат якую літаратуру падобнай тэматыкі проста адмаўляюцца браць на продаж.

В. Н.: Слушна, але З. Санько як адно з тлумачэньняў выказаў такую думку: быў абсалютны вакуум, усё, што пісалася на гістарычную тэматыку, было новае і цікавае, таму ўсё раскуплялася. Сёньня сказаць нешта кардынальна новае ўжо складана — трэба браць за кошт узроўню. А гэты пераход на другую прыступку, складаецца такое ўражаньне, не адбыўся.

У. А.: З. Санько ня мог не сказаць, што галоўную прычыну ён бачыць у катастрафічным зьбядненьні нашага насельніцтва. Калі настаўнік павінен дзясятую частку свайго заробку аддаць, каб набыць кнігу, выдадзеную ў недзяржаўным выдавецтве…

В. Н.: Так. Яшчэ ёсьць і гэткі фактар, што адносны кошт кнігі (у параўнаньні зь іншымі прадметамі спажываньня) значна вышэйшы, чым быў у савецкія часы. Сёньня добрая кніга за 10—15 умоўных адзінак — гэта і для дацэнта істотна, ня тое што для студэнта.

Вацлаў Арэшка: Расейскамоўныя папулярныя кнігі па гісторыі сёньня тысячамі экзэмпляраў трапляюць да нас, да нашых дзяцей, бо беларускія "недзяржаўнікі" проста ня ў стане рабіць адпаведнага сучаснаму рынку па паліграфічным узроўні прадукту. Нашыя недзяржаўныя структуры не прыцягваюць увагі рынкавага пакупніка. Кола зацікаўленых асобаў застаецца амаль тым жа, што і 10 гадоў таму.

Валянцін Голубеў: Мы гаворым пра тое, чаму не купляюцца кніжкі. Але паглядзіце на якасьць! І калі ідзе гаворка пра гістарыяграфію, давайце зьвернем увагу, чаму нашыя гістарычныя працы, датычныя гісторыі Беларусі, не карысталіся ўвагай і даверам з боку замежных гісторыкаў. Па вялікім рахунку, уласна беларуская гістарыяграфія — гэта апошнія 10—12 гадоў. Раней можна было напісаць працу на тэму, якая *дазвалялася*. Што было распрацавана? Калі гаварыць пра фэадалізм, нам дазвалялася займацца пытаньнямі разьвіцьця гаспадаркі, дзе можна было напісаць больш-менш аб'ектыўна. Ды яшчэ Георгі Галенчанка змог даволі аб'ектыўна асьвятляць пытаньні гісторыі культуры, за што, аднак, ягоная кніга і была рассыпаная паводле рашэньня ЦК Кампартыі. Астатняе — зададзеныя тэмы з зададзенымі вынікамі. Яны і тады ня мелі вялікай каштоўнасьці з гістарыяграфічнага пункту гледжаньня, і на сёньняшні дзень яе ня маюць. Але што адбылося потым? Пачалі займацца дзьвюма цікавымі і патрэбнымі рэчамі: палітыкай Вялікага Княства, ваеннай гісторыяй і цікавымі праблемамі, якія можна было выдаць публіцы і якіх яна патрабавала. Сёньня гэты момант — задавальненьне цікаўнасьці шырокай публікі ў сваёй гісторыі — мы ўжо прайшлі. І некаторыя літаратурна-гістарычныя працы ідуць па другім-трэцім коле: студэнты да сёньняшняга дня носяць на сэмінары працы Вітаўта Чаропкі…

Дык чым павінны сёньня займацца беларускія гісторыкі? І што сёньня павінна ўяўляць сабой беларуская гістарыяграфія?

Вельмі добра, што ў нас зьявіліся абагульняльныя кнігі па гісторыі Беларусі з пункту гледжаньня Беларусі (я маю

на ўвазе працы З. Шыбекі, Г. Сагановіча, У. Арлова, А. Латышонка, Я. Мірановіча). Але чым сёньня трэба займацца беларускім гісторыкам, каб іхныя дасьледаваньні паказалі і нам, і Эўропе нашую гісторыю?

Ня ўсё так дрэнна было ў плянаваньні, якое існавала ў савецкія часы. У нас сёньня няма такога органу, які вызначае, што трэба напісаць для беларускай гісторыі, чаго ў нас не стае. Тое, што людзі самі выбіраюць цікавыя для сябе пытаньні, добра. Але нам казалі так: напішыце адну працу пра тое, што трэба беларускай навуцы, а другую можаце пісаць для сябе. Калі б мець такі сьпіс тэмаў, якія патрабуюць глыбейшага дасьледаваньня, праз асьпірантуру (рэкамэндацыямі маладым дасьледчыкам) можна было б дамагчыся распрацоўкі патрэбных тэмаў.

Алесь Смалянчук: У Беларусі што ні вазьмі — усялякая праблема становіцца актуальнай. Але ёсьць іншае: амаль нормай становіцца, калі абараняецца дысэртацыя на тэму, абароненую раней. Вось напярэдадні Аляксандар Сьвірыд абараніўся па гісторыі ўніяцтва ў 20—30-х, пра што раней ужо была праца. Каардынацыі няма нават на такім узроўні. Вяртаючыся да абвінавачаньня ў нацыяналізьме беларускіх гісторыкаў, хачу сказаць: праблема ня ў тым, што ў нас няма школы, што мы яе толькі ствараем. Пра нас ведаюць (ужо!) з падачы расейскіх гісторыкаў, польскіх, літоўскіх. І выглядаем мы там не як беларусы, а як Заходні край, Крэсы Ўсходнія, як нейкая этнічна невыразная частка літоўскай дзяржавы. І тут таксама трэба нешта рабіць. Ёсьць штогоднік Інстытуту гісторыі Літоўскай акадэміі на ангельскай мове. Там у адным зь першых нумароў была вельмі рэзкая рэцэнзія Артураса Дубоніса на кніжку Алеся Краўцэвіча. Усе гэтыя ацэнкі пайшлі ў Эўропу. А. Краўцэвіч адказаў — на беларускай мове ў беларускім выданьні. Хто там пра гэта ведае?! А там ацэнка пайшла: Ермаловіч — нацыяналіст і прапагандыст, Краўцэвіч зь іншай канцэпцыяй стварэньня ВКЛ — таксама. Калі думаць пра тое, што выдаваць, дык варта было б падумаць пра нешта падобнае. Калі цяжка штогоднік, дык хаця б зборнікі на ангельскай мове, каб даходзілі да чытача.

А. Д.: Хто б мог выдаваць у Беларусі такія зборнікі на ангельскай мове? Ці ёсьць нейкі такі асяродак?

Г. С.: Гісторыкі, якія ведаюць ангельскую мову. Мусіць быць і разуменьне спэцыфікі гэтай працы, і фінансаваньне, і належнае кіраўніцтва.
А. Д.: А ў Літве хто фінансуе падобнае выданьне?
Г. С.: Дзяржава. Мусіць быць дзяржаўная палітыка ў галіне разьвіцьця гістарыяграфіі. Усе ведаюць, якая яна ў нас. І, можа быць, гэтым тлумачацца шмат якія цяжкасьці. А што да праграмы і плянаваньня, дык я падобныя рэчы некалі бачыў у друку — пералікі пэрспэктыўных актуальных праблемаў. Ува Ўкраіне, у Літве такое ёсьць.
А. Д.: А зь якога году пачалі выдаваць тое ангельскамоўнае выданьне? Ці было яно ў Літоўскай акадэміі навук у савецкі час?
Г. С.: Гэта палітыка незалежнай літоўскай дзяржавы. Выданьне выходзіць зь сярэдзіны 90-х гадоў.
А. Д.: Ці ёсьць у Літве аналягічнае выданьне па-расейску?
В. Н.: Па-расейску — дакладна не.
А. С.: Ёсьць польская мова — робяцца літоўска-польскія зборнікі.

В. Н.: У мяне ёсьць дзьве заўвагі. Наконт выданьня на замежных мовах. Неабавязкова адразу пісаць на ангельскай мове. Добрая праца ня будзе незаўважанай, і яе перакладуць на Захадзе.
Другая заўвага наконт заявы Г. Сагановіча, што дзяржава не падтрымлівае беларускай гістарыяграфіі. Гэта, з аднаго боку, сапраўды так. А з другога боку, тут ёсьць аналёгія з рок-музыкай. Калі яна была забароненай, дык з духу супраціўленьня ўтвараліся выдатныя рэчы. Калі ім стала можна гучаць, яны адразу прагучалі. Сёньня можна ўсё — і ўзровень року панізіўся. Так і тут: калі б зьнялася гэтая пэўная апазыцыя, дык ня факт, што адразу зьявіліся б пэўныя працы. Калі ў стол нічога ня пішацца, то і з дазволу не напішацца.
Ігар Лялькоў: Што да выданьняў на замежнай мове, дык ёсьць яшчэ адзін аспэкт. Калі б беларускія гісторыкі былі здольныя пісаць па-ангельску ці па-французску, дык знайсьці выдаўцоў было б вельмі рэальна. Па-французску існуе цэлая сэрыя “Беларусь” выдавецтва “l’Harmattan”, у якой ужо выйшла зь дзясятак кніжак. Пытаньне ў тым, ці пішуць беларускія гісторыкі па-французску і па-ангельску. А пераклад трэба

замаўляць: на грамадзкіх пачатках наўрад ці хто пагодзіцца рабіць.
Міжнародныя кантакты лепш за ўсё наладжваюцца на міжнародных канфэрэнцыях, сэмінарах і г.д., дзе прысутнасьць беларускіх гісторыкаў ня вельмі вялікая. Калі да Польшчы, Расеі яны неяк даяжджаюць, дык на захад ад Польшчы вельмі рэдка можна сустрэць беларускіх гісторыкаў. Таму і стэрэатыпы ў заходняй гістарыяграфіі адносна Беларусі ўмацоўваюцца. Візія расейскіх, літоўскіх, польскіх дасьледнікаў там даступная, зь яе карыстаюцца напоўніцу. Але калі б беларускія гісторыкі часьцей прысутнічалі на канфэрэнцыях, выступалі, маглі кантактаваць з сваімі калегамі, даводзіць свой пункт гледжаньня, дык, можа, і ў гэтым кірунку можна было б штосьці зьмяняць.
В. Б.: Тут прысутнічаюць людзі, якія ўжо выдалі свае манаграфіі альбо асобныя публікацыі ў Эўропе: Г. Сагановіч, З. Шыбека, П. Церашковіч. Спадар Захар, калі Вы рыхтавалі сваю публікацыю ў Польшчы, ці былі ў Вас праблемы, якіх Вы не перажывалі б пры працы зь беларускімі выдаўцамі?
Захар Шыбека: Мы выхоўваліся ў традыцыях савецкай гістарыяграфіі, а тут упершыню сутыкнуліся з прадстаўнікамі эўрапейскай гістарыяграфіі. Гэта першая праблема. Другая праблема — выпрацоўка новых поглядаў на гісторыю, якія не маглі ў нас спачатку быць іншымі, як нацыянальнымі, нацыянальна-народніцкімі. І гэтая пазыцыя ніяк не прымалася нашымі калегамі з Польшчы, Літвы і Ўкраіны. Было шмат праблемаў ува ўзгадненьні супольных поглядаў з польскай гістарыяграфіяй, а асабліва — зь літоўскай: ніяк не маглі падзяліць супольную спадчыну Вялікага Княства Літоўскага. Гэтым тлумачыцца тое, што наш праект цягнуўся з 1992 да 2001 году. Урэшце, нас сталі больш разумець, ня ўсе нашыя прапановы былі адкінутыя. Мы зразумелі, што кожная краіна, кожная нацыя мае права на сваё ўласнае бачаньне гістарычнага працэсу. Мы ня можам загадаць літоўцам, як пісаць сваю гісторыю, а яны — нам. Таму ўсе сьцьверджаньні, нібыта ёсьць міжнародная згода гісторыкаў лічыць Вялікае Княства Літоўскае беларуска-літоўскай ці літоўска-беларускай дзяржавай, няслушныя — немагчыма дамовіцца на міжнародным узроўні. Кожны лічыць так, як гэта адпавядае яго нацыянальнай традыцыі, яго дзяржаўным інтарэсам. Такая

ўзаемапавага, узаемацярплівасьць якраз падчас зьдзяйсьненьня гэтага праекту ажыцьцявілася.
Што тычыцца нашага сьцьвярджэньня ў эўрапейскай гістарыяграфіі… Пераскочыць цераз пэўныя этапы немагчыма. У нас так шмат яшчэ ўнутраных праблемаў у разьвіцьці гістарычнай навукі, што адразу думаць пра міжнародны ўзровень, вядома, трэба, але гэта не заўсёды прадуктыўна. Мы знаходзімся ў спэцыфічных умовах: ня маем дзяржаўнай падтрымкі. Ну як выйсьці на міжнародны рынак без падтрымкі дзяржавы, якая прытрымліваецца ізаляцыянісцкай палітыкі? Па-другое, нам не хапае вопыту, прафэсіяналізму і нават звычайнага прадпрымальніцтва. Мы пішам кніжкі, якіх ня ведаюць за мяжой ня толькі таму, што мы ў ізаляцыі, але і таму, што мы нічога ня робім, каб іх ведалі. Элемэнтарна — даслаць сваю кніжку на Захад сваім знаёмым, у нейкія часопісы, каб яна проста там прысутнічала. Я, напрыклад, праз сваіх знаёмых паслаў кнігу “Гарады Беларусі” ў Германію — і там выйшла рэцэнзія. Вось што ў значнай ступені залежыць ад нас!
Я хацеў бы зьвярнуць дыскусію на ўнутраныя праблемы. Якія нашыя рэсурсы, якія праблемы ўнутры гістарыяграфіі, што мы можам зрабіць, каб павысіць узровень нацыянальнай гістарыяграфіі? Нацыяналізм павінен абавязкова прысутнічаць у нашай гістарыяграфіі. У прынцыпе, ён прысутнічае ў любой цяперашняй эўрапейскай гістарыяграфіі. Я назіраю вяртаньне да нацыяналізму ўва ўсіх краінах. Што, французская гістарыяграфія ня мае нацыяналізму? Адзінае, чаго нам бракуе, — культуры выкладаньня, культуры адстойваньня сваіх нацыянальных інтарэсаў паводле правілаў гульні, якія існуюць у эўрапейскай гістарыяграфіі. А тыя ж ідэі можна акуратна праводзіць у формах, зразумелых і прымальных для эўрапейскіх спэцыялістаў.

Павал Церашковіч: Я хацеў бы зноў згадаць “Handbuch”, выдадзены ў Нямеччыне. Гэтаму выданьню папярэднічала канфэрэнцыя ў Франкфурце, што адбылася ў 1995 годзе. Там прафэсар Байраў адкрыта абвінавацiў нас у нацыяналізьме і ў мітатворчасьці. У прыватнасьці, было пастаўлена такое пытаньне: “Чаму вы вырашылі, што Кастусь Каліноўскі быў беларускім нацыяналістам? Якія ў вас ёсьць доказы?” Мне

давялося выступаць там вельмі рэзка, бо нават з гледзішча савецкіх традыцыяў умовы дыскусіі былі яўна не дыпляматычныя. Нам прыйшлося нагадаць немцам: у другой палове XVIII стагодзьдзя “лідэрам” нямецкай філязофіі Ляйбніцу і Гердэру давялося шмат разоў даказваць, што нямецкая мова прыдатная для выкладаньня ўва ўнівэрсытэтах. Немцы гэта ўспомнілі і пакрыўдавалі: “Ня трэба параўноўваць Нямеччыну і Беларусь”.

Але пасьля таго, як я добра пазнаёміўся з ангельскай гістарыяграфіяй этнічнасьці Беларусі і польскімі працамі, то прыйшоў да высновы: нашая сучасная гістарыяграфія шмат у чым нацыяналістычная. Сёньня ў нашай дыскусіі сп. Сагановіч сказаў, што ў нас нацыяналізму няма. Сп. Шыбека кажа, што нацыяналізм у нас ёсьць, але гэта абсалютна нармалёва. Я ўжо амаль скончыў манаграфію, прысьвечаную параўнальнай этнічнай гісторыі беларусаў і некаторых іншых народаў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы ў XIX — пачатку XX стагодзьдзяў, дзе прыйшоў да такіх высноваў. Калі нацыя пачынае разьвівацца, нацыяналізм у гістарыяграфіі вельмі моцна выяўлены. Калі ж нацыя больш-менш сталее, яна пачынае асэнсоўваць яго і нават змагацца зь ім. У Чэхіі ёсьць прыклад нацыяналіста Ганкі, які стварыў “Кралядворскі рукапіс”, каб узьняць нацыянальны дух, і ёсьць прыклад нацыяналіста Масарыка, які ўсё жыцьцё змагаўся супраць такога разуменьня нацыяналізму, але фактычна стварыў праект незалежнасьці Чэхаславаччыны і дамогся рэалізацыі гэтага праекту.

У параўнаньні з польскай гістарыяграфіяй наша выглядае мітатворчасьцю. Я дасьледаваў этнічную прыналежнасьць каталіцкага насельніцтва Віленшчыны ў канцы XIX стагодзьдзя, спрабаваў дасьледаваць, ці існавала ўжо нацыянальная сьвядомасьць у той час у палякаў на іхных этнічных землях. Я знайшоў некалькі манаграфіяў, у тым ліку — манаграфію Хелены Брадоўскай, што вельмі моцна мяне ўразіла: як могуць палякі абсалютна адкрыта пісаць пра тыя рэчы, якіх мы ўсё яшчэ саромеемся? Напрыклад, яна абсалютна адкрыта піша, што польскае сялянства збольшага не падтрымала паўстаньня 1863 году. Мала таго, у Варшаўскай губэрні была шматлікая сялянская варта, якая дапамагала царскай арміі. Былі выпадкі, калі ня толькі сяляне, як кажуць, “закладвалі” паўстанцаў, але

і шляхта гэта рабіла таксама. Што мяне дабіла канчаткова: былі выпадкі, калі сяляне дабівалі параненых паўстанцаў пасьля бітвы. Яны пра ўсё гэта пішуць абсалютна адкрыта. І мне падалося, што гэта добры прыклад і для нас — цьвяроза паглядзець на нашую нацыянальную гісторыю. Іншы прыклад — даволі добра ўжо вядомая ў нашай краіне гісторыя фармаваньня мадэрнай украінскай нацыі, выдадзеная Ярославам Грыцакам. Там ёсьць усяго некалькі момантаў замілаваньня сечавымі стральцамі ў 1918 годзе, але ў астатнім гэта вельмі спакойная цьвярозая праца. Можа, яна і жорсткая, але раней ці пазьней мы павінны да такога прыйсьці.

В. Б.: А якія асноўныя міты ў беларускай гістарыяграфіі?

П. Ц.: Я магу прыгадаць міт, у стварэньні якога я прымаў непасрэдны ўдзел, — пра тое, што Баброўскі і Даніловіч былі стваральнікамі беларускай нацыянальнай ідэі. Ня я быў першым, шмат было папярэднікаў. І вось у Любліне мне давялося знайсьці працу, прысьвечаную гісторыі славяназнаўства ў Польшчы ў пачатку XIX стагодзьдзя. Там шмат лістоў Баброўскага, якія сьведчаць: у нас няма фактаў, якія б даводзілі, што ён быў лідэрам нацыянальнага руху. Ёсьць толькі ўскосныя моманты значна больш позьняга паходжаньня. Больш за тое, ён напісаў некалькі лістоў да Лялевеля, дзе зазначаў пра Даніловіча: Ігнацы наш зьехаў у Харкаў і там “ахохліўся” і “сказачэў”. У свой час я пісаў адкрыта, што гэта была першая праява нацыянальнай ідэалёгіі. На самай справе ня ўсё так проста…

У. А.: Я не гістарыёграф, а прадстаўнік той часткі літаратараў, якія ствараюць нацыянальныя міты як неабходны чыньнік для паўнавартаснага жыцьця нацыі. Гісторыя мае велізарную стваральную сілу. Што да мітаў, дык я якраз сёньня ў “Белорусской деловой газете”, адказваючы на пытаньні чытачоў пра унію, згадаў Баброўскага і Даніловіча. Гэты міт замацаваны і ў “Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі”, у энцыкляпэдычным даведніку “Беларусь”.

Але я хацеў цяпер сказаць пра іншае — пра ўзровень шчырасьці ў працы пра паўстаньне 1863 году з боку палякаў. Можа, нашыя гісторыкі яшчэ не адчуваюць у сабе маральнага права акцэнтаваць увагу менавіта на такіх момантах, як роля значнай часткі шляхты і праваслаўнага духавенства. Колькі сьвятароў

тады атрымалі мэдалі за ролю ў тых падзеях! А сяляне без усялякіх мэдалёў за тры рублі, якія плацілі ім за мёртвага паўстанца, і пяць рублёў, якія плацілі за жывога, супрацоўнічалі вельмі актыўна з карнікамі.

Сытуацыя ў Беларусі такая, што нацыянальны міт не авалодаў яшчэ сьвядомасьцю нашых грамадзян настолькі, каб грамадзтва пачувалася ў бясьпецы што да сваёй будучыні, сваёй гістарычнай памяці. Нашая гісторыя пакуль што застаецца ня вельмі прадказальнай, пра што сьведчаць некаторыя артыкулы, якія зьявіліся апошнім часам у энцыкляпэдыях. У 1999 годзе ў адпаведным томе ўнівэрсальнай беларускай энцыкляпэдыі напісана, што ў Курапатах, паводле адной вэрсіі, расстрэльвала НКВД, паводле другой — ажыцьцяўлялі генацыд нямецка-фашысцкія захопнікі. Не пададзеная ніякая колькасьць ахвяраў. Гэта растыражавана ў дзесяці тысячаў асобнікаў, якія трапяць найперш у бібліятэкі і навучальныя ўстановы. Таму я лічу, што праблема нацыянальнага міту застаецца ня менш актуальнай, чым праблемы гістарыяграфіі. Часам менавіта літаратары даюць прыклад разгляду некаторых падзей і асобаў у эўрапейскім кантэксьце. Я не сустракаў ні ў кога з нашых гісторыкаў такой выразнай думкі, што друкаваная “Біблія” Скарыны па-беларуску выйшла ня толькі раней, чым расейскі, польскі, літоўскі, баўгарскі, сэрбскі, але і французскі, ангельскі пераклады. Пакуль што пра гэта пісалі толькі літаратары, а не гісторыкі.

У мяне засталося яшчэ адно пытаньне да прафэсійных служак Кліё: ці існуе ў каго-небудзь праект выданьня працаў такога гісторыка, “двойчы нацыяналіста” (асуджанага за беларускі і ўкраінскі нацыяналізм), як Леў Акіншэвіч? Бо якраз ён даваў прыклад разгляду шмат якіх старонак нашай гісторыі ў эўрапейскім кантэксьце. Можна згадаць ягоную ацэнку палітычнага разьвіцьця Вялікага Княства: вэктар палітычных сымпатый і культурных арыентацыяў нізоў быў скіраваны на Ўсход, а вярхоў — на Захад, што мы і назіраем з стагодзьдзя ў стагодзьдзе. Зборнік ягоных працаў прагучаў бы вельмі актуальна.

П. Ц.: Каб ужо скончыць тэму пра мітатворчасьць і абавязковасьць ейнай наяўнасьці ў працы гісторыка… Сваім часам я быў уражаны, калі ўпершыню прыехаў у Талін

і працаваў з калегамі, хадзіў па горадзе, казаў: “Які цудоўны эстонскі горад!” А яны адказвалі: “Гэта ня наш горад. Мы, эстонцы, нацыя сялянаў і настаўнікаў. Гэтыя гарады пабудавалі немцы і датчане”.

У сярэдзіне XIX стагодзьдзя эстонскія сяляне называлі сябе “маарахвас”, што ў перакладзе на беларускую абсалютна дакладна абазначае “тутэйшыя”. А назва “эстонец” для іх была штучнай. Усіх астатніх, хто ўмеў пісаць і чытаць, яны называлі “сакс” — “немцы”. Нават тыя эстонцы, якія навучыліся чытаць і пісаць (а гэта магло быць толькі па-нямецку), таксама станавіліся “сакс”. Яшчэ ў сярэдзіне XIX стагодзьдзя Фэльман, які заснаваў таварыства па вывучэньні фальклёру і этнаграфіі Эстоніі ды пачаў выкладаць эстонскую мову ў Дэрпцкім унівэрсытэце, лічыў, што шанцаў на будучыню эстонская культура ня мае, што ўсе будуць германізаваныя, а трэба проста штосьці захаваць для нашчадкаў… Але прайшло літаральна паўстагодзьдзя, і ўжо ў 1900 годзе выйшаў першы том “Эстонскай энцыкляпэдыі”.

Фактычна, нацыя была створаная. У эстонцаў ніколі не было ні дзяржаўнасьці, ні якіх-небудзь значных гістарычных асобаў у сівой мінуўшчыне. Тым ня менш, нацыянальны праект быў вельмі добра рэалізаваны. Перш-наперш, Крэйцвальдам быў адшуканы эпас “Калевіпоэг”. Хаця гэта не гістарычныя падзеі, а літаральна міталягічныя, гэта вельмі моцна паўплывала на эстонскую сьвядомасьць. Па-другое, ёсьць такая амэрыканская дасьледчыца Лія Грынфэлд, якая лічыць, што ўвогуле ідэя нацыі была створаная толькі аднойчы — у Англіі ў XVI—XVII стагодзьдзях. Англія была самай разьвітай краінай у сьвеце, і ўсе хацелі быць падобнымі да ангельцаў. А гэтае падабенства абавязкова патрабавала стаць такой жа нацыяй, як ангельцы. Менавіта гэтая зайздрасьць паспрыяла пашырэньню нацыяналізму. Вядома, эстонцы не былі ў XIX стагодзьдзі арыентаваныя непасрэдна на Вялікабрытанію, але мелі вельмі добры прыклад Фінляндыі. Для іх гэта быў моцны арыенцір.

Нашая геапалітычная сытуацыя правакуе да стварэньня мітаў таму, што гістарыяграфічныя традыцыі суседзяў заснаваны на мітах. Але ёсьць ужо вельмі добры прыклад украінскай гістарыяграфіі, якая, на мой погляд, да нядаўніх дзён была абсалютна мітатворчай. Адзіная праца Грыцака сьведчыць, што

ёсьць пэўны ўзровень сьпеласьці. Польская і асабліва расейская гістарыяграфіі заснаваныя на мітах, і ад нас яны вымагаюць стварэньня мітаў. Акрамя эстонскага прыкладу, ёсьць цудоўны ўзор латышоў. У іх, як у эстонцаў, ніколі не было сваёй дзяржаўнасьці, гістарычных герояў. Больш за тое, у латышоў не было нават “Калевіпоэгу”! І прыкладна як Ганка ствараў “Кралядворскі рукапіс”, так і некалькі паэтаў стварылі нібыта народны эпас пра героя Лачплесіса. Але ён спрацаваў і працаваў гэтак жа добра, як і “Калевіпоэг”. Так што ёсьць варыянты, калі адзінай падставай для стварэньня моцнага пасьпяховага нацыянальнага праекту служыць толькі культура сялянства.

У. А.: Думаю, сярод прысутных няма тых, хто разумее гістарычныя міты як набор легендаў, як казачкі, што ўздымаюць “нацыянальнае пачуцьцё” і г.д. Нацыянальны міт — гэта шэраг канкрэтных, выразных, ясных адказаў на кардынальныя пытаньні быцьця нацыі. Напрыклад, мелі беларусы дзяржаўнасьць з часоў Полацкага княства альбо атрымалі яе толькі дзякуючы Вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі (як усіх нас вучылі калісьці на гістарычным факультэце)? З такіх канкрэтных адказаў і складаецца тое, што можна ўмоўна назваць нацыянальным мітам.

Вацлаў Арэшка: Мы, праводзячы конкурсы сярод школьнікаў, сутыкаемся з масавай гістарычнай сьвядомасьцю. Гэта дае нам магчымасьць бачыць зрэз таго, што робіцца ў галовах дзяцей і моладзі, як выхоўваецца гістарычнае ўсьведамленьне рэчаіснасьці. Непакоіць працэс апошніх пяці гадоў: у гістарычнай сьвядомасьці беларусаў адбываецца працэс, які я назваў бы “рэсаветызацыяй”. Па працах відаць, што больш і больш вяртаюцца ў творы ўдарнікі працы, будаўнікі сацыялізму, героі-партызаны, прычым у такіх штампах, якія нават нам ужо цяжка згадаць. Дзеці абсалютна сур’ёзна пішуць, як добра жылося будаўнікам МАЗу, як партыя і ўрад клапаціліся пра іх і давалі ім усе магчымасьці… Гэты працэс нарастае, ён падтрымліваецца і праз стварэньне новых падручнікаў. Вельмі важна для нас прарывацца ня толькі ў замежную гістарыяграфію, але і ў беларускую.

А. С.: У абласным інстытуце падвышэньня кваліфікацыі настаўнікаў я ў 1998 годзе праводзіў апытаньні, зьвязаныя

з гістарычнай памяццю і яе аналізам. Прасіў, каб настаўнікі (не гісторыі!) назвалі пяць найбольш важных асобаў беларускай гісторыі. Было больш за 250 анкетаў, і тройка лідэраў выглядала так: Скарына, Каліноўскі, Эўфрасіньня Полацкая. У 2002 годзе я паўтарыў гэтае апытаньне, прычым выйшла так, што настаўнікі былі пераважна маладога веку. І тройка лідэраў амаль не зьмянілася: Скарына, Эўфрасіньня Полацкая, Каліноўскі. Але агулам у сьвядомасьці настаўнікаў у 2002 годзе адраджаюцца савецкія постаці: больш балаў набірае Машэраў і іншыя постаці, пра якіх пэўным часам перасталі нават казаць. Але і ў 1998 годзе, і ў 2002 годзе амаль не прысутнічаюць у пераліку гэтых найбольш значных асобаў беларускай гісторыі дзеячы нацыянальна-культурнага адраджэньня пачатку XX стагодзьдзя. Асабліва тыя, хто займаўся палітыкай.

Я на гэта зьвярнуў увагу не адразу, але неяк размаўляў зь літоўскімі калегамі, распавядаў пра апытаньне і вынікі. Яны зьдзіўлена на мяне паглядзелі: “Калі б мы такое праводзілі, у нас Вілейшыс і дзеячы, якія стваралі літоўскую дзяржаву ў XX стагодзьдзі, занялі б усе першыя пазыцыі”. Пытаюся: “А Вітаўт?” Адказваюць: “Ну, быў бы дзе-небудзь у першай дзясятцы”. Тут выразна відаць праблемы, зьвязаныя зь беларускай дзяржаўнасьцю: Усяслаў Чарадзей прысутнічае, Вітаўт ёсьць, а пачатак XX стагодзьдзя абсалютна выпадае з памяці.

В. Н.: Першае пытаньне, зь якога пачалося нашае абмеркаваньне, і другое, на якое яно пераключылася, — яны выразна асьвятляюць праблему з двух бакоў. Альбо мы, прафэсійныя гісторыкі, сапраўды засяродзімся на пытаньнях унутраных — на адраджэньні нацыянальнай сьвядомасьці, і тут бязь мітаў не абысьціся, як ня раз гучала. Альбо мы будзем дасягаць эўрапейскага ўзроўню. З пункту гледжаньня германскага клясычнага гісторыка, усё, што мы напішам дзеля нашых унутраных патрэбаў, ніколі інакш як “нацыяналізм” ня будзе ўспрымацца. Нам трэба вырашыць: ці мы робім сусьветную гісторыю, ці мы робім сваю нацыю. Што для нас даражэйшае?

У. А.: Гісторыкі могуць працаваць самі на сябе, а грамадзтва пойдзе ў іншы бок.

В. Н.: А калі казаць пра міты, дык я мушу зазначыць: самы

галоўны міт беларускай гістарыяграфіі і нацыянальнага руху — тое, што беларусы ня горшыя за іншых. Калі казаць аб'ектыўна (як гэта абыякава прэпараваў бы немец), трэба прызнаць шчыра: беларусы — горшыя за іншых у многіх пытаньнях! Не кажу, што суцэльна, але — у многіх пытаньнях. Вось тут гучалі прыклады: у такім самым становішчы былі эстонцы, латышы. Дзе яны сёньня, і дзе — мы? Гэта ж таксама прафэсійнаму навукоўцу трэба растлумачыць: чаму? Што перашкодзіла гэтаму танцору? Можа, тут — як у псыхааналізе: загаварыць пра гэта, прызнаць, што ў цябе ёсьць такі комплекс, — і тады можна далей рухацца. Пакуль не прызнаў — разьвіцьця няма. Калі б мы пагадзіліся абмяркоўваць паміж сабой, у чым мы горшыя за іншых, мо гэта б адчыніла дзьверы і дазволіла рухацца наперад? А мы ад сябе хаваем, што ёсьць пэўныя асаблівасьці беларускага мэнталітэту, мітатворчасьці, сьвядомасьці, якія не дазваляюць нам рабіць навуковыя працы на сусьветным узроўні, рабіць палітыку і будаваць дзяржаву на тым самым узроўні. Я ня ведаю, ці можна пра гэта шчыра гаварыць з народам, але паміж сабой — можна.

Дарэчы, яшчэ адно пра савецкі міт. Чаму ён так спрацоўвае? Мы часам зьдзіўляемся: мы прапаноўваем такія прыгожыя міты — няма водгуку. А там таксама міты, але чамусьці ідуць "на ўра". Што, пры Машэраву жыцьцё было добрае?

У. А.: Адказ вельмі просты: тады дзяржава мэтанакіравана, пасьлядоўна займалася ўкараненьнем гэтага міту, а што мы бачым цяпер?..

В. Н.: Тады дзяржава міту пра Машэрава актыўна перашкаджала! Гэта быў не такі й дрэнны міт: ён ствараў уражаньне, што мы — частка вялікай дзяржавы (і дзяржава была ў ліку першых ня толькі па вайсковым патэнцыяле, але і па ўзьдзеяньні на сусьветную палітыку). Тое, што сёньня прапануецца, — адчуць сябе адной з *маленькіх* нацыяў, ня горшай за іншыя *маленькія*, — гэта адназначна пройгрышная сытуацыя! А там мы былі часткай вялікай і моцнай дзяржавы, і самі былі вялікімі і моцнымі! І супраць гэтага змагацца складана.

І. Л.: Трэба ўлічваць і тое, што беларусы як нацыя, гэта значыць як палітычная, а не этнічная супольнасьць, большую частку сваёй гісторыі фармаваліся (і гэтае фармаваньне яшчэ ня скончанае!) ува ўмовах савецкай улады. Савецкая ўлада

ў гэтым сэнсе была адным з нацыятворчых чыньнікаў сучаснай беларускай нацыі. Пра гэта як палеміст і эсэіст даволі добра пісаў Алесь Чобат у “Нашай Ніве”.

У. А.: Я прынцыпова ня згодны з такой пазыцыяй: альбо мы будзем займацца прарывам у эўрапейскую гістарыяграфію, альбо будзем ствараць нацыю. У эўрапейскай культурнай традыцыі ёсьць, да прыкладу, такое паняцьце, як “прафэсарскі раман”. Асабліва гэта ўласьціва для XIX стагодзьдзя. Той самы гісторык калісьці адкладаў убок сваю манаграфію і пісаў прафэсарскі раман пра нейкую падзею, асобу, якую ён вывучаў як дасьледнік, якую ён хацеў паказаць сваім чытачам. Раман выходзіў накладам у дзясяткі тысяч асобнікаў, манаграфія — у сотні асобнікаў. Наш Генадзь Сагановіч піша навуковыя дасьледаваньні і папулярныя кнігі (ягоная “Невядомая вайна” дагэтуль займае высокія месцы ў розных рэйтынгах).

І. Л.: Трэба падзяляць навуковую літаратуру і папулярную, якая, аднак жа, пішацца на падставе таго, што напісалі гісторыкі-навукоўцы. Адно другому не перашкаджае. Праблема з папулярнай гістарычнай літаратурай ёсьць: ня кожны будзе чытаць навуковую манаграфію! Кола чытачоў навуковае літаратуры абмежаванае. У папулярнай жа літаратуры кола чытачоў патэнцыйна неабмежаванае, але ў нас катастрафічны брак такой літаратуры! “Невядомая вайна” — вельмі добры прыклад такой літаратуры, напісанай на саліднай навуковай базе для шырокага чытача. Калі мы хочам прабіцца да шырокай публікі і да дзяцей, трэба ствараць такія творы.

В. Г.: Нашыя акадэмічныя дасьледаваньні ня горшыя за эўрапейскія. Калі мы гаворым пра эўрапейскі ўзровень, гэта трэба разумець як бачаньне нас у Эўропе. А ў тым, што мы пішам для сябе, таксама магчымыя некалькі ўзроўняў, і гэта ёсьць у кожнай краіне. У Савецкім Саюзе гэта было: “История нашей Родины”, 4-я кляса — просьценька расказваецца тое, што хацелі ўкласьці ў галаву; у 7-й клясе на гэта накладзецца нешта іншае. Гэта шырокая гісторыя для люду паспалітага. Могуць быць варыянты гісторыі, якія пішуць літаратары. Але акадэмічная гісторыя ніколі ня будзе супадаць ні з простым варыянтам гісторыі, ні з гісторыяй, якую будуць пісаць літаратары. Гісторыкі павінны сказаць: гісторыя ніколі ня можа быць поўнасьцю напісанай! Гэта толькі адзін

“гісторык” у нас нядаўна сказаў, што “гісторыя Беларусі ўжо напісаная, і зараз трэба выдаваць больш расейскіх работ”. Чым далей будзем дасьледаваць, тым больш будзе праблемаў, будуць зьяўляцца новыя, больш глыбокія працы. Я думаю, што трэба пісаць, а розныя працы будуць па-рознаму запатрабаваныя ў грамадзтве. Некаторыя працы, якія выходзяць тыражом 100—200 экзэмпляраў, ня менш робяць палітыку ў гістарычнай навуцы, чым тыя, што выходзяць тыражом 15 тысяч. Кніга Арлова і Сагановіча працуе на шырокую публіку, але яны пішуць на аснове таго, што мы выдаем гэтымі маленькімі тыражамі.

А. С.: Мне здаецца, што задача гісторыка сёньня ня ў тым, каб тлумачыць, што мы горшыя ці лепшыя за іншых. Трэба тлумачыць свой гістарычны набытак як тое, што стварылі беларусы. Паспрабаваць убачыць, што да ўсяго, што адбывалася (нават палянізацыя і русіфікацыя), непасрэдна дачыняліся беларусы. Нашая гісторыя беларуская не таму, што яна адбывалася ў Беларусі, а таму што гэта мы, беларусы, яе рабілі. Калі мы ўбачым сябе галоўнымі творцамі гісторыі, з гэтага шмат што пойдзе.

В. Н.: Толькі не даказваць, што мы горшыя, а тлумачыць, чаму!

А. С.: Так, і ў выніку гэтага сфармуецца той міт, якога вельмі не хапае: нашая гісторыя і наш сёньняшні дзень — гэта тое, што мы самі ствараем. Бо ёсьць такое агульнае пачуцьцё ў грамадзтве: “А што мы можам? Мы ні пры чым. Гэта нехта іншы нарабіў, прыйдзе нехта іншы і нешта зробіць”. І гісторыя да гэтага, на жаль, таксама спрычынілася: то тыя ваявалі, то гэтыя, то нехта палянізаваў… А мы тут, маўляў, проста жывем!

Вельмі важна, вядома, каб быў эўрапейскі кантэкст. Бо ў гэтым кантэксьце нават міт выглядае па-іншаму.

З. Ш.: Я б хацеў выказацца і ў абарону мітаў, і ў абарону нацыяналізму. Міт можна разглядаць і як своеасаблівую навуковую гіпотэзу. Што дае міт? Ня толькі ўпэўненасьць, што за сьпінай у цябе тысячагодзьдзі, да якіх ты маеш дачыненьне, але і магчымасьць потым разьвенчваць гэтыя міты. Спачатку ствараць, а потым разьвенчваць — гэтым пастаянна падтрымліваецца інтарэс да гісторыі. А ў навуцы — таксама: ствараеш гіпотэзу і маеш стымул для яе пацьвярджэньня альбо разьвенчваньня.

Што тычыцца нацыяналізму, я лічу яго часовым, але непазьбежным этапам, а не асаблівасьцю нашай гістарыяграфіі. Гэты нацыяналізм я тлумачу тым, што, па-першае, нам трэба сьцьвердзіцца ў эўрапейскай гістарыяграфіі. Па-другое, тым, што прафэсійныя нацыянальна арыентаваныя гісторыкі ўвесь час правакуюцца. Калі ўвесь час гавораць, што беларусы нікчэмнасьці, што ў іх нічога не было, гэта адразу выклікае рэакцыю — сьцьвердзіць наадварот. Мы на гэта ўвесь час выдаткоўваем сілы. Па-трэцяе, пашыранасьць нацыянальнай тэматыкі тлумачыцца тым, што пісаць на гэтую тэму лягчэй за ўсё. Можна быць патрыётам, публіцыстам — і гэтага дастаткова, каб лічыць сябе спэцыялістам у нацыянальнай тэме.

Мы хутка пройдзем гэты этап, і нас чакае новы. Мы перастанем захапляцца сабой, ці займацца самабічаваньнем, ці разьбіраць, як мы сябе ўсьведамляем. Мы пярэйдзем да пазытыўнага выкладаньня гісторыі. Будзем пісаць пра тое, як мы працавалі, якое ў нас было прадпрымальніцтва, сацыяльныя пласты… Гэта вечныя гістарычныя тэмы, якія ў нас абсалютна не распрацаваныя, але запатрабаваныя ў Эўропе! Мы можам праводзіць цэлыя дасьледаваньні па гісторыі бульбы, піва, капелюшоў і г.д. Гэта вельмі цікавыя тэмы!

В. Б.: А якія плыні існуюць сёньня ў беларускай гістарыяграфіі? З аднаго боку, ёсьць Якаў Трашчанок, настаўнік А. Лукашэнкі, — гэткая крайнасьць. З другога боку, ёсьць група незалежных гісторыкаў, якая далёка не вычэрпваецца постацямі, сабранымі сёньня тут. І ёсьць беластоцкая група гісторыкаў: Яўген Мірановіч, Алег Латышонак і іншыя — своеасаблівая дыяспара, якая вельмі моцна ўплывае на стан гістарыяграфіі ў мэтраполіі. Ці можна гаварыць, што ўжо цяпер у беларускай гістарыяграфіі сфармаваліся нейкія плыні?

З. Ш.: Я супраць тэрміну “школы” — гэта нейкая партыйнасьць у гістарычнай навуцы. Лепей гаварыць пра традыцыі.

В. Г.: Я зьвяртаў увагу на тое, што адбывалася апошнія 10 гадоў. Калі стала можна пісаць на ўсе тэмы, асновай сапраўднай гістарычнай навукі стаў Інстытут гісторыі Акадэміі навук. Туды пайшлі тыя, хто хацеў займацца гісторыяй. Пісалі так, як давалі інфармацыю крыніцы. А “плынь” пайшла пасьля 1994 году, калі ў беларускую навуку былі “ўкінутыя” былыя дасьледчыкі гісторыі Кампартыі СССР і КПБ, што сталі

займацца гісторыяй Беларусі. Яны амаль усе пачалі пісаць працы “ў піку” таму, што было напісана з нацыянальных, справядлівых пазыцыяў. Вось вядомы зялёны падручнік[1] : чытаеш яго, і ў кожным параграфе бачыш, як аўтар стараецца даказаць, што савецкі падыход хаця б у чымсьці рацыянальны. Вось гэта плынь ідэалягічнага змаганьня супраць навуковасьці! У беластоцкіх жа гісторыкаў менш акадэмічнасьці, менш працы з дакумэнтамі, якія ёсьць тут. Працы, якія выйшлі ў Беластоку, — больш ацэначныя. І ацэнкі пераважна справядлівыя, але не настолькі доказныя, як акадэмічныя працы, якія выходзяць тут.

А. С.: У нас у Горадні ёсьць прадстаўнікі такой плыні, як “заходнерусізм”, прычым у найбольш кансэрватыўным варыянце. Напрыклад, прафэсар Валеры Чарапіца — усе яго працы зыходзяць з ідэяй, што ёсьць трыадзіны рускі народ: велікаросы, маларосы і беларусы. І так трактуюцца многія падзеі беларускай гісторыі.

Чыста гістарыяграфічна можна вылучыць некалькі ўмоўных плыняў: беластоцкая, рэканструкцыя савецкага варыянту, заходнерусізм, нацыянальная… Але калі ацэньваць рэальную вагу кожнай зь іх, іх прадукцыю, дык няцяжка заўважыць: у працах “заходнярусаў” не выконваюцца нават мінімальныя навуковыя патрабаваньні. Няма рэпрэзэнтацыйнасьці крыніцаў: даецца погляд толькі аднаго боку. Ня ўлічваецца гістарыяграфія праблемы…

В. Б.: З. Шыбека згадаў традыцыю, і мне хацелася б разьвіць тэму. Эміграцыйныя гісторыкі лічаць сваю традыцыю навуковай. А тут яна часьцяком нават не разглядаецца. Што дала гістарычная навука на эміграцыі? Ці актуальны ейны даробак сёньня? Характэрна, што Г. Сагановіч у сваім “Нарысе” ў апісаньні беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі XX стагодзьдзя пераходзіць ад Вацлава Ластоўскага адразу да Міколы Ермаловіча. Яна Станкевіча, гістарычныя творы якога налічваюць больш як 800 старонак і чыя “Крыўя-Беларусь у мінуласьці” свайго часу выдавалася накладам у 10000 асобнікаў, для яго не існуе. Я магу назваць таго Акіншэвіча, Урбана, Тумаша, Запрудніка… Але хто зь іх тут запатрабаваны? Якія трактоўкі былі прынятыя, якія — не?

І. Л.: Большасьць зь іх вельмі цяжка ахарактарызаваць

як акадэмічных дасьледчыкаў. Апрача Акіншэвіча і Запрудніка, якія былі прафэсійнымі гісторыкамі, астатнія пераважна былі папулярызатарамі гісторыі. Сур'ёзна разглядаць эміграцыйную гістарыяграфію на акадэмічным узроўні даволі цяжка. Што да Тумаша, дык ён некаторыя рэчы знайшоў і апублікаваў раней, чым іншыя. Праца Я. Станкевіча можа разглядацца ў якасьці прапагандысцкай, папулярызатарскай літаратуры.

В. Б.: Але праца Я. Станкевіча нічым ня горшая за працы В. Ластоўскага. Пры гэтым Я. Станкевіч застаецца "фігурай замоўчваньня", а В. Ластоўскі ператвараецца ў "будзіцеля нацыянальнага духу". Альбо, напрыклад, Мікола Ермаловіч, які як гісторык шмат у чым нагадвае Я. Станкевіча… Калі ўчытацца ўважліва ў працы М. Ермаловіча, дык можа скласьціся ўражаньне, што ён уважліва пачытваў Я. Станкевіча. Пэўныя трактоўкі і падыходы надзіва супадаюць.

І. Л.: Ніхто ня можа назваць акадэмічным гісторыкам ані В. Ластоўскага, ані М. Ермаловіча. Гэта людзі, якіх можна клясыфікаваць як папулярызатараў. Вось У. Арлоў — таксама прадстаўнік такой плыні, яго можна ўпісаць поруч з В. Ластоўскім, Я. Станкевічам, М. Ермаловічам і інш.

В. Г.: Гістарыяграфія — гэта працы прафэсійных гісторыкаў, напісаныя на аснове аналізу крыніцаў і спэцыяльнай навуковай літаратуры. А ўсё астатняе — тое, што зыходзіць з гэтага. Трэба падзяляць: праца, напісаная на навуковай аснове, і варыяцыя (магло, маўляў, быць так ці так) — гэта розныя рэчы.

В. Б.: А з каго пачыналася беларуская гістарыяграфія? Відавочна, што ні В. Ластоўскі, ні дасьледчыкі ягонага ўзроўню ня могуць прэтэндаваць на гэта.

І. Л.: З М. Доўнар-Запольскага і У. Ігнатоўскага.

В. Н.: Але ў Ігнатоўскага "Нарыс гісторыі Беларусі" — гэта зусім іншы ўзровень, да эўрапейскай працы ён не дацягвае. Ён не напісаны на аснове крыніцаў.

У нас шмат не дасьледавана. У Інстытуце гісторыі вяліся працы па эканамічнай гісторыі. А хто з вас назаве працу па сацыяльнай гісторыі, якая б цягнула на гістарыяграфію?..

З. Ш.: Усе кніжкі па беларускай гісторыі ёсьць набыткам беларускай гістарыяграфіі. Напрыклад, гісторыі, напісаныя ў замежжы, — неад'емная частка беларускай гістарыяграфіі, бо яны грунтуюцца на арыгінальных крыніцах, невядомых у нас: мэмуарах і сямейных архівах. Калі да гэтых крыніцаў

дабавіць агульнадаступныя гістарычныя дасьледаваньні, дык атрымаецца выданьне, якое мае навуковую каштоўнасьць.
В. Г.: Але мы прыйшлі да кансэнсусу: гістарыяграфія — любая праца, любая ідэя, заснаваная на факце. Ня проста фантазія (тое, што хацелася б), а тое, што заснавана на гістарычным факце.
П. Ц.: Адна заўвага наконт таго, што “беларусы горшыя”. Ці на шчасьце, ці на жаль, але “горшых” шмат. Мне давялося сваім часам прысутнічаць у Цэнтральнаэўрапейскім унівэрсытэце на лекцыі, прысьвечанай такому фэномэну, як стыгматызацыя, на прыкладзе народаў Балканаў. Там такіх прыкладаў шмат. “Вось мы румыны. Мы невядома адкуль узяліся. Мы праваслаўныя, жывем на Балканах, мы горшыя за ўсіх”. “Мы баўгары, мы сапсаваныя туркамі. Мы жывем на Балканах, мы праваслаўныя. У нас ніколі не было шчасьця і ніколі ня будзе”. Тое самае пісалі сэрбы, харваты, славенцы, альбанцы, македонцы… Думаю, і немцы ў XVIII стагодзьдзі, калі параўноўвалі сябе з моцнай Вялікабрытаніяй ці Францыяй, задумваліся: “Чаму мы разьяднаныя? Значыць, мы горшыя за іх”.
Гэта пэўны момант разгубленасьці. Ён сёньня прысутнічае ўва ўсёй размове: дзяржава не клапоціцца пра нас і г.д. З вынікаў маіх дасьледаваньняў, якія закранаюць гісторыю нацыянальнага руху, вынікае: нацыянальны рух — заўсёды маргінальная зьява. Ён рэальна бывае запатрабаваны толькі падчас крызысу.
Возьмем для прыкладу народы Прыбалтыкі. Добра вядома, што літоўскія сяляне ў час, калі ўжо існаваў нацыянальны рух, саромеліся гаварыць па-літоўску і ў грамадзе стараліся гаварыць па-польску ці па-нямецку. Яны не хацелі чытаць часопіс “Аўшра”, а некаторыя ксяндзы яго палілі. Гэта пэўны момант у разьвіцьці. З гэтага пункту і трэба разглядаць: гэта разьвіцьцё, гэта гісторыя, так шмат у каго было.
Наконт савецкага міту. Чаму ён вельмі жывучы? Тут згадвалася, што шмат у чым беларуская нацыя сфармавалася пад уплывам савецкай ідэалёгіі, у савецкі час і г.д. Сапраўды, супольнасьцю беларусы пачалі сябе адчуваць толькі ў 20-я гады XX стагодзьдзя. Калі мы параўноўваем другую сусьветную вайну і тую, пра якую піша Г. Сагановіч, тая вайна не захавалася ў памяці, бо яна перажывалася кожнай вёскай

асобна. А гэтая вайна была перажытая беларусамі як нечым супольным. Таму гэты міт вельмі моцны і жывучы. І міт Машэрава вельмі моцны, бо сапраўдная мадэрнізацыя ў Беларусі адбылася пры Мазураву і Машэраву. З чым яе можна параўнаць? З пункту гледжаньня сацыяльнай трансфармацыі, яна, бадай што, наймацнейшая. Тады большасьць насельніцтва зь вёскі перасялілася ў горад.
Асноўная хіба гісторыкаў, зацікаўленых нацыянальнай гісторыяй, у тым, што ўсе мы збольшага арыентаваныя на вывучэньне чагосьці апрыёрна цікавага: гісторыі ВКЛ, канцлераў, паўстаньняў. А самае актуальнае сёньня — гісторыя XX стагодзьдзя, самая навейшая гісторыя. Манаграфія Тацяны Процькі — прыклад таго, як гэта трэба рабіць. А яшчэ патрэбная сапраўдная гісторыя другой сусьветнай вайны — тое, што пачала рабіць “Белорусская газета”, калі прапаноўвала розныя пункты гледжаньня на партызанскую вайну. Абсалютна “белай плямай” мне падаецца ў нас гісторыя другой паловы XX стагодзьдзя, калі беларусы фактычна ўпершыню сталі кіраваць Беларусяй. Як бы мы ні ставіліся да Мазурава і Машэрава, гэта першыя беларусы, якія сталі на чале дзяржавы. Гэта яшчэ не асэнсавана.

А. Д.: Ці нясе рэанімацыя савецкіх мітаў небясьпеку для нацыятворчага працэсу? Відавочна, што яна не спрыяе дэмакратызацыі беларускага грамадзтва ці аслабленьню аўтарытарызму. Але што наконт нацыятворчага працэсу?
У. А.: Паколькі ў нашай усходняй суседкі сёньня на ўзбраеньні зьяўляюцца імпэрскія міты, дык рэанімацыя савецкіх мітаў у нашай краіне зьяўляецца небясьпечнай.
І. Л.: У нас рэанімацыя савецкіх мітаў адбываецца якраз у сутыкненьні з расейскай ідэалёгіяй. У Расеі адбываецца вяртаньне ў “да 17-га году”, а ў нас Лукашэнка супрацьстаўляе гэтаму вяртаньне ў савецкае мінулае.
У. А.: Тут яны сэгмэнтарна накладаюцца: “Мы адзіны народ” etc.
В. Г.: Гэта ж робіцца не на ўзроўні гісторыі, а на ўзроўні палітыкі для падрыхтоўкі так званага Саюзу!..
Аляксей Хадыка: Я хачу вярнуцца да тэмы, абвешчанай на самым пачатку. Сабраліся беларусісты: гісторыкі, культуролягі, этнолягі і г.д. і пачалі гаварыць: як нам зрабіць

так, каб голас беларускай гістарыяграфіі быў пачуты ў эўрапейскім кантэксьце? Для гэтага трэба вырашыць некалькі праблемаў. Трэба: а) цікава пісаць і б) цікава перакладацца. Чаму чытаюць Алексіевіч і чаму ў Быкава ўзьнікаюць праблемы з намінацыяй на Нобэлеўскую прэмію? Бо яго горш перакладалі.

Па-за межамі мітатворчасьці ёсьць цікавыя тэмы, якія могуць быць актуальнымі для эўрапейскай супольнасьці. Безумоўна, гэта праблема фармаваньня нацыі (бо ёсьць яшчэ недзяржаўныя нацыі ў сьвеце), праблема этнічных і канфэсійных канфліктаў, якая сёньня надзвычай актуальная. Вядучая школа амэрыканскага мастацтвазнаўства — Прынстанскі ўнівэрсытэт — паступова перасоўвае свае інтарэсы ад дасьледаваньня чэскага Адраджэньня і барока да працэсаў, што адбываліся на пачатку Новага часу ў культуры шматканфэсійных шматнацыянальных краінаў — на Балканах, ва Ўкраіне, Беларусі. А гэта цікавы час і для нас: у наш "залаты век" быў прыклад пераадоленьня рэлігійных і этнічных канфліктаў.

І. Л.: Што да гісторыі, якая была б цікавай на Захадзе, дык чамусьці ніхто ня кажа пра нашую супэрнайноўшую гісторыю — з 1991 году. На Захадзе зь вялікай цікавасьцю ўспрынялі б і зрабілі б адразу некалькі перакладаў, калі б хтосьці напісаў біяграфію Лукашэнкі. Тое самае датычыць усёй гісторыі пасьля 1991 году, бо Беларусь відочна выбіваецца з агульнага працэсу трансфармацыі постсавецкіх краінаў і на Захадзе было б цікава даведацца — чаму.

А. Х.: Я ў 1997 годзе ў Новым Арлеане чытаў лекцыю на тэму сучаснай гісторыі Беларусі. І аказалася, што ў аўдыторыі з 13 чалавек, якія вывучалі сучасную гісторыю, 2 чалавекі цудоўна арыентаваліся! І гэта не найлепшы ўнівэрсытэт.

В. Н.: А калі я ў славяназнаўчым цэнтры Хакайдзкага ўнівэрсытэту зрабіў невялічкі даклад пра магчымыя падставы сучаснай палітычнай сытуацыі ў Беларусі, адразу была вялізная цікавасьць і прапановы перакласьці матэрыял. Калі Алег Бухавец напісаў артыкул пра выключнасьць адносінаў да габрэяў у Беларусі падчас другой сусьветнай вайны, гэта адразу выйшла ў "Socialogical Research" у перакладзе на ангельскую мову. І гэта таксама пэрспэктыўны кірунак, бо стаўленьне да габрэяў у Беларусі сапраўды ўнікальнае.

У тых самых літоўцаў і эстонцаў усіх габрэяў панішчылі ў 1941 годзе, і насельніцтва пляскала ў далоні, а ў Беларусі цягнулі да 1943 году. Бо нэгатыўнай была рэакцыя насельніцтва на вынішчэньне габрэяў!

А. Д.: Шмат сёньня гаварылася, што нам няма як разьлічваць на дзяржаўныя інвэстыцыі. Але ж цяперашняя дзяржава штогод істотна павялічвае бюджэтныя расходы на навуку і адукацыю…

В. Н.: Фінансаваньне Інстытуту гісторыі на мінулы год было жорстка парэзанае, а на гэты год — парэзалі і “парэзанае” мінулагодняе. У Інстытуце гісторыі вядзецца размова пра 30-працэнтнае скарачэньне штатаў.

В. Г.: Цяперашні палітычны рэжым можа падтрымаць гістарычную навуку толькі ў пляне абслугоўваньня сваіх інтарэсаў.

У. А.: Мне здаецца, што на ўзроўні пэўных структураў існуе разуменьне таго, што нацыянальны рэсурс не задзейнічаны ў іхных інтарэсах. Але выразнай тэндэнцыі тут не назіраецца.

В. Б.: Галоўная выснова, якую я зрабіў падчас сёньняшняй размовы, — што на дзяржаву бессэнсоўна абапірацца для разьвіцьця нацыянальнай гістарыяграфіі. Калі мы станем мацнейшымі, больш разгалінаванымі ў сваіх дасьледаваньнях, калі беларуская гістарыяграфія дасягне поліфаніі (будуць і акадэмічныя, і навукова-папулярныя кнігі), калі яна стане фактарам унутранай грамадзка-палітычнай сытуацыі, дык беларуская дзяржава ніколі ня зможа ігнараваць гэта дзеля сваёй стабільнасьці. Трэба мэтаскіравана дасягаць той крытычнай сытуацыі, калі гэткае ігнараваньне станецца палітычна праблемным.

Занатаваў Зьміцер Дзядзенка

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2003/04/26
[image]

Андрэй Катлярчук

Чаму беларусы не апанавалі літоўскай спадчыны

АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК (нар. 1968 у Новачаркаску) — гісторык. Выкладае ўва ўнівэрсытэце Паўднёвага Стакгольму. Апошняя публікацыя — кніга “Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў” (Менск, 2002).

Timothy Snyder. The Reconstruction of Nations. Poland, Ukraine, Lithuania, Belarus 1569—1999. — Yale University, 2003. — 367 p.

Сёлета ў ЗША выйшла манаграфія выкладчыка польскай і ўсходнеэўрапейскай гісторыі Ельскага ўнівэрсытэту Цімаці Снайдэра “Адбудова нацый. Польшча, Украіна, Летува, Беларусь”. Нягледзячы на сваю маладосьць (год нараджэньня — 1962), Цімаці Снайдэр досыць вядомы дасьледнік гісторыі нашай часткі Эўропы. Ягоная першая праца “Nationalism, marxism, and modern Central Europe: a biography of Kazimierz Kelles-Krauz, 1872—1905” (1997, Украінскі дасьледчы інстытут Гарвардзкага ўнівэрсытэту) атрымала прэмію Оскара Халецкага, што прысуджаецца за найлепшыя дасьледаваньні ўсходнеэўрапейскай гісторыі.

Другая работа Снайдэра мае ўсе шанцы стаць навуковым бэстсэлерам. Не шукаючы простых адказаў на складаныя

пытаньні, аўтар паспрабаваў паглядзець на драматычныя, часам брутальныя факты гісторыі нацыянальных рухаў народаў былой Рэчы Паспалітай з пункту гледжаньня нэўтральнага навукоўца, не заангажаванага ў нацыяналістычную летувіскую ці беларускую, польскую ці ўкраінскую гістарыяграфію. Кніга чытаецца як прафэсійны й адначасова дэтэктыўна цікавы твор. Складаецца яна з трох частак, прысьвечаных адпаведна Вялікаму Княству Літоўскаму (Летуве й Беларусі), Украіне й Польшчы.

У гэтым артыкуле гаворка пойдзе толькі пра беларуска-летувіскую частку працы (сс. 13—102). Ужо ейная назва "Спрэчкі за летувіска-беларускую Айчыну" робіць сэнсацыю, бо амаль упершыню (калі не лічыць англамоўных працаў нашых эмігрантаў) у сучасны заходні дыскурс гісторыі Літвы ўводзіцца, як паўнапраўная ўдзельніца, Беларусь. Падразьдзел мае наступны зьмест:

— Вялікае Княства Літоўскае (1569—1863);
— Літва! Мая айчына (1863—1914);
— Першая сусьветная вайна і пытаньне Вільні (1914—1939);
— Другая сусьветная вайна і пытаньне Вільнюсу;
— Эпілёг: савецкі летувіскі Вільнюс (1945—1991).

Пачынаецца тэкст з славутых радкоў Адама Міцкевіча "Літва! Мая Айчына, ты як здароўе…", ад якіх адштурхоўваюцца аўтарскія развагі пра лёс ВКЛ. Ужо першы сказ задае плянку дыскусіі: *"Калісьці Вялікае Княства Літоўскае дамінавала на ўсходзе Эўропы. З 1991 году Літоўская Рэспубліка — гэта маленькая краіна на ўзьбярэжжы Балтыйскага мора. Вільня, былая сталіца ВКЛ, сёньня сталіца сучаснай Рэспублікі. Паўтысячагодзьдзя перад 1991 годам летувіская мова не была ані моваю віленскіх уладаў, ані моваю віленскіх вуліц. Да другой сусьветнай вайны гутарковай мовай трэцяй часткі віленскіх дамоў была жыдоўская; моваю вуліц, касьцёлаў і школ была польская; моваю навакольля была беларуская. У 1939 амаль ніхто ў Вільні не гаварыў па-летувіску"* (с. 15).

Аўтар задаецца пытаньнем: як адбыліся гэткія вялізныя перамены, як сталася, што сёньня ВКЛ асацыюецца на Захадзе выключна з сучаснай Летувой? Каб адказаць на гэтае пытаньне, ён пачынае з тлумачэньня, што Вялікае Княства Літоўскае й Рускае заўсёды было дзяржаваю дзьвюх элітаў, балцкай і

ўсходнеславянскай. Пра гэта сьведчыць тытулятура гаспадароў ВКЛ як “вялікіх князёў літоўскіх і рускіх”. Пад літоўскімі (Litvanorum) і русінскімі (Ruthenirum) меліся на ўвазе перадусім палітычныя эліты, баяры, а не шматэтнічныя месты ці вёска. Кажучы пра колькасную перавагу ўсходнеславянскай эліты, Снайдэр зазначае, што нават перад Крэўскай уніяй 1385 году ў рэлігійным і моўным сэнсах Літва была больш праваслаўнай, славянскай, чымся паганскай балцкай дзяржавай. Цэнтар праваслаўя перамясьціўся з Кіева ў Вільню (с. 17). Менавіта таму Ягайла вагаўся паміж праваслаўем і каталіцтвам. Ёсьць зьвесткі, што ў 1382 годзе Ягайла меўся ажаніцца з дачкой Дзьмітрыя Данскога ды прыняць праваслаўе. Ад такога пляну ён адмовіўся зь дзьвюх прычынаў. Першае — праваслаўе не абараніла б Літвы ад Ордэну. Па-другое, гэты крок азначаў бы канчатковае дамінаваньне славянскай эліты ў ВКЛ, што магло выклікаць грамадзянскую вайну (с. 18). Тым ня менш, пасьля пэрсанальнай уніі Літвы й Польшчы ўрад карыстаўся трыма мовамі: супольнай лацінскай, польскай у Польшчы ды, згодна з вызначэньнем Снайдэра, блізкай да беларускай “афіцыйнай славянскаю мовай” (Chancellery Slavonic) у ВКЛ. Апошні вялікі князь, які ведаў балцкую мову, Казімер, памёр у год, калі Калюмб адкрыў Амэрыку (с. 32). У дачыненьнях з элітай ВКЛ Казімер, апошні балцкамоўны гаспадар літоўскі, карыстаўся старабеларускай мовай. Гэтая мова стала мовай права і адміністрацыі. Гэта значыць, выбар прыйшоўся на мову, зразумелую ўсёй палітычнай нацыі Літвы. У часы гаспадарства Казімера ў Рэчы Паспалітай былі надрукаваныя першыя кнігі, але не па-летувіску, а на польскай ды царкоўнаславянскіх мовах. Першадрукар Літвы Францішак Скарына друкаваў кніжкі беларускім варыянтам царкоўнаславянскай мовы. Літаратура ВКЛ таксама да XVI стагодзьдзя стваралася выключна на “рускай” мове. Гэтая мова была гутарковаю мовай шляхты й жыдоў ВКЛ, моваю Статутаў ВКЛ і моваю палітычнага жыцьця дзяржавы. Яна адрозьнівалася ад расейскай актавай мовы Маскоўшчыны, “маскоўскай” з пункту гледжаньня ліцьвінаў. Маскоўская эліта называла дзяржаўную мову ВКЛ “літоўскай” альбо “беларускай” ды перакладала беларускія тэксты (с. 19).

Такім чынам, згодна з высновамі Снайдэра, у палітычных

структурах ВКЛ дамінавала ўсходнеславянская (протабеларуская) этнічная група, што ў пэрспэктыве стварала добрыя шанцы для беларускага нацыяналізму адаптаваць спадчыну ВКЛ у Новы час. Але гэтага не адбылося.
Пасьля Люблінскай уніі 1569 году руская эліта ВКЛ, паводле Снайдэра, хутка палянізавалася (с. 20—25). З таго часу шляхціц ВКЛ натуральна мог быць “ліцьвінам” па паходжаньні, “палякам” па палітычнай сьведамасьці й “русінам” па канфэсіі (с. 24). Менавіта ў такім асяродзьдзі праз тры гады па сконе Рэчы Паспалітай нарадзіўся самы славуты ў сьвеце ліцьвін Адам Міцкевіч. Снайдэр заўважае, што толькі паўсталы ў другой палове XIX стагодзьдзя нацыяналізм стварыў парадокс, калі адзін паэт пачаў лічыцца геніем трох розных народаў. Палякі зрабілі Міцкевіча сымбалем Польшчы. Летувісы трансфармавалі Міцкевіча ў нацыянальнага паэта Літвы. Між тым, на думку Снайдэра, Міцкевіч, які меў праваслаўныя і жыдоўскія карані, паводле сучаснай дэфініцыі *“ня быў ні польскім, ні летувіскім, але беларускім паэтам”* (с. 29).
Ён нарадзіўся і стварыў свайго “Пана Тадэвуша” на ўсходнеславянскай зямлі ВКЛ, сярод сялянаў, якіх сёньня ўвесь сьвет ведае як беларусаў (с. 29). Згодна з сучаснай лёгікай Міцкевіч ёсьць прадстаўніком даміноўнай этнічнай групы былога ВКЛ — беларусаў, а ня польскамоўнай шляхты ці балцкай меншасьці, таму ён беларускі паэт. Менавіта так вырашаюцца гэтыя пытаньні ў сучасным сьвеце. Але гэта цяпер.
Снайдэр падкрэсьлівае, што для часоў Міцкевіча быць ліцьвінам значыла натуральна ўспрымаць як цэлае часткі адной мясцовай традыцыі — польскую, беларускую й летувіскую. Напрыклад, паўстанец 1863 году Якуб Гейштар (1827—1897), што лічыў сябе палякам, заснаваў прыватную летувіскую школу для сялянаў. Ён ня бачыў у гэтым ніякай супярэчнасьці. Кастусь Каліноўскі і Антанас Мацкявічус, якія ў сучаснай Беларусі й Летуве лічацца бацькамі адпаведна беларускага і летувіскага нацыяналізму, карысталіся польскай мовай і бачылі будучыню толькі ў адбудове фэдэрацыі ВКЛ і Польшчы (с. 30). Роднай мовай аднаго з самых вядомых у сьвеце летувісаў Мікалаюса Чурлёніса была польская, летувіскай мове ён навучыўся ў сталым веку ад сваёй жонкі (с. 100). Толькі працэс крышталізацыі польскага, беларускага й летувіскага рухаў паставіў перад мясцовай элітай пры

канцы XIX — на пачатку XX стагодзьдзяў праблему выбару й самаідэнтыфікацыі. Агульнавядомы прыклад братоў Іваноўскіх, адзін зь якіх стаўся лідэрам беларускіх нацыяналістаў, другі — летувіскім прафэсарам, урэшце, трэці — польскім палітыкам. Снайдэр дадае іншы прыклад — ліцьвінскую шляхецкую сям'ю Нарутовічаў. Адзін сын, Габрыэль, стаўся першым прэзыдэнтам Польшчы, другі, Станіслявас, — сябрам "Тарыбы", першага кіраўнічага органу незалежнай Літвы (с. 70).
У другой частцы, *"Літва, мая Айчына (1863—1914)"*, Снайдэр аналізуе тое, якім чынам спадчыну ВКЛ адаптавалі сучасныя летувіскі, беларускі рухі, польскія краёўцы ды расейскія палітычныя колы. Першым разглядаецца летувіскі нацыянальны рух. Снайдэр піша, што росквіту летувіскага руху па 1863 годзе паспрыяла палітыка расейскіх уладаў. Пасьля паўстаньня 1863 году расейскія аналітыкі вырашылі ў супрацьвагу моцнаму польскаму руху падтрымаць летувіскі нацыяналізм. У выніку дзяржаўная расейская вышэйшая вучэльня ў летувіскім Марыямпалі стала кузьняй летувіскай эліты. Мову балцкіх сялянаў царскія ўлады зрабілі ў гэтай вышэйшай вучэльні мовай навучаньня.

Летувіская гістарычная і мастацкая літаратура ідэалізавалі ВКЛ да 1569 году і трактавалі яго гісторыю пасьля Люблінскай уніі з выразным антыпольскім ухілам. Для летувісаў гэтая унія сталася сымбалем нацыянальнай катастрофы накшталт бітвы ля Белай Гары для чэхаў. Выпускнікамі вучэльні ў Марыямпалі былі "бацькі" летувіскага руху канца XIX — пачатку XX стагодзьдзя Ёнас Басанавічус (пазьней выпускнік Маскоўскага ўнівэрсытэту) ды Вінцас Кудзірка (с. 36—38). Абодва дзеячы ігнаравалі складаную ў сэнсе этнічнай дэфініцыі гісторыю ВКЛ раньняга Новагу часу і канцэнтраваліся на, як здавалася, зразумелым і слаўным балцкім Сярэднявеччы (с. 39). Заўважым, што летувіская гістарыяграфія дагэтуль хварэе на гэтыя хібы. У выніку летувісы з згоды расейскіх уладаў выбудавалі міт ВКЛ як этнічна "літоўскай" дзяржавы. Гэты міт зрабіўся фундамэнтам, на якім летувіскія дзеячы пачалі адбудову новай летувіскамоўнай Літвы. Каб аддаліць летувіскі альфабэт ад польскага, за аснову правапісу быў узяты чэскі варыянт.
На працягу трох стагодзьдзяў шляхта ВКЛ існавала ў сьвеце

польскай мовы і культуры. Таму ліцьвіны — шляхта польскай культуры — досыць варожа паставіліся да плебэйскага летувіскага руху, на чале якога стаялі ксяндзы сялянскага паходжаньня ды дзеці свабоднага заможнага сялянства, хутаранаў (у сэрцы летувіскага руху, на Сувальшчыне, прыгон быў скасаваны на пачатку XIX стагодзьдзя). Іншым было стаўленьне да беларускага руху. Тая самая польскамоўная шляхта брала масавы ўдзел у стварэньні беларускага руху, разглядаючы яго як частку агульнапольскага. Тутэйшыя польскамоўныя магнаты-“краёўцы” падтрымлівалі беларускіх актывістаў. У сваю чаргу, беларускія дзеячы мелі сымпатыі да ідэі адбудовы Польска-Літоўскай фэдэрацыі.
Як падкрэсьлівае Снайдэр, “бацька” новай польскай Рэспублікі Юзаф Пілсудзкі нарадзіўся ў шляхецкай (дадамо: і лютэранскай) сям’і на тэрыторыі былога ВКЛ, быў і лічыў сябе ліцьвінам, гаворачы па-польску ўдома, па-беларуску на двары й па-расейску ў сібірскай ссылцы (с. 41). Ліцьвінам быў “бацька” Сярэдняй Літвы генэрал Люцыян Жалігоўскі — зь летувіскага пункту гледжаньня “акупант”. Жалігоўскі таксама ўмеў гаварыць па-польску, па-беларуску ды па-расейску, бо меў жонку-расейку й быў афіцэрам царскага войска (с. 64). Як Пілсудзкі, так і Жалігоўскі не гаварылі па-летувіску, ня ведалі летувіскай ці жмудзкай культуры, але іх родным домам была Літва. Будучыню адноўленага ВКЛ яны бачылі толькі ў фэдэрацыі мультыкультурнай Літвы з Польшчай.
Адначасова зь летувіскім рухам зарадзіўся нацыяналізм беларускі. Снайдэр падкрэсьлівае, што, як даміноўная этнічная група на землях былога ВКЛ, беларусы мелі ўсе шанцы перамагчы ў барацьбе за літоўскую спадчыну (с. 42). Ён дадае, што “этнічная група” беларускамоўных сялянаў колішняй Літвы была ў дзесяць разоў большай за яе балцкамоўных суседзяў. Першыя беларускія пісьменьнікі-ліцьвіны Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і Ян Чачот пачалі працу ў слушным кірунку. Дунін-Марцінкевіч пераклаў і надрукаваў па-беларуску культавую кнігу ліцьвінаў — “Пана Тадэвуша” (тое самае зрабілі летувісы). Чачот стварыў нізку рамантычных балядаў з гісторыі ВКЛ, сабраў ды надрукаваў багаты беларускі фальклёр, працаваў над граматыкай мовы. Камплімэнты на адрас гаворкі беларусаў выказаў ягоны сябра Адам Міцкевіч. Такім чынам, першыя актывісты хацелі адаптаваць

спадчыну ВКЛ пад патрэбы новага беларускага руху. Ліцьвінам, шляхціцам паводле паходжаньня, быў “бацька” беларускай гістарыяграфіі, найбуйнейшы знаўца ВКЛ прафэсар Мітрафан Доўнар-Запольскі. З падвіленскай каталіцкай ліцьвінскай сям’і паходзіў “бацька” беларускай граматыкі Браніслаў Тарашкевіч (с. 66). З карэнных віленчукоў быў “бацька” беларускай драматургіі Францішак Аляхновіч. Тым ня менш, летувіскі нацыянальны рух здолеў ператварыць сялянскую масу ў нацыю, а беларускі — не.

Нягледзячы на поўнае гістарычнае права, сучасныя беларускія дзеячы гэтак і ня здолелі адаптаваць літоўскай спадчыны і такім чынам крышталізаваць этнічную беларускамоўную большасьць Літвы ў сучасную нацыю. Чаму так адбылося? Адказ аўтара на гэтае пытаньне, на маю думку, ёсьць найцікавейшым месцам кніжкі (сс. 44—49). Першае — гэта сацыяльнае паходжаньне “абуджальнікаў нацыі”. Тут летувісы мелі значную перавагу над беларусамі. Першае пакаленьне летувіскай інтэлігенцыі складалі дзеці заможных сялянаў — настаўнікі і ксяндзы. Гэтай сацыяльнай групе вельмі лёгка было пабудаваць з нуля новую монаэтнічнаю інтэрпрэтацыю гісторыі Літвы, у якой беларусам і палякам месца не было, заняць выразна антыпольскую пазыцыю. Першае пакаленьне беларускіх дзеячоў складалася з шляхціцаў і шляхцянак — простых нашчадкаў гістарычнай Літвы. Яны былі часткаю гэтай векавечнай шматкультурнай (беларуска-польска-летувіска-жамойцка-жыдоўска-татарскай) традыцыі, што не дазволіла ім вызначыць асобны беларускі шлях. Ідэя монаэтнічнай беларускай Літвы іх ня вабіла, бо была для іх відавочнаю хлусьнёй (с. 46).

Важным чыньнікам стаўся моўны фактар. Беларуская мова як славянская даволі блізкая да польскай і расейскай. Таму нават трохі адукаваны беларус заўсёды мог задаволіцца польскім ці расейскім тэкстам. Гэта моцна звужала рынак беларускага друку. Летувіская мова, наадварот, вельмі розьніцца ад славянскіх. Такім чынам, філялягічны факт вырашыў лёс нацыі. Да таго ж, пасьля паўстаньня 1863 году царскі ўрад заахвочваў летувіскую асьвету і друк (хай сабе й кірылічны), тады як беларуская мова ў той самы час апынулася пад забаронай. Калі летувісы мелі нацыянальны касьцёл, касьцельны друк і адукацыю, беларусы па зьнішчэньні ў 1839 годзе ўніяцкай

царквы згубілі сваю канфэсійную нішу. Снайдэр адзначае, што гэтую, на пачатку XIX стагодзьдзя ўжо моцна спалянізаваную царкву ня трэба ідэалізаваць. Тым ня менш, ува ўмовах існаваньня паміж расейскім і польскім уплывамі менавіта ўніяцкая царква фармальна мусіла выканаць ролю фундамэнту нацыятварэньня.

Нарэшце, калі ў летувісаў была база для разгортваньня свайго руху — пруская “малая Летува”, дзе ў спрыяльных для разьвіцьця ўласнай культуры ўмовах пражывала каля 100000 балтаў, усе беларусы цалкам апынуліся ў межах Расейскай імпэрыі. Гэта пазбавіла іх вялікіх магчымасьцяў кантакту з Эўропай, падтрымкі з боку заўсёды больш нацыяналістычнай заходняй дыяспары, распаўсюджваньня ведаў пра свае нацыянальныя патрэбы ў сьвеце, зацікаўленасьці ў разыгранцы беларускай карты з боку іншых дзяржаваў. Дадамо, што менавіта нямецкі (прускі) фактар быў вырашальны ў справе дасягненьня Летувой незалежнасьці ў 1918 годзе, вырваў краіну з сфэры расейскага ўплыву. Вось жа, такія фактары, як сацыяльнае паходжаньне нацыянальных дзеячоў, характар мовы й геаграфічная лякалізацыя, вызначылі, на думку Снайдэра, посьпех летувіскага й няўдачу беларускага старту (с. 47).
Апошні артыкул другой часткі прысьвечаны спробе расейскіх палітыкаў таксама адаптаваць спадчыну ВКЛ. Гуляючы на гістарычнай ролі “рускай” праваслаўнай шляхты ВКЛ, расейскія палітыкі пачалі адбудову міту пра Літву як “другую Заходную Русь” ці “Белую Расею”. Цікава, што Снайдэр адзначае: галоўным правадніком гэтай ідэі была ліцьвінская шляхта праваслаўнага паходжаньня, якая праз “рэправаславізацыю” нібыта павярталася да сваіх каранёў. Ліцьвінамі былі найбуйнейшыя пасьля Мураўёва-Вешальніка русіфікатары краю — віленскі генэрал-губэрнатар князь Пётра Сьвятаполк-Мірскі і варшаўскі генэрал-губэрнатар генэрал Язэп Гурко. Пагодзімся з аўтарам. Сапраўды, далёкі продак губэрнатара Пятра Мірскага стражнік літоўскі Рыгор Мірскі быў адным з апошніх праваслаўных магнатаў Літвы, заўзятым сэпаратыстам, адным з арганізатараў антыпольскай Кейданскай уніі ВКЛ з Швэцыяй 1655 году. Ягоны нашчадак Пётра Мірскі, праваслаўны ліцьвін і адначасова расейскі

губэрнатар, лепей за расейцаў ведаў гісторыю й становішча краю. Ён даводзіў расейскаму ўраду, што беларусы-каталікі ня ёсьць палякамі, што трэба дазволіць летувісам друк лацінкай. Гэта ня значыць, што Мірскі падтрымліваў беларускі ці летувіскі рух, зусім не. Для яго гэта была барацьба перадусім з палянафільскай элітай. Ён проста ня бачыў самастойнае будучыні Літвы па-за межамі расейскага (альбо, як ягоныя браты-шляхта, “краёўцы”, — польскага) кантэксту. Верыў ён у слушнасьць расейскацэнтрычнага шляху ці не — мы ня ведаем. Але права на гэта меў, бо Вільня і Літва былі і ягоным родным домам (сс. 50—51).

Частка трэцяя прысьвечаная барацьбе за Вільню паміж польскай, летувіскай і беларускай элітамі ў 1914—1939 гадох. Аўтар даводзіць, што на золку ХХ стагодзьдзя беларускі рух упершыню зрабіўся сур’ёзнай альтэрнатывай імпэрскай ідэі “Заходняй Русі” і важным чыньнікам тутэйшай палітыкі. Цэнтрам руху на пачатку ХХ стагодзьдзя была абраная колішняя сталіца Вільня, тамака друкаваліся газэта «Наша Ніва» й кніжкі, беларускія актывісты стварылі моцную пагрозу пэрспэктывам летувіскага руху, які таксама атабарыўся ў Вільні. Вакол гораду, які належаў Расейскай імпэрыі, але быў галоўным чынам польскамоўным, пражывалі беларусы, што складалі палову насельніцтва Віленскага краю — больш, чым палякі, летувісы, жыды й расейцы разам узятыя. Вільня заставалася таксама цэнтрам польскага “краёвага” руху ды таксама руху жыдоў-“літвакоў”.

Летувіскі рух дзейнічаў згодна з уласнай стратэгіяй на сэпаратызм. Беларусы ўзаемадзейнічалі з палякамі, маючы на мэце адбудову шматкультурнага ВКЛ. Асноўнае насельніцтва гарадоў Літвы — жыды — часткова падтрымлівалі расейскую культуру, часткова — польскі рух. Прыхільнікаў саюзу зь летувісамі сярод жыдоў не было, бо кіраўнікі руху ня бачылі добрых для жыдоў пэрспэктываў у ідэі монаэтнічнай Літвы-Летувы.

Першая сусьветная вайна дэтанавала ўсе рухі. Разумеючы важнасьць чыньніку Вільні, летувіскі ўрад 1918 году менавіта тут, у славянска-жыдоўскім горадзе, абвесьціў сваю новую этнічную дзяржаўнасьць. У сваю чаргу, менскі ўрад БНР вызначыў Вільню неад’емнаю часткай незалежнай Беларусі, паўсталай у межах беларускага этнасу. Зварот Юзафа

Пілсудзкага “Да жыхароў былога ВКЛ” знайшоў прыхільнікаў толькі сярод тутэйшых палякаў і беларусаў ды часткі жыдоў. Другі па сіле летувіскі палітычны рух рашуча адмовіўся ад абмеркаваньня гэтае тэмы. У выніку мясцовыя польскамоўныя ліцьвіны “польска-беларускай дывізіі” на чале з генэралам Жалігоўскім увайшлі ў Вільню ды абвесьцілі стварэньне Сярэдняй Літвы, гэта значыць — Літвы паміж Літвой Жмудзкай і Літвой Беларускай. Яны былі сынамі гэтай зямлі і мелі на яе гістарычнае права. Сярэдняя Літва неўзабаве стала часткай Польскай дзяржавы.

Асобныя старонкі працы прысьвечаныя Беларускай ССР. Снайдэр піша, што, як калісьці летувісаў, у 1920-я гады Масква падтрымлівала беларускі рух у процівагу Польшчы. Важную ролю ў гэтым працэсе грала польская Заходняя Беларусь, брутальны вынік дамовы, падпісанай у Рызе. Менавіта тады настроі беларускіх дзеячоў з палянафільскіх памяняліся на антыпольскія.
Значны кавалак чацьвертай часткі прысьвечаны перадачы Вільні савецкім урадам буржуазнай Летуве ўвосень 1939 году (сс. 79—84). Варта зазначыць, што аўтар цудоўна ведае беларускі аспэкт гэтай мала дасьледаванай праблемы. Снайдэр піша, што напачатку савецкая прапаганда гуляла беларускай картай. На Віленшчыне пачаў выходзіць беларускі савецкі друк, ачуняла віленская беларуская “буржуазная” інтэлігенцыя. Савецкія газэты зьмяшчалі матэрыялы пра гістарычнае права беларусаў на Вільню, пра беларускі характар гістарычнай Літвы. Але пры канцы верасьня 1939 году Сталін перадумаў ды перадаў Вільню, што мусіла стацца сталіцай адзінай савецкай Беларусі, капіталістычнай Летуве. Беларушчына была вынішчаная разам зь дзеячамі віленскага нацыянальнага руху. Трэба зьвярнуць увагу на высновы аўтара пра наступствы гэтага сталінскага кроку для лёсу беларусаў. Падзеі верасьня канчаткова вызначылі лёс беларусаў Віленшчыны, паставілі крыж на пэрспэктыве, што яны зробяцца часткай беларускай нацыі. Згодна зь лёгікай савецкай прапаганды, з гэтага часу Летува, а не Беларусь лічылася нашчадкам ВКЛ. Супадзеньне новай этнічнай назвы краіны і адвечнага палітоніму Літва толькі палегчыла гэты шлях. Усё разам азначала спыненьне гістарычных дасьледаваньняў ВКЛ у Беларусі, а значыць,

поўнае забыццё пяцісотгадовай гісторыі і хваробу на амнэзію цэлага народу (с. 81). Вынікам другой сусьветнай вайны сталася татальная колькасная ды якасная зьмена насельніцтва Вільні. Жыды былі зьнішчаныя нацыстамі з дапамогай летувіскіх калябрантаў (сс. 84—87). Польская эліта і месьцічы былі прымусова дэпартаваныя ў Польшчу. Разам з палякамі выехала шмат адукаваных беларусаў. Адвечная шматкультурная сталіца Літвы згубіла свой твар, сталася *“местам безь імя”* — гатовым да любых этнічных экспэрымэнтаў (с. 89).

Апошняя частка першага падразьдзелу працы найбольш вострая. Хіба ўпершыню ў заходняй гістарыяграфіі аналізуецца палітыка “літуанізацыі” Вільні ў паваенны час. Снайдэр адзначае, што летувіская прыказка “Vilnius mūsų, Lietuva Rusų” (Вільня летувіская, а Летува расейская) аказалася толькі прыказкай. Насамрэч Летува стала савецкай. Улічваючы моц нацыяналістычнай інтэлігенцыі і наяўнасьць мясцовых камуністаў, савецкі ўрад выкарыстаў у адносінах да Летувы мадэль усходнеэўрапейскага нацыянал-камунізму. Узамен за ляяльнасьць Масква дала карт-блянш на “літуанізацыю” Вільні. Калі Талін ці Рыгу хутка апанавала расейскамоўная працоўная сіла, Вільню павольна засяляла жамойцкая вёска. Коштам закрыцьця адзінага летувіскага ўнівэрсытэту ў Коўне летувісы адчынілі новы Вільнюскі ўнівэрсытэт (стары Віленскі ўнівэрсытэт выехаў у Польшчу). З установы шматкультурнай Вільнюскі ўнівэрсытэт пераўтварыўся ў кузьню кадраў для савецкай летувіскай эліты. Парадокс, але ў межах інтэрнацыянальнага СССР толькі ў Летувіскай ССР з дазволу Масквы побач з камуністычнай існавала нацыяналістычная ідэалёгія, заснаваная на гістарычных мітах, — рэч абсалютна немагчымая ў іншых рэспубліках. На падставе розных крыніцаў, у тым ліку статыстычных зьвестак, аўтар тлумачыць вытокі гэтага парадоксу, разьбірае крокі і мэтады літуанізацыі, абгрунтоўвае карысьць гэтага кампраміснага шляху для савецкага ўраду, мясцовых нацыяналістаў і камуністаў.

Што датычыць недахопаў і памылак работы, дык яны, як і ў кожнай навуковай працы, ёсьць, але іх адносна няшмат. Перш за ўсё, крытычную ўвагу зьвяртае на сябе стратэгічны тэзыс аўтара пра імклівую культурную і палітычную самапалянізацыю шляхты ВКЛ адразу пасьля Люблінскай уніі

1569 году. Створанае клясычнай польскай гістарыяграфіяй, такое бачаньне не вытрымлівае крытыкі. Прыгадаем добра вядомы тэзыс, перадусім з працаў сучасных польскіх гісторыкаў (Генрык Люлевіч, Анджэй Рахуба, Генрык Віснэр, Зьбігнеў Войцік) пра сэпаратызм ліцьвінаў, які не згасаў да падзелаў Рэчы Паспалітай. Прыгадаем колькі фактаў, якія супярэчаць тэзе пра хуткую палянізацыю ліцьвінаў. Калі галоўнаму выдаўцу беларускамоўнага статуту ВКЛ 1588 году Ляву Сапегу прапанавалі падрыхтаваць таксама польскае выданьне, ён адказаў, што зрабіць пераклад будзе складана, бо яго веды польскай мовы не “грунтоўныя”[1]. Гэтак адказаў адзін з найадукаванейшых ліцьвінаў-русінаў ВКЛ. Што казаць пра звычайную дробную шляхту Пінскага ці Мсьціслаўскага паветаў, якая нават у XVIII стагодзьдзі штодзённа карысталася дыялектамі беларускай мовы. Вядома, што яшчэ ў канцы XVIII стагодзьдзя беларуская мова выконвала кадыфікаваныя функцыі ў шляхецкім асяродзьдзі нават заходніх паветаў ВКЛ. Як пісаў у 1820-х гадах Ян Чачот, сяляне Наваградзкага павету, “каторы зь іх яшчэ жывы”, размаўлялі паміж сабой ня польскаю, але беларускаю мовай. Тэзіс Ю. Вінніцкага, сьведчаньне Міцкевічавага сябра не супадае з тэзісам Сэнт-Ожэдэра, што вялікі польскі паэт нарадзіўся на зямлі беларускіх сялянаў і польскай шляхты Наваградзкага павету. Ён нарадзіўся ў асяродзьдзі “старых паноў” — беларускамоўнай, штодзённым жыцьці наваградзкай шляхты канца XVIII — пачатку XIX стагодзьдзя. Менавіта пакаленьне Адама Міцкевіча і Яна Чачота было першым пакаленьнем цалкам польскамоўнай шляхты Літвы, якая карысталася беларускай (ці летувіскай) моваю толькі ў гутарках зь сялянамі. Гэтак пісаў польскі дасьледнік Рышард Радзік, высновы якога надзвычайныя: татальная й канчатковая палянізацыя літоўскай эліты адбылася па падзелах Рэчы Паспалітай, як культурна-эканамічны на палітычнае змаганьне з Расейскай імпэрыяй[2]. Вядома, што ў першай палове XVII стагодзьдзя магнаты і некаталіцкія роды ВКЛ, перадусім Радзівілы, Агінскія, Сапегі, Статкевічы, Мірскія, усё яшчэ кантралявалі значную частку ўлады і мелі моцны ўплыў на шляхту. Менавіта гэтая сацыяльная група падтрымлівала беларускі (праваслаўны) і летувіскі (кальвінскі) друк і культуру. На сярэдзіну XVII стагодзьдзя пратэстантамі былі гетман вялікі ВКЛ Януш

1 Кіраванне Жыгімонта Вазы ў Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай (1587–1632) / пад рэд. Ю. Вінніцкага. Варшава, 2007. С. 86.

Kiaupienė, Jūratė. The Grand Duchy and the Grand Dukes of Lithuania in the Sixteenth Century: reflections on the Lithuanian political nation and the Union of Lublin. The Polish-Lithuanian Commonwealth in European Context. 1500–1795. / Edited by Richard Butterwick. Great Britain: Palgrave, 2001. С. 86.

Радзівіл, князь слуцкі, канюшы літоўскі Багуслаў Радзівіл, кашталян полацкі Томаш Касакоўскі, кашталян віцебскі Ян Сасноўскі ды іншыя ўплывовыя лідэры “літоўскай” нацыі. Праваслаўнымі былі ваявода менскі Аляксандар Агінскі, цівун троцкі Самуэль Агінскі, кашталян мсьціслаўскі Багдан Статкевіч, кашталян навагрудзкі Самуэль Статкевіч, стражнік ВКЛ Рыгор Мірскі[3]. Іх палянізацыі ішла павальней, бо яны не былі каталікамі. Каля кожнага магната гуртавалася шляхецкая кліентура, якая мела няпольскую сьвядомасьць. Прыгадаем тут вядомую антыпольскую паводле зьместу “Прамову Мялешкі”, створаную ў шляхецкім праваслаўным асяродзьдзі па-беларуску ў першай палове XVII стагодзьдзя. Дарэчы, паводле маіх падлікаў, у гэты час каля трэцяй частки дакумэнтаў Мэтрыкі ВКЛ пісалася кірыліцай, пераважна па-беларуску. Першая палова XVII стагодзьдзя — час росквіту старабеларускага друку й літаратуры, галоўным носьбітам якой была шляхта. Зьмены ў сьвядомасьці літоўскай эліты адбыліся ў выніку войнаў сярэдзіны XVII стагодзьдзя. Пратэстантаў на чале з кланам слуцка-біржанскіх Радзівілаў зьвінавалі ў здрадзе на карысьць Швэцыі, праваслаўных — у саюзе з Агінскімі і Статкевічамі — у калябарацыі з маскоўцамі. У выніку некаталіцкая шляхта была выціснутая з кіруючых структураў каталіцкімі магнацкімі кланамі Пацаў, Сапегаў. Апошні сэнатар Рэчы Паспалітай, які не быў каталіком, Аляксандар Агінскі, памёр у 1667 годзе. Вынікам стала амаль татальнае добраахвотна-прымусовае навяртаньне дысыдэнцкай шляхты ВКЛ у каталіцтва, заход старабеларускага друку, мовы й культуры. Менавіта тады, у другой палове XVII стагодзьдзя, і адбыліся значныя зьмены ў мэнтальнасьці літоўскай шляхты ад літвацэнтрызму да польскага рэгіяналізму, формулай якога стала: “gente Lithuanus (Ruthenus), natione Polonus”.

2 Radzik, Ryszard. Między zbiorowością stanową a wspólnotą narodową. Białorusini na tle przemian narodowych w Europie Środkowo-Wschodniej XIX stulecia. Lublin, 2000. P. 301.

3 Lulewicz, Henrik. Skład wyznaniowy senatoryw

świeckich Wielkiego Księstwa Litewskiego za panowania Wazów // Przegląd Historyczny. T. LXVIII, Z.3, 1977. С.425—445.

4 Напрыклад, у 1669 годзе ў мэтах працягу палітычнай кар'еры вымушаны быў прыняць каталіцтва апошні праваслаўны беларускі магнат Марцыян Агінскі. Што

цікава, ён і пасьля гэтага працягваў дапамагаць праваслаўнай царкве.

5 Уваходзіць Сывяжынскі. Прабачце, я тэрміналогіі, афіцыйнай мовы ВКЛ// Metrica. Даследаванні і матэрыялы Метрыкі ВКЛ і Кнігі запісаў Гістарычнага архіва Літоўскага. Выпуск 1. Мінск, 2001.

Выклікае сумнеў спроба аўтара аддзяліць мову статутаў ВКЛ ад гутарковай мовы ліцьвінаў і “рускай” мовы старабеларускай літаратуры (сс. 18—20). Першую мову аўтар называе, у поўнай адпаведнасьці зь летувіскай гістарыяграфіяй, “афіцыйнай славянскай мовай” (Chancellery Slavonic). Другую Снайдэр называе “рускай мовай” ВКЛ (Ruthenian), а летувіская паводле паходжаньня дэфініцыя “афіцыйная славянская мова” — гэта недасканалая, далёкая ад рэальнасьці мадэрнізацыя, адзіная мэта якой — зарэтушаваць прысутнасьць беларускага этнасу ў гісторыі ВКЛ. У статутах ВКЛ, як і ў іншых актах, гэтая мова называецца стваральнікамі тэксту “рускай” і носьбітамі “рускай” на ўзор мовы літаратуры ВКЛ часоў росквіту ліставаньня шляхты. Сёньня сярод філёлягаў гэтую мову прынята называць старабеларускай, бо створаная яна была на падставе беларускіх дыялектаў. Натуральна, у сваім пісьмовай мове нашай шляхты ў параўнаньні з вуснай шмат лацінізмаў, іншых запазычаньняў. Як любая штучная мова, створаная адукаванай элітай, менавіта ў гэтым яна адрозьнівалася ад народных дыялектаў і штодзённай гутарковай мовы шляхты і месьцічаў. З прычыны прыпыненьня сталай пісьмовай традыцыі ў XVIII стагодзьдзі сучасная беларуская літаратурная мова ў XIX стагодзьдзі стваралася цалкам на падставе народных дыялектаў. Таму сучасная літаратурная мова дастаткова адрозьніваецца ад мовы старабеларускай, але не настолькі, каб філёлягу пачаць сумнявацца ў іх генэтычнай роднасьці[5]. Можна казаць, што старабеларуская мова адрозьніваецца ад сучаснай беларускай мовы, як старапольская мова адрозьніваецца ад сучаснай польскай мовы. Гэты відавочны факт прывёў да таго, што некаторыя летувіскія гісторыкі пачалі замест дэфініцыі “афіцыйная славянская мова” карыстацца навуковым паняцьцем “старабеларуская, альбо русінская мова” (напрыклад, Станіслявас Лазутка).

Адной з аўтарскіх праблемаў сталі недастатковыя веды

летувіскай гістарыяграфіі. Як прызнаўся аўтар, летувіская мова — адзіная з шэрагу неабходных дзеля такога дасьледаваньня, якою Снайдэр валодае слаба (с. X). У выніку ў кнізе кепска прадстаўленая Летувіская Ковенская рэспубліка 1918—1940 гадоў, яе палітыка ў адносінах да Вільні. Няма зьмястоўнай інфармацыі пра летувіскі культурны рух у Вільні 1905—1939 гадоў, які не саступаў па значнасьці беларускаму. Няма інфармацыі пра кантакты і супрацоўніцтва летувіскіх нацыяналістаў зь беларускімі дзеячамі (урадам Ластоўскага). Бяз гэтага кантэксту зьмест другой і трэцяй частак першага падразьдзелу здаецца няпоўным.

Паказальна, што высокі ўзровень ведаў дазволіў Снайдэру праігнараваць "жамойцкую" тэорыю папулярнага беларускага гістарычнага міту ВКЛ. Сапраўды, яна не вытрымлівае (дарэчы, як і летувіскі міт ВКЛ) крытыкі. Дастаткова зірнуць на мапу ВКЛ, каб убачыць, што найбуйнейшае балцкае места ВКЛ Коўна знаходзілася ў Літве, а не ў Жамойці. Што адносіцца да Жамойці, ліцьвіны-балты жылі ў шэрагу "літоўскіх" паветаў ВКЛ, такіх, як Упіцкі, Вількамірскі, Ковенскі, Ашмянскі, ў Троцкім і Віленскім. Гэтыя абшары гістарычнай Літвы былі заселеныя балтамоўнай шляхтай і сялянамі. Дастаткова пагартаць каталёгі крыніцаў ВКЛ, каб даведацца, што ў Літве XVII стагодзьдзя выдаваліся кніжкі на "літоўскай" мове і што менавіта гэтак ("літоўскаю") гэтую мову называла эліта балцкіх паветаў Літвы.

Іншая справа, што шляхта славянскай часткі Літвы сама сябе лічыла сябе ліцьвінамі (напрыклад, славуты беларускі пісьменьнік Хведар Еўлашэўскі, навагрудзкі пратэстант, сын праваслаўнага ўладыкі Пінскага), а беларускую мову звала часам "літоўскай"[6]. Такім чынам, панятак "Літва" не супадаў зь беларускай ці летувіскай этнічнай групай ВКЛ, а панятак "ліцьвін"/"літоўскі", будучы палітонімам, выкарыстоўваўся абедзьвюма этнічна рознымі групамі шляхты. Факт існаваньня ў Літве раньняга Новага часу дзьвюх "літоўскіх" моваў (славянскай і балцкай паводле паходжаньня) зафіксавалі падарожнікі ў ВКЛ, напрыклад маскоўскі амбасадар Фёдар Куракін ды славацкі лютэранскі пастар Даніэль Крман. Іншая справа, што продкі балтамоўных ліцьвінаў складаюць меншасьць сучаснай летувіскай нацыі, створанай на жамойцкай этнічнай аснове пры манапольнай адаптацыі

6 **Дубянец С., Саганович Г.** **Старажытная Літва і сучасная Летувіс. Літва: Гістарычны нарыс. Вып. 2. Менск, 1994.**

апошнімі супольнай культурнай спадчыны Літвы, у якой няма месца для беларусаў.

З важных англамоўных працаў апошняга часу аўтар абмінуў выдатную манаграфію фінскага гісторыка Ёханэса Рэмі пра “польскі” студэнцкі рух у Расейскай імпэрыі 1832—1863 гадоў, які, як высьветліў аўтар, фактычна быў польска-беларуска-летувіска-ўкраінскі[7]. Нагадаем таксама важны для разумення ролі ўніяцкай царквы для беларускага руху XIX стагодзьдзя артыкул амэрыканскага гісторыка Джэймза Фліна[8]. Недаступнай аўтарам забытая клясычная праца пра нацыятворчыя працэсы ва ўсходзе Эўропы чэскага гісторыка Міраслава Грох, якая вытрымала два ангельскія перавыданьні[8]. Між тым Міраслаў Грох робіць шэраг важных высноваў у пытаньні актывізацыі і паходжаньня дзеячоў летувіскага руху XIX стагодзьдзя. Паводле падлікаў Гроха, толькі 4% летувіскіх дзеячоў паходзілі з шляхты (с. 89). Складзеная Грохам мапа месцаў паходжаньня дзеячоў руху даводзіць, што ніводзін зь летувіскіх дзеячоў XIX стагодзьдзя не нарадзіўся ў Вільні ці Віленшчыне. Праца чэскага гісторыка выклікала розгук у летувіскіх гісторыкаў.

На жаль, па ўсіх вышэйзгаданых праблемах Беларусь пакуль ня мае сур’ёзных дасьледаваньняў. Большасьць беларускіх гісторыкаў “застылі” на ўзроўні мэтадаў і праблемаў нацыянальнай гістарыяграфіі пачатку XX стагодзьдзя. Напрыклад, пры вялікай ролі Вільні для беларускага нацыяналізму дасьледаваньняў сярэднявечнай Вільні, сьвету віленскіх беларускіх месьцічаў раньняга Новага часу, старабеларускай культуры Вільні, сацыяльнай структуры беларускага віленскага руху, дзеячоў-віленчукоў амаль нэмае ў беларускай гісторыі Вільні надалей застаюцца нявырашанымі папулярных дэклярацый нашаніўскага пэрыяду. Такая праблема існуе ў гістарыяграфіі ВКЛ, БНР і БССР. Нэмагчыма — трох кітоў дзяржаўнасьці Беларусі, падмурку сучаснага права беларусаў на ўласную дзяржаву й паважнага месца ім’і эўрапейскіх народаў. Пакуль у краіне абараняюцца тэмы, тэматычна неактуальных па тэматыцы гістарычных дысэртацый, частка інтэлектуалаў Эўропы і Расеі ўсё яшчэ ня ведаюць Рэспубліку Беларусь за выпадковае, недарэчнае й штучнае ўтварэньне, а беларускую нацыю — як негістарычнае

7. **Johannes Remy. Higher Education and National Identity. Polish Students in Russia, 1832—1863. Helsinki, 2000. 380 c.**

8. **Hroch M. Social preconditions of national revival in Europe: a comparative analysis of the social composition of patriotic groups among the smaller European nations. New York: Columbia University Press, 2000 (1985). 220 p.**

Гл. ск. 87—97.

насельніцтва на землях Літвы. Праца амэрыканскага навукоўца Цімаці Снайдэра адна зь першых, якая дапамагае разбурыць гэты вельмі адмоўны для нас стэрэатып на Захадзе. Наяўнасьць агромністых лякунаў у беларускай гістарыяграфіі ўскладніла працу амэрыканскага гісторыка. Тым ня менш, аўтар змог пераадолець “супраціў” матэрыялу. Карціна беларускага руху XIX стагодзьдзя выпісаная дакладна і арыгінальна. Заўважым амаль поўную адсутнасьць у працы Снайдэра фактычных памылак што да беларускай гісторыі — зьява рэдкая для амэрыканскай гістарыяграфіі. Памылковае толькі цьверджаньне пра паходжаньне Мітрафана Доўнара-Запольскага зь віленскай шляхты (с. 44). Насамрэч гісторык нарадзіўся далёка ад Вільні, у шляхецкай сям’і былога Рэчыцкага павету Менскага ваяводзтва.
Абазнанасьць аўтара ў беларускай гісторыі выклікае пытаньне, якой літаратурай карыстаўся Снайдэр. У бібліяграфіі багата прадстаўленая сучасная польская беларусістыка. Гэты факт сьведчыць пра ключавую ролю сучасных польскіх вучоных у “адкрыцьці” гісторыі і культуры Беларусі для Захаду. Шмат спасылак на англамоўныя працы беларускіх эмігрантаў Мікалая Вакара, Івана Любачкі, Яна Запрудніка, Вітаўта і Зоры Кіпель, Яна Садоўскага, а таксама ізраільскага навукоўца Мошэ Альтбаўэра, амэрыканца Джона Стэнлі, знанага ангельскага беларусіста Арнольда МакМіліна. Знаёмыя амэрыканскаму гісторыку й беларускія публікацыі першакрыніцаў: пераклад Бібліі і прадмовы Скарыны, Статуты ВКЛ 1529 і 1588 гадоў, творы беларускай літаратуры XIX стагодзьдзя, пераклад Браніслава Тарашкевіча “Пана Тадэвуша”. Зь беларускіх часопісаў паважнае месца займае “Беларускі гістарычны агляд” з артыкуламі Соф’і Кузьняевай, Аляксандра Смаленчука ды іншых аўтараў. Сярод беларускіх манаграфій — працы Мітрафана Доўнара-Запольскага, Аляксандра Цьвікевіча, Антона Луцкевіча, Галіны Дзербінай. Аўтар карыстаўся таксама работамі Адама Мальдзіса, Міхаіла Біча, Уладзімера Ладысева, Пятра Брыгадзіна. Гэта сьведчыць, што сёньня нават геаграфічна далёкі ад Беларусі навуковец пры жаданьні можа знайсьці ўсю неабходную базавую інфармацыю пра гісторыю нашай Радзімы. У падзяках вучоным, якія дапамаглі Снайдэру парадамі пры падрыхтоўцы працы, ён згадвае добрым словам вядомых у сьвеце беларусістаў Адама Мальдзіса й

Яна Запрудніка.
Кніга Цімаці Снайдэра не стварае чарговых мітаў, такіх папулярных сёньня сярод вялікай часткі беларускіх — як пралукашэнкаўскіх, так і нацыянальных — гісторыкаў. Што да мэтадалягічнага ўзроўню працы, дык яна можа быць узорам для беларускіх дасьледнікаў. Варта перакласьці ды выдаць гэтую кнігу па-беларуску.

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/05/02**
[image]

Яраслаў Грыцак

Жарсьці па Львове*

ЯРАСЛАЎ ГРЫЦАК — гісторык. У «ARCHE» друкаваўся ягоны артыкул “Усходняя Эўропа як інтэлектуальная канструкцыя” (“Українскі нумар”).

“Жарсьці па Львове” друкуюцца з ласкавае згоды аўтара і часопісу «Критика», у якім яны пабачылі сьвет.

* Артыкул напісаны ў лютым 2002 г., але аўтар ня лічыць патрэбным штосьці ў ім перарабляць: хоць у Львове ад таго часу шмат што зьмянілася — у прыватнасьці гарадзкія ўлады, — акрэсьленыя тут тэндэнцыі застаюцца тымі самымі. Кнігі ды публікацыі, згаданыя ў артыкуле:

Andrzej Bonusiak. *“Niedemokratyczna demokracja. Rzecz o Lwowie w latach 1918—1934”*. Lwyw. Miasto. Społeczeństwo. // Kultura. Tom II. Studia z dziejów Lwowa pod redakcją Henryka W. Zalińskiego i Kazimierza Karolczaka. Kraków: Wydawnictwo Naukowe WSP, 1998, s. 215—234.

Grzegorz Hryciuk. *Polacy we Lwowie. 1939—1944.* Warszawa, 2000.

Ryszard Gansiniec. *Notatki Lwowskie (1944—1946).* — Wrocław, 1995.

Ната Ленко (Наталія Леонтович-Башук). *На межовій землі (спогади з Закерзоння).* Київ: Пам’ять століть, 1999.

Игорь Клех. *Инцидент с классиком.* Москва: Новое литературное обозрение, 1998.

Aleksandra Matjuchina. *W Sowieckim Lwowie. Życie codzienne miasta w latach 1944—1990.* Kraków, 2000.

Robert D. Putnam. *Making Demokracy Work. Civic Traditions in Modern Italy.* Princeton, NJ., 1993.

Концепція розвитку Львова. *Перспективи стратегічної програми. Матеріяли до конференції 3 березня 2001 р.* Львів: Інститут розвитку міста, 2001 (Андрій Садовий, Орест Друль, Юрій Зима, Олександр Фільц).

Іхныя нататкі пра нашыя парадкі

Кадры пра львоўскія хваляваньні я пабачыў на канале «Эўранавін» на пачатку траўня 2000 году ў сваім гатэльным пакоі ў Стакгольме. Спачатку масавая працэсія з труною. Потым — група разьюшаных кабет разьбівае нейкі шкляны павільён. І, нарэшце, спалоханы твар міліцыянта, які больш хваляваўся за сябе, чым за парадак на вуліцы. Добра, што навіны паўтараюцца, і за паўгадзіны я здолеў пабачыць больш і даведацца пра дэталі: у львоўскай кавярні два маладзёны зьбілі да сьмерці ўкраінскага кампазытара Ігара Білазора за тое, што той патрабаваў ад іх ня слухаць расейскіх песьняў. Жанчыны, якія вярталіся з пахаваньня, ад бясьсільнага адчаю пабілі шыбы ў злашчаснай кавярні.

На пытаньне “Што там робіцца ў вас у Львове?” я адказваў на працягу двух месяцаў у Гарвардзе, дзе выкладаў у летняй школе. 19 ліпеня «Financial Times» надрукавала артыкул пра перасьлед расейцаў у Львове — артыкул як артыкул, нічым ня лепшы й ня горшы за тыя, што піша пра Ўкраіну амэрыканская прэса, але з трывожнай фотаілюстрацыяй: украінскія нацыяналісты, з сымболікай, надта падобнай да свастыкі, у белы дзень крочаць цэнтрам гораду.

Яшчэ праз год у тым самым Гарвардзе мы з студэнтамі сачылі за візытам ва Ўкраіну папы Яна Паўла II. Амэрыканскія газэты назвалі той візыт “контравэрсійным”. Чаму контравэрсійным? Бо папа наведаў таксама Львоў, дзе мясцовыя ўкраінскія нацыяналісты ды грэка-каталікі перасьледуюць

праваслаўных расейцаў.
Украіна чарговым разам прайграла інфармацыйную вайну.
І вобраз нацыяналістычнага Львова, створаны расейскімі сродкамі масавай інфармацыі, зрабіўся ў гэтай вайне казырнаю картай. У паведамленьні маскоўскіх «Известий» (1.06.2000) пра сьмерць Білазора можна прачытаць, што 45-гадовы кампазытар загінуў... абараняючы “права ўкраінца сьпяваць па-расейску!” А родны Львоў сустракае цябе пасьля чарговага вяртаньня з-за мяжы зусім ня тым, чаго можна было спадзявацца, начытаўшыся расейскіх і амэрыканскіх газэт. Таксіст, які вязе цябе з аэрапорту, гучна ўключае расейскую папсу. На просьбу прыцішыць гук выбачаецца па-ўкраінску: “Я ж хацеў як найлепш...” Кніжныя шапікі на цэнтральным праспэкце Свабоды запаланіла расейскамоўная літаратура. У кавярні насупраць Львоўскага ўнівэрсытэту гучыць “жывая” блатная расейская музыка. “Русіфікацыя Львова завершылася”, — паведамляюць мясцовыя газэты.
Нагледзеўшыся, наслухаўшыся і начытаўшыся ўсяго гэтага, дзівуешся: а дзе ж тыя легендарныя ўкраінскія нацыяналісты, УНА-УНСО, вэтэраны УПА ды іншыя “нацыкі-соцыкі”, што так палохаюць абаронцаў лібэралізму, рынку й дэмакратыі на Захадзе ды прыхільнікаў праваслаўя й векавечнай украінска-расейскай дружбы на Ўсходзе?
Львоў ніколі не перастае зьдзіўляць. Паводле словаў карэспандэнта «New York Times» (26.02.99), “ня знойдзеш больш эўрапейскага і больш дэмакратычнага ўкраінскага гораду, чым Львоў. І знойдзеш толькі некалькі бяднейшых за яго”. Чаму Львоў, самы эўрапейскі, рэлігійна й нацыянальна сьведамы, а таксама дэмакратычны, не зрабіўся прыкладам эканамічнага цуду для ўсёй Украіны? Бальшыня маладых і амбітных львавян за апошнія дзесяць гадоў пакінулі Львоў дзеля прафэсійнай кар’еры ў Нью-Ёрку, Таронта, Варшаве, Маскве, у найгоршым выпадку — у Кіеве. У Львоў яны прыяжджаюць хіба на Каляды, каб за філіжанкай кавы распавесьці знаёмым пра сваю тугу па родным горадзе... і пра сваё нежаданьне калі-небудзь сюды вярнуцца.
Дык што ж адбываецца ў Львове? І што адбываецца зь Львовам? Няўжо гэты горад прыдатны толькі на тое, каб страшыць Украіну і сьвет сваім нацыяналізмам? І няўжо гэты ўкраінскі нацыяналізм настолькі слабы, што ня можа зрабіць украінскае

грамадзтва квітнеючым — хаця б у межах аднаго асобна ўзятага гораду?

Міт аўстрыйскага Львова

Гісторыкам няцяжка адшукаць у гісторыі Львова сытуацыю, падобную да сёньняшняй. Яны раскажуць, якое важнае месца займаў Львоў у нацыянальнай сьвядомасьці адукаваных палякаў падчас падзелаў Польшчы (1772—1918) і якую выключную ролю адыграла ў адбудове польскай дзяржавы бітва за Львоў падчас украінска-польскай вайны 1918—1919 гадоў. Аднак стасункі міжваеннага Львова і міжваеннай Польшчы былі, мякка кажучы, не найлепшымі. Пры новым урадзе, што кіраваў з “расейскай” Варшавы, колішні аўстрыйскі Львоў пачаў хутка ператварацца ў правінцыйнае мястэчка. Каб супрацьстаяць такой пагрозьлівай тэндэнцыі, у горадзе была створаная Камісія абароны будучыні Львова. Яна распрацавала цэлы сьпіс захадаў, дзе поруч з цалкам рэалістычнымі быў амаль вар’яцкі плян ператварыць Львоў у вялікі рачны порт. Што з тых плянаў выйшаў пшык, ня варта й казаць. Падводзячы вынікі разьвіцьця міжваеннага Львова, малады польскі гісторык Анджэй Банусяк піша, што “насамрэч горад нічога ня выйграў ад утварэньня незалежнай польскай дзяржавы, а здаецца, нават наадварот — стратаў было больш, чым набыткаў”.

Гістарычныя паралелі могуць быць падманлівымі. Сучасныя львоўскія ўлады, марачы адрадзіць былую веліч гораду, паклікаюцца не на яго савецкі (1944—1991) вобраз, бо хто ж хоча бачыць сучасны Львоў забудаваным хрушчобамі і шматпавярховымі будынкамі ў стылі савецкага “рэпрэсансу”?! Ідэал для ўладаў — часы, калі Львоў быў вялікім горадам з сэцэсійнымі будынкамі, кавярнямі, дзе можна было пачытаць сьвежую венскую прэсу, ды тэатрамі, у якіх гастралявалі эўрапейскія зоркі. Іншымі словамі, улады апэлююць да міту “аўстрыйскага Львова”, што быў пунктам адліку і для міжваеннага польскага гарадзкога ўраду.

Але калі кажуць пра міт аўстрыйскага Львова, дык забываюцца, што ён узьнік і функцыянаваў пры пэўных умовах, якіх — на шчасьце ці на жаль — ужо ніколі не атрымаецца паўтарыць. Чароўнасьць Львова палягала на адсталасьці і правінцыйнасьці Галіччыны. Для першых аўстрыйскіх чыноўнікаў, што прыяжджалі ў гэты край, ён быў напалову Азіяй, аўстрыйскім

Сібірам. Ад'ехаўшы за сотні міль ад Вены ці Прагі, аўстрыйская бюракратыя хацела кампэнсаваць сваю "высылку" дробнымі радасьцямі жыцьця, кшталту закладаньня шырокіх бульвараў, дзе яны маглі гуляць у нядзелю з сваімі сем'ямі[1]. Тэатар, кавярні ды венская мода належаць да таго самага роду экспарту, які рабіў Львоў "Венаю Ўсходу".

З усіх гарадоў колішняй Рэчы Паспалітай Львоў быў адным з самых мадэрным, а магчыма, і адзіным сапраўды мадэрным — калі за крытэр мадэрнасьці ўзяць тую суму цывілізацыйных выгодаў, якімі мог карыстацца сярэдні гараджанін. Тое, што называецца "мадэрнізацыяй праз бюракратызацыю", ішло ўсюды рухавіком цывілізацыйных зьменаў выступаў не капіталіст і банкір, а бюракрат. Львоў быў сталіцай Галіччыны, найбольшай правінцыі Габсбурскай манархіі — найбольшым асяродкам чыноўніцтва. Зразумела, што аўстрыйскі лад ня быў дасканалым — ён быў нашмат лепшым за тое, што мясцовыя жыхары зведалі да і пасьля яго. І незалежная Польшча ў 1919-м, і нарэшце Ўкраіна ў 1991-м скарысталіся з часткі тае аўстрыйскае спадчыны. Ясная рэч, у 1991-м яе ў Львове засталося нашмат меней (скажам, ад савецкага часу застаўся ў цэнтры хранічны недахоп вады ў горадзе, хаця да 1939 году вады было дастаткова). Праўда, тэатры ды кавярні, як і звыклі шпацыраваць у нядзелю па цэнтральным бульвары, засталіся. Аднак бракавала й бракуе найістотнейшае рэчы з таго статусу Львова.

У аўстрыйскай спадчыне ўкраінцаў, палякаў і габрэяў статус набыў рысы сталіцы "П'емонту" (у габрэйскім — "маці Ізраілю") — іхнае малое Бацькаўшчыны. Яно мелася пачацца адраджэньне Вялікай і Незалежнай нацыянальнай Бацькаўшчыны. У стварэньні мітуднай, як калыскі польскага, украінскага ды габрэйскага нацыяналізмаў аўстрыйскія бюракраты, як гэта ні дзіўна, таксама адыгралі сваю ролю. Тыя зь іх, хто першы прыехаў у Львоў, ня толькі расейскіх ды габрэйскіх мяшчанаў і польскую шляхту ўважалі за малакультурных варвараў. Яны ўсклалі на сябе вялікую цывілізацыйную місію "перавыхаваць гэтых сармацкіх бэстыяў (шляхціча — *Я.Г.*) у людзей". Спосабам далучэньня да "цывілізацыі" мелася стаць нямецкая мова й нямецкая культура. Для нямецкага вандроўніка, які

1 Падобная тэндэнцыя ў гарадабудаўніцтве зьяўляецца ўласьцівай усёй Цэнтральнай Эўропе, але ў Львове яна прасочваецца ў 1772–1805 гадах — раней, чым у Вене (пасьля 1857-га) і Празе (пасьля 1870 году). Былі таксама надрабязныя пра гэта ў артыкулах Міколы Бяўзы, Кшыштафа Пяўлоўскага і Альгерда Чэрнера ў зборніку "Архітэктура Львова XIX — XX стст." (Львоў, 1996).

ў 1830-х гадох заблукаў у Львоў, горад выглядаў цалкам як нямецкі, накшталт Магдэбургу, Нюрнбэргу ці Франкфурту. На карысьць ягонае нямецкасьці сьведчылі ня толькі сярэднявечнае плянаваньне, але й пачуцьцё бясьпекі, бездакорны парадак і, не ў апошнюю чаргу, якасьць кавы ў кавярні.

Паступова германізацыя гораду пачала выклікаць супраціў польскага мяшчанства. Да сярэдзіны XIX стагодзьдзя львоўскія адукаваныя колы падзяліліся на “партыю Шылера” й “партыю Міцкевіча”. У апошняй траціне стагодзьдзя пасьля ўтварэньня галіцкай аўтаноміі “партыя Міцкевіча” ўсё ж такі ўзяла верх, і ўжо апошні мэр Львова, яшчэ прызначаны зь Вены, запісаў у тэстамэнце, каб яго пахавалі ў польскім кантушы — то бок у тым самым сармацкім адзеньні, зь якога так сьмяяліся першыя аўстрыйскія чыноўнікі. Прычыны посьпеху польскага нацыяналізму, сярод іншага, крыліся ў ягоным рамантычна-прывабным духу й дэмакратычнай праграме. Нават мясцовыя ўкраінцы ды габрэі падпадалі пад ягоныя чары. Польскі нацыяналізм адыгрываў ува Ўсходняй Эўропе прыблізна такую самую ролю, як і французскі — у Заходняй: ён нацыяналізаваў іншыя народы, даючы ім гатовыя ідэалягічныя формулы ды палітычныя формы. Не выпадкова і ўкраінскі, і габрэйскі гімны пачынаюцца з падобных радкоў: “Шчэ нэ вмэрла Украіна”, “Яшчэ не памерла нашая надзея” — а гэта ня што іншае, як пераніцоўваньне польскага “Ешчэ Польска не згінэла”.

У першай палове XX стагодзьдзя Львоў меў усе шанцы зрабіцца ўсходнеэўрапейскім Сараевам. Праваднік па Львове пачатку XX стагодзьдзя ня толькі старанна пералічае ўсе кавярні, але й дадае, у якой зь іх п’е каву паасобку польская, украінская ды габрэйская публіка. Ежы Грыцюк у сваёй нядаўняй кніжцы “Палякі ў Львове, 1939—1944. Паўсядзённае жыцьцё” падае шмат прыкладаў узаемнай этнічнай варожасьці, карані якое сягаюць яшчэ перадваенных часоў. Падчас першай савецкай акупацыі (1939—1941) украінцы ды палякі падазравалі й абвінавачвалі адзін аднаго ў супрацоўніцтве з бальшавікамі дзеля вынішчэньня свайго “нацыянальнага ворага”. І адны і другія, аднак, пагаджаліся ў тым, што найбольш у савецкай калябарацыі вінаватыя габрэі. А настрой габрэяў перадае “Габрэйская малітва” першых месяцаў 1941 году: “1) Каб тыя

[саветы] пайшлі; 2) каб ён [Гітлер] не прыйшоў; 3) каб мы тут засталіся; 4) каб тыя [палякі] не вярнуліся!!!" Даходзіла да таго, што ў першыя дні нямецкай акупацыі (ліпень 1941 г.) каля крамаў утваралася не адна, а адразу некалькі чэргаў, адпаведна веравызнаньню й нацыянальнасьці. Гарадзкія ўлады мусілі адмысловым распараджэньнем забараніць такую практыку.

Міт страчанага цэнтральнаэўрапейскага Львова

Адкрытую й непрыхарошаную карціну міжэтнічных стасункаў у галіцкім П'емонце падаюць апублікаваныя нядаўна дзёньнік Рышарда Гансінца, прафэсара клясычнай філялёгіі Львоўскага ўнівэрсытэту, і ўспаміны Наты Лянко (Натальлі Леантовіч-Башук), маладой сяброўкі Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў. І дзёньнік, і ўспаміны, знойдзеныя й апублікаваныя ўжо па сьмерці іхных аўтараў, складаюць нібыта сымэтрычную пару. Гансінец піша пра паўсядзённае жыцьцё ў паваенным Львове, Ната Лянко — пра жыцьцё на Закерзоньні, украінска-польскім памежжы. Абодва тэксты напісаныя ў 1944—1946 гадох — у той час, калі польскі Львоў меўся стаць часткаю камуністычнай Украіны, а ўкраінскае Закерзоньне — часткаю камуністычнае Польшчы. Яны вельмі падобныя паміж сабой пачуцьцём немінучае страты сваёй "малое радзімы".

Рышард Гансінец быў, безумоўна, чалавекам інтэлігентным і — як піша ў прадмове ягоная дачка Радасьць — зычлівым да ўкраінскіх і габрэйскіх студэнтаў. Тым цікавей знаходзіць шматлікія месцы, якія ўвачавідкі дэманструюць "нацыяналістычныя акуляры", скрозь якія ён глядзеў на сьвет. Вось Рышарда Гансінца арыштоўваюць і кідаюць у савецкую вязьніцу. Сярод сяброў па няшчасьці — паляк габрэйскага паходжаньня. Ён ходзіць па камэры і ціха прамаўляе: "О мой Ісусе каханы". Гансінец прапануе, каб замест усяе фразы той гаварыў каротка і проста: "Ай-вай". Камэра рагоча.

А ў арыштаваных украінцах Гансінец заўважае толькі "ўкраінскае сяло, з усім яго брудам, хамствам, вошамі ды зладзействам". Злодзея, які ў камэры спрабаваў быў скрасьці тытунь, прафэсар "пазнаў па паху: быў гэта ўкраінец". Пазьней высьветлілася, што насамрэч вінаваты паляк, але пра ягоныя пахі ў дзёньніку няма ні слова: мусіць, свае

не сьмярдзяць.
Але больш за ўсіх дастаецца “маскалём”. Яны яшчэ менш цывілізаваныя, чымся мясцовыя ўкраінцы. Яны ня трацяць грошай ані на кватэру, ані на мэблю, ані на бялізну з адзеньнем, а толькі на ежу ды, перадусім, на гарэлку. Нядзеля бяз п’янкі для іх не нядзеля. Яны трымаюць у кватэрах сьвіньні, козы, каровы, качкі і не зважаюць на смурод і гной, згнілую падлогу ды збуцьвелую столь. Асабліва Гансінец ня любіць расеек. Для прафэсара яны — вяршыня безгустоўнасьці. Усе “маскалькі” носяць чырвоныя баръткі. Чаму чырвоныя? “А каб вошы таксама мелі свой чырвоны куток”. Ад полек іх лёгка адрозьніць на вуліцы: полькі вылучаюцца спакоем і зграбнаю хадою, нават калі яны апранутыя бедна, тады як “маскалькі”, піша прафэсар, ня ходзяць, а маршуюць і круцяць задам то ўправа, то ўлева. У дзёньніку Гансінца можна знайсьці толькі паасобныя прыклады, калі пачуцьці сымпатыі ды салідарнасьці прарываюцца скрозь этнічныя межы. У 1946 годзе на каталіцкія Каляды (паводле савецкай звычкі, абвешчаныя працоўным днём) украінскія студэнты ў аўдыторыі прывіталі прафэсара на лаціне, а потым засьпявалі тры калядкі: лацінаю, па-польску й па-ўкраінску. Дзёньнік цытуе таксама “правіла ленінградзкіх прафэсараў”: “Ня думай, а калі думаеш, дык не кажы й не пішы, а калі напісаў, дык адмаўляйся”. Гэта дазваляе прыпусьціць, што паміж польскімі ды ленінградзкімі прафэсарамі, якіх падчас хвалі савецкай антысэміцкай кампаніі выслалі ў Львоў, таксама ўсталяваўся нейкі давер, — інакш адкуль бы ўзяўся такі запіс?
На падставе аднаго толькі дзёньніка немагчыма рабіць нейкія абагульненьні. З найноўшай навуковай літаратуры мы ведаем, што былі спробы завязаць кантакт паміж украінскім ды польскім антыкамуністычным падпольлем. Тады ў Львове пра гэта хадзілі толькі пагалоскі. Рышард Гансінец старанна іх натуе, але для яго яны гучаць настолькі ж фантастычна, як аповед пра чорта, які, зьявіўшыся ў лютым 1946 году на вуліцы Зялёнай, апавядаў, што праз два тыдні будзе новая вайна.
Успаміны Наты Лянко таксама малююць вобраз цалкам “знацыяналізаванага краю”, дзе можна выжыць толькі тады, калі ведаеш “нацыянальныя” правілы, накшталт: як хочаш

выжыць, дык “у палякаў трэба прасіцца, з маскалём сварыцца, а зь немцам нічога не паможа”. Дзеці падчас візытаў няпрошаных гасьцей мусяць маўчаць: па-польску яны ня ўмеюць, а таму могуць выдаць украінскасьць сям’і.
Аднак ва ўспамінах Наты Лянко ёсьць і іншыя фрагмэнты, калі чалавечыя пачуцьці ўсё ж пераадольваюць этнічныя ды палітычныя межы. Польскі салдат хоча забраць ва ўкраінскай сям’і апошнюю курыцу. Але выпускае здабычу, даведаўшыся, што галава сям’і быў вязьнем Асьвенціму. Палякі з суседніх вёсак забясьпечваюць мясцовых украінцаў дакумэнтамі і мэтрыкамі, выдаюць іх за сваіх сямейнікаў, каб уратаваць ад высяленьня на Ўсход. На Каляды ў адной хаце выпадкова сутыкнуліся лоб у лоб украінскія ваяры з двух варожых войскаў — УПА і Чырвонай арміі. Савецкага афіцэра запрашаюць да сьвяточнага стала. Узрушаны нечаканай гасьціннасьцю — калядныя прысмакі замест пятлі ў лесе, ён хоча неяк аддзячыць і вырашае падарыць паўстанцам сваю зброю. Тыя не прымаюць падарунка: не пасуе вайскоўцу аддаваць зброю...
Львоў згадваецца ў гэтым сумятлівым сьвеце толькі раз: калі маці заспакойвае сваю маленькую дачку казкай пра цудоўны сьвет. Сьвет, дзе езьдзяць трамваі, дзе ёсьць шакалядкі і няма страшных палякаў. Дзе можна купацца ў ваньне, сустракацца з знаёмымі і не хавацца, не баяцца аблаваў і расстрэлаў.
А ўвечары ісьці ў кіно. У гэтай казцы выразна праглядаецца аўстрыйскі Львоў, цывілізаваны горад на нецывілізаваных землях.
Воляю Божай ані Натцы Лянко, ані ейнай дачцэ не давялося вярнуцца ў гэты горад. Бо ён перастаў існаваць ужо ў 1944 годзе, абрынуўшыся ў змрок савецкай цывілізацыі. Гэтаксама й Рышард Гансінец з болем у сэрцы глядзіць на прыгажосьць таго шляхетнага гораду, “на той сымбаль Польшчы й польскасьці, які паволі патанае ў барбарстве стэпу”. Дзёньнік абрываецца на тым моманце, калі прафэсар сядае ў вагон, каб выехаць у Польшчу й назаўсёды пакінуць Львоў.
Праз адзінаццаць гадоў Львоў адведала ягоная жонка, едучы ў Крым на археалягічныя раскопкі. Вялікім было яе расчараваньне: яна памятала Львоў цудоўным горадам, а пабачыла правінцыйнасьць, зьнішчэньне і занядбаньне.

Львоў усходнеэўрапейскі, неміталягізаваны

Гісторыю Львова можна каротка акрэсьліць так: гэта крах мультыкультуралізму. Яшчэ за часоў заснавальніка гораду Данілы (Раманавіча) Галіцкага ды яго сына Лява ў горадзе жылі русіны (украінцы), немцы, палякі, вугорцы, армяне, габрэі, а таксама таямнічыя “сарацыны”. Пасьля таго як згасла дынастыя Раманавіча і Львоў трапіў пад польскую карону, ніводзін горад у Рэчы Паспалітай, а магчыма, і ўва ўсёй Эўропе, не вылучаўся такой этнічнай ды рэлігійнай стракатасьцю. Тут адначасова жылі ажно пяць этнічных групаў, кожная зь якіх складала больш за пяць адсоткаў мясцовага насельніцтва: немцы, палякі, украінцы, габрэі ды армяне — і налічвалася некалькі канфэсіяў: каталікі, праваслаўныя, грэка-каталікі, манафізыты, юдэі. На пачатку аўстрыйскага пэрыяду з культурнага ляндшафту гораду амаль зьніклі армяне, асыміляваўшыся ў польскую культуру. Польская асыміляцыя была трывалай тэндэнцыяй аж да другой сусьветнай вайны. Тым ня менш дамінаваньне польскай культуры, падмацаванае дамінаваньнем палітычным, не магло зьнішчыць стойкага падзелу львоўскага насельніцтва на палякаў (50—55%), габрэяў (30—35%) і ўкраінцаў (15—20%). Пасьля таго як Гітлер зьнішчыў габрэяў, а Сталін дэпартаваў палякаў, Львоў зрабіўся горадам усходнеэўрапейскім, украінска-расейскім. У першае пасьляваеннае дзесяцігодзьдзе розьніца ў колькасьці тых і тых складала толькі 10%, але ў 1960—70 гадох масавы наплыў жыхароў навакольных украінскіх вёсак, якія ўпарта не хацелі пераймаць расейска-савецкай культуры, рашуча пераламіў балянс на карысьць украінцаў (79,1% у 1989 годзе). Расейская меншыня й надалей была значнай — 16,1% у 1989 годзе, а вось палякі ды габрэі прысутнічалі досыць сымбалічна: усяго 1,2—1,6%. З колішняга цэнтральнаэўрапейскага гораду Львоў ператварыўся ў тыповы ўсходнеэўрапейскі — з той хіба розьніцай, што ні ў якім іншым вялікім горадзе ўкраінская прысутнасьць не вымалёўвалася так моцна, як тут. Колішні львоўскі, а цяпер маскоўскі пісьменнік Ігар Клех зрабіў вобраз гэтага ўсходнеэўрапейскага Львова вядомым у сваёй кнізе “Інцыдэнт з клясыкам”: “У замшэлай гарою... закамянеласьцю ляжаў шэра-зялёны, як змеіна скура, цэнтральнаэўрапейскі горад... — хаця ён ужо даўно не з сорак, перастаў быць цэнтральнаэўрапейскім, але

2. Дэталёвую
старыя тэхніку
пераемных
дэмаграфічных
зьменаў
можна
знайсьці

ў гэтай краіне анулюецца ў першую чаргу”.
Тут ня месца пераказваць сюжэты ягоных апавяданняў. Як на мой вельмі суб’ектыўны густ, усе яны ёсьць нейкімі адной тэмы — “пакутаў маладога Вэртэра”, які нарадзіўся ня там і не тады. Таму, хутчэй за ўсё, ён ніколі не ўвойдзе ў Стакгольм па Нобэлеўскую прэмію. А паколькі ён нарадзіўся ў ХХ стагодзьдзі, дык ён падобны да Кафкі. І ён і сьніць сама з жаночымі наманікюранымі пальцамі, раздушаны прусак крычыць “Будзьце вы ўсе выкляты!”, а супрацоўнік моргу чытае Бадлера, есьць павукоў і ножыкі ў старчма пастаўленыя трупы.

ў працы:
Віктар Сусак.
Етнічныя і нацыянальныя меншыні ў Стакгольме.
Вынаходніцтва Кафкі ў 1939 — 1999 гг.
Магістэрская работа.
Львів, 2000.

Для майго аповеду важна тое, што гэты “львоўскі Кафка”, нягледзячы на свой універсальны боль ды лібэральны message, гучыць нацыяналістычна — таксама як і Гансінец, польскі прафэсар клясычнай філялёгіі. Ён неабыякавы да ўкраінцаў, асабліва да ўкраінскіх інтэлігентаў. Яны — гэта яны, ягоныя антыподы, якія дабіваюцца славы ў правінцыйным Івана-Франкоўску, іхныя творы трапляюць у школьныя праграмы, бо так захацелі “іхныя жонкі” (празрысты намёк на вядомую львоўскую пару). Гэта ў іх Рыгор Чубай, непрызнаны й рана памерлы львоўскі паэта, адкінуў “Лесю Ўкраінку й Івана Франка ды ўзяў у рукі Эліёта з Эзрам Паўндам”. Што, вядома, — на думку Клеха — мала дапамагло.

Таксама красамоўнае апісаньне Клехам сцэны, якую ён пабачыў у Львове ў 1994 годзе: “У Львоў прыехалі ізраільцяне прысуджаць нейкія ўзнагароды (“герояў сусьвету” ці нешта накшталт) і даваць матэрыяльную дапамогу ўкраінцам, якія перахоўвалі габрэяў падчас вайны. Цырымонія адбывалася ў будынку колішняга абкаму. Сэк’юрыты абшуквала і празвоньвала ўсіх запрошаных, баючыся мажлівага тэракту. Дык вось, з амаль сотні ўзнагароджаных, якія прайшлі паўз мае вочы, я не запомніў ніводнага хаця б адносна інтэлігентнага аблічча. Усе гэтыя людзі, што падстаўлялі пад расстрэл уласныя сем’і, былі або ад зямлі, або жыхарамі бедных фабрычных ускраінаў, з рукамі і фігурамі, дэфармаванымі фізычнай працай” (“t° карта Галіччыны”[3]).

Клеху ня тое каб не шанцавала з інтэлігентнымі ўкраінцамі — ён іх папросту ня бачыў. Каго ён і заўважыў у сучасным Львове — дык гэта так званую “адукаваную клясу” (на думку Клеха, вельмі павярхоўна адукаваную), па-прафашыстоўску

настроеныя палітычныя колы, малаквaліфікаваную новаўкраінскую бюракратыю, а таксама масу цалкам неадукаваных украінцаў, выхадцаў зь вёскі, якія робяць постсавецкі Львоў “найвялікшай заходнеўкраінскай вёскай”. Кніжка Клеха — яшчэ адзін артэфакт малое (міжэтнічнае) халоднае вайны, якая разгарнулася пасьля заканчэньня вялікай. Абедзьве вайны — паміж камуністамі ды некамуністамі, украінцамі ды неўкраінцамі — ніколі не згасалі ў паваенным Львове. На культурнай карце савецкага гораду заўсёды можна было знайсьці выспачкі з надпісамі: “Стараньнім уваход забаронены”. Выглядае, што Ігар Клех так ніколі й не пабываў на адной зь іх — у сьвеце старой украінскай інтэлігенцыі. Яе дробнашляхецка-чыноўніцка-сьвятарскія радаводы цягнуцца яшчэ ад аўстрыйскіх часоў, а інтэлектуальныя — ад Гегеля, якога Клех вучыў на памяць цэлымі старонкамі, да Франка й Шульца, якіх ён так ня любіць. Гэта яны, колішнія выпускнікі польскіх гімназій, стваралі “Эўропу неправінцыйную”, па якой ён так сумуе і якой зблізу ня бачыць, шпацыруючы вуліцамі ўжо страчанага савецкага Львова.

Багацейшую на адценьні карціну савецкага Львова падае Аляксандра Мацюхіна ў кніжцы пра побыт гораду ў 1944—1990 гадох. Як і Клех, Мацюхіна не належыць да карэнных львавян. Яна нарадзілася ў Ленінградзе ў 1955 годзе, але ў Львове жыве з раньняга дзяцінства. Кніжку складаюць пераважна інтэрвію з прадстаўнікамі розных асяродкаў: карэннымі львавянамі, прыбышамі з Расеі ды Ўсходняе Ўкраіны, а таксама з выхадцамі з навакольных украінскіх вёсак ды мястэчкаў. Аднак нямала тут і асабістых рэмінісцэнцый ды назіраньняў за найбліжэйшым аўтарцы расейскамоўным сьветам (таму, скажу адразу, кніжка мае хібы — аўтарка прапускае міма вачэй старыя ўкраінскія, габрэйскія ды польскія асяродкі).

Мацюхіна падае багата прыкладаў “культурных войнаў”, якія асабліва зацята вяліся паміж прышлым расейскамоўным і ўкраінскамоўным асяродзьдзямі. У расейскамоўных дзяцей выхоўвалі ў перакананьні, што савецкая — найбуйнейшая шырэй, расейская — культура перавышае дасягненьні іншых народаў. Таму бацькі стараліся вызваліць дзяцей ад вывучэньня мовы мясцовага насельніцтва. Расейская школа Украины”

З Ўкраінскай

Інай Бруклінай

Адэсы

элемэнтам ізаляцыі вучня ад карэнных украінскіх каштоўнасцей (Мацюхіна, 2002). і вартасьцяў іхнае культуры. Выхадцаў зь вёскі (“рогаў” альбо “рагуляў”) высьмейвалі за іхныя манеры, мову й няўменьне апранацца. “У асяродку [расейскай] інтэлігенцыі, — піша Мацюхіна, — словам “рогі” ці “рагулі” адпавядаў жэст, калі абедзьве далоні падымаліся над галавой і ўказальныя пальцы некалькі разоў згіналіся. Гэтым жэстам карысталіся, калі хтосьці гучна сёрбаў за сталом альбо бесцырымонна выстаўляў ногі на сярэдзіну пакою, разваліўшыся ў крэсьле. Жэст гэты нібы азначаў запытаньне: “А хто ж гэта столь рогамі падрапаў?”

Тым часам украінцы культывавалі народныя й рэлігійныя традыцыі, якіх амаль ня мелі прыбышы. Гэтыя традыцыі давалі ім пачуцьцё перавагі, якое часам даходзіла нават да агрэсіі. І па-над усім узносіўся культ украінскай мовы, якая зрабілася своеасаблівым *sacrum* ва ўкраінскім асяродзьдзі.

Наагул, гарадзкое насельніцтва падзялялася на кланы й сваяцкія групы, што функцыянавалі па прынцыпе “ты мне — я табе”. Пры гэтым, піша Мацюхіна, паміж рознымі групамі назіраліся ўзаемаўплывы. Расейцы перанялі некаторыя мясцовыя стравы і традыцыі сьвяткаваць забароненыя рэлігійныя сьвяты (як, прыкладам, рабіць падарункі дзецям на сьвятога Мікалая), украінцы — звычай адзначаць дзень нараджэньня замест мянінаў, ладзіць “сабантуі” з шашлыкамі ды гарэлкай і да т.п. Дзесьці ў гэты час, сьцьвярджае Мацюхіна, утвараецца супольная для ўсіх групаў спэцыфічна львоўская “мяшчанская культура”, з прагулянкамі па цэнтральных вуліцах ды наведваньнем кавярняў. (Аўтарка, здаецца, ня ведае, што тут вядзецца ня так пра нараджэньне новых, як пра адраджэньне старых традыцыяў.) Галоўнымі чыньнікамі ўтварэньня новай мяшчанскай культуры сталі ўзоры, накінутыя кінафільмамі і тэлебачаньнем, узаемныя культурныя ўплывы сярод суседзяў, сувязі мясцовых украінцаў з сваякамі ў ЗША ды Канадзе, нарэшце, “міт Польшчы” — найбліжэйшай суседкі па камуністычным бараку, якая дзякуючы сваёй адкрытасьці на Захад і дасягальнасьці ў Львове варшаўскіх радыё- і тэлехваляў зрабілася для львавян акном у Эўропу.

Мацюхіна прыходзіць да высновы, што Львоў, пасьля ўсіх палітычных катаклізмаў, ізноў вяртаецца да статусу цэнтру спэцыфічнай і арыгінальнай культуры. Калі перад 1939 годам

культура Львова была непаўторным сынтэзам перадусім польскай традыцыі з дамешкамі ўкраінскай, габрэйскай ды армянскай, дык сучасная культура зрабілася больш аднароднай, украінскай, якая прэзэнтуе ўва Ўкраіне найбольш эўрапеізаваны варыянт.

Львоў постсавецкі, паміж Палерма й Парыжам, Уроцлавам і Данецкам

Такая выснова нібыта павінна даваць падставы для аптымізму. Вядомы брытанскі публіцыст Цімаці Гартан Эш пісаў у адным з сваіх артыкулаў, датаваным 90-мі гадамі: “...Усталявалася штосьці падобнае да правіла: чым больш этнічна мяшанай ёсьць посткамуністычная краіна, тым большая імавернасьць, што яна выбера нацыяналістычна-аўтарытарны, а не лібэральна-дэмакратычны шлях. Краіны, што дасягалі найлепшых вынікаў, былі краінамі найбольш этнічна аднароднымі: Польшча, Чэхія ды Славенія. ...Адраджэньне цэнтральнаэўрапейскай ідэі ў 1980 гадох улучала ўслаўленьне перадваеннай этнічна-культурнай мешаніны ў гэтым рэгіёне: зьмяшаных гарадоў, накшталт Прагі, Чарнаўцоў ці Братыславы, дзе людзі звычайна гаварылі на трох-чатырох мовах; шматлікіх нацыянальных мяншыняў, асабліва нямецкай ды габрэйскай; мультыкультуралізму *avant la lettre*. Але, здаецца, адзін з крытэраў палітычнай прыналежнасьці да Цэнтральнай Эўропы — гэта ня быць цэнтральнаэўрапейскім грамадствам у папярэднім [мультыкультурным] сэнсе”[4]. Гэтае правіла, на першы погляд, спрацоўвае і ў выпадку зь Львовам: у палітычным сэнсе горад такі падобны да цэнтральнаэўрапейскага якраз таму, што перастаў быць цэнтральнаэўрапейскім у сэнсе этнічна-культурнага. Другі, трэці і кожны наступны погляды ставяць пад сумнеў такі аптымізм. Львоў можа выглядаць цэнтральнаэўрапейскім з пэрспэктывы Кіева ці Данецку. З пэрспэктывы Вены, Будапэшту ці Кракава Львоў выглядае па-ўсходнееўрапейску. Што датычыць узроўню грамадзкай актыўнасьці (маючы на ўвазе, з статыстыкай — колькасьці грамадзкіх арганізацыяў на 10 тысяч насельніцтва), Львову няма роўных ува ўсёй Украіне — ён нібы самалёт, які запусьцілі высока ў неба, тады як рэшта ўкраінскіх гарадоў і рэгіёнаў толькі-толькі вучыцца хадзіць па зямлі. Але лёгка быць зоркай, калі месяц ня сьвеціць.

4 Timothy Garton Ash. The Puzzle of Central Europe // New York Review of books, XLVI, 5 (March 18, 1999).

У параўнаньні з суседняй Польшчай Львоў ледзь-ледзь выбіваецца на сярэдні ўзровень. Найсправядлівей будзе параўнаць яго з Уроцлавам: той таксама пасьля вайны зьмяніў свайго “гаспадара”, і бальшыня мясцовага насельніцтва там — таксама перасяленцы, а не карэнныя гараджане. Далейшыя параўнаньні не на карысьць Львова. Нядаўна дасьледнікі запыталіся ў лідэраў грамадзкіх арганізацыяў у Львове ды Ўроцлаве: што вы робіце, калі ў вас узьнікаюць праблемы? Ува Ўроцлаве апытаныя адказалі, што яны ўсімі даступнымі мэтадамі мабілізуюць грамадзкасьць; львоўскія лідэры шукаюць вырашэньня праблемаў у “калідорах улады”.
Гэтае апытаньне ладзілася ў рамках швэдзка-ўкраінска-польскага праекту, што ставіў за мэту спраўдзіць тэорыю пра залежнасьць посьпеху ці няўдачы посткамуністычных рэформаў ад гістарычнай мінуўшчыны. Нядаўна амэрыканскі палітоляг Робэрт Патнэм апісаў яе ў кнізе “Пабудова дэмакратыі. Грамадзкія традыцыі ў сучаснай Італіі”. Дваццаць гадоў запар Патнэм вывучаў хаду і ўплыў італьянскіх рэформаў рэгіянальнага самакіраваньня. Яго найбольш цікавіла, чаму ў адной і той самай краіне, пры фармальна аднолькавых умовах пасьпяховыя ў адных мясцовасьцях рэформы зазнавалі крах у другіх? Чаму на поўначы Італіі мясцовыя рэгіянальныя ўрады і выглядам, і паводзінамі супрацоўнікаў нагадваюць сучасныя высокатэхналягічныя фірмы, тады як на поўдні праблематычна нават адшукаць патрэбную кантору, а калі й знойдзеш, дык хутчэй за ўсё пабачыш там пусты стол: мясцовыя чыноўнікі ня маюць звычкі сядзець на працы больш за адну-дзьве гадзіны.
Патнэм тлумачыць гэта розьніцай паміж сацыяльнымі капіталамі — спэцыфічнымі формамі кантактаваньня і стасункаў, якія для палітычнай стабільнасьці, эфэктыўнасьці кіраваньня, эканамічных рэформаў, магчыма, нават больш важныя, чым фізычны або чалавечы капітал. У аснове “дабраякаснага” сацыяльнага капіталу ляжыць ананімны давер і жаданьне добраахвотна супрацоўнічаць дзеля супольных інтарэсаў. “Недабраякасны” сацыяльны капітал базуецца на адносінах у вузкіх і замкнёных групах — сем’ях і кланах, дзе давер грунтуецца на асабістым знаёмстве ды выгадзе.
Патнэм заканчвае выклад простай высновай: тып сацыяльнага капіталу, што пануе ў кожным грамадзтве, залежыць ад нормаў

паводзінаў, якія склаліся ў мінулым. Мінуўшчына ды будучыня выразна ўзаемазьвязаныя: кажучы словамі Патнэма, “куды ты трапіш, залежыць ад таго, адкуль ты выйшаў”. Жыхарам учорашніх камуністычных краінаў Эўразіі, асабліва іхным пазаходняму настроеным элітам, такая выснова можа навеяць пэсымізм. Расейская імпэрыя ды Савецкі Саюз вызначаліся асаблівай жывучасьцю кланавай сыстэмы, хабараў і “блату”. Таму кожная з постсавецкіх дзяржаваў — за выняткам хіба што балтыйскіх — падобная да паменшанай копіі Савецкага Саюзу. Дык якой будзе іхная будучыня? Гэтаксама, як Азэрбайджан ня можа на ўзмах чароўнай палачкі перанесьціся ў Балтыю і зрабіцца “эўрапейскай дзяржавай”, так і Палерма — а не Парыж ці Вена — зьяўляецца правобразам будучыні для Масквы.

Львоў таксама мае свае абмежаваньні. Калі вымяраць сацыяльны капітал ня колькаснымі, а якаснымі парамэтрамі, дык ён бліжэйшы да Данецку, чым да Ўроцлава. І ў Львове, і ў Данецку больш за палову насельніцтва не цікавіцца палітыкай і амаль усе мала давяраюць сродкам масавай інфармацыі, палітыкам ды дзяржаўным чыноўнікам. Дэмакратызацыя ды фармаваньне ў Львове празаходняй грамадзянскай культуры набралі хуткі тэмп у часы Гарбачова і ў пярэдадзень украінскай незалежнасьці — у 1988—1991 гадох. Але ў незалежнай Украіне гэтыя працэсы замарудзіліся. Палітычныя мітынгі больш не зьбіраюць шмат людзей, львавяне ня маюць вялікай ахвоты браць удзел у грамадзкіх арганізацыях. Інакш кажучы, недабраякасны сацыяльны капітал — нежаданьне супрацоўнічаць і адсутнасьць даверу — пашыраецца ўва ўсім грамадзкім целе як злаякасная пухліна, пажыраючы здаровыя каморкі.

У постсавецкім Львове назіраецца фармаваньне новых кланаў, падобных да старых савецкіх. Яны зрастаюцца з кланамі, якія свайго савецкага паходжаньня й не хаваюць. Яскравым прыкладам можа быць гісторыя львоўскай мэрыі.

Яе цяперашняга кіраўніка Васіля Куйбіду абралі за ягонае напалову дысыдэнцкае мінулае. У першыя гады кіраваньня ён цешыўся славай ды сымпатыяй — колішні львавянін, а цяпер маскоўскі рэжысэр Раман Вікцюк назваў яго найлепшым мэрам на ўсіх прасторах СНД. Гэта дзякуючы намаганьням Куйбіды ЮНЭСКА ў 1998 годзе надало

гістарычнаму цэнтру Львова статус сусьветнай культурнай каштоўнасьці. Але ад пэўнага часу Куйбіда зачасьціў да Кіева, і львавяне ўжо маглі пабачыць яго на трыбуне разам з прэзыдэнтам падчас трансьляцыі футбольнага матчу. А мінулым летам ягонае прозьвішча трапіла ў сьпіс ста найбольш уплывовых і найбагацейшых асобаў Украіны — чаго сам ён, уласьнік сьціплае двухпакаёвае кватэры, выразна патлумачыць ня мог.

Львавяне маглі б яму гэта прабачыць, як і звычку красавацца на рэклямных плякатах зь нязьменным надпісам “Наш горад — найпрыгажэйшы”, калі б... — калі б Львоў і сапраўды быў самым дагледжаным горадам, а багацьці мэра, уяўныя ці сапраўдныя, адпавядалі б багацьцям гараджанаў. Энэргазабесьпячэньне ў горадзе й вобласьці знаходзіцца пад кантролем тых самых людзей, якія валодаюць кіеўскім “Дынама”, таму ўвечары горад асьвятляецца настолькі ж паскудна, наколькі блага гуляюць сталічныя футбалісты. Перабоі з вадой у кватэрах і безьліч жабракоў у цэнтры гораду нагадваюць паўднёваафрыканскія гарады, а ўсім вядомая карупцыя сягае паўднёваамэрыканскіх вышыняў. Мясцовыя ўлады пахваляюцца, што ў Львове знаходзіцца палова гістарычна-культурных помнікаў Украіны. І гэта страшна — бо азначае, што палова ўкраінскае культурнае спадчыны ўвесь час знаходзіцца пад пагрозай зруйнаваньня ці зьнікненьня. Наш прэзыдэнт любіць гаварыць, што Львоў — гэта эўрапейскае аблічча Ўкраіны. Калі так, дык можна толькі ўяўляць, у якім стане знаходзяцца іншыя, менш эўрапейскія часткі ўкраінскага цела.

Постсавецкі Львоў насамрэч ёсьць Львовам вельмі савецкім. Няхай ня ўводзяць вас у зман мясцовая эўрапейская архітэктура й венскія кавярні, эўрапейскія звычкі й адзеньне гараджанаў ды іхная праэўрапейская арыентацыя — гэта толькі ў нашым славянскім сьвеце слова прыраўноўваецца да справы, а выгляд — да сутнасьці. Істотна, што робіцца ў галовах львавянаў. Усіх абурыла, што Білазора забілі расейцы. Але мала хто абурыўся, што ягоных забойцаў пакрывалі паводле чыста савецкай схемы: міліцэйскі патруль адпусьціў аднаго з маладзёнаў, калі даведаўся, што гэта сын аднаго зь мясцовых міліцэйскіх начальнікаў. Бальшыні львавян не падабаецца, што ў кавярнях і крамах гучыць расейская музыка. Нікому

ня прыйдзе да галавы кінуць лёзунг: “Байкатуйма гэтыя кавярні! Калі мы плацім ім грошы, дык маем права замаўляць у іх сваю музыку”. “Свой да свайго па сваё” — гэты стары чэскі лёзунг, што ўвайшоў у цела й кроў міжваенных галічанаў як частка аўстрыйскае спадчыны, немагчыма рэалізаваць у сучасным Львове. Бо ў ягоным паветры бракуе чагосьці такога, што б зрабіла магчымай доўгатрывалую й сплянаваную акцыю калектыўнай салідарнасьці. Выйсьці на пахаваньне, пабіць шыбы, прайсьціся зь сьцягам, прагаласаваць за кандыдата-дэмакрата, сустрэць Папу — гэта зАпраста! І запрОста. А вось дамагчыся нармальнага водазабесьпячэньня ці спыніць руйнаваньне гораду — заскладана. Бо гэта патрабуе ўжо пастаяннага арганізаванага дзеяньня — тых кропель вады, што крышаць камень ня сілай, а частатой падзеньня.

У чаканьні новага міту

Больш за ўсё ня могуць зьмірыцца з сучасным станам Львова маладыя мясцовыя інтэлектуалы. Іхныя незадавальненьні выказваньні найчасьцей можна пабачыць на старонках мясцовай газэты “Поступ” — газэты вельмі добрай, з напаўдысыдэнцкім радаводам і агульнаўкраінскай рэпутацыяй. Гэтае незадавальненьне набірае канцэптуальную форму дзякуючы нядаўна створанаму Інстытуту грамадзянскага гораду. Летась ён прапанаваў альтэрнатыўную канцэпцыю разьвіцьця гораду, паклаўшы ў яе аснову ідэю адраджэньня мэтрапольны статус Львова. Канцэпцыі надае моц тое, што яе стваральнікі добра разумеюць сутнасьць мадэрнасьці (ён мусіць быць горадам найпаўнейшай рэалізацыі асобы і задавальненьня ейных патрэбаў) дый дакладна акрэсьліваюць ролю гэтак званых постіндустрыяльных вартасьцяў (узвышэньне асьветы як падмурку сучаснай эканомікі). Горш, аднак, з абгрунтаваньнем гэтых тэзаў. Тут рацыянальныя аргумэнты саступаюць на карысьць старых і новых мітаў. Гаворыцца пра мэтрапольнасьць Львова на працягу ўсяе ягонае гісторыі — хаця мэтраполіяй горад быў толькі час ад часу, у выніку перапляценьня спрыяльных абставін. Пішацца пра “талерантнае суіснаваньне” розных этнічных групаў — хаця насамрэч Львоў ёсьць красамоўным прыкладам краху ідэі мультыкультуралізму ў гэтай частцы Эўропы. А далей канцэпцыя падае некалькі старонак захадаў, выкананьне якіх

5 Орест Друль. Львова Україна vs української. Ї. 2001. Ч. 23: Федеративна республіка Україна (www.ji.lviv.ua/n23texts/N23-forlach.htm)

мелася б ашчасьлівіць горад і гараджанаў. Гэтыя пляны не такія фантастычныя, як прапановы міжваенных уладаў збудаваць у Львове рачны порт. Але ад іх патыхае старымі савецкімі пяцігадовымі плянамі, наконт якіх існавала маўклівая згода ўладаў і грамадзтва: ня тое каб не выконваць, але нават і ня ставіцца да іх усур'ёз.

Яшчэ больш у гэтых прапановах угадваецца перадвыбарная праграма. І за Інстытутам разьвіцьця гораду, і за газэтай "Поступ" стаіць малады і амбітны мясцовы алігарх Андрэй Садовы. Ужо каля двух гадоў ён вядзе "халодную вайну" з Васілём Куйбідам, умела і трапна выкарыстоўваючы незадаволенасьць "сярдзітых" львоўскіх інтэлектуалаў дзеля назапашаньня свайго перадвыбарнага капіталу. І вось на пачатку гэтага году Андрэй Садовы абвесьціў пра намер балятавацца на пасаду львоўскага мэра. Аднак ці ня пойдзе ён, прымерыўшы тогу й шапку з кутасамі (китчасту шапку), шляхам свайго папярэдніка? Бо ў гэтай дзяржаве платай за посьпех ёсьць безумоўная ляяльнасьць да кіеўскіх уладаў. А хто ж ня ведае, што гэтая ляяльнасьць азначае насамрэч... Пры гэтым ёсьць спосаб пазьбегчы кіеўскай залежнасьці: абвесьціць галіцкую аўтаномію. Пра такую ідэю ў прыватных размовах гаварылі ўжо даўно, але шэптам, як пра забаронены плод, адначасова і салодкі, і небясьпечны. Праўда, яшчэ да абвяшчэньня незалежнасьці яе намагаўся агучыць Вячаслаў Чарнавіл, калі ён зрабіўся галавой львоўскае абласное рады. Але ідэю хуценька зацыкалі, бо што станецца з Украінай, калі сьледам за Галіччынай захоча аўтаноміі Данбас? Цяпер жа галічане па горла сытыя і Данбасам, і Днепрапятроўскам, і Кіевам зь іхнай савецка-расейска-азіяцкай культурай. Дый з самога Кіева ім кажуць украінскамоўныя патрыёты: "Аддзяляйцеся, пакуль яшчэ ня ўсё страчана".

Ідэя аўтаномнае Галіччыны або нават усяе Заходняе Ўкраіны як апошняга прытулку сапраўднай украінскамоўнай і па-эўрапейску зарыентаванай Украіны робіцца тым пільнейшаю, чым больш мацнее, з закрыцьцём заходніх межаў, пагроза апынуцца сам-насам з эўразійскім прасьцягам, дзе ўкраінцам можна будзе езьдзіць бяз візы хіба што да Варкуты ці Ўладзівастоку. А ў асобна ўзятай галіцкай Украіне Львоў стане сапраўднай мэтраполіяй, бо ніякі іншы заходнеўкраінскі горад не пасуе да гэтай ролі. Што, як кажуць матэматыкі, і трэ

было давесьці.
Таму й цягнуцца ў сучасным Львове спрэчкі, ці ня варта вярнуць лацінку ўва ўкраінскую мову? Або як ушаноўваць заснавальніка гораду Данілу Галіцкага — як украінскага ці як галіцкага караля? У тым самым “Поступе” можна пабачыць карыкатуры, якія сьмяюцца з жаданьня старэйшых галіцкіх патрыётаў бачыць Украіну саборнаю: маўляў, што, дачакаліся? Або дасьціпныя малюнкі львоўскага мастака Ўладзімера Кастырка аб прымітыўных украінцах-“рагулях” з Усходу і рафінаваных украінцах-панох ды паненках з Захаду. На адной зь ягоных работ Галіччына ў вобразе дзяўчыны ў рыцарскім уборы кідае сваім нябачным ворагам выклік “На калені, хамы!”; на другой — закутыя ў латы ваякі “СС Галіччыны” сядзяць, як рыцары круглага стала, а на стале перад імі ляжаць гранаты — ня тыя, якія ядуць, а тыя, што выбухаюць.
Усё гэта — на ўзроўні новай мітатворчасьці. А на ўзроўні палітычных праграмаў Андрэй Садовы ўзімку прапанаваў правесьці рэфэрэндум аб праве наданьня Львову статусу мэтраполіі. Трохі раней Арэст Друль, супрацоўнік Інстытуту разьвіцьця гораду і аўтар найцікавейшых публікацыяў, што паходзяць зь ягонага асяродку, зьмясьціў у львоўскім часопісе “Ї” эканамічна, палітычна і культурна аргумэнтаваны артыкул пра магчымасьць і неабходнасьць галіцкай аўтаноміі[5]. Гэтыя погляды можна прымаць або не прымаць. Але спрачацца зь імі марна. Бо прызначэньне мітаў ды ідэалёгій ня ў тым, каб даваць сапраўдную ці скрыўленую карціну сьвету. Іх трэба ацэньваць не паводле праўдзівасьці, а паводле эфэктыўнасьці — то бок наколькі ўдала яны легітымізуюць інтарэсы ды дзеяньні асобных грамадзкіх групаў. Варта нагадаць, як у 1895 годзе ў Львове з асяродку такіх самых маладых і сярдзітых украінскіх інтэлектуалаў выйшла кніжка “Ukraina irredenta” Юліяна Бачынскага — кніжка, якая ўпершыню ў гісторыі ўкраінскай палітычнай думкі аргумэнтавала магчымасьць і неабходнасьць украінскай палітычнай самастойнасьці. Не бяды, што аргумэнтацыя была памылковай і нацягнутай, бо абапіралася на марксісцкую тэорыю. Вельмі хутка яна ператварылася ў “кіраўніцтва да дзеяньня”, аж пакуль не зрабілася рэальнасьцю на палітычнай карце сьвету.

Ня ведаю, ці ўдасца галіцкім аўтанамістам пабачыць рэалізацыю сваёй ідэі і калі гэта будзе. Адно можна сказаць з пэўнасьцю: калі б яна рэалізавалася ў найбліжэйшай будучыні, дык наўрад ці яны былі б вельмі гэтаму радыя, бо тады, хутчэй за ўсё, яны апынуліся б не ў “эўрапейскай” Галіччыне, а ў паменшанай мадэлі постсавецкай Украіны, ці, прашу прабачэньня, Савецкага Саюзу. З тою розьніцай, што на вуліцах Львова больш гаварылі б украінскаю мовай. Але бегалі б на вуліцах камандзіраваныя з Каламыі ці Самбору чыноўнікі, каб праз знаёмых ці сваякоў трапіць у “калідоры ўлады” і там вырашыць свае праблемы. Таксама, як цяпер бегаюць львавяне ў Кіеве, а калісьці — у Маскве. І, напэўна, у якой-небудзь правінцыйнай моладзевай “паступовай” газэце у тым самым Самборы ці Каламыі зьявілася б карыкатура на галіцкіх аўтанамістаў: маўляў, што, дачакалі?

Эпілёг

Жарсьці па Львову — гэта жарсьці па мітах, якія ніколі ня спраўджваюцца. Адзін з найтрывалейшых — міт нацыяналізму. Абмеркаваньне нацыянальнага пытаньня тут адбывалася й адбываецца з інтэнсіўнасьцю, якую рэдка можна сустрэць ува Ўкраіне, а можа, нават ува ўсёй Усходняй Эўропе. Кожны, хто жыве ў Львове ці прыяжджае сюды, рана ці позна пачынае глядзець на горад і сьвет праз “нацыянальныя” акуляры. Таму гэты горад і адыгрывае такую вялікую ролю ў нацыянальных — а лепей сказаць, знацыяналізаваных — гісторыях украінцаў, палякаў, габрэяў, а ад нядаўняга часу яшчэ й расейцаў. Гэтыя гісторыі заўсёды фармаваліся пад уплывам страху, што “нам” увесь час нехта пагражае. Таму галоўная функцыя такога міту — забясьпечыць абарону “нашай” ідэнтычнасьці, якая апынулася ў небясьпецы, ды абражанага нацыянальнага гонару. І рэцэпт прапануецца вельмі просты: трэба выдаліць “чужых” і зрабіць горад “нашым”.

Гісторыю Львова можна пераказаць як нізку перамог розных нацыяналізмаў, кожны зь якіх пастанавіў зрабіць горад “сваім”. Апошнім у гэтай чарзе апынуўся ўкраінскі нацыяналізм. Але й ягоная перамога не да канца пераканаўчая. У Львове, як і раней, гавораць пра тое, што ўкраінская культура тут знаходзіцца ў небясьпецы, што яе трэба тэрмінова ратаваць

і г.д. і да т.п. Каб не ператварыць гэтую перамогу ў яшчэ адну чарговую паразу, трэба нарэшце зьняць “нацыянальныя акуляры”. І пабачыць, што ў сьвеце, дзе мы жывём, падзел на “чужых” і “сваіх” надта спрошчаны, і нават згубны. Асабліва калі ў якасьці крытэраў такога падзелу выступаюць мова, колер барэтак ды інтэлігентны твар. Бо насамрэч у кожным з “нашых” сядзіць хаця б кропля “чужога” і “чужыя” пераймаюць звычкі “сваіх”.

Скажы мне, хто твой вораг, і я скажу, хто ты. Гэтыя словы добра тлумачаць, што робіцца ў Львове і зь Львовам. Міжваенны і ваенны ўкраінскі нацыяналізм быў добрым вучнем свайго галоўнага ворага — нацыяналізму польскага, адгэтуль у іх столькі супольных рысаў. Паваеннае ўкраінскае грамадзтва — гадаванец савецкай сыстэмы. Яно не дало асымільваць сябе ў расейскамоўную савецкую культуру, але ягоны сацыяльны капітал немінуча склаўся пад уплывам савецкіх традыцый. Таму “Прывід Палерма” пагражае ня толькі Маскве. Ён вісіць і над нашым горадам. Львоў быў і застаецца найбольш украінізаваным і эўрапеізаваным горадам — але на карце вялікага “савецкага” кантынэнту, што цягнецца ад Брайтан-Біч да Ўладзівастоку.

Заўважыць гэта можна толькі тады, калі час ад часу пакідаеш гэты кантынэнт, а потым вяртаешся назад. Колькасьць жыхароў Украіны, якія ўвесь час курсуюць між тым і тым сьветам, налічвае ўжо мільёны. Ёсьць надзея, што ім ужо ня ўдасца “саветызаваць” Амэрыку ды Эўропу. Наадварот, яны прывязуць разам зь цяжка зароблены мі грашыма яшчэ й іншы, сацыяльны капітал, такі патрэбны для пазытыўных зьменаў дома. І, можа, тады нарэшце зьдзейсьніцца міт пра цудоўны сьвет, дзе рэгулярна ходзяць трамваі, дзе заўсёды ёсьць вада ў ваньне, а ўвечары можна бяз страху ісьці ў кіно. Міт пра цывілізаваны горад на цывілізаваных землях.

Пераклала з украінскай Віялета Кавалёва
паводле часопісу «Критика», № 7—8/2002.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (25) – 2003

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/04/28**
[image]

Цімаці Гартан Эш

Антыэўрапейскасьць амэрыканцаў

ЦІМАЦІ ГАРТАН ЭШ (нар. у 1955) — брытанскі гісторык, пісьменьнік і публіцыст. Выкладае ў St. Antony's College і ў Гувэраўскім інстытуце Стэнфардзкага ўнівэрсытэту. Аўтар шматлікіх кніжак, сярод якіх: Польская рэвалюцыя. «Салідарнасьць»", Historikerstreit. Спрэчка аб месцы Трэцяга Райху ў гісторыі Нямеччыны", У цені Эўропы. Нямеччына

Сёлета, асабліва калі Злучаныя Штаты распачнуць вайну з Іракам, у амэрыканскай прэсе, бясспрэчна, сумневу зьявішча, безьліч артыкулаў аб антыамэрыканізьме эўрапейцаў. А як жа стаіць справа з антыэўрапеізмам амэрыканцаў? Возьмем, напрыклад, такую тэзу: "Да сьпісу сыстэмаў, месца якіх — у эўрапісуары гісторыі, трэба дадаць Эўрапейскі Зьвяз і французскую Пятую Рэспубліку. Пытаньне толькі ў тым, наколькі шмат клопату выкліча іхні распад" (Марк Стэйн, «Jewish World Review», 1.05.2002).

Альбо вось іншая думка: "Выразы "сыраеды, малпы пахківыя" [у адносінах да французаў] ужываюцца ў нас не часьцей, чым у Францыі "дручыць жыдоў". Ох, прабачце, гэта толькі таго, французскі каляквіялізм" (Ёна Гольдбэрг, «National Review Online», 16.07.2002).

Альбо яшчэ, з трохі іншай пэрспэктывы: "Жадаеце ведаць, што я насамрэч думаю пра эўрапейцаў? — пытаецца ўжыны функцыянэр Дзяржаўнага дэпартамэнту. — Думаю, што на працягу апошніх 20 гадоў яны памыляліся ўва ўсіх сур'ёзных

міжнародных пытаньнях” (гэтае выказваньне цытавалі **і паўзелены** 13 лістапада 2002 году Марцін Уокер з інфармацыйнай **кампанент”.** агенцыі UPI).
З увагі на гэткага кшталту думкі я нядаўна выбраўся ў ЗША. Наведаў Бостан, Нью-Ёрк і Вашынгтон, а таксама Канзас і Місуры. Хацеў пабачыць, як зьмяняецца стаўленьне амэрыканцаў да Эўропы ў сьвятле другой вайны ў Пэрсідзкай затоцы. Амаль кожны, з кім я размаўляў, пагаджаўся, што ўзровень варожасьці перасягнуў трывожны стан пачатку 80-х.

Злыя пёры не шкадуюць чорнай фарбы, пішучы пра эўрапейцаў, якіх называюць “эўрасамі”, “эўроідамі”, “эўрапэнсамі” [Europeens] і “эўрапутамі” [Euroweenies].
Такія настроі пануюць і на найвышэйшых узроўнях улады. Рычард Пірл, старшыня Рады абароннай палітыкі ЗША, неяк заявіў, што Эўропа згубіла “маральныя арыенціры”, а Францыя — “маральны хрыбет” («Guardian», 13.11.2002). Падчас размоваў з вышэйшымі функцыянэрамі адміністрацыі Буша я мог асабіста пераканацца, што словы “нашы эўрапейскія сябры” звычайна суправаджаюцца эпітэтам “гемарой”.
Няцяжка ўявіць амэрыканскі стэрэатып эўрапейцаў. Гэта сьлімакі — слабыя, уражлівыя, аблудныя, перасвараныя, часта антысэміты, а яшчэ часьцей капітулянты. Адным словам — “эўрапуты” пад нагамі ў амэрыканскага Гулівэра (яшчэ раз паклон Ёну Гольдбэргу). Іх маральны касьцяк і вартасьці расталі ў цёпленькім шматскладовым, наднацыянальным, сьвецкім і постмадэрнісцкім кампоце. Марнуюць свае эўра на віно, вакацыі ды разьдзьмутае сацыяльнае забесьпячэньне, замест таго каб выдаткоўваць на абарону, а потым сыкаюць з трыбунаў, калі Злучаныя Штаты выконваюць за іх цяжкую і брудную працу, каб яны, эўрапейцы, маглі жыць у бясьпецы. Затое амэрыканцы — цьвёрдыя і рашучыя абаронцы свабоды. Яны высока трымаюць штандар патрыятычнага служэньня апошняй на сьвеце сапраўды сувэрэннай дзяржаве.
Тут было б дарэчы вывучэньне сэксуальных падтэкстаў, схаваных за гэтымі стэрэатыпамі. Наколькі па-антыамэрыканску настроеныя эўрапейцы бачаць у янкі хуліганістых каўбояў, настолькі антыэўрапейскія амэрыканцы лічаць эўрапейцаў пэдыкамі. Амэрыканец — гэта мужны,

гетэрасэксуальны самец, эўрапеец жа — гэта нешта жаноцкае, імпатэнт альбо кастрат. Часам замест “эўнух” у Штатах пішуць “EU-нух”. У вайсковым сэнсе эўрапейцы ні на што ня здатныя (напрыклад, у іх менш за 20 цяжкіх транспартных самалётаў, у той час як у амэрыканцаў больш за 200 такіх машынаў). Пасьля маёй лекцыі ў Бостане немалады амэрыканец прыклыпаў да мікрафона, каб запытацца, чаму Эўропе “не стае зьвярынага напору”. Сэксуальныя мроі пракрадаюцца нават у субтыльны паліталягічны аналіз амэрыканска-эўрапейскіх супярэчнасьцяў. Робэрт Каган з Фонду Карнэгі за мір (Carnegie Endowment for Peace) у слынным ужо артыкуле ў «Policy Review»[1] паважна пісаў пра “амэрыканцаў, народжаных пад знакам Марсу”, у адрозьненьне ад “эўрапейцаў з-пад знаку Вэнэры” (парафраза назвы гучнай кніжкі Джона Грэя “Мужчыны ёсьць з Марсу, а жанчыны — з Вэнэры”, якая апісвае адносіны між полаў). Але ня ўсе эўрапейцы аднолькава кепскія. Брытанцы, напрыклад, лічаць трохі лепшымі. Амэрыканскія кансэрватары, нягледзячы ўвогуле не залічваюць іх у склад эўрапейцаў — ня вельмі абражаць, — што ў большасьці брытанскіх кансэрватараў, духоўных вучняў Маргарэт Тэтчар, выклікае непадробны энтузіязм. А Тоні Блэр — як перад ім Маргарэт Тэтчар, і раней Уінстан Чэрчыль — лічыцца ў Вашынгтоне амаль што пахвалы выняткам з агульнаэўрапейскага правіла.

Найгоршыя мянушкі прызначаюцца французам, і, дарэчы, справа, плацяць амэрыканцам той самай манэтай. І я нават не ўяўляў, наколькі папулярная ў амэрыканскай масавай культуры старая ангельская забава “пакпі з француза”. У казыно «Ameristar» у Канзас-Сыты якісьці вэтэран другой сусьветнай вайны жаліўся: “От мне тыя французы! Мы ім двойчы ратавалі зад, а яны хоць бы чым калі аддзячылі”. У размовах зь ліцэістамі й студэнтамі каледжаў у Місуры й Канзасе я сутыкнуўся зь дзіўным этнічным забабонам — быццам французы ня мыюцца. “Я адчувала сябе вельмі бруднай”, — кажа адна з студэнтак, калі ўзгадвае падарожжа ў Францыю. “Але ўсё ж ад французаў была чысьцейшай”, — дадае іншая.

Двох знаных амэрыканскіх журналістаў — Томас Фрыдман з «New York Times» і Джо Кляйн «New Yorker», якія аб’ехалі краіну ў пошуках матэрыялаў для кніг, апавядалі мне (незалежна адзін ад другога), што паўсюль яны сутыкаліся з

1 *Policy Review*, No 113 (June/July 2002).

антыфранцускімі настроямі. Кожны жарт з французаў выклікае рогат. Ёна Гольдбэрг, кансэрватыўны “змагар з жабаедамі”, рэдактар «National Review Online», які таксама часта выступае па тэлебачаньні, зрабіў папулярным цытаваны ўжо эпітэт “сыраеды, малпы палахлівыя”. Гэты зварот упершыню зьявіўся ў сэрыяле “Сям’я Сымпсанаў”. Як сьцьвярджае сам Гольдбэрг, калі ў 1998 годзе ён пачаў пісаць антыфранцускія анэкдоцікі для «National Review», то адразу ж зарыентаваўся, што “на гэта ёсьць попыт”. Кожныя кпіны з французаў ставалі, як ён кажа, “забойным нумарам”.

1

Натуральна, ня мае сэнсу складаць у адзін кошык нэакансэрватыўную рыторыку, своеасаблівыя ўяўленьні вучаніц з Канзас-Сыты пра гігіенічныя звычкі французаў і заўвагі высокага функцыянэра Дзярждэпартамэнту, а пасьля называць гэта ўсё гуртам антыэўрапеізмам. Не хацелася б трактаваць антыэўрапеізм амэрыканцаў такім самым чынам, якім амэрыканскія аўтары часта трактуюць антыамэрыканізм эўрапейцаў.

Ня трэба блытаць законную і аргумэнтаваную крытыку Эўрапейскага Зьвязу альбо прынцыпаў, якімі цяпер кіруецца Эўропа, з глыбока ўкаранёнай сталай варожасьцю да Эўропы ды ейных жыхароў. Таксама й амэрыканскія публіцысты мусяць ня блытаць (але часта блытаюць) законную й аргумэнтаваную крытыку адміністрацыі Буша з боку эўрапейцаў з антыамэрыканізмам. Таксама як і законную й аргумэнтаваную крытыку ўраду Арыэля Шарона ня трэба разглядаць як праяву антысэмітызму.

Да таго ж, мы ня мусім губляць пачуцьця гумару. Адна з прычынаў пакепліваньня эўрапейцаў з прэзыдэнта Джорджа У. Буша — ягоныя забаўныя выказваньні (альбо фразы, што выдаюцца за ягоныя выказваньні). Напрыклад: “Праблема з французамі ў тым, што ў іх мове няма слова entrepreneur[2]”. Англасаксонская традыцыя высьмейваньня французаў сягае прынамсі Шэксьпіравых часоў.

Але менавіта тут схаваная пастка. Кансэрватыўныя публіцысты, кшталту Ёны Гольдбэрга ды Марка Стэйна, дазва**2** **“Прадпрымальнік”** (анг. *entrepreneur*) скандальныя выказваньні, некаторыя зь якіх ёсьць

жартамі, іншыя гучаць напаўжартам-напаўсур'ёзна, а трапляюцца і такія, што выглядаюць цалкам сур'ёзна. Калі мы пачынаем пратэставаць супраць якога-небудзь цьверджаньня, яны заўсёды могуць адказаць: "А, гэта толькі жарт!" Гумар абапіраецца на перабольшваньні і стэрэатыпамі. Але паспрабуйма сабе ўявіць, што эўрапейскі публіцыст назваў габрэяў "мацаедамі і палахлівымі". Ці лічылася б гэткае выказваньне жартам? Натуральна, кантэкст тут выступае абсалютна ў у ЗША не было генацыду французаў. Аднак гэткі экспэрымэнт павінен прымусіць перасьмешнікаў задумацца.

Антыэўрапеізм — не люстраны адбітак антыамэрыканізму. У аснове першага — раздражненьне, зьмяшанае з зайздрасьцю, у аснове другога — варожасьць у спалучэньні з зайздрасьцю. Антыамэрыканізм можа ператварацца ў сапраўдную нацыянальную манію — як у Францыі, пра што нядаўна пісаў Жан-Франсуа Рэвэль[3]. Амэрыканскі антыэўрапеізм трэніе так далёка. У амэрыканскім грамадзтве хутчэй дамінуе памяркоўная абыякавасьць у дачыненьні да Эўропы, спалучаецца зь неймаверным невуцтвам. Я два дні падарожнічаў па Канзасе і пытаўся ў людзей, якія ў іх "Што вам прыходзіць у галаву, калі я кажу "Эўропа"?". Найчасьцейшай рэакцыяй былі зьбянтэжанасьць і маўчаньне, час ад часу — пахіхікваньне. Пасьля хвіліны рэфлексіі кшталту:

— Ну, я думаю, там асабліва дзе не папалюеш (Вэрнэ Б. Марска, лесасек з Маклаўту).

— Ну, гэта вельмі далёка ад нас (Рычард Соўза, гандляр з Францыі й Партугаліі).

— Кусок дарогі дзесь за акіянам, — адпарыраваў пасьля паўзы Джэк Вайсгар, стары фэрмэр нямецкага паходжаньня. Няма сумневу, што селянін ці лесасек з найдалейшага андалюскай альбо закарпацкай вёскі меў бы больш сказаць на тэму Амэрыкі.

(Газета "Times", 9.07.2002, прыводзіць цытату, пазьней адхіленую, што цытата нібыта належыць Ўільяму Расквайту, карэспандэнту "Ньюсдэй", і ў якой ён расказваў, што ягоны калега Бэрні Шэрлі расказваў, што гэта яму сказаў прыдворны Буш Прэс. Бліцер Асістэр Кемпбэл заявіў, што брытанскі прэм'ер нічога такога не казаў.)

3 Jean-François Revel, *L'Obsession Anti-Américaine* (Paris: Plon, 2002).

У Бостане, Нью-Ёрку і Вашынгтоне мне ўвесь час паўтаралі, што пасьля таго, як халодная вайна скончылася, нават тыя людзі, якія добра ведаюць "кантынэнт"[4], робяцца ўсё абыякавымі да ягоных справаў. Эўропа не разглядаецца як магутны хаўрусьнік, ні як сур'ёзны патэнцыйны моўтай (як Кітай).

"Гэта старэчы прытулак!" — лічыць мой амэрыканскі сябра, які скончыў школу і ўнівэрсытэт у Ангельшчыне. Кансэрватыўны экспэрт Такер Карлсан казаў падчас дыскусіі на CNN (12 чэрвеня 2001 г.): "Каго цікавіць, што думаюць эўрапейцы? Эўрапейскі Зьвяз марнуе час на вызначэньне таго, ці брытанская балёнская кілбаса будзе прадавацца кіляграмамі або фунтамі. Увесь гэты кантынэнт робіцца ўсё менш істотным з пункту гледжаньня амэрыканскіх інтарэсаў". (Думаю, брытанцу цікава было б даведацца, што гэта такое — "брытанская балёнская кілбаса".)

Я спытаўся ў высокага функцыянэра з Вашынгтону, што будзе, калі вайскова слабыя эўрапейцы будуць працягваць крытыкаваць ЗША. Адказ зводзіўся да пытаньня: "Ну і што?" Аднак я адчуваў, што мае суразмоўцы прысьвячаюць зашмат часу й сілаў на пераконваньне мяне ў тым, як мала іх цікавіць Эўропа. Справа ў тым, што перакананыя супраціўнікі Эўропы — як правіла, гэта ня невукі, абыякавыя да ейных праблемаў. Яны ведаюць нашыя краіны — палова зь іх, здаецца, вучылася ў Парыжы ці Оксфардзе — і ахвотна пералічваюць сваіх

4 Ужо больш-менш традыцыі гэта значыць Эўропа, але без Брытаніі

эўрапейскіх сяброў. Амаль усе яны падкрэсьліваюць, што не зьяўляюцца антыэўрапейцамі — гэтаксама, як большасьць эўрапейскіх супрацоўнікаў ЗША катэгарычна адмаўляюць абвінавачаньне, быццам яны ворагі Амэрыцы ("Не зразумейце мяне няслушна, я люблю Амэрыку ды амэрыканцаў").
Толькі Ёна Гольдбэрг не хаваў у размове з мною сваёй антыэўрапейскасьці. Але нават ён папярэджваў, што "эўрапеец" у ягоным разуменьні — гэта левы бюракрат-інтэрнацыяналіст з Парыжу ці Брусэлю, якому здаецца, што ён найразумнейшы ў сьвеце.
Антыамэрыканізм і антыэўрапеізм ляжаць на супрацьлеглых канцах палітычнага спэктру. Першы зь іх чэрпае прыхільнікаў з шэрагаў левых, другі — з правых. Большасьць дэкляраваных амэрыканскіх эўрафобаў — гэта нэаконсэрватары, што адносна нашага кантынэнту паслугоўваюцца той самай ваяўнічай рыторыкай, якую выкарыстоўваюць у дачыненьні да айчынных левых. Для Гольдбэрга "эўрапейцы" — гэта толькі шырма, каб наносіць удары па левых.
— Дык, такім чынам, Біл Клінтан — гэта эўрапеец? — запытаўся я.
— Так, — адказаў ён, — прынамсі, ён мысьліць як эўрапеец.
Здаецца, стаўленьне да Эўропы знаходзіцца таксама ў залежнасьці ад таго, трымаецца чалавек левых ці правых поглядаў. На пачатку сьнежня 2002 году асяродак вывучэньня грамадзкай думкі IPSOS-REID уключыў у свой сталы апытальнік некалькі пунктаў, сфармуляваных адмыслова для гэтага артыкулу. Рэспандэнты мусілі выбраць адно з чатырох цьверджаньняў наконт амэрыканскага й эўрапейскага падыходаў да дыпляматыі й вайны. Погляд, што "эўрапейцы аддаюць перавагу дыпляматычным рашэньням перад ваеннымі і гэта іх добрая рыса, якую амэрыканцы маглі б пераняць", падзяліла 30% электарату Дэмакратычнай партыі і толькі 6% электарату рэспубліканцаў. Затое з супрацьлеглай тэзай — "эўрапейцы занадта схільныя да кампрамісу і не гатовыя бараніць свабоду ў тым выпадку, калі для гэтага даводзіцца ўжываць ваенныя сродкі" — згадзілася толькі 13% дэмакратаў і аж 35% рэспубліканцаў.
Падзел выявіўся яшчэ больш выразна, калі рэспандэнтаў папрасілі выбраць адно з двух цьверджаньняў наконт спосабу вядзеньня вайны ў Іраку. 59% рэспубліканцаў і толькі

33% дэмакратаў палічылі, што “ЗША павінны кантраляваць усю апэрацыю, каб пазьбегчы абмежаваньня іхняга поля манэўру эўрапейскімі хаўрусьнікамі”. Для параўнаньня: погляд, згодна зь якім “каардынацыя дзеяньняў ЗША зь іхнімі эўрапейскімі хаўрусьнікамі неабходная, нават калі гэта абмяжуе магчымасьць прыняцьця самастойных рашэньняў”, падзяляюць 55% дэмакратаў і 34% рэспубліканцаў.
Такім чынам, здаецца, з-пад знаку Марсу ўсё ж паходзяць рэспубліканцы, а з-пад Вэнэры — дэмакраты.

На думку некаторых кансэрватараў, пляцоўкай Вэнэры зьяўляецца таксама… Дзяржаўны дэпартамэнт ЗША. Адзін зь лідэраў амэрыканскіх нэакансэрватараў Уільям Крыстэл пісаў пра “вось саступак, якая цягнецца ад Эр-Рыяду да Брусэлю і Фогі Ботам [Foggy Bottom — рэзыдэнцыя Дзярждэпартамэнту]”[5]. Вандруючы ад Бостану да Вашынгтону, я наслухаўся пра дзьве групы, якія змагаюцца за дабрасклонна вуха прэзыдэнта ў ірацкім пытаньні: з аднаго боку — “Чэйні—Рамсфэлда”, з другога — “Паўэла—Блэра”. Падданыя ангельскай каралевы вельмі, думаю, зьдзівіліся б, калі б даведаліся, што прэм’ер Яе вялікасьці разглядаецца ў якасьці высокага функцыянэра Дзяржаўнага дэпартамэнту ЗША.
Але праатлянтычна настроеным эўрапейцам няма чаго цешыцца, бо нават сярод запісных лібэральных эўрафілаў зь Дзярждэпартамэнту чуюцца галасы расчараваньня ў Эўропе. У найбольшай ступені гэтаму паспрыяла жахлівая параза Эўропы: Эўропа ня здолела прадухіліць вынішчэньне чвэрці мільёна басьнійскіх мусульманаў у сябе пад носам[6]. З таго часу ўжо шмат разоў пацьвярджалася, што эўрапейцы ня ўмеюць “дзейнічаць сумесна” ў пытаньнях замежнай палітыкі ці бясьпекі. Нават спрэчку за бязьлюдную выспачку паміж Гішпаніяй і Марока мусіў вырашаць Колін Паўэл. “Гэта ж несур’ёзныя людзі”, — коратка падсумоўвае Дэвід Ф. Уіл, палітычны камэнтатар-ультракансэрватар, выпадкова шчодрага сьняданку ў вашынгтонскім гатэлі. Хаця Ўіл — чалавек далёкі ад “левых” зь Дзярждэпартамэнту, шмат хто з тамтэйшых лібэралаў пагадзіўся б зь ягонай думкай. З гістарычнага пункту гледжаньня сытуацыя павярнулася на 180 градусаў. Бо якім быў вэрдыкт Нарцыса

5 *Weekly Standard*, August 26, 2002.

6 Гл. мой артыкул “Bosnia in Our Future”, *The New York Review*, December 21, 1995.

Голя наконт амэрыканцаў? “Ils ne sont pas sérieux”

У выпадку брытанскі ўрад займаў нават вельмі эўрапейскія пазыцыі.

2

Такім чынам, цяпер у ЗША назіраецца расчараваньне і раздражненьне, нарастае пагарда, а нават і варожасьць да эўрапейцаў. Чаму так сталася?

Некаторыя тлумачэньні мы ўжо ведаем, падрабязны аналіз усіх вымагаў бы напісаньня цэлай кнігі. Тут магу толькі зьвярнуць увагу на пэўную праблему, якая заслугоўвае глыбейшага разгляду. Але перадусім заўважым, што антыэўрапейскія настроі ўзьніклі ў Злучаных Штатах ня сёньня і ня ўчора. Як акрэсьліў былы рэдактар «Atlantic Monthly» Майкл Келі, “Амэрыка паўстала як антыпод Эўропы”. У сваёй разьвітальнай прамове ў 1796 годзе Джордж Вашынгтон пытаўся: “Навошта зьвязваць наш лёс зь лёсам якой-кольвек часткі Эўропы, аддаючы наш мір і дабрабыт на волю эўрапейскіх амбіцыяў, спаборніцтваў, інтарэсаў, настрояў і капрызаў?” У XIX і XX стагодзьдзях для мільёнаў амэрыканцаў Эўропа была месцам, зь якога ўцякаюць.

Але існавала таксама іншая зьява — сталае захапленьне Эўропай. Яно было зьвязанае з жаданьнем зраўнавацца, а потым пераўзысьці Эўропу, а перадусім дзьве краіны — Ангельшчыну й Францыю. Выразьнікам гэтае тэндэнцыі быў амэрыканскі празаік Генры Джэймз. Томас Джэфэрсан казаў: “Кожны амэрыканец мае дзьве айчыны — уласную й Францыю”. Гісторык і палітоляг Артур Шлезынгер-малодшы нагадваў мне старую прымаўку: “Пасьля сьмерці амэрыканцы трапляюць у Парыж”.

Калі ж стаўленьне амэрыканцаў так рэзка памянялася? Ці ў 1940 годзе, калі Францыя прайграла “дзіўную вайну” і надышоў “час славы” ангельцаў? Ці трохі пазьней, калі генэрал дэ Голь аднаўляў пачуцьцё ўласнай годнасьці французаў у апазыцыі да Амэрыкі, тады як Чэрчыль ствараў “адмысловыя стасункі” паміж дзьвюма нацыямі, да якіх належалі яго бацькі[7]? (У кожным выпадку імёны дэ Голя й Чэрчыля і надалей застаюцца ключавымі для разуменьня сёньняшняга

стаўленьня Шырака й Блэра да ЗША.)

7 Маці Нарчыля Джэрі Джэрам была амерыканкай.

Палову стагодзьдзя, ад 1941 да 1991, Злучаныя Штаты вялікая эўрапейская сям'я вялі вайну супраць супольнага ворага спачатку супраць нацызму, потым — савецкага камунізму. Гэта быў пэрыяд геапалітычнага росквіту Захаду. У гарачыя вайны, натуральна, таксама часам узьнікала напружаньне паміж партнэрамі абапал Атлянтыкі. Некаторыя сёньняшнія стэрэатыпы выявіліся ва ўсёй сваёй красе ўжо на пачатку 80-х гадоў, падчас спрэчак наконт разьмяшчэньня ў Эўропе амэрыканскіх ракетаў «Cruise» і «Pershing». Фармаваліся яны тады ў сьвядомасьці часта тых самых людзей — Рычарда Пірла за ягоную жорсткую лінію праціўнікі тады нярэдка называлі "князем цемры". Раздражняла эўрапейцаў таксама палітыка ЗША ў адносінах да Цэнтральнай Амэрыкі ды Ізраілю. У 1984 годзе на вокладцы часопісу «Economist» зьявіўся малюнак з подпісам "Па чым амэрыканец пазнае эўрапейца". Эўрапеец злым вокам глядзіць на Рэйгана, а сьляпым — на Расею. З подпісу можам даведацца, што эўрапеец — гэта "сьлімак, баязьлівец, заечая душа, якому самаўпэўнена здаецца, што ён усё можа, але рукі па дапамогу ён выцягвае ўсё ж да ЗША".

Аднак тагачасныя спрэчкі ўрэшце сунімала наяўнасьць відавочнага супольнага ворагу — Савецкага Саюзу. Сёньня яго няма. Мы зьяўляемся сьведкамі таго, што гадоў 10 таму прадказваў на старонках «Foreign Affairs» аўстралійскі аналітык Оўэн Гарыс, — зьмярканьня Захаду як магутнай геапалітычнай структуры з прычыны зьнікненьня супольнага ворагу[8].

Эўропа была галоўным тэатрам другой сусьветнай і халоднай войнаў, але не вайны з тэрарызмам. Павялічылася таксама дыспрапорцыя сілаў. ЗША ёсьць цяпер ня толькі адзінай звышдзяржавай — яны сталіся гіпэрдзяржавай, чые ваенныя выдаткі неўзабаве зраўнуюцца з абаронным бюджэтам наступных 15 найбагацейшых краінаў сьвету разам узятых. ЭЗ не выкарыстоўвае сваёй гаспадарчай моцы (сукупны валавы нацыянальны прадукт дзяржаваў — сяброў ЭЗ — набліжаецца да ўзроўню амэрыканскага — 10 трыльёнаў даляраў), каб дасягнуць параўнальнай вайсковай моцы, дыпляматычнай моцы. Ёсьць таксама розьніца ў ступені карыстаньня з уласных магчымасьцяў.

8 "The Collapse of the West", *Foreign Affairs*, Vol.72, No.4 (September/ October 1993).

На думку Робэрта Кагана, Эўропа перайшла ў кантаўскі “сьвет правоў і правілаў, міжнародных перамоваў і міжнароднага супрацоўніцтва”, у той час як Злучаныя Штаты надалей існуюць у гобсаўскім сьвеце, дзе ключом да дасягненьня міжнародных мэтаў застаецца вайсковая сіла. Паўстае пытаньне: ці гэта праўда? Асабіста мне здаецца, што малюючы гэты — прызнаемся, карыкатурны — вобраз, Каган перахвальвае Эўропу ў тым сэнсе, што ён бачыць рацыянальную сумесную дзейнасьць там, дзе па сутнасьці мы маем дачыненьне з сэрыяй спробаў і памылак, а таксама з рознымі нацыянальнымі асаблівасьцямі. Іншае, менш відавочнае, пытаньне гучыць так: ці эўрапейцы й амэрыканцы хацелі б, каб тэза Кагана была праўдзівай? Хіба так. Шмат каму з амэрыканскіх палітыкаў падабаецца думка, што яны з Марсу, тады як шмат эўрапейскіх палітыкаў ахвотна ўважаюць сябе за вэнэрыянцаў.

Эўрапейскі Зьвяз, пашыраючыся, шукае сабе ясьнейшай тоеснасьці. Ён адчувае моцную спакусу самаакрэсьліцца ў апазыцыі да ЗША ды ўдакладняе свой імідж шляхам пералічэньня рысаў, якія розьняць яго ад Амэрыкі.

У пачварным жаргоне дасьледаваньняў самасьвядомасьці Амэрыка сталася Чужою.

Аднак амэрыканцы ня хочуць быць Чужымі — а хто б, зрэшты, гэтага хацеў? Узрушэньне, выкліканае тэрарыстычнай атакай 11 верасьня, толькі ўзмацніла іхнюю гатоўнасьць прыняць вайскова-місіянэрскую ролю ЗША ў сьвеце.

Як заўважыў палітоляг Стэнлі Гофман, і французкі, і амэрыканскі народы аднолькава вераць у сваю ўнівэрсальную цывілізацыйную місію. Сёньня, зрэшты, мы маем справу з агульнаэўрапейскім, а ня толькі французкім, бачаньнем mission civilisatrice — з “(Э)ўтопіяй”, якая гвалтоўна змагаецца з амэрыканскім бачаньнем гэтае місіі ў ягоным новым кансэрватыўным выданьні[9].

Кожны з бакоў уважае сваё бачаньне за справядлівае. Гэта тычыцца ня толькі канкурэнтных мадэляў міжнароднага, але таксама й дэмакратычнага капіталізму — бо зусім па-рознаму разумеюць прапорцыі паміж волевым і сацыяльнай дзяржавай, свабодай асобы і грамадзкай салідарнасьцю і г.д. На думку палітоляга Чарльза А. Кіна-

9. Дж. Калдуэл, Nicolaïdis and Robert Howse, “This is my EUtopia...”

аўтара кнігі “Канец эры Амэрыкі”[10], што нядаўна ўстаноўлены сьвет, усё гэта зьвястуе ні больш ні менш як хуткае “сутыкненьне цывілізацыяў”: эўрапейскай ды амэрыканскай. Наколькі, згодна з Каганам, Эўропа пакутуе ад хранічнай слабасьці, настолькі Капчан уважае менавіта яе за наступнага вялікага праціўніка ЗША. Шмат эўрапейцаў ў гэта вераць, але ў ЗША Капчан бадай адзіны прыхільнік гэткага погляду.

У ЗША мы назіраем яшчэ іншы, глыбейшы працэс. Як я ўжо ўзгадваў, на працягу апошніх стагодзьдзяў падазронасьць у адносінах да Эўропы спалучалася зь зьдзіўленьнем і захапленьнем. Калі сказаць адкрыта, амэрыканцы пачалі ад комплексу культурнай непаўнавартасьці. Дыскурсіўны комплекс паступова зьнікаў і канчаткова зьнік разам з сканчэньнем халоднай вайны і пераходам ЗША ў статус звышдзяржавы. Новы Рым не адчувае больш пашаны да грэкаў. “Калі ў 40-я і 50-я гады я ўпершыню наведаў Эўропу, то адчуваў ейную вышэйшасьць, — напісаў мне вядомы адстаўны амэрыканскі дыплямат з шматгадовым стажам ў Старым Сьвеце. — Гэта не была перавага ў сэнсе сілы, бо я ніколі не пачуваўся прыніжаным, нават чыніў супраць патэрналізмам, але гэта была цывілізацыйная вышэйшасьць. З гэтым скончана. Амэрыка больш не адчувае сябе правінцыяй

Narcissus as Power”, *Journal of Common Market Studies*, Vol. 40, No. 4 (November 2002).

10 Гл. ягонае “The End of the West” in *The Atlantic Monthly*, November 2002, і адказ Эўропы “The End of the American Era: US Foreign Policy and the Geopolitics of the Twenty-first Century” (Knopf, 2002).

11 E-mail аўтару ад пасла Томаса У.Сайманса, 16 траўня 2002, на цытаваньне якога я атрымаў дазвол аўтара. Майкл Ледын выказвае гэта шчырэй: “Размовы

ў Амэрыцы цікавейшыя”, — піша ён, а “ў эўрапейцаў застой у галовах”. Цытую паводле American Enterprise Institute, *The American Enterprise* , December 2002. Гэты нумар, тэма якога сфармулявана як “Continental Drift: Europe and the US Part Company”, — сапраўдная анталёгія амэрыканскіх правых поглядаў на Эўропу з фантастычным камэнтаром Марка Стайна: “Мне лягчэй з большым аптымізмам глядзець на будучыню Іраку і Пакістану, чым, напрыклад,

Галяндыі і Данії”.

3

Па заканчэньні халоднай вайны ўсе гэтыя тэндэнцыі былі згладжаныя з прычыны васьмігадовай прысутнасьці ў Белым доме “пачэснага эўрапейца” Біла Клінтана. Аднак у 2001 годзе там пасяліўся Джордж У. Буш, хадзячы падарунак усім эўрапейскім па-антыамэрыканску настроеным карыкатурыстам, які пасьля 11 верасьня акрэсьліў сваю прэзыдэнтуру як “ваенную”. Перакананьне, што Злучаныя Штаты знаходзяцца ў стане вайны, сёньня наймацней адчуваецца ў Вашынгтоне, а дакладней, у колах прэзыдэнцкай адміністрацыі. Вайна з тэрарызмам узмацніла давер рэспубліканскіх элітаў да чагосьці, што Робэрт Каплан называе “ваяўнічай палітыкай” з моцным дамешкам хрысьціянскага фундамэнталізму. Падобную сумесь цяжка сабе ўявіць у глыбока сьвецкай Эўропе. Уолтэр Расэл Мід з Рады па міжнародных адносінах сьцьвярджае (у кніжцы “Special Providence”)[12], што амэрыканскай замежнай палітыцы ажыла “джэксанаўская” тэндэнцыя[13]. Тэрарысты з «Аль-Каіды» сталіся новымі крывавымі іракезамі.

Як акрэсьліў тое ў размове з мною кансэрватыўны публіцыст Чарльз Кротамэр, амэрыканцы пытаюцца ў эўрапейцаў “Чаму вы з намі ў гэтай вайне ці не?” Спачатку адказам быў моцны “так”. Хто ня памятае загалоўку з “Le Monde”: “Nous sommes tous des Américains”[14]? І вось праз паўтара году адзіным эўрапейскім кіраўніком, які, на думку амэрыканцаў, знаходзіцца на іхнім баку, застаўся Тоні Блэр. Гэта пацьвярджае апытаньне IPSOS ад 3—5 сьнежня 2002 году. На пытаньне “Якая краіна выяўляе найбольшую салідарнасьць з ЗША ў іхнім змаганьні зь Іракам?” 59% рэспандэнтаў адказалі — Вялікабрытанія. Наступныя месцы занялі Ізраіль (у 38%), Канада (7%), Францыя (4%), Нямеччына і Расея (па 3%). І хто ў Вашынгтоне лічыць, што Францыя вярнулася на шлях даўнія антыамэрыканскія пазыцыі, а нямецкаму канцлеру Гергарду Шродэру ўдалося перамагчы на леташніх выбарах дзякуючы цынічнаму выкарыстаньню антыамэрыканскіх настрояў.

Шляхі эўрапейцаў і амэрыканцаў пачалі разыходзіцца пачатку 2002 году адначасова з эскаляцыяй ізраільска-

12 **Special Providence: American Foreign Policy and How It Changed the World** (Routledge, 2002).

13 **Ад прозьвішча** 7-га прэзыдэнта ЗША (у 1828—36 гг.), які шукаў **апору** ў **шырокіх** **масах.**

14 **“Мы ўсе — амэрыканцы”,**

палестынскага канфлікту. Блізкі Ўсход зьяўляецца крыніцай і каталізатарам шмат якіх пачуццяў, уключна з радыкальным эўрапейскім антыамэрыканізмам і нованароджаным амэрыканскім антыэўрапеізмам. Крытыка ўрадаў Шарона з боку эўрапейскіх палітыкаў выклікала самыя зьедлівыя антыэўрапейскія камэнтары амэрыканскіх публіцыстаў, у якіх не-не дый прамільгне абвінавачаньне эўрапейцаў у антысэмітызьме. Як мне заявіў адзін левы габрэйскі выдавец, аўтары гэткіх камэнтароў часта ня проста займаюць праізраільскія пазыцыі, яны “прыроджаныя лікуды”.

“Гэтыя людзі, — пісаў нядаўна палітоляг Стэнлі Гофман, — здаецца, перакананыя ў адзінстве інтарэсаў габрэйскай дзяржавы і Злучаных Штатаў”[15]. Прапалестынскія эўрапейцы, абураныя тым, што крытыку Шарона ў ЗША выдаюць за антысэмітызм, пачынаюць гаварыць пра моц “габрэйскага ўплыву” ў Амэрыцы. Гэта пацьвярджае найгоршыя падазрэньні амэрыканскіх камэнтатараў наконт эўрапейскага антысэмітызму. І гэтак кола замыкаецца.

За безнадзейнай блытанінай узаемных забабонаў хаваецца ясная рэч, сапраўдная розьніца ў поглядах на праблему Блізкага Ўсходу. Эўрапейскія палітыкі, напрыклад, схільныя меркаваць, што дасягненьне ізраільска-палестынскага паразуменьня больш дало б для канчатковай перамогі ў вайне з тэрарызмам, чым інтэрвэнцыя ў Іраку.

З нашага пункту гледжаньня цікавым выглядае больш агульнае назіраньне: калі ўсходнеэўрапейская халодная вайна з камунізмам яднала Эўропу з Амэрыкай, то блізкаўсходняя “вайна з тэрарызмам” аддаляе іх адну ад другой. Савецкі Саюз яднаў Захад, Блізкі Ўсход яго разьядноўвае.

Калі паглядзець на рэчы цьвяроза, такое разьядананьне — поўнае глупства. Для Эўропы, што суседзіць з буйной, усё буйнейшаю папуляцыяй мусульманаў, мір, дабрабыт і дэмакратыя на Блізкім Усходзе зьяўляюцца непасрэднай жыцьцёвай праблемай — значна большай, чым для ЗША.

Я размаўляў з двума высокімі функцыянэрамі вашынгтонскай адміністрацыі, і ім спадабалася думка, выказаная некаторымі амэрыканскімі аналітыкамі, што новай вялікай задачай новага адзінага Захаду мусіць стаць дэмакратызацыя Блізкага Ўсходу

гэткімі нацыянальнымі і каталізатарам радыкальным французскай Шарона з боку абвяшчала ідэі якіх ня ўзаемнасьці гэткіх выбухаў 11 верасьня.

15 Stanley Hoffmann, “The High and the Mighty”, *The American Prospect*, January 13, 2003.

і сумежных краінаў. Адно што пакуль такое разуменьне ня стала явай.
Пакуль здаецца, што вайна з Іракам толькі паглыбіць разлом паміж Эўропай і Амэрыкай. Але нават калі ўрэшце да вайны ня дойдзе, Блізкі Ўсход застанецца катлом, у якім праўдзівы ці ўяўны антыамэрыканізм эўрапейцаў будзе правакаваць праўдзівы ці ўяўны антыэўрапеізм амэрыканцаў, а абодва гэтыя пачуцьці будуць жывіцца павярхоўнымі абагульненьнямі наконт эўрапейскага антысэмітызму. Зьмяніць сытуацыю можна было б толькі супольнымі высілкамі абодвух бакоў альбо з абраньнем у Белы Дом новае адміністрацыі ў 2005 ці 2009 годзе. Але пакуль такое станецца, яшчэ шмат шкоды можа зрабіцца зь цяперашняга стану.
Можна лічыць, што само пісаньне пра амэрыканскі антыэўрапеізм накручвае сьпіраль узаемнага недаверу. Аднак публіцысты — не дыпляматы. Амэрыканскі антыэўрапеізм існуе, а ягоныя вестуны могуць стацца першымі ластаўкамі іншых, кепскіх часоў.
Пераклаў з «New York Review of Books» Ігар Лялькоў
з ласкавае згоды выданьня

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/04/25**
[image]

Валер Булгакаў

Новае ў лукашэнкаўскай ідэалёгіі: Антырасійская гістэрыя і нацыяналістычны папулізм

ВАЛЕР БУЛГАКАЎ (нар. 1974 г. у Менску) — публіцыст. Апошняя публікацыя ў часопісе — артыкул “Пра клясычныя і неклясычныя нацыяналізмы” («ARCHE»-Андрэй Хадановіч).

Неўзабаве па мясцовых выбарах Лукашэнка чытаў прамову па ідэалёгіі беларускай дзяржавы. Яна зьмяшчае набор тэзысаў, якія дазваляюць па-новаму зірнуць на прынцыпы ажыцьцяўленьня культурнай, інфармацыйнай, адукацыйнай і іншай палітыкі ў краіне.

Палітычны момант, на які прыпала Лукашэнкава прамова, схіляе да думкі, што рэжым цяпер або імкнецца мабілізаваць дзяржаўны апарат напярэдадні важных палітычных падзеяў (напрыклад, рэфэрэндуму, на які мае быць вынесенае пытаньне аб падаўжэньні прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі), або проста стабілізаваць сыстэму дзяржаўнай улады ў краіне.

У кулюарах дзейкаюць, што правядзеньне гэткага рэфэрэндуму — справа ўжо вырашаная, і называюць нават яго прыблізную дату — сёлетні лістапад.

Для той канструкцыі дзяржаўнай улады, якая існуе цяпер у краіне, калі прэзыдэнт фактычна зьяўляецца рэччу ў сабе і ў юрыдычным сэнсе не належыць да выканаўчай або заканадаўчай улады, для павелічэньня аб'ёму яго ўладных паўнамоцтваў або іх падаўжэньня надзвычай пажадана рэгулярна заручацца народнай падтрымкай. Тым самым фармальна выконваецца дэмакратычная працэдура: народ як адзіная крыніца ўлады надзяляе шырокімі паўнамоцтвамі яе найвышэйшага прадстаўніка. Пры ўсёй палітычнай прывабнасьці і нават мэтазгоднасьці гэткага мерапрыемства з пункту гледжаньня лукашэнкаўскай адміністрацыі існуюць чыньнікі, якія рэзка зьніжаюць імавернасьць яго ажыцьцяўленьня ў кароткатэрміновай пэрспэктыве. Гэтая акцыя можа па часе супасьці з палітычным торгам вакол усенароднага прыняцьця "канстытуцыйнага акту саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі", і неўнясеньне ў выбарчыя бюлетэні пытаньня аб гэтым акце можа быць балюча ўспрынята ўсходнімі партнэрамі Лукашэнкі. Шанцаў жа, што сёлета гэткі акт будзе прыняты на ўсеагульным галасаваньні, бадай няма.
Магчыма, праблемай для лукашэнкаўцаў будзе недапушчэньне злоўжываньня палітычнай ляяльнасьцю масаў, г. зн. можа быць вырашана, што гнаць выбарца двойчы на год да выбарчых урнаў таксама палітычна немэтазгодна. Акрамя таго, вельмі прывабна выглядае пэрспэктыва сумяшчэньня з рэфэрэндумам парлямэнцкіх выбараў 2004 году — камбінацыя, выпрабаваная ў 1995 і 1996 гадах.
Таму мы схіляемся да думкі, што стратэгічная мэта рэжыму палягае не ў мабілізацыі дзяржапарату (прамова была прачытаная "на стала дзейным сэмінары кіраўнічых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў") перад абліччам новых палітычных узрушэньняў, а хутчэй у стабілізацыі палітычнай сыстэмы Беларусі (толькі такая стабільнасьць забясьпечыць бясконца працяглыя прэзыдэнцкія паўнамоцтвы "няўрымсьлівага Аляксандра").

Прынамсі ў Менску мясцовыя выбары паказалі, што Лукашэнка не дапускае канкурэнцыі кланаў у сваім атачаэньні. Калі ў 2000 годзе падчас выбараў у Палату прадстаўнікоў кланавыя лідэры маглі пасьпяхова лабіраваць сваіх кандыдатаў у дэпутаты (напрыклад, паводле вартай даверу інфармацыі, Уладзімер

Навасяд здабыў дэпутацкі мандат дзякуючы пратэкцыі Ўладзімера Канаплёва, аднаго зь лідэраў т. зв. магілёўскага клану; нагадаем, што з Магілёва паходзіць і сам Навасяд), то сёлета на мясцовых выбарах кандыдатамі ад “партыі ўлады” былі бадай выключна *беспартыйныя* пэдагогі, дактары і прадстаўнікі такіх прафэсіяў, якія традыцыйна ня схільныя або нават няздольныя да адстойваньня сваіх карпаратыўных інтарэсаў перад палітычным кіраўніцтвам краіны. Інакш кажучы, палітычная стабілізацыя атаясамліваецца Лукашэнкам з уніканьнем канкурэнцыі паміж кланамі ў сваім найбліжэйшым атачэньні, зьніжэньнем іх лабісцкага патэнцыялу і здольнасьці да вядзеньня самастойнай палітычнай гульні.

У тэксьце прамовы гэтая стратэгія палітычнай стабілізацыі набывае выразнае ідэйнае гучаньне. Падымаючы дзясяткі розных пытаньняў, Лукашэнка пастаянна гаворыць пра сваю асноўную амбіцыю, свайго роду вянок сваёй палітычнай кар’еры: ён хоча быць ня проста выбраным на пару ці хай сабе на дзесяць тэрмінаў прэзыдэнтам. Яму рупіць разглядаць сваё прэзыдэнцтва ўсяго толькі як спосаб закласьці доўгатрывалыя палітычныя традыцыі, якія перажывуць яго палітычны або фізычны канец. А каб увекавечыць сваё імя на стагодзьдзі, трэба даць неперасягальныя ўзоры рэальнай палітыкі і палітычнага мысьленьня.

Калі рэальная палітыка ў дусе Лукашэнкі давяла сваю адносную эфэктыўнасьць, то каэфіцыент карыснага дзеяньня яго палітычнага мысьленьня ўсё яшчэ застаецца пад пытаньнем. Відаць, каб разьвеяць у дзяржаўнага апарату апошнія сумневы ў сваёй тэарэтычнай кампэтэнтнасьці, Лукашэнка і прачытаў гэтую прамову.

У ёй Лукашэнка дыягнастуе слабасьць і бездапаможнасьць афіцыйнай ідэалёгіі і афіцыйных ідэолягаў ня толькі зь дзяржапарату, але й з адукацыйнай сфэры, шаблённасьць і прадказальнасьць іх дзейнасьці. Цытуючы Янку Купалу і беларускую Канстытуцыю, Лукашэнка патрабуе, каб былі выпрацаваныя аўтэнтычна беларускія ідэалягічныя формулы, “народжаныя і выпакутаваныя нашым народам”, не прымаючы як тых, хто заклікае, паводле ягоных слоў, “давайце зробім як на Захадзе”, так і тых, хто хацеў бы “вярнуцца да савецкай практыкі”. Шукаючы “ідэалягічныя асновы сувэрэннай

незалежнай дзяржавы”, ён робіць экскурс у гісторыю, да Вялікага Княства Літоўскага, Беларускай Народнай Рэспублікі і, нарэшце, да БССР, ад якой, па словах Лукашэнкі, і пачынаецца традыцыя нашай дзяржаўнасьці. Ён доўга і падрабязна крытыкуе беларускі нацыяналізм і беларускіх нацыяналістаў за тое, што яны праводзілі падзелы ў грамадстве паводле нацыянальнай і моўнай прыкметы, каб пасьля перайсьці да маштабу ўсяго сьвету й разгледзець тры глябальныя ідэалёгіі — марксізм, кансэрватызм і лібэралізм (марксізм і кансэрватызм у ягоным разуменьні досыць блізкія беларускай душы, а лібэралізм — бясконца далёкі). Нацыяналізм як асобную ідэалёгію Лукашэнка не вылучае, відаць, з той прычыны, што да канца ня вызначыўся наконт ступені яго блізіні да беларускай душы.

Як падлічылі журналісты, слова “Захад” у ягонай прамове сустракаецца часьцей, чым слова “Расія”. На новай лукашэнкаўскай візіі Расіі варта спыніцца. Расія, на яго думку, перастае быць культурным і духоўным узорам, а таксама прыкладам у тэхналягічным і эканамічным пляне. Вінаватай у гэтым прызнаецца эканамічная трансфармацыя краіны апошняга дзясятка гадоў, калі зьявіліся сыравінавыя алігархі і несправядліва выкарысталі нацыянальныя расійскія багацьці. Лукашэнка мае рахункі і да сёньняшніх расійскіх палітычных элітаў, якія абвінавачваюцца ў палітычна разбуральнай дзейнасьці. Рэзкая ацэнка даецца Расіі і ў сувязі зь яе падрыўной інфармацыйнай актыўнасьцю, якая перашкаджае дасягненьню палітычнай стабільнасьці ў краіне. Нацыяналізму адраджэнцаў першай паловы 90-х гадоў XX стагодзьдзя Лукашэнка супрацьстаўляе ўласны нацыяналізм. Па сутнасьці, Лукашэнкаў нацыяналізм мала адрозьніваецца ад гэтага “адраджэнскага” нацыяналізму — ён грунтуецца на ўсьведамленьні нацыянальнай выключнасьці (у трактоўцы Лукашэнкі Беларусь паўстае адзінай краінай ува ўсходняй Эўропе, якая “адкрыта прапаведуе вернасьць нашым традыцыйным цывілізацыйным вартасьцям”), сьцьвярджае “свой асаблівы шлях” (само гэтае паняцьце — абавязковы атрыбут усходнеславянскіх нацыяналізмаў), настойвае на дэманізацыі “чужых” у нацыянальнай карціне сьвету (пасьля Захаду гэтым “чужым” няўхільна стаецца Расія), ганарыцца

нацыянальнай культурнай спадчынай (“...беларускае грамадзтва павінна разьвівацца… у рамках уласнай культурнай традыцыі”), процістаўляе залежную дзяржаўнасьць савецкага часу “незалежнай дзяржаўнасьці” сёньняшніх дзён і г.д. У Лукашэнкавай прамове шмат палітычнага славаблудзтва, якое надае ёй цімала эклектычнасьці і адцяняе гэты нацыяналістычны патас. Да таго ж яна вельмі неаднародная стылёва й структурна: частку, нашпіганаваную сухімі навуковымі фармулёўкамі, відаць, пісаў нехта накшталт акадэміка Яўгена Бабосава, у разьдзеле пра СМІ адчуваецца рука рэдактара Паўла Якубовіча, а ў фармулёўках пра Беларусь як духоўную лідэрку ўсходнеэўрапейскай цывілізацыі ўгадваецца стыль Эдуарда Скобелева. Пэўную яе частку складаюць спантанныя выказваньні самога Лукашэнкі, якія руйнуюць выгадны як уладам, так і апазыцыі стэрэатып пра яго як пра “ваабшчэ ненармальнага калгасьніка”. Лукашэнка, па ўласным прызнаньні, глядзіць «CNN», «Euronews» і «BBC», чытае “Рухнаму” Сапармурата Туркмэнбашы Ніязава ў перакладзе на беларускую мову, слухае скандальную расійскую поп-групу «Тату», называе расійскага пісьменьніка Міхаіла Булгакава клясыкам і высока ацэньвае ваяцкія здольнасьці чачэнскіх сэпаратыстаў.

Сам факт рэвізіі дзяржаўнай ідэалёгіі недвухсэнсоўна паказвае, што нарэшце на самым палітычным версе зразумелі, што толькі заснаваная на эгалітарысцкіх лёзунгах ідэалёгія сацыяльнага папулізму, пад сьцягам якой Лукашэнка прамаршаваў першую пяцігодку сваёй прэзыдэнтуры, ніяк ня можа служыць асновай для кансалідацыі ўсяго грамадзтва. Але на зьмену сацыяльнаму папулізму рэжымам прапаноўваецца ідэалёгія, жыцьцяздольнасьць якой будзіць ня меншыя пытаньні, — яе можна вызначыць як нацыяналістычны папулізм або папулісцкі нацыяналізм. Яна будуецца сваімі канструктарамі з крутой сумесі асобных элемэнтаў клясычнай нацыяналістычнай дактрыны, каляніяльных культурных комплексаў і традыцыйных вартасьцяў дамадэрнага грамадзтва. Колькі яшчэ часу ў галовах вышэйшых урадоўцаў зможа мірна суіснаваць нацыяналістычны міт пра гістарычную абранасьць беларускай нацыі з публічнымі кпінамі зь беларускай мовы, сказаць цяпер ня ў стане ніхто. Але няма сумневу, што й гэтую пачварную

мяшанку раней ці пазьней чакае перагляд.
Пакуль жа пад гэты шумок працягваецца выцісканьне зь беларускай інфармацыйнай прасторы расійскіх электронных СМІ, распрацоўваюцца праекты новай адукацыйнай палітыкі і стварэньня новай ідэалягічнай вэртыкалі.
Ня трэба ўводзіць сябе ў зман: асучасьніваньне дзяржаўнай ідэалёгіі, курс на палітычную стабілізацыю не нясе нічога добрага грамадзтву. Гэта выразны знак, што пакуль Лукашэнка ні з кім не зьбіраецца дзяліцца сваёй уладай, не зьбіраецца і перадаваць яе свайму дэмакратычна абранаму пераемніку. Закуты ў браню проста каралеўскіх паўнамоцтваў, беларускі аўтакрат здаецца непераможным. Да наступнага крызысу падноўленай ідэалёгіі?

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/04/29**
[image]

Ева Вежнавец

Гаючая нянавісьць

ЕВА ВЕЖНАВЕЦ — сталая аўтарка «ARCHE». Апошняя публікацыя ў часопісе — аповед “Ня варта азірацца” («ARCHE» № 1 (24) 2003).

1. Вяртаньне фэміністкі на Ўсход

У вагон № 655 цягніка Кёльн—Масква ўвайшлі жанчына й мужчына, абое ў сьветлых плашчох і цёмных акулярах. Жанчына сказала маладому вусатаму правадніку (з выгляду — выкапаны Георгі Буркоў, расейцы такія падобныя адзін да аднаго):

— Мы хотим ехать вместе. Никаких мужских и женских купе!

Праваднік па-змоўніцку выгнуўся і праказаў нізкім інтымным голасам:

— Может, хотите ехать вдвоём, только вдвоём?

— Вы поощряете порок? — запытала кабета, а мужчына раздражнёна дадаў:

— Необязательно вдвоём. Мы просто хотим вместе напиться.

І расчараваны праваднік падсадзіў іх да старога брывастага паляка, які неўзабаве сышоў. “У казырных цягнікох заўжды праваднікамі езьдзяць такія вось спрытныя мужыкі. Хаця ўвогуле гэта жаночая прафэсія”, — падумала жанчына.

Гэтыя двое пасажыраў былі слыннымі дзеячамі беларускага фэмінісцкага руху. Зьміцер быў адзіным на ўвесь край фэміністам, таму ён, як фэномэн і рарытэт, у два разы часьцей

выяжджаў на захад, чым любая фэміністка. Аза — вядомая змагарка з сэксізмам. Яны вярталіся зь міжнароднай канфэрэнцыі ў Аахене, прачытаўшы даклады, паслухаўшы іншых ды адвёўшы душу ў кулюарах. Ехаць ім было больш за суткі. Запаланіўшы купэ Gepak'ам (пудэлкі й торбы), яны пазалазілі на верхнія паліцы нязручнага "дэдээраўскага" вагону і, лежачы там, як у трунах, то драмалі, то вялі дарожную гутарку, папіваючы віно з тэтрапакаў і закусваючы сырам, які так добра ўдаецца галяндцам — "сырным галовам". Зьлёгку хвоснуўшы, яны загаварылі пра сваю прафэсію — фэмінізм. Абое з зайздрасьцю згадвалі каляжанак, што адразу з Аахену паехалі ў Гётэбарг — на наступнае фэмінісцкае зборыска. Урэшце, уставіўшы вочы ў днішча Азінай паліцы, Зьміцер запытаўся:
— Ты што, сапраўды верыш у гэты фэмінізм? Сьмешна мне зь цябе. Ты хіба ня ведаеш, што галоўную фэміністку, Ларачку, ейны Міша вакол хаты ганяе, лупіць, калі захоча. А так дык яна фэміністка ого-го!
Аза ўзгадала бледны маленькі Лараччын тварык, вялікія спалоханыя вочы, дзьвюх такіх жа бяленькіх дачушак па бакох і прызналася:
— Яе так і хочацца адлупцаваць.
— Тыповая ахвяра, — пацьвердзіў Зьміцер з свае паліцы. — І ёй гэта падабаецца, магу засьведчыць. Яна абагаўляе сваго Мішу. Лара — фэміністка! Ды такіх фэмініст ак ракам да Масквы не пераставіш.
— Стоп! Брашы ды меру знай: сэксісцкі выраз.

— А ўзяць Любу, — гнуў далей Зьміцер, — кіруе паўсотняю фэмініст ак, сэмінары ладзіць, па тэлевізіі і ў газэтах шум, гендэрныя перакосы выкрывае, а ведаеш, як ейны Ромік яе малоціць?
— Любу — Ромік?! Малоціць?!!
— І варта. Люба ні ў чым меры ня знае. Я б яе тоўк як грушу.
— Як ты можаш так казаць? Як ты можаш быць такі цынічны? Збудаваў кар'еру на фэмінізьме, а выказваешся як бугай!!!
Я распавяду гэта на радзе. Ты адусюль вылеціш.
— Ня вылечу. Цябе ніхто не паслухае.
— Чаму гэта?
— Бо фэміністкі нашыя мяне абагаўляюць. Сілу ўва мне чуюць.

Я ніводнай кабеце ня быў такі патрэбны, як фэміністкам. Звычайная кабета, што верне воз па жыцьці, і з слабым мужчынам пражыве й ня пікне. А фэміністкі ў Беларусі ўзьняліся праз адсутнасьць моцнага мужчыны.
Аза аж утрупянела ў сваім пэнале. Зьміцер заўсёды быў парадаксаліст, але не да такой ступені. Яна зьвесілася з паліцы і зірнула на спадарожніка: той насьмешліва глядзеў на яе прыпухлымі ад ляжаньня вочкамі.
— Калі б мяне хоць раз хто ўдарыў, — урачыста прамовіла Аза, — я б яму твар набок зьвярнула… Божа, Божа, каб гэта Любу білі. Яна ж здаровая жанчына, ня мышка якая.
— Ну, Ромік усё ж мацнейшы.
— Яна можа прымяніць інструмэнтарыю…
— Тады ён ачухаецца і зусім Любу заб'е.
— Я зразумела. Ты хлусіш! Пацяшаешся зь мяне. Бурыш мой сьветагляд.
— Ды нашто табе гэты сьветагляд? Ты ніякая не фэміністка! Ты безь мяне кампутару не магла выбраць, торбы на вакзале пагубляла, гатэльны прас спаліла. Прасторавага ўяўленьня ў цябе няма, блудзіш у трох кварталах, кантынэнтальная ідыётка!!! Ты прападзеш, варта табе застацца адной. Галаву згубіш.
— Гэта не прыкмета полу. Я проста разявака.
— Вам можна адчыняць клюб разявак і варон, і ўсе там будуць бабы. І мая Вэроніка, і ты, і Любка, і Лара, і ўсе нашыя сяброўкі. Вэроніка за два месяцы чатыры камплекты сосак спаліла. Кожны раз вязу новыя патэльні ці рондалі дахаты. Кожны дзень малюся, каб ключы не згубіла, машыну ў слуп не ўпіліла, пажару не нарабіла. Фэміністкі!
Адчуўшы ў апошніх словах асабістую драму суразмоўцы, Аза далікатна змоўкла. І ці мае сэнс увогуле зь ім спрачацца? Аднак вось жа дзіўна: езьдзіць чалавек, даклады правільныя чытае пра гендэр, а сам — звычайны шавініст з комплексамі.

Адчуўшы прыступ кляўстрафобіі, Аза вылезла з пэналу ды пайшла ў тамбур. Вусаты праваднік, прапускаючы яе, зазірнуў у твар. Яўна ня супраць завесьці знаёмства, раз ужо яна вольная. Аза насупіла бровы і ўзьняла ўгару сваю гусіную галоўку. Праваднік адступіўся. Палячы ў тамбуры, яна думала пра тое, што вось жа пасадзіў праваднік пяцёх азэрбайджанцаў

да Масквы і з кожнага ўзяў па 50 эўра. Гэта 250 эўра за адну паездку. Выгадна! Не, ня дзіва, што тут ніводнае правадніцы няма. Мужчыны захапілі ўсе сонечныя бакі: што ў цягнікох, што ў фэмінізьме. А жанчыне, каб прабіцца, трэба быць або моцнай, як конь, альбо падлабуніцца да мужчыны. Узяць, напрыклад, ейную сяброўку, што пару гадоў таму выйшла за галяндца, нарадзіла дваіх дзяцей і цяпер жыве сабе прыпяваючы хатняй гаспадыняй. Аза адведала яе ў ейным шчасьці і цяпер запухае ад зайздрасьці, як ад сьвінкі. Прыяцелька жыве ў ціхім прадмесьці, дзе можна было сесьці ў белых шортах на брукаванку й не забрудзіцца, дзе па вуліцах бегалі зайцы, а ў прысядзібных садкох ужо ў сакавіку заліваліся салаўі. Прытым у 20-тысячным мястэчку ёсьць танная саўна на 15 заляў, некалькі вялікіх і малых крамак са сьляпучым выбарам тавараў, шмат рэстарацыяў і кінатэатар на 10 заляў. Пры кожным дамку — некалькі аўто і яхта на чатырох стойках, як папуаская хаціна. Ежу й пітво купляюць скрынямі. Каміны паляць яблыневымі дровамі. Усе вітаюцца між сабой. Марына памаладзела, расквітнела, ейны мужык набыў ёй мэдычную страхоўку, і ёй памянялі зубы, прыбралі ўсе жаночыя хваробы, праапэравалі гаймарыт, перад якім капітулявалі беларускія лекары.

Марына радавалася, што ёсьць перад кім пахваліцца сваім шчасьцем.

— Помніш, як я перажывала, як мой тумкач мяне кінуў? Плакала, вены рэзала. А цяпер так рада, што ня выйшла за яго. Як ад'яжджала сюды, то думала: бывайце, слабакі і рабакі. Хоць здохніце. Так мяне дасталі беларусікі нашыя. Я, як Алесік сышоў, ачуняла і вырашыла: трэба цяпер розумам жыць, а не эмоцыямі. Ведаеш правіла Парэта "Дваццаць — восемдзесят"? Яно вучыць, што 80 % кліентаў ствараюць 20 % таваразвароту. А ёсьць 20 % кліентаў, якія твораць 80 % таваразвароту. Любы разумны чалавек улічвае правіла Парэта і ставіць на эфэктыўных кліентаў. А я пачала ставіць на іншаземцаў. Любіць багатага можна гэтак жа, як і беднага. І нават болей. І мужчыны тут не скукожаныя ад беднасьці. І я ў парадку, і дзеці ў мяне нармальныя, здаровыя, харошыя. Гэта проста ідэальнае выйсьце для жанчыны з усходу. Муж дае табе спакой і дабрабыт (падарожжы, сапраўдную ежу й мэдыцыну, магчымасьць падоўжыць прыгажосьць). Ты яму — ляяльнасьць,

добрае выхаваньне і згоду сядзець дома. Плюс некалькіх дзяцей.
— А хто ж застанецца нашым мужчынам?
— Ты за іх не турбуйся, а лепш за сябе паперажывай. І ім нехта застанецца.
— Бачу, табе тут добра.

— Ты ж ведаеш, я ніколі не хацела працаваць за капейкі. Люблю сядзець на шыі. Не люблю браць на сябе адказнасьць. Тут я дапамагаю мужу ў офісе й вяду дом. Заўжды на другіх ролях, заўжды любая й свабодная. У выпадку разводу буду забясьпечаная на ўсё жыцьцё. А ты чым можаш пахваліцца? Я ж ведаю твайго Славіка. На ім дзе сядзёш, там і зьлезеш. Вечна ты на перадавой, уся ў бінтах і ў мыле. Уцякай ты адтуль, там хутка ўсё вагінай накрыецца.
— Накрылася даўно.
На разьвітаньне сяброўка, крыва ўсьміхнуўшыся, сказала: “Помніш, як у студэнцкія гады мы толькі й думалі, што пра каханьне. Як мала яно вызначае ў жыцьці, аказалася!”
І Аза мусіла згадзіцца.
Купіўшы кампутар і камбайн, а таксама атрымаўшы ад сяброўкі мех шмотак сэканд-хэнд, Аза паехала дамоў. І цяпер, палячы ў тамбуры цягніка Кёльн—Масква, перажывала. Яна ведала, што яе чакае дома. Мінулым разам, вярнуўшся з Амэрыкі, Аза два тыдні ляжала на канапе й п’янчылася. Трэба прайсьці праз запой, каб пераладавацца ад Амэрыкі да роднага пякелца. Аза ўсё стаяла ў тамбуры, калі цягнік пераваліў зь Цярэспалю ў Берасьце. Адразу ж — сьнег і золь. У Менску яна выйшла на цьмяную плятформу. Муж не сустракае. Беларускіх грошай няма. Аза доўга стаяла з каробкамі пад ліхтаром, атакаваная таксоўшчыкамі. Урэшце, вырашыўшы пазычыць грошай на таксоўку ў суседзяў, паклікала дзядзьку. Яны ўжо амаль заладавалі мяхі й каробкі ў таксоўку, калі Аза пабачыла запыханага Славіка, што бег да яе праз шэры натоўп. Яны абдымаліся, цалаваліся, углядаючыся ў твар адно аднаму. І ўсё ж Аза разумела, што Славік спазьніўся, бо недзе выпіваў. Зрэшты, гэтая гарчынка на дне была звычная. Яна больш чым што нагадвала: Аза дома. У хаце Аза пачала распакоўваць сумкі, а Славік палез у Інтэрнэт. Потым яна пайшла папіць гарбаткі.

На кухню было страшна ўвайсьці. Быццам гіена балявала. Ва ўсіх трох патэльнях дагнівалі парэшткі страваў, з рондаляў пазірала блакітная, як лён, плесьня. Газавая пліта сьпярэшчаная каляровымі плямамі. Падлога сьлізкая. Аза пачала шалець, але ўвайшоў Славік, і крыўда адступіла. Аза была радая бачыць мілы хударлявы твар, гарбаты нос, сінія вочы. Яе Славік быў самы прыгожы мужчына ў Беларусі.
— Пайду, тут мяне хлопцы па асьцы на піва завуць, — сказаў ён.
— О'кей, — адказала яна.
Разгубілася, як заўсёды. Трэба было ў косьці даць за такую сустрэчу.

Аддрайваючы кухню, яна думала пра тое, што мусіла б пакінуць так, як ёсьць. Ён павінен навучыцца хаця б прыбіраць за сабою. Дый чаму з дваіх чалавек, якія роўна працуюць і аднолькава зарабляюць, адзін павінен яшчэ мыць унітаз, падлогу, кухню, ванну, бялізну, варыць штодня ежу, а другі — не? Аза ведала, што гэта несправядліва. Але яна не была гатовая ваяваць дома. Ейны дом быў адзіным бясьпечным месцам, з двума ядлоўцамі за акном і шасьцю кактусамі на акне (два рады калючага дроту); са старым кампутарам (а цяпер і новым), прасавальнай дошкаю, сталом і шафамі, зь якіх кнігі перлі, як цеста зь дзежкі. Яе дом — ціхае месца, і яна ціха ўладкуецца ў ім, хай нават цаною несправядлівасьці. Яна набыла рэзку для мяса й хлеба, мікрахвалёўку, камбайн, пралку, пыласос. Яна навучыцца хутка абслугоўваць дом і пакіне час для працы й хобі. Выкруціцца, выхітрыцца й выжыве. Адзінае пытаньне — *нашто ёй патрэбны муж* — Аза пакінула без адказу. Усё ж добра, калі ў хаце нехта ёсьць. А шукаць іншага пры жывым мужу Аза не хацела. Але дзеля тэрапіі думала: будзе іншае каханьне, патрапіцца добры й заможны чалавек, і будзе ён працавіты, таварыскі й кампэтэнтны, і яна будзе яго паважаць, а Славік тым часам недзе ўладкуецца і сыдзе сам, першы. Тады яна, бы Марына, сядзе ў крэсла ў прасторным новым доме новага мужа, накрые ногі пледам, заплюшчыць вочы і, перш чым задрамаць у спакоі й дабрабыце, будзе доўга-доўга, шчасьліва-шчасьліва плакаць.
І Аза пачынае плакаць ужо цяпер, прысеўшы ў старое аплылае крэсла. Сьлёзы бягуць па ўпартым скуластым тварыку. Потым

ейныя вялікія, жоўтыя, як лотаць, вочы адкрываюцца ўжо ў іранічным пасьмеху. Аза ведае, што ніколі ня кіне свайго Славіка, бо мае за ім вольную волю, як і ён за ёй. І нічым яны адно аднаму не абавязаныя. Аза жыве на сваіх грашох, Славік — на сваіх. Кожны матузок у гэтай хаце набыты ейнаю і ягонай працаю. Яна не павінна нікому плаціць — ні ляяльнасьцю, ні спакоем, ні дзецьмі. Усё, што ёсьць пры ёй, — мае права быць: і зайздрасьць, і боль, і нянавісьць — увесь брыдкі Азін унутраны сьвет, уся Азіна мізантропія й гардыня.
Паплакаўшы, Аза ідзе на кухню, дзе за мяшэчкамі з крупамі схаваны пачак лёгкіх цыгарэт, варыць гарбату і, паглядаючы на ядлоўцы пад акном і месяц у небе, закурвае…
Аза — каралева джазу.

2. Дзябёлая Ганорыя

Адразу ж, як ейны мужчына сышоў з рэчамі, бялявая Ганорыя Найман зьняла скураныя штаны й шаўковыя трусікі. Гэтыя шмоткі страшна намулялі Ганорыніны клубы. Яна апранула старыя расьцягненыя спартовыя трусы з чыстае бавоўны. Трусы гэтыя — ня проста адзежа, а нейкая адзежная амброзія. Нідзе не адчуваліся, хаця й глядзеліся на Ганорыі ня надта.
Адпусьціўшы на волю свае доўгія кшталтныя ногі з цэлюлітным галіфэ (якое толькі надавала Ганорынай пастаце велічы), яна пачала адпускаць і хату. Адкрыла гаўбец. Выгнала на вуліцу лёгкія блакітныя фіранкі. Памыла посуд. Выкінула сьмецьце. Нават ануча для посуду патрабуе догляду. Яе, напрыклад, трэба кіпяціць. А калі ты карыстаешся фабрычнымі, іх трэба рэгулярна набываць. У гэтым карэніцца ўся сутнасьць хатняй гаспадаркі. Ты павінна аддаваць ёй або працу, або грошы. Рэсурс ідзе нязьмерны. Але Ганорыя, як бальшыня жанчын, не цярпела вэрхалу ў сваім доме.
Нора, паглядзі, якое надвор'е. Навошта ты калупаешся ў хаце?
Ганорыя адмывала сваё жыцьцё ад мужчыны. Яна выкінула старыя станкі з засохлай пенай. Выкінула патэльню разам з тлушчам і прыгаркамі. *Ёй ніколі не спатрэбіцца смажыць мяса і мыць патэльні.* Сансара ў лядоўні скончылася. Настала нірвана: белы тварог, белазадая пірамідальная курыца, белае малако, белая міса з бледным салатным лісьцем. Белая пушка зь яйкамі, белая пляшка кефіру. Астатняе — прастора. Мужчына шмат еў мяса. Мужчына доўга гатаваў ежу. Мужчына смажыў,

пёк і варыў. Ён быў ненаедны. Цяпер гэтаму канец.
Ганорыя прынесла з крамы скрыню “Кадаркі”, паўкруг сыру й пакунак шынкі. Два пачкі кавы. Выстраіла ў барчыку плячыстую брыгаду — тэкіла, каньяк ды бальзам. Цяпер ніхто ня будзе зжараць гэта за два заседы. Жыць умеюць толькі жанчыны й геі.
Ганорыю не любілі паўсюль. Асабліва суседкі. Так ненавідзяць франтавікі штабнога пацука. Ганорыя па чарзе выганяла з хаты сваіх мужчын, добра апраналася і заўсёды мела грошыкі. Яна штовечара вылазіла з таксоўкі. Яна была адзінаю пакупніцай на цэлы квартал. Насельніцтва набывала малако, хлеб, “вінапрадукт” ды кавалкі чорнае сьвініны зь фіялкавымі пячаткамі. Ганорыя несла дахаты ёгурты, аліўкі, марскіх жыхароў у бляшанках, маленькія баўгарскія гурочкі й куплёнае варэньне (быццам нельга закатаць самой!), тэтрапакі з сокам і малаком. Яблыкі й дарагія грушы з латка. Даўгашыйныя пляшкі. Як нахабна гэта ўсё прасьвечвала з пакетаў!
— Які ў яе клопат, — казалі матроны з хрушчоўкі, — ні мужа, ні дзяцей. І я была б як лялька.
Чыталася гэта так: хай я мучаюся й гарую, але дзетак маю, а ты — як абсевак у полі. Хто табе шклянку вады паднясе? Пусты колас! Справа, аднак, была не ў каласох і водах. Проста гэта інстынкт працягу роду, ён хапае, як абцугі. Але калі перацярпець, то твайго жыцьця ніхто не замуціць: ні дзеці, ні мужчыны.

Можаш устрымацца ад шлюбу — устрымайся.

Зь ліста кіраўніцы Асацыяцыі мацярок-самотніц да пісьменьніцы Норы Найман:
“Дарагая сп-ня Найман! Вашыя кнігі чытаюць усе. Толькі Вы здольныя ўратаваць сям’ю. У нашай краіне на 2 шлюбы прыпадае 1 развод. Самі ведаеце. Колькі льецца сьлёз з вачэй кабет і колькі гарэлкі ў горлы мужчын! (Ладны вобраз, ці ня так?) Зноў вяртаюся да сур’ёзнасьці. Благаю, благаю Вас, шаноўная сп-ня Нора, ратуйце сям’ю! Мы арганізавалі ва ўнівэрсытэтах курс лекцый па тэорыі сямейных адносінаў і хочам бачыць нашай дакладчыцай ВАС”.
Нора сьмяецца. Потым, умасьціўшы ў кілім свае доўгія ступні і склаўшы перад вуснамі далоні, садзіцца памэдытаваць.

Жаночая праца падобная да араньня вады.
Насамрэч жанчыне не патрэбны мужчына.
Ганорыя Найман, цалкам пазбаўленая цяпла, дзеля грошай піша love story.
Дзеля пацехі свае халоднае і сытае душы Ганорыя пераніцоўвае сусьветную літаратуру на ўласны капыл. Асабліва я люблю адзін Ганорын шэдэўр — **Кароль-Крыжадзюб**.
“Была ў аднаго караля дачка, незвычайна прыгожая, але такая ганарыстая й натурыстая, што ніводзін жаніх не здаваўся ёй вартым. Яна раз-пораз адмаўляла ім дый яшчэ пасьміхалася. Аднойчы кароль вырашыў наладзіць вялікі баль. Адусюль склікалі каралевічаў, якія жадалі пасвататаць каралеўну. Найшоў іх цэлы сьвет. Паставілі каралевічаў у шэраг.
І павялі каралеўну па шэрагах. У кожным яна бачыла нейкую ваду. Адзін ёй быў затоўсты, другі — сухарэбры; трэці — цыбаты, як чапяла, чацьвёрты — карузьлік; пяты — белатвары, вароны ўкрадуць; шосты — замалады. Але найбольш пакпіла ганарліўка з аднаго добрага караля. Ён быў найвышэйшы з усіх, а ягонае падбародзьдзе было трохі крываватае.
— У яго падбародзьдзе, быццам дзюба ў крыжадзюба! — насьмяялася каралеўна.
З тае часіны празвалі гэтага караля Крыжадзюб.
Як пабачыў стары кароль, што ягоная дачка зноў адмовіла ўсім жаніхом, загневаўся ён і пакляўся, што аддасьць яе замуж за першага, хто ў дзьверы пагрукае.
Праз колькі дзён пагрукаў у палацавую браму музыка-жабрак, пачаў сьпяваць і граць на лютні. Кароль загадаў пусьціць яго ў палац.
Зайшоў музыка ў парванай, запыленай вопратцы й стаў граць і сьпяваць перад каралём і каралеўнай. Калі ён скончыў, кароль сказаў:
— Мне твае сьпевы даспадобы. Аддаю табе дачку ў жонкі.
Каралеўна спалохалася, але кароль быў гэткі ж ганарлівы й натурысты, як дачка. Ён стрымаў сваё слова, і каралеўна абвянчалася з вандроўным музыкам.
Пасьля вянчаньня кароль сказаў дачцэ:
— Была ты дачкой караля, а стала жонкай жабрака.
А жабрачысе ў маім палацы рабіць няма чаго. Ідзі адгэтуль разам з сваім мужам.
І жабрак павёў сваю жонку з палацу прэч. Ідуць яны скрозь

цёмны лес.
— Чые гэта лясы й лугі? — пытаецца каралеўна.
— Караля-Крыжадзюба. Не прагнала б ты яго — гэта ўсё было б тваё.
— Ты мой муж і ты мне люб, а ня гэты Крыжадзюб, — сказала ганарліўка, якая не жадала прызнацца ў сваёй паразе.
Ідуць яны па палёх, і пытаецца зноў каралеўна:
— Чые гэта палі й рэчка?
— Караля-Крыжадзюба. Не прагнала б ты яго — гэта ўсё было б тваё.
— Ты мне муж і ты мне люб, а ня гэты Крыжадзюб, — ізноў кажа каралеўна.
І тут прыйшлі яны ў горад, поўны чырванадахіх дамоў і белых палацаў.
— Чый гэта чароўны горад? — спыталася каралеўна.
— Караля-Крыжадзюба. Не прагнала б ты яго — гэта ўсё было б тваё.
І ўпершыню каралеўна заплакала:
— Была б я жонкай караля, а стала жонкай жабрака.
— Мне не падабаецца, што ты жадаеш за мужа кагосьці, а не мяне, — сказаў музыка.
Падышлі яны да шэрае хацінкі, і вандроўнік сказаў:
— Мы будзем тут жыць.
— А дзе ж служкі? — запыталася каралеўна, зайшоўшы ў хаціну.
— Будзе толькі тое зроблена, што ты сама зробіш, — адказаў жабрак. — Распалі печку й згатуй абед.
Але абыходзіцца з агнём і вадой, з гаршкамі й печкаю каралеўна ня ўмела. Паелі яны абы-чаго й леглі спаць.

Так пражылі яны некалькі дзён — і паелі ўсе прыпасы. Тады муж і кажа:
— Жонка, мы ямо, а нічога не зарабляем. Напляці кашоў на продаж.
Ён нарэзаў лазовых дубцоў, прынёс іх дахаты, і пачала каралеўна плесьці, але жорсткія дубцы парэзалі яе пяшчотныя далоні.
— Я бачу, справы ў цябе ня пойдуць, — кажа муж, — папрадзі лепей кудзелю.
Села прынцэса й паспрабавала прасьці, але суворыя ніткі

ўрэзаліся ў белыя пальчыкі і зь іх палілася кроў.
— Бачыш, — кажа ёй муж, — ты ні да якай працы нягодная. Будзеш гандляваць збанамі, кубкамі ды гаршкамі.
Каралеўне вельмі не хацелася стаяць на кірмашы, але што рабіць? Не марнець жа з голаду.
Справа ў яе пайшла. Дзяўчына была прыгожая, і ёй плаціліся гэтулькі, колькі прасіла.
Аднойчы села каралеўна гандляваць, аж вылятае з-за рогу на кірмаш конны рыцар, пабіў ёй гаршкі, кубкі ды збаны — адны аскялёпкі паляцелі.
Уся ў сьлязох пабегла каралеўна да мужа.
— Я бачу, ты да прыстойнай работы нявартая. Вось быў я ў палацы нашага караля, там мне паабяцалі ўзяць цябе пасудамыйкаю, за гэта нас будуць карміць.
І стала каралеўна пасудамыйкаю. Яна прывязвала да свае торбачкі дзьве міскі й прыносіла дадому ежу, што давалі ёй за мыцьцё посуду. Тым яны й жылі.
Аб той пары дзень і ноч раўлі трубы: абвяшчалі вясельле караля. Аднаго дня паднялася бедная жанчына наверх і стала ля дзьвярэй, каб пераймаць брудны посуд. У залю заходзілі пышна ўбраныя госьці. З горыччу ў сэрцы думала каралеўна пра сваю ганарлівасьць і фанабэрыю, якія так яе прынізілі. Яна адчувала прызабыты пах дарагіх страваў, якія заносілі й выносілі служкі. Яны кідалі ёй нешта зь недаедзенага, і яна хавала ежу ў торбачку.
Раптам зайшоў сам кароль. Пабачыўшы прыгожую жанчыну, ён схапіў яе за руку і пацягнуў у залю танчыць; каралеўна пазнала ў ім Караля-Крыжадзюба, якому некалі адмовіла. І нейкім ён ёй падаўся мілым. Як яна ні ўпіралася, ён уцягнуў яе ў залю. Тут торбачка разьвязалася, зь яе выпалі дзьве місачкі і з бразгатам пакаціліся да гасьцей. Весела засьмяяліся госьці, а прынцэса заплакала. Ёй было так сорамна. Як варам абліло.
— Ня плач і ня бойся, — ласкава сказаў ёй Кароль-Крыжадзюб, — я і музыка, твой муж, — адзін і той жа чалавек. Я быў і тым рыцарам, што пабіў твой посуд. Усё гэта я зрабіў, каб зламаць тваю фанабэрыю, калі ты пасьмяялася зь мяне. Цяпер горкія дні прайшлі, настаў час для радасьці. Зараз мы адсьвяткуем наш шлюб.
І адразу ж у залю ўвайшлі служкі, у паклоне паднесьлі ёй шаўковую сукенку, дыямэнтавы пярсьцёнак і залатыя чаравічкі.

Але каралеўна выпрасталася, сувора паглядзела на Крыжадзюба й сказала:
— Ніколі не забуду я твайго прытворства й свайго прыніжэньня.
І вярнулася ў сваю шэрую хацінку. Бо з натуры была яна сапраўднаю каралеўнаю. І гонар гаварыў у ёй мацней за ўсё. Кароль-Крыжадзюб і бацька, якія былі, натуральна, у змове з самага пачатку, не чакалі такога наступства ад свайго шавіністычнага ўчынку. І працягвалі дамагацца, каб каралеўна заняла належнае ёй месца жонкі Крыжадзюба. І тады прынцэса зьбегла, пайшла вандраваць па сьвеце. Клопаты вандроўнікаў зрабілі рысы яе твару вострымі, як лязо. Аб яго многія парэзаліся да крыві.
Нябожчык Селяшчук бачыў яе праўда, толькі ў профіль. Яна прайшла ўзбоч. Паралельна.
Бывай, каралеўна!”
(гл. братоў Грым)

3. Людка й Сафіко

Кожнага разу, калі перапоўнены тралейбус прыцішаў ля прыпынку хаду, у Людчына нутро шыбала радасьцю. Ейны белы й худы тварык ажыўляўся, вочы гарэлі, а вусны ледзь чутна прамаўлялі: “Нах.й, нах.й, нах.й, нах.й”. Так Людка суправаджала кожнага з пасажыраў, які пакідаў салён і вывальваўся на прыпынак, бы парашутыст. Людка ненавідзела людзей і навакольную рэчаіснасьць, якую людзі збудавалі. Яна ненавідзела ўсялякіх суседзяў. Чалавек мілы, пакуль не сапе на цябе. Пакуль не разяўляе зяпы. Людка ўсьведамляла, што, каб не гаючая нянавісьць, яна б загінула ў мілым Менску — горадзе, дзе людзі варацца, як бульба ў рондалі. Нянавісьць падымала Людку штораніцы й кідала яе ў вір жыцьця, нянавісьць дапамагала ёй ірвацца на дзьвюх працах, гойсаць па крамах і стаяць у чэргах, штовыходныя вадзіць прычапураных дзяцей у *парк Сківіцоўцаў* і купляць там зялёную вату і карузэлі. Нянавісьць замяняла Людцы волю да жыцьця. Цяпер Людка зларадна назірала, як далікатная белая ручка з пурпуровым манікюрам бездапаможна, як матылёк, пырхае ля поручняў, намагаючыся ўчапіцца. Але поручні былі абцопаныя іншымі лапамі — старымі й маладымі, брудными й параўнальна чыстымі, далікатнымі й пралетарскімі, з наколкамі й без. Усе

“рончкі” былі сьціснутыя да пабяленьня ў суглобах, і пяшчотнаму матыльку ніхто й мілімэтру ад парэнчы не саступіў. Урэшце адчайны матылёк ірвануўся далей і — ляп! — ухапіўся за нейкую закрутку над тралейбуснымі дзьвярыма. Людка аж пашкадавала ручку — гэтулькі пульхнага графітавага пылу было там. І паставіла побач зь пекнаю ручкаю й сваю руку. У Людкі моцныя рукі, але гэта рукі чалавека, які не стварае, а трымае. Гэта рукі Карыятыды, абвітыя доўгімі й вузкімі мускуламі й такімі ж выпуклымі венамі. З загрубелай скурай. Бязь сьледу манікюру й догляду. Людка пагарджае тымі, хто носіць манікюр у пекле. Гэты паскудны пабытовы гераізм. Гэтае імкненьне заставацца прывабным сярод смалы. Наводзіць прыгажосьць любой цаной. Хістацца ў тралейбусах на абцасах і ў вечаровых строях. Выстаўляць грудзі й ягадзіцы як ракеты. Налюбаваўшыся на кантрасты рук і набрыняўшы салодкаю злосьцю, Людка вывальваецца ўсьлед за іншымі і, крануўшыся нагамі зямлі, суправаджае й сябе вясёлым словам “нах.й!”

Праходзячы штораніцы ля нізкіх вокнаў антыкварнае крамкі, Людка заўжды паварочвае галаву й глядзіць на ляльку, што выстаўленая побач з шкляным прэс-пап’е, абажурам і вугальным прасам. Лялька ў трэць Людчынага росту, з сапраўднымі валасамі, з гульліваю і летуценнаю мінаю.

У сукенцы, фартуху і каптуры ў краткі. Людка заве ляльку Сафіко за падабенства з грузінскаю акторкаю Чыяўрэлі. Яна зайздросьціць гэтай ляльцы і адначасна хоча яе набыць. І Людка прароча ведае: у адзін прыўкрасны дзень, калі ёй давядзецца з малодшым сынам езьдзіць па паліклініках — на Паўднёвы Захад да хірурга, у Зялёны Луг да артапэда, на Розачку да ўроляга — і складаная гэтая праграма дасьць збой, а сын заплача і папросіць есьці, а грошай акурат ня будзе ў партманэце… а на нагах у Людкі будуць запыленыя боты, бо на чаравікі зноў не стае… Людка пабяжыць дадому, залезе ў кішэнь, прышытую спадыспаду да кіліму, выцягне “аварыйныя” даляры й набудзе Сафіко. Імгненны рывок у вар’яцтва, імгненнае шчасьце — і вечнае валоданьне Сафіко. О не, Сафіко — гэта не такая рэч, на якую жанчына можа забыцца.

4. Мартушын дзень

Ранічка

Ключык Марына, 27 год, з прафэсіі вольны нехта-там, прачнулася ад таго, што ейны сябар завалэнсаўся па хаце, зьбіраючыся на працу. Марына закруцілася ў ложку, як пячкур на патэльні, падкідваючы то вострыя моцныя каленцы, то невялікую круглую дупку. Яна сердавала, што зноў раніца і трэба заводзіцца, як аўтамат, уставаць, засьцілаць ложак, сьнедаць якой-небудзь брыдою паскуднай (сьнедаць Марта не любіла, але як не паясі дома, то трэба ў горадзе, а гэта дорага), пасьля сьняданку трэба прыняць душ, высушыць валасы (калі б не лапавухасьць, Марына пагаліла б галаву), намазаць твар тонікам, дзённым крэмам-падкладкаю, зьверху — тон (хаваць зморшчынкі й плямы — абавязак жанчыны перад навакольным асяродзьдзем), цені, шмінка, аловак; прасаваць шмоткі (якая ідыётка будзе псаваць сабе вечар, прасуючы шмоткі загадзя), і, нарэшце, кава — Каралева Ранку, найлепшая сяброўка Мартушы Ключык.

Мартуша пракруціла ў галаве альгарытм дня і вырашыла пакуль з-пад коўдры не вылазіць, а прыдумаць сабе стымул ці хоць чвэрць стымулу, дзеля якога варта “спусьціць ногі з ложка”. Можа, паклікаць сябра ды прайграць абавязковую сэкс-праграму? Не, гэта добра ўночы. Тым часам сябар сабраўся, гукнуў зь вітальні: “Бывай!” ды ляснуў дзьвярыма. У хаце ўсталявалася чакальная, запытальная, празрыстая ціша: “Мартуша? Мы адны! Уставай, Мартуша”. І ўстала, што ж. “Вось каб я не нарадзілася, — марыла яна, бязмэтна ходзячы па пакоях, — як бы гэта было добра. Мне не давялося б зьбіраць грошы на ежу, кватэру, вопратку, транспарт, які носіць мяне зь месца на месца, тады б не было гнюсных ранкаў, паскудных дзён, цалкам прысьвечаных здабыцьцю хлеба. Заробіш сёньня — паясі назаўтра. А калі не заробіш — заўтра будзеш галадаваць”. Мартуша хілялася б у прасторы і нічога ня ведала б пра гэтае жыцьцё, у якое яе піхнулі, не спытаўшы. Дык пра якую свабоду выбару вядзецца? Каб спыталіся ў яе: “Хочаш, Мартуша, штораніцы ўставаць, прыводзіць сябе ў парадак (sic!), есьці яечню, ісьці на працу, у поце твару свайго здабываць хлеб, ненавідзець жыцьцё, але яшчэ болей баяцца сьмерці”, то Мартуша зараўла б: “Не!”.

А калі яе сюды выпхнулі для выпрабаваньня — дык гэта сьвінства. Мартуша адразу заяўляе, што яна выпрабаваньня не вытрымлівае, хавае галаву ў падушку, а сьвет разам зь людзьмі

ненавідзела й ненавідзець будзе. Прытым Мартуша ня хоча, аднак, мець нічога супольнага з Сусьветным Ліхам. Проста хай яе пакінуць на ўбочку й ня ўцягваюць ні ў якія справы. “Ну-ну, Мартуша, — завёўся Аўтаматычны Цытатнік, — а Бог выплюне цябе такую, ні гарачую ні халодную, з вуснаў сваіх, ды не куды-небудзь, а ў Вечны Агонь. Вось ужо завыеш — і заўжды, да сканчэньня вякоў выць будзеш”. Мартуша боязна косіцца на абразы ў куце — сама ж і павесіла. Ці будзе Бог пляваць ёю ў агонь? На тое ў Яго ёсьць падставы. Ужо ж Герой Чалавецтва, Пан Езус, не валяўся да абеду. Ня гідаваў простымі людзьмі, ня пышыўся перад імі! Каб было цяпер другое прышэсьце, то Ён, магчыма, прамаўляў бы ў менскіх тралейбусах. Самае тое месца.

Мартуша ідзе ў кухню і ставіць кавaварку-сьвістуху, якая цісьне добрую каву. Выпіўшы пару філяжанак з канцэнтраваным малаком, Мартуша ўжо бяз болю ўспрымае жыцьцё. Яна ператвараецца ў Самотную **практыкуючую** Сьвятую, Крыніцу ўсяго Сьвятла. (Мартуша страшная ламака і заўжды грае нейкую ролю.)
Самотная практыкуючая Сьвятая праплыла па пакоі, як рыба. Дзень пачынаецца позьняю сьветлаю раніцай. У пустой хаце. Яна гуляе ў Самотную Сьвятую, якую немагчыма ўстурбаваць. “Ніколі ня буду сьпяшацца я болей. Ніколі-ніколі, ні кропелькі болей”, — зрыфмавала Самотная Сьвятая і зноў пайшла, несучы свой зіхоткі спакой, у кухню. Спакой трохі здрыгануўся пры выглядзе пластоў бруднага посуду. Самотная Сьвятая нагадала сабе, што нікуды не сьпяшаецца і ні пра што не турбуецца, і прыбрала кухню. Выкінула стары хлеб. “Хлеб, дзе твой сакрум?” І ўсё-такі пры выкіданьні хлеба яна адчула, што ейны спакой здрыгануўся яшчэ раз. Трэці раз Унутраны Спакой Самотнае Сьвятой здрыгануўся, калі яна зьела кавалак шынкі, які акуратны сябар прыгатаваў для салаткі. Уласная жарлівасьць расчаравала і ўзлавала Мартушу, і яна зь нянавісьцю пачала думаць пра сябра. Яна ўзгадала, як ён прывёз сваю маці знаёміцца, і тая шнырыла па ўсіх кутох, чытала Мартушы натацыі за неахайнасьць, што ссохлыя скарынкі апэльсыну за крэсламі, вішнёвыя косткі ў засохлых кружках, дыван ня выбіты, а бялізна (ха-ха-ха!) не крухмаленая. Так Мартуша давяла сябе да шаленства.

Ланцуг ператварэньняў сёньня быў як ніколі дасканалы — з Самотнае Сьвятое ў Скончаную Сьцерву. Мартуша вызірае ў акно. Вецер. У лужынах мікраштармы. Маці-самотніца Людка пхае супраць ветру каляску, як гарматны ляфэт. Пара і мне на працу.

“Каб вы ўсе падохлі!”
Пакой адпачынку ў рэдакцыі падпольнага радыё. Абед. На канапе й крэслах вакол нізкага століка сядзяць супрацоўнікі рэдакцыі, п’юць каву, чытаюць газэты, хто-ніхто паліць. Гэта маладыя людзі гадоў дваццаці пяці — трыццаці, абодвух полаў, усе ў акулярах і штанах. Сьцярвозныя твары.

Юзя (чытае “Саўбелку”, заліваецца рогатам): Давайце нарэжам цытат з “Саўбелкі” і з Лукашэнкі ды будзем чытаць у эфір рознымі галасамі. Народ укісьне! “Квадракола” лясьне ад зайздрасьці!
Марат (сур’ёзны хлопец): Я не хачу з гэтага сьмяяцца. Калі ўспрымаць гэта са сьмешкаю, прытупяцца здаровыя рвотныя рэфлексы і мы будзем успрымаць маразм як належнае.
Тацяна: Гэта мы, сьмеючыся, разьвітаемся зь мінулым. Якраз той выпадак, калі яно абярнулася з трагедыі ў фарс.
Юрась: Фарс-вадэвіль! Гратэск-драма, камэдыя з трагічным канцом. Гэта фарс з налётам трагедыі ці трагедыя з налётам фарсу?
Уладзя: Божа! Няўжо вы гаворыце гэты баналітэт усур’ёз? О, як я вас ненавіджу! Як я ненавіджу гэтую ў.бішчную краіну!
Гэля: Прапаную адкрыць рубрыку: “Так вам і трэба!”
Марат (сумленна): Можа, лепей “Так нам і трэба!”? І мы ж сядзім у гэтым г...е.
Гэля: Гэта безь мяне. Я настойваю на рубрыцы “Так вам і трэба!”
Тацяна: А што будзем кідаць у гэтую рубрыку?
Гэля: Сацыяльна-эканамічную тэматыку можна ўсю. “Людзі і лёсы” — амаль усю. А пачынаць будзем з падводкі: “Каб вы ўсе здохлі! З падрабязнасьцямі — Уладзімер Чарвінскі”.
Уладзя: Як я Вас ненавіджу!
У рэкрэацыю залятае Пятро, скідаючы па дарозе куртку, трасе сьвежаю газэцінаю і радасна крычыць: “Людзі! Калгасы падохлі! Зусім падохлі калгасы! Вось не дачакаў мой дзядуля!”

(кулак з-пад Вялейкі). І пэнсій старым казлам ня плацяць!
На тым радыё “Каб вы ўсе падохлі” завяршае сваю трансьляцыю, бо ў рэкрэацыю заходзіць галоўрэд — паважны пузан гадоў 40:
— Марына, штатнікі ўсе занятыя, можаш зараз паехаць пад Стоўпцы?
— Чаго?
— Там хлопец павесіўся. Кажуць, праз каханьне. Зробіш рэпартаж з чалавечынкай. “Трагічны лёс закаханых” ці нешта накшталт. 5—6 хвілін. Ідэя: маўляў, і ва ўбогай рэчаіснасьці беларускіх вёсак родзяцца трагедыі, годныя пяра Шэксьпіра.
…
Вёска Мартушу нічым не зьдзівіла й ня ўразіла. Схаваная ў вольхах, з шэрымі хаткамі й шчарбатымі платамі, даліпаначкі, як сто, ці трыста, ці пяцьсот год таму. Толькі могілкі былі ўзьнесеныя над вёскай высокім пагоркам. Туды й валаклася працэсія, несучы труну самагубцы, 18-гадовага калгасьніка. Пасьля пахаваньня Мартуша пацягалася вакол двара самагубцы, але не адважылася турбаваць бацькоў у такі час. Яна адразу пайшла ў хату старшыні сельсавету, апантанага пчаляра і бээнэфаўца, сябра галоўрэда, якога ён надзяляў каларытнай інфармацыяй пра ідыятызм вясковага жыцьця. На Мартушына радыё ён пастаўляў тэмы для рубрыкі “Лад вясковы”. Парфіяновіч наліў Мартушы гарэлкі, баршчу, мёду. Застольле пайшло.

— Ну што, Мартуша, прыехала пра каханьне пісаць?
— Ну. Раскажы мне ўсю гісторыю. Не магу я бацькоў турбаваць у такі дзень.
— А вось чакай, набяруцца, то тады й патурбуеш.
— Не, лепей ужо ты мне распавядзі.
— Ну добра. Толькі ты кульні як сьлед.
— Я так і да Фаніпалю не даеду, ня тое што ў Менск.
— Перасьпіш на печы. Жонкі ў мяне няма. — Парфіяновіч паклаў Мартушы руку на плечы.
— Адчапіся, Парфіяновіч.
— Ну, добра, хадзем, пакажу табе галаву каханкі. Яе сьвякруха забіла, Паўлікава маці. Застала Паўла зь ёю і адсекла ёй галаву, а саму ў чыгуне зварыла й на стол падала.
Мартуша зьбялела. Як? А што ж міліцыя? Як жа ж гэта так?

Дзікунства! Другой рэакцыяй была радасьць. Гэта ж які матэрыял! Мартуша праславіцца як здабыўца сэнсацыі. Праўда, сьмярдзючай, але ў тым не Мартуша вінаватая, а жыцьцё.
Яны выпілі яшчэ па шклянцы й пайшлі на загуменьні.
Там Мартуша пабачыла адсечаную бяскроўную галаву белапухай, жаўтавокай казы.
— Ах ты, скаціна, пачвара ты, — Мартуша аперазала інфарматара торбачкаю.
— Ды ня біся ты! З гэтай казой стары іхны жыў, жонку кінуўшы. Дапіліся. А потым недатумак іхны стаў тое самае рабіць. Прывяжуць у хляве Маньку — і наперад. Людзі падгледзелі. Дык старая казу засекла, а галаву на плот пачапіла. Паўлік як пабачыў, то ўзяў у рукі і плакаў над ёй усю ноч. А нараніцу павесіўся ў хляве.
— А чаго ж ім, дзевак не хапала?
— А хто б ім даў? Ты б бачыла гэтых страшыдлаў. Сьпітыя, страшныя, сын у іх дурнілам нарадзіўся, ніхто на яго й ня глянуў бы. У войска не ўзялі, каровы пасьвіў у калхозе. А тады мо падгледзеў, як татка казу акучвае, ну, і ён.
Мартушу заванітавала. Яна зьбегала да алешніку. Парфіяновіч закопваў галаву.
— Каб сабакі ня зьелі, — патлумачыў ён Мартушы. Ото паадвязваюць на ноч, то яны хутка яе апрыходуюць.
— Парфіяновіч, навошта ты нам гэта расказаў? Гэтага здаровы чалавек ня вытрымае.
— Чыстаплюі вы там у рэдакцыі. Што вам ні напішы, прыхарошыце, прычэшаце. А людзі во як жывуць насамрэч. У нас тут больш за 40 халасьцякоў у акрузе, ад 30 да 60 гадоў. Дзеўкі паўцякалі ў горад. А мужыкі сьпіваюцца патроху. Дык каго ім чапаць, як не каровы ды козы?
Мартушу ня мела чаго сказаць. У яе было адно жаданьне — сесьці на найбліжэйшы аўтобус і плетануць дадому.
Парфіяновіч узяў пляшку і шклянку ды пайшоў яе праводзіць. На прыпынку яны яшчэ выпілі, прыпадаючы па чарзе да шклянкі. І Мартушы палепшала на душы. Калі прыйшоў аўтобус, яны з Парфіяновічам сядзелі ў цэмэнтовай будачцы, абняўшыся, і горка плакалі па Паўліку. Ім было ўсё роўна, каза гэта была ці не каза. Для хлопца яна была замучанай каханай. Гэтую Васілеўну, паскуду, саму трэба засекчы й зварыць.
…

— Увогуле, трагізм — надуманая рэч. Нічога асабліва трагічнага няма ў сьвеце, калі ведаць, што гэта проста чысьцец.
— Вось зараз з намі — гэта чысьцец?
— Ну. Я нядаўна здагадалася. Аднак баюся, што мяне доўга яшчэ ў рай ня пусьцяць.
— Чаму?
— Я гультайка і абжэра. Паспаць люблю. Сваё нутро люблю больш за сьвет. Як у троля, вочы ў мяне павернутыя ўнутро мяне. Нават жыву з заплюшчанымі вачыма. Мала ў мяне цягі да самаўдасканаленьня. Гультайскага галерніка трэба правучыць, навучыць... Гэта займае час.
— Дык ты лічыш, што мы ня дзеці і не браты, а служкі Божыя?
— Я баюся думаць у гэтым кірунку. Але чаму мы за ўсё чакаем пакараньня, баімся шчасьця, каб не наклікаць гора? Калі гэта пачуваньне дзяцей, то толькі з паталягічных сем'яў.
Парфіяновіч задумаўся.
— Я баюся з табой побач сядзець. Ты такая рэзкая. Як... страшна сказаць, хто.
— Я ж кажу, што баюся думаць у гэтым кірунку.
— Табе трэба маліцца.
— Я не магу маліцца штораніцы й штовечару. Гэта як гімнастыка ці чыстка зубоў — абрыдлівы абрад.
— Малітва — гэта й ёсьць гімнастыка.
— Няўжо ты молішся штодня?
— Штодня па сто разоў. Бачыла ж, я паставіў каплічку ў двары. Я малюся кожны раз, як вока падае на крыж. Недарэмна мяне лічаць занудным чалавекам. Я вельмі просты, Мартуша. У мяне ўсё проста. І ў цябе ўсё проста. Я менавіта цябе й пазваў, каб пісаць пра скаталожніцтва. Я ўпэўнены, ты вытрымаеш тон, ня будзеш блюзьнерыць. Напішы пра каханьне. Напішы, што зь ім сталася ў нашым балоце.

Увечары
— Што, спужаўся? — ухмыльнулася Мартуша, бліскучымі вачыма пазіраючы на сябра. — А гэта ўсяго толькі я, юнача.
— Я б прасіў цябе, Мартуша, не падкрадвацца поначы, як здань, — голас сябра ледзь не трымцеў з сполаху й крыўды. Юнак быў страшэнна ўражлівы, вельмі баяўся ўночы, і ў Мартушы быў любімы жарт: "Бабай ідзе!" Юнак нявесела сьмяяўся разам зь ёй.

— Ты ведаеш, — казаў ён у хвіліны даверу, — я магу ўявіць што заўгодна. І мне непрыемна ўяўляць Бабая ці каго падобнага. Я прашу цябе, Мартуша, не выкідай сваіх конікаў уночы. Я ж магу звар'яцець ці памерці.
— Добра, ня буду, ня бойся, мілы! — прамовіла Мартуша, засоўваючы нос пад накрыўкі рондаляў. Сьветленькі далікатны Юнак любіў танную й тлустую беларускую кухню. Сёньня былі бульбяныя клёцкі ў сьмятане са смажанаю цыбуляй.
— Яшчэ не гатовыя, — сказаў мэлянхалічна Юнак, замешваючы фарш (кавалкі сырога фаршу ён, тоячыся ад Мартушы, пхаў у рот). Мартуша ня першая заўважыла, што субтыльныя асобы любяць мяса з крывёю.
— Еж, не саромся, зайчыку, — сказала яна. — У сырым мясе хоць нейкія вітаміны.
— Няма там вітамінаў, і ня трэба яны нікому.
На што абураны Галоўны Дыетоляг краіны сказаў з рэпрадуктара:
— Прадпрыемствы "Памакс" і Менскі хлебазавод № 3 прыступілі да выпуску вітамінізаванага малака й хлеба.
— Лепш вітамінізуйце бульбу й гарэлку, дурні! — сказала Мартуша, выцягваючы з рондаля клёцку. І дадала, ласкава гледзячы на Сябрыка:
— Ты — самая важная зьява з часоў адкрыцьця бульбы.
Яе адпусьціла. Чарговы Мартушын дзень прайшоў без асаблівых стратаў.

5. Гусіныя ловы

Сустрэча даўніх выпускнікоў скончылася. Сп'янелыя 27-годкі разышліся. У самотнай школцы, што крылом прыпала да сасьняку, засталіся дзьве жанчыны памыць посуд. Адна зь іх, званая са школьных часоў Мышкаю, была малая ўвішная кабетка; яна жвава шморгалася з клясы да мыйні, міма сьвяточных насьценгазэт, зморшчаных балёнікаў, здымкаў і аб'ехалых папяровых істужак. Другая, высокая нязграбная шатэнка мянушкаю Гусь, спрабавала прыбраць падлогу. Хаатычнымі й адчайнымі рухамі яна хапалася то за памяло й шуфлік, то за анучу й тазік. Гусь відавочна была няздольная жыць на зямной кары. Урэшце пабіла трохлітровік з памідорамі і на тым спыніла марныя спробы дапамагчы Мышцы. Яна стала ля акна з канапкаю ў руцэ і ўгледзелася за шыбы. Хутка

клалася ноч, але пражэктар на назіральнай вежы заліваў навакольле белым сьвятлом. Сьвятло імкнула вышэй за сосны. Іхная вёска месьціцца ня так далёка ад Урэцкае вайсковае базы, і таму Гусь мала зьдзівілася, калі далёка ў чорным небе, недзе па-за пражэктарным сьвятлом, загрукатаў гелікоптэр. Яна насьцярожылася толькі тады, калі грукат павіс над школьным дваром, а потым пачуўся й сьвіст — вецер з-пад шруба рваў хвоі.

— Мышка! Бягом сюды! — крыкнула ўзбуджаная Гусь. — Верталёт сядае!

— Хлусіш! — крыкнула аднекуль з калідора Мышка, і Гусь засталася сам-насам зь нябачным шрубалётам. Далей усё адбывалася імгненна. Шрубалёт упаў на качагарку, і, перш чым выбухнула полымя, Гусь палюбавалася ягоным доўгім зграбным хвастом, які стырчэў упоравень з комінам. Потым і хвост, і комін назаўжды зьніклі ў громе й полымі. Аскепы падалі на дах, гарэла-сосна-палала, у глыбіні школы вішчэла спалоханая Мышка, а Гусь стаяла, гледзячы на полымя качагаркі. У міг гібелі гелікоптэра яе працяў дзіўны холад, і яна безумоўна й неадменна пачула, што мара ўсяго жыцьця збылася.

Збылося ўсё.

Зь сёньняшняга дня я Ніцалёт Аераплаў.

Ніцалёт Аераплаў.

І мне ўсё падуладна.

Варта пабачыць, як падае нехта лятучы, і ты сама навучаешся лятаць.

Гусь выйшла на поле, якое нядаўна было балотам, так што куга расла тут пышна, як бэз. Поле было ўсаджана бусловымі статкамі: лічылі свае шэрагі перад выраем. Яна назірала за бусловым зьлётам з ускрайку лесу. Сёлета гэтыя чорна-белыя дзятлы трохі затрымаліся. Аднак зіма ўсё роўна будзе сьнежнай.

Буслы зашумелі крыльлем і белаю віхурай пачалі падымацца ў неба. Поле спусьцела. Пранёсься пошум кугі: “Цішшш! Ціш гуляе полем!”

Пустое, Бескалёрнае, Брунатнае, Бясплённае!
Якое ты прыгожае.
Якое сіратлівае.

Якое непатрэбнае.
Я так цябе люблю.
Шэрапес, Жаўтазель, Ліляволь!
Хмызы й смуга, быльнёг і ціша.
Яна патроху ўзьнялася над аерам. Лілёвы дом. Тут наш лілёвы дом.
“Цішшш! Ціш гуляе лесам”.

“Абалоніка абла.
У абалонцы ўся зямля.
Хто тут першы прайшоў,
Той прасіў і знайшоў.
Я знайшоў, Ты знайшла.
Абалоніка абла”.
Зямля круглая, яна плаўна закругляецца, як жывот цяжарнай. Можа, гэта толькі ў Беларусі яна так кругліцца? Ня ведаю, я ніколі не залятала за дзяржаўную мяжу. Там стаіць такі плякацік: “Стоп!” А я законапаслухмяная тутэйшая Гусь.

Брудны беларускі сьвет мае тры фарбы; платы й стагі, торф; выстраеныя швадроны быльнягу маршыруюць у алешнік.
Чаго ехаць у той сьвет? Чаго шукаць? Каханьня, грошай? Гусь жыла сваімі пералётнымі днямі й начамі і нікуды не хацела. Нашто кветку перасаджваць, калі начамі яна ператвараецца ў птушку?
Чаму б мне ня жыць у вёсцы? А ў Менск залятаць зрэдку? Чыста на ежу зарабіць. Калі лётаць вышэй, ніхто й не заўважыць, што гэта я лячу, а ня бусел.
…
Тэлевізар надрываўся. Мажны, як шафа, вусаты мужчына казаў: “Вы ўяўляеце, што будзе, калі яе злавіць, апладніць і прымусіць нараджаць дзяцей, якая карысьць будзе для народнай гаспадаркі? Выведуцца крылатыя жаўнеры, і перад нашым войскам адкрыюцца новыя магчымасьці. Мы зможам змагацца зь міжнародным тэрарызмам. Мы можам узьняць айчынную картаграфію да небывалых вышынь. Урэшце, лятучыя людзі-паштавікі будуць дастаўляць пошту і лекі ў самыя аддаленыя вёскі, дзе за бездаражжу жывуць нямоглыя пэнсіянэры”.
…
Узьлётныя вершы — трайчастыя. Прамаўляеш адну формулу —

не ўзьлятаеш. Прамаўляеш другую — ізноў не ўзьлятаеш. Потым мармычаш на вецер трэцюю, і тады ўзьлятаеш. Я, здаецца, казала вам пра гэта. Пачынаецца залева, і трэба ляцець адсюль. Аднак у Батанічным садзе мяне заўсёды ахоплівае пачуцьцё чаканьня. Я ня ведаю, чаго чакаю, магчыма, вялізныя слупы дрэваў паваляцца на дарогу, ці неба абрынецца на гэтыя слупы, утварыўшы пэўны грозны Парфэнон... Нешта здарыцца, нешта безумоўна здарыцца, менавіта на гэтым месцы. І з такім пачуцьцём я прылятаю сюды почасту.
Але калі ты пачынаеш прамаўляць рытуальны ўзьлётны верш, з-за дрэваў выбягаюць дурні зь сеткамі, якія думаюць, што рытуал — ня больш чым прафэсійнае слоўка трунароў. І яны зломяць твой рытуал і абрад, бедная ты Гусь.

Як жа ты апынулася ў гэтых пахмурых краях,
Дзе халодныя ветры нуду навяваюць і жах?
Пад дажджом паміраюць кусты хрызантэм у двары,
Ападаюць пад воглай імжою галоўкі юргінь.
Толькі мы застаемся заўсёды у духу сваім.
Разумеючы: ўсё ў гэтым сьвеце — лайно і падман.
Вось мы зноўку сустрэліся, зноўку гаворым праз ноч,
Зноўку поўня круглявая ціха з пагорка спаўзла.
Як сьляза.
Майстра дапісаў слоўка і адкінуўся ў крэсьле бяз змогі. Як файна тут жыць! Адарвешся ад старонкі, на якой паўстае бязрадасны і пакутны сьвет Бацькаўшчыны — а тут да плечаў вэлюравы фатэль ільне, на стале — найлепшыя лекі, што ратуюць жыцьцё. І ціхі шолах дажджу па лістоце ліпаў. Вуліца Падліпная — Unter-Den-Linden. Гучыць як перазвон музычнай скрыначкі. Гусь мусіць загінуць падчас ловаў. На Бацькаўшчыне ўсё вырашаецца так. І ягоная самая любая гераіня, вечна юная, лятучая Гусь мусіла “хрумснуць у лапах свайго народу”. Ён быў Майстра і ніколі не схлусіў у сваіх творах. Горкі, як хіна, праўдзівы, як сьмерць. Майстар з пачуцьцём выкананай місіі заснуў у сваім крэсьле, зьвесіўшы змучаную галаву.
Фіраны адкрытага гаўбца зашаляста́лі, і яна ўвайшла ў пакой. Яе крылы мялі паркет. Празрыстымі вачыма яна прачытала канец, празрыстаю рукою ўзяла пяро і дапісала:
Майстра! Ты ўсё рабіў слушна. Але каб толькі ты паслухаў мяне, ты б ведаў: сон над нашай краінай шматслойны. Я

пераканалася ў гэтым сама. У першым слоі нашага сну мяне сапраўды б злавілі. Але вышэй, крыху вышэй, дзе толькі й ёсьць сапраўднае жыцьцё, там мы недасяжныя, Майстра. Як дзіўна, што ты не лятаў за жыцьцём. Паляціш за сьмерцю. І ўпэўнішся сам: мы няўлоўныя, Майстра.
Нам няма чаго рабіць у найлепшых сталіцах сьвету. Мы мусім выжыць тут.

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/04/23**
[image]

[image]
ARCHE Пачатак № 2 (25) – 2003
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image] [image] [image] [

проста ў сонца. Было, значыцца, гэтак спякотна, і я нарэдка з асалодай узгадваў пра сваю паляну ды пра свайго сябра, які часам надвячоркам завітваў да мяне дадому, даваў, ведаючы маю бяду, параду: “Зрабі сабе маленечкі фантанчык — і ў цябе будзе ўсё, што ты пажадаеш; і таго клопату”. Гэткія парады даваў мне мой сябар, вядома ж, зычачы мне дабра. Але не, мне фантана было не трэба, безумоўна, не. Як доўга ды марна я ўсё яшчэ чакаю, чакаю, што зяленіва нарэшце пажоўкне і ападзе; што рыбка, адна-адзінюсенькая, можа быць, залатая рыбка, пачне рухацца сярод тых стакротак. Мой сябар раіў мне тады выправіцца ў падарожжа. Я пярэчыў яму, бо далёка ад дому не надта добра пачуваюся, але ён не адчапіўся: прыносіў мне праспекты й падарожныя даведнікі, казаў, што вось тут расцэнкі танныя, а людзі вельмі прыязныя. Урэшце **Дэніэла** **з горада Кутор** на падарожжа ў Іспанію, уласна кажучы, толькі **у Іспанію** што праспект выглядаў досыць прывабна й на ім **Іспанія** стракатай рыбкі.

Больш як шэсць гадоў таму я перастаў вучыцца, усеўся на сваёй паляне і пачаў чакаць. Ніхто не паказваўся, апроч жаўтадзюбых драздоў. У Іспаніі мне чакаць не давялося. Штодня па абедзе ў адным і тым жа месцы, на фоне вугальных гор, перад самымі нябёсамі ў порт з гудам заплывалі караблі. Не паспявала спёка праглынуць апошні борт, як цераз мур, цераз камяні пачыналі сыпацца крабы й лангусты, рачкі й слізкая, з безліччу плаўнікоў рыба. Пакідаючы за сабою мокрыя сляды, усё гэта валілася цераз тую пляцоўку проста сюды, ляскала сваім рыштункам, згінала пад сваім цяжарам асвятляльныя мачты і збівала рэзкасць майго позірку, які нейкі час усё яшчэ намагаўся справіцца з гэтай масай, што расла ў жахлівым тэмпе. Вось, думаў я сабе, гэта і ёсць Іспанія. І больш не хацеў належаць да гісторыі. Мая паляна — думаў я — ...у нядзелю яны паблізу ад яе гуляюць у футбол... Я выразна чую гэты сухаваты гук — калі адбываецца сутыкненне буцы й мяча. Буцы — вось дзівосы. Купляюць жа іх сабе хлопцы — а каштуюць яны, вядома ж, нятанна — і старанна, амаль што з любоўю даглядаюць. Такія буцы трэба насіць у Іспаніі. Трэба было мне насіць гэткія вось буцы ў Іспаніі. Хадзіў бы я тады па пляцы праз завалы гэтых крабаў ды лангустаў і шмат чаму здолеў бы перашкодзіць. Я чуў, што гэты своеасаблівы абутак аснашчаны

сталёвымі наскамі. От была б уцеха — хадзіць па пляцы, па ўсіх гэтых крабах, з цвёрдай вераю ў гэткі абутак. Па сваёй паляне я лётаю басанож. У Іспаніі я насіў лёгкія сандалі й купленыя ў Барселоне штаны. Яны былі з тонкага матэрыялу, прыемнага навобмацак, які, аднак, лёгка камечыўся.
— Божа мой, дзіця па пляцы ідзе! — вырвалася ў мяне тады. — Пэпіта! Пэпіта!
Што за легкадумнае дзіця... Малое асцярожліва павярнулася ў мой бок і прыязна мне кіўнула (мы ведалі адно аднаго з абедаў у пансіёне), потым нахілілася, падняло адну з тых патрывожаных жывых істотаў і загаварыла, уласна, звяртаючыся толькі да мяне, крыху павучальна:
— Глядзі, гэта Ісус Хрыстос, які аддаў за нас сваю кроў.
Тады дзяўчынка расхінула сваю белую сукенку і паднесла гэтую страшна ўзброеную жывёліну да сваіх яшчэ зусім маленькіх грудзей.
— Пэпіта! — выгукнуў я. — Твае бацькі праз гэта будуць цэлы век журыцца.
Але дарма: Пэпіціна сукенка адразу ж пачала афарбоўвацца ў чырвоны колер, які ўсё цямнеў і цямнеў. Дзяўчынка амаль па-даросламу разумна ўсміхнулася і знікла з маіх вачэй.
Збянтэжаны, я пайшоў у касцёл і паспрабаваў знайсці там супакаенне ў малітве. Супакоіцца было цяжка. На дварэ вечарэла; з суседняга кінатэатру “Cinema Sol” даносіліся шумныя гукі мультфільму пра Мікі-Маўса. Пры канцы сваёй малітвы я прашаптаў: “Госпадзе, калі ты хочаш, каб я вярнуўся дадому, зрабі так, каб ля маёй паляны была рыбіна”. Позна ўвечары, перачакаўшы ўжо другі сеанс у кінатэатры, я працягваў уздыхаць: “Пэпіта, Пэпіта, бедныя твае бацькі!” Я не здолеў даць сабе лепшае рады, акрамя як узяць аркуш паперы ды хоць неяк увекавечыць дзіця, што загінула.

У порце вугаль, вугаль,
Ён гэткі чорны, чорны.
Пэпіта, надзень сваю белую сукню.
У цябе новая плоць.
Не кліч да сябе мух,
Не прыцягвай пальцаў,
Што хапаюцца за газеты.
Ты лапочаш лухту.

Пэпіта, Пэпіта, што значыць — Пэпіта.
У порце вугаль, вугаль,
У небе згасаюць рыбы
Ды іхнія косці-гітары, Пэпіта.
І вось — смерць, турыстка
Сядае, здымае сонечныя акуляры.
“Пэпіта, — кліча ён, — хадзі сюды,
Прынясі газету мне,
Будзем разгадваць красворд… Пэпіта.

У порце соль,
Белая, сляпучая.
Пэпіта, надзень сваю чорную сукню.
Цяпер, калі я зноўку сяджу ў сваім крэсле на ўскрайку паляны, гэтыя радкі чытаюцца добра. Я ўзгадваю, што нехта з маіх сяброў аднаго разу ў часіну натхнення прамовіў: “Тое, што ты можаш узяць аловак, каб накрэсліць на паперы кола, а пасля яшчэ дадаць: вось паглядзі, гэта сонца, — вось гэта і даказвае, што чалавек — істота богападобная”. Тое самае з гэтым аркушам. І калі я чытаю: “Пэпіта, Пэпіта” (якое бязглуздае імя) — яго наўсцяж залівае кроў. Але мая паляна зялёная. Зеляніна крыху горнецца ўлева, натамляючы мяне. На маёй паляне няма нічога, што магло б затрымаць мой позірк, — няма кропкі, якая азначае канец важнага сказу.

З таго часу, як я пачуў тую арыю, я ўяўляю дыяганаль, праведзеную цераз паляну. Гэта адбывалася на тым самым месцы, на фоне гораў вугалю. Я замовіў сабе нешта такое халаднаватае, блакітнавата-белае, але не малако. Чалавек прайшоў па пляцы, па самым сонцы, і сказаў зусім не гучна: “Шаноўны спадар, зараз я спяю арыю пра дыяганаль, паслухайце, калі ласка”. Прамовіўшы гэта, ён выставіў наперад правую нагу і заспяваў. Калі цяпер я сяджу тутака, на паляне, праседжваю сваё крэсла, мне прыгадваецца адзін з прыпеваў, прыблізна гэткі:

Сабака брэша, і ляскае пуга,
Я кнігу загарнуў
І дзверы ўсе пазамыкаў,
О чорная дыяганаль.

Ён праспяваў гэтыя радкі тэнарам. Але — што значыць тэнарам? Ці не было б лепшым такое азначэнне: гукі ягонага голасу, суладнасць гэтых гукаў, апусціліся на пляц. Гэта была дарагая луска рыбіны. Я ўстаў са свайго месца, хацеў яе сабраць і засыпаць сабе ў гаманок — так, як у некаторых мясцовасцях у навагодні вечар збіраюць луску карпа. Але сонца мяне пакарала; на мае воплескі прыйшоў кельнер, якога я не клікаў, і запытаўся: “Чаго жадаеце?..” І я зноў сеў на месца. Скончыўшы спяваць, тэнар перачакаў мае хапатлівыя воплескі, адставіў назад сваю правую нагу і прамовіў: “Шаноўны спадар, вы праслухалі арыю пра дыяганаль, якую таксама называюць “Шляхам трох кабальера”. Прамовіўшы свае першыя словы, ён адступіў назад, а трое дзецюкоў у белых кашулях энергічна перасеклі пляц у кірунку махіны-экскаватара, што ржавеў ля партовых муроў. Твары ў іх былі да ненатуральнасьці сур’ёзныя, і пры гэтым яны ішлі склаўшы рукі. З боку рыбнага складу на іх былі настаўленыя рулі вінтовак, прагучала каманда “плі”, над пляцам разнёсся залп, і тыя тры кабальера паваліліся на брук. Значыцца, гэта і ёсць тое, што́ ў Іспаніі разумеюць пад дыяганаллю, а тэнары ўмеюць спяваць арыі пра дыяганалі гэткага кшталту. Калі я кажу пра тэнара ці тэнараў, дык маю на ўвазе гукавы шэраг, што апускаецца на пляц, — каштоўную луску. Я хацеў яе пазбіраць, але афіцыянт гучна прамовіў: “Чаго жадаеце?..” Я сеў на сваё крэсла, даслухаў арыю, кароткае тлумачэнне тэнара, убачыў трох кабальера, пачуў той залп, зірнуў на іхнія кашулі — як яны набраклі й пацямнелі, — падумаў пра Пэпіту, як на яе сукні з’явілася кроў, і захацеў прамяняць усю гэтую чырвань на зяленіва маёй паляны.

Не, мне гэта не ўдалося. Яшчэ і сёння я веру, што калі нехта наважыцца паехаць у Іспанію, ён мусіць быць гатовым да іхнага звычаю размалёўваць напаказ кашулі ды сукенкі, да таго, што там няма дзе схавацца ад арыі пра дыяганаль. “Госпадзе, калі ты хочаш, каб я вярнуўся дадому, — гэтак маліўся я тады, разлічыўшыся з афіцыянтам і выйшаўшы вон, — зрабі, каб над маёй палянаю была рыбіна, за якою плыло б маё вока, пакуль не адчула б яе холаду”.
Калі я колькі дзён таму заснуў у сваім крэсле, прачытаўшы перад тым нейкі раман, старонкі якога зверху паведамлялі пра

тое, што ўнізе ўжо зноўку ломіцца ў адчыненыя дзверы, называе свой кірунак і рухае дзеянне, — тады я прачнуўся. У мяне заляжаўся бок, я быў абураны тым нястрымным рогатам, які часцяком дазваляе сабе ў маёй прысутнасці мой сябар. Ён стаяў побач, даваў мне свае звыклыя парады, тыкаючы на раман.

— Раман благі, — прамовіў я. — Усякі раз, калі яго герою надараецца магчымасць падрабязна апавесці пра сваё жыццё, ён пераўзбуджаецца і вырашае паехаць у падарожжа.

— А ты ж, — адказаў мой сябар, — таксама тады паехаў у падарожжа і крыху развеяўся. Табе трэба нешта рабіць; паспрабуй паставіць сабе фантан альбо жаніцца. Вазьмі сабе маладую жоначку, лепшай рыбкі не прыдумаеш.

Гэтак казаў ён і не ў меру смяяўся. Не, мне фантан не патрэбны, а каб узяць ды жаніцца? Я як падумаю, што яна кожнага вечара будзе стаяць перада мною ў белай сукенцы, у якой я памятаю Пэпіту, і я буду чакаць, калі ж яна пасадзіць сабе на грудзі штосьці такое, што пафарбуе ейную сукенку... Напэўна ж, яна не будзе прыціскаць да сябе нічога, толькі свае мітуслівыя, нявыхаваныя далоні, якія не здолею выхаваць і я. Але тады мне б давялося дарэмна чакаць, наша сям'я засталася б бяздзетнаю, паляна — недагледжанай і аддадзенай на водкуп садоўніка. Я хачу набрацца цярпення, усе свае малітвы скіраваць толькі на рыбіну; а жаніцца яшчэ заўсёды паспею. Альфонса Кальяс умеў цярпець. Аднойчы ў суботу пачалося тое, што ў гэтай краіне называецца фіестай і шырока рэкламуецца. У звычайным касцюме тарэра ён у ідэальнай — наколькі я як турыст магу меркаваць — паставе стаяў на пляцы. Потым пасля пэўнага папярэдняга рытуалу да яго бясконца-марудна пачаў набліжацца слімак. Мяркую, што ён быў метры два з паловай увышкі і пад сем метраў удоўжкі. Але гэтыя памеры не павінны вам казаць ні пра што іншае, акрамя як пра маю няздольнасць апісаць неверагодна гарманічны рух гэтага голага цела. Пакуль ён у апісанай вышэй паставе чакаў яго, а разам з ім і гледачы (а сярод гледачоў і я таксама), я пачуў, як у порт заходзіць карабель, але мне не ўдалося прыгадаць яго назвы, бо ўжо вечарэла і ўсе рыбакі стаялі тут поруч са мною і, здавалася, гэтаксама, як я, нічога не бачылі. Слімак поўз на Альфонса, пакідаючы за сабою мокры ліпкі след. Той прапусціў яго паўз сябе, ухіліўшыся ад ягоных

мацакоў: так было вызначана правіламі гэтай бойкі. Пасля ён нанёс удар пікаю — кроў не з'явілася. "Кроў! Кроў! Дзе кроў?" — вылецела ў гледачоў, і ў мяне таксама. Слімак яшчэ раз пайшоў у наступ, тарэра зноў ударыў пікаю, і кроў зноўку не схацела праліцца.

Альфонса Кальяс меў досыць цярпення. Было б у мяне гэткае цярпенне, каб я мог гэтак вычэкваць, у мяне б з'явілася рыбіна. У мяне ж усё так проста: няма жонкі, якая стаіць каля майго ложка, няма дзяцей каля маіх ног, няма публікі — нікога, хто б стаяў там і крычаў: "Кроў! Дзе кроў?" Альбо: "Дзе рыбіна?" На маёй паляне няма ніякай публікі. Хоць паблізу юнакі й гуляюць у футбол, ды мая рыбіна — гэта не іхняя рыбіна. У Іспаніі публікі не бракуе. І ўсё ж такі сёння я магу сцвярджаць, што Альфонса Кальяс страціў цярпенне сам. Не, гэта публіка змусіла яго страціць цярпенне. Ён хацеў штосьці прапанаваць ёй, зразумеў яе нуду, хоць сам ён, закаханы ў сваё рамяство, не паказваў нават знаку стомленасці альбо нецярпення. Так яно выходзіла само сабою, атрымлівалася паводле натхнення. Ізноў слімак прайшоў паўз яго, зноў прыняўшы ў сябе ўдар пікаю, нібы тоўстая губка; частка гледачоў паўскоквала са сваіх месцаў, бурна рэагуючы на пабачанае. Тут тарэра павярнуўся, зрабіў спрактыкаваны рух — і ў яго руках бліснуў востры інструмент. Тады выступіла кроў. Ён спыніўся, але праз пэўны час заняў зручнейшую паставу, каб яшчэ даўжэй прадэманстраваць, якую ласку для ўсіх ён здолеў зрабіць. Удзячныя гледачы моўчкі сядзелі вакол пляцу.
Пазней у мяне надарылася магчымасць абдумаць гэта ўсё, седзячы ў сябе на паляне. Не спяшаючыся, слімак зноў і зноў поўз праз мае думкі. Але ж чаму ён выцягваў перад сабою хусціну? Хусціну, колерам якое ў іншым месцы дражняць пяцігадовага быка. Мо ён не ведаў, што слімак сляпы, што ніводны колер не змусіў бы яго гладкае цела заспяшацца. Цяпер я не задаю гэтага пытання. Падчас аўтамабільных гонак — мой сябар быў вінаваты ў тым, што я іх убачыў, — мне прыйшло ў галаву: як жа мала мы разбіраемся ў хуткасці слімака. Нашы вочы таго не ведаюць, не могуць спасцігнуць гэтага гладкага цела, што шалёна імкнецца ў часе. Ад гэтага мы пачынаем адставаць, і слімак пакідае нас далёка ззаду. Я амаль што мог бы сказаць — не лічачы сябе прарокам, — што

слімак выцягвае свае мацакі ў наступнае стагоддзе. Яно будзе стагоддзем абачлівасці, у ім здымуцца ўсе абвінавачанні; стагоддзем без таго экстравагантнага колеру, які так любіла Пэпіта.

Часцяком я думаю, што нечага навучыўся, што слімак Арчыбальд наблізіў мяне да рыбіны. Але пасля, калі я гляджу на абыякавую паляну, у галаву мне прыходзяць журботныя, якім я з цяжкасцю надаю агульны напрамак. Маб[illegible] радкамі хрэстаматыйнага верша Арчыбальда Дуглас Дэвідсана насіў гэта сем гадоў...” пачнецца паэма гэтых часоў

Арчыбальд Дуглас Дэвідсан прадстаўнік пакалення, якое змагаўся за незалежнасць свайго краю.

Сем гадоў чакаў я слімака
І ўжо забыўся, як слімак выглядае.
Калі ён прыйшоў, голы і чулы,
Я шукаў для яго адпаведнага йменя.
Я казаў: “Пачуццё”, “Цярпенне”, “Шчасце”,
А ён коўзаўся бязгучна.

Пераклаў з нямецкай Лявон Баршчэўскі
паводле: Erzählungen. Hauslektüre. Moskau: Hochschule, 1969.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/05/02**
[image]

ВЕРА РЫЧ — паэтка й перакладчыца. Скончыла Оксфардзкі й Бэдфардзкі каледж («Oxford and Bedford College») у Лёндане. Выкладае славянскія літаратуры ва ўніверсытэце Бірмінгему. Асабістая вэб-старонка http://www.belarus-misc.org/v-rich.htm.

Вера Рыч

Беларусь: ні дыктатура, ні дэмакратыя

Contemporary Belarus: Between Democracy and Dictatorship. Edited by Elena Korosteleva, Colin W. Lawson, and Rosalind J. Marsh. London: RoutledgeCurzon, 2003.

Матэрыяламі для гэтай кнігі, яшчэ адной з шэрагу “Беларусь паміж X і Y”, паслужылі дакумэнты канфэрэнцыі “Беларусь: забытае сэрца Эўропы”, што праводзілася ўва ўніверсытэце гораду Бат у лютым 2000 году. Таксама кніга зьмяшчае пасьлямову, у якой аналізуюцца прэзыдэнцкія выбары 2001 году. Некаторыя матэрыялы кнігі былі ўзятыя з двухгадовага дасьледаваньня “Параўнальны аналіз харызматычнага лідэрства ў Расеі, Беларусі і Ўкраіне: яго вытокі, разьвіцьцё і падтрымка”, праведзенага навукоўцамі з БДУ, Украінскай акадэміі навук і МДУ пры дапамозе INTAS (Незалежнай міжнароднай асацыяцыі, створанай краінамі, якія ўваходзяць або імкнуцца ўвайсьці ў Эўразьвяз) і Брытанскай Акадэміяй. Гэты праект, як нам паведамілі, стварыў эмпірычную базу для высноваў дасьледаваньняў пры канцы кнігі.

Вынікам аб’яднаных намаганьняў стаў моцны ў навуковым

Артыкул “Беларусь: ні дыктатура, ні дэмакратыя” быў упершыню апублікаваны

сэнсе зборнік, амаль усе аўтары якога займаюць **на адпаведныя** пасады ці пішуць доктарскія дысэртацыі ў заходніх ці беларускіх універсытэтах. Выключэньнямі зьяўляюцца Дэвід Думашы (“Адносіны Беларусі з Эўразьвязам — за і супраць”, пэрспэктывы”), якая падчас напісаньня працы была **Ліцэнцыят** навуковай супрацоўніцай (аналітыкам) па пытаньнях Беларусі й Малдовы ў Лёнданскім універсытэце, Ян Запруднік працуе ў Брытанскай амбасадзе ў Парыжы, і знакаміты беларускі навуковец, эмігрант Ян Запруднік, які цяпер пасьля **Radio Free Europe/ Radio Liberty,** працы на радыё «Свабода» знаходзіцца на пэнсіі.

**міжнародных адносінах Дзяржаўнага ўніверсытэту Ньюкасла, Аўстралія, і кандыдацкую ступень па гісторыі Беларусі ў Варшаўскім універсытэце. Ён працаваў у Беларускім інстытуце стратэгічных даследаванняў, Варшаўскім цэнтры ўсходніх даследаванняў, Цэнтры Мікалая Барадулина, Беларускім інстытуце навукі і мастацтва, Беларускім гістарычным таварыстве, Беларускім ПЭН-цэнтры і Беларускай рэдакцыі радыё «Свабода». Ён з’яўляецца аўтарам кнігі “Беларусь: Выбар нацыянальнай ідэнтычнасьці” (Беларусь: Выбар нацыянальнай ідэнтычнасьці), а таксама шматлікіх артыкулаў пра Беларусь, Украіну і Малдову ў часопісах “Беларускі гістарычны агляд”, “Arche”, “Nowa Europa Wschodnia”, “Sprawy Narodowościowe”, “Studia Politologiczne”, “Studia Ukrainoznawcze”, “Wschodnioznawstwo”, “Ab Imperio”, “Nationalities Papers”, “Europe-Asia Studies”, “Journal of Ukrainian Studies”, “Journal of Baltic Studies”, “Slavic Review”, “Problems of Post-Communism”, “Journal of Democracy”, “Demokratizatsiya”, “Transitions Online”, “Current History”, “Orbis”, “Foreign Affairs”, “Foreign Policy”, “Survival”, “Jane’s Intelligence Review”, “Jane’s Defence Weekly”, “Jane’s Foreign Report”, “Jane’s Sentinel: Russia and the CIS”, “Jane’s Sentinel: Central Europe”, “Jane’s Sentinel: Security Assessment — Eastern Europe”, “Jane’s Sentinel: Security Assessment — Russia”, “Jane’s Sentinel: Security Assessment — Commonwealth of Independent States”, “Jane’s Sentinel: Security Assessment — Central Asia and Caucasus”, “Jane’s Intelligence Digest”, “Jane’s Terrorism and Security Monitor”, “Jane’s Islamic Affairs Analyst”, “Jane’s Intelligence Review — Special Report”, “Jane’s Intelligence Review — Country Briefing”, “Jane’s Intelligence Review — Country Profile”, “Jane’s Intelligence Review — Country Risk Assessment

ляжыць альбо незваротны пераход да дэмакратыі, альбо вяртаньне назад да дыктатуры”.
За тры гады, у якія гэтыя даклады рыхтаваліся да публікацыі, Беларусь амаль не скранулася ў выразна дэмакратычным кірунку. Аднак, нягледзячы на пагрозьлівае ўзмацненьне аўтарытарызму і парушэньні правоў грамадзяніна і асобы (напрыклад, новай рэдакцыяй Закону аб рэлігіях, 2002), адкат да поўнай дыктатуры яшчэ ня зрабіўся непазьбежнасьцю і перадумовы для дэмакратыі яшчэ існуюць. Беларусь загрузла на скрыжаваньні, і, нягледзячы на пэўны час, што прайшоў з моманту напісаньня тэкстаў, высновы, зробленыя ў кнізе, застаюцца актуальнымі й сёньня. Некаторыя лічбы, вядома, састарэлі, а некаторыя аўтары выяўляюць наіўнасьць, карыстаючыся афіцыйнай статыстыкай, зьвесткамі дзяржаўных сацыялягічных апытаньняў і некрытычна давяраючы ім.
Але ўвогуле кніга робіць карысны й цікавы ўнёсак у вывучэньне сучаснай Беларусі.
З ангельскай мовы пераклаў Аляксей Ігнатовіч

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/04/29**

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ (нар. у 1972 у Менску) — палітолаг. Дацэнт катэдры эканомікі Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту. Друкуецца ў «ARCHE» ўпершыню.

Віталь Сіліцкі

Савецкая экзотыка, расейская правінцыя ці эўрапейская дзяржава?

Contemporary Belarus: Between Democracy and Dictatorship. Edited by Elena Korosteleva, Colin W. Lawson, and Rosalind J. Marsh. London: RoutledgeCurzon, 2003.

The EU and Belarus: Between Moscow and Brussels. Edited by Ann Lewis. London: The Federal Trust Europe's Eastern Borders Series, 2002.

Паколькі Беларусь доўга заставалася па-за ўвагай паліталягічнай і сацыяльнай думкі ў сьвеце, публікацыю адразу дзьвюх кнігаў нельга не лічыць значнай падзеяй. Адметнасьцю абодвух выданьняў зьяўляюцца даволі шырокія аўтарскія калектывы, якія аб'ядналі ў сабе экспэртаў, палітолягаў і эканамістаў зь Беларусі й Захаду, вядомых дзеячоў беларускай дыяспары, афіцыйных асобаў беларускага ўраду і ўплывовых міжнародных арганізацый, таксама як і цэлы шэраг прадстаўнікоў новай генэрацыі беларускіх інтэлектуалаў, якія

атрымалі заходнюю адукацыю і цяпер працуюць над беларускай праблематыкай як у Беларусі, так і па-за яе межамі. Менавіта гэтае кола аўтараў у сваіх працах спрабуе аналізаваць палітычныя, культурныя і эканамічныя працэсы ў Беларусі ў рамках асноўных канцэптуальных падыходаў, што выкарыстоўваюцца ў сусьветнай сацыяльнай думцы. Нягледзячы на тое што кожнае выданьне мае сваю спэцыфіку (першае ў большай ступені прысьвечанае аналізу ўнутранай сытуацыі ў краіне, другое — яе замежным дачыненьням), абедзьве кнігі маюць на мэце азнаямленьне заходняй аўдыторыі зь Беларусяй і становяць сабой зборы артыкулаў, напісаных вельмі неаднароднымі аўтарскімі калектывамі, дзеля чаго сярод аўтараў адсутнічае адзінства канцэптуальных ды ідэалягічных падыходаў. Гэтая акалічнасьць і характарызуе абодва выданьні, якія сталі свайго роду форумам экспэртаў і аналітыкаў, што працуюць над беларускай праблематыкай. У разнастайнасьці падыходаў і ацэнак, безумоўна, ёсьць свае дадатныя і адмоўныя бакі. Да першых можна аднесьці шырыню “ахопу” беларускай праблематыкі й мультыдысцыплінарнасьць дасьледаваньняў, да другіх — некаторую тэндэнцыйнасьць найбольш палярных падыходаў і досыць павярхоўны агляд некаторых тэмаў.

Аўтары надавалі шмат увагі парадаксальнаму стану, у якім выразна недэмакратычны рэжым абапіраецца на шэраг мэханізмаў, што звычайна забясьпечваюць стабільнасьць дэмакратычнага ладу, — такія як апора ўлады на сьвядомую падтрымку значнай часткі грамадзтва, яе здольнасьць да маніпуляцыі дэмакратычнымі інстытутамі дзеля падмацаваньня аўтарытарнай сыстэмы ды пільная ўвага да грамадзкай думкі пры вызначэньні стратэгічных рашэньняў у вонкавай і ўнутранай палітыцы. Таму шэраг аўтараў дзеля характарыстыкі палітычнага рэжыму ў сучаснай Беларусі выкарыстоўваюць тэрміны “выбарная дыктатура” (Карасьцялёва [1]), “элегантная дыктатура” (Хоўкс [2]) ці “дыктатура з элемэнтамі дэмакратычнай легітымнасьці” (Сіліцкі [2]). Іншыя аўтары (Харпфэр [1]; Ротман і інш. [2]) выяўляюць яшчэ адзін парадокс сучаснага беларускага палітычнага жыцьця — супярэчнасьці паміж аўтарытарнымі палітычнымі інстытутамі й палітычнай культурай беларускага

грамадзтва, якая значна дэмакратызавалася на працягу апошніх дзесяці год. У адпаведнасьці з “індэксам новых дэмакратый” (кумулятыўным рэйтынгам прыхільнасьці да дэмакратычных і грамадзянскіх вартасьцяў), беларускае грамадзтва за гэты час дасягнула самага значнага прагрэсу ў параўнаньні зь іншымі краінамі ўсходнеэўрапейскага рэгіёну, бо колькасьць “цьвёрдых дэмакратаў” узрасла больш чым удвая і яго палітычныя арыентацыі ўжо амаль не адрозьніваюцца ад тых, што пануюць у краінах Балтыі. Цікава, адзначае Харпфэр, што падобны парадокс (аўтарытарная ўлада — дэмакратызаваная грамадзкая сьвядомасьць) назіраўся і ў былой Югаславіі за часамі Мілошавіча. Гэтыя парадоксы прывялі многіх аўтараў да аналізу дынамікі палітычнага жыцьця ў краіне і высьвятленьню таго, як палітычныя стратэгіі асноўных гульцоў (Сіліцкі [1] і [2]), слабая інстытуцыяналізацыя партыйнай сыстэмы (Карасьцялёва [1]) ды цяжкасьці ў фармаваньні нацыянальнай палітычнай эліты (Жыль-Бялова [1]) спрыялі фармаваньню ўмоваў, у якіх грамадзтва, што ўжо збольшага адышло ад старых савецкіх стэрэатыпаў у сваіх палітычных арыентацыях, існуе ў старамоднай аўтарытарнай палітычнай рэчаіснасьці.
Ці здолее Беларусь умацавацца як самастойная дзяржава і асобная нацыя? У дыскусіі на гэтую тэму можна назіраць рэзкае разыходжаньне пунктаў гледжаньня аўтараў, пачынаючы ад безапэляцыйных цьверджаньняў дэ Ватэра і Вірсмы накшталт “Беларусь ніколі не была часткай эўрапейскай гісторыі” ці “Беларусь нельга нават характарызаваць як нацыю” [2], праз ужо вядомае апісаньне Беларусі Марплзам як “дэнацыяналізаванай нацыі” [1], да больш грунтоўнага аналізу Запрудніка, у якім разьмяжоўваецца лінгвістычная і палітычная русіфікацыя і робіцца выснова пра тое, што базавыя атрыбуты нацыі (ляяльнасьць да дзяржавы, пачуцьцё адметнасьці й адзінства лёсу) замацаваліся ў беларускім грамадзтве, нягледзячы на дзесяцігодзьдзі палітыкі задушэньня нацыянальнай самасьвядомасьці [1].

У аналізе эканамічнай сытуацыі ў Беларусі большасьць аўтараў (Злотнікаў [2]; Раманчук [2], а таксама з заходняга боку — Лаўсан [1] і Ослунд [2]) паўтараюць вядомыя высновы пра лукашэнкаўскую эканамічную палітыку, гэтаксама як і

прадказаньні немінучага эканамічнага каляпсу, зь якімі беларускі чытач знаёмы паводле матэрыялаў беларускай прэсы. На мой погляд, у эканамічных блёках абедзьвюх кнігаў за рэдкім выключэньнем пераважаюць ідэалягічныя штампы й амаль адсутнічае аналіз як такі.

Паміж аўтарамі разгарнулася жывая дыскусія па пытаньні, якая стратэгія ўзаемадзеяньня Эўрапейскага Зьвязу зь Беларусяй была б аптымальнай. Палярныя пункты гледжаньня былі прадстаўленыя Мартынавым [2] і Гішэр [2]. Першы паўтарае афіцыйную пазыцыю беларускага ўраду: “Беларусь ня гнецца пад вонкавым націскам. <…> Будаваньне адносінаў на падставе выкананьня папярэдніх перадумоваў — гэта тупіковы шлях”. Другая выносіць жорсткі вэрдыкт: “Беларусь павінна зьмяніцца ўнутры, каб мець магчымасьць збудаваць шчыльнейшыя стасункі з аб’яднанай Эўропай”. Ватэр і Вірсма [2], а таксама Сіліцкі [2] шукаюць шляхі выхаду з тупіка, у які зайшлі эўрапейска-беларускія стасункі, на падставе больш гнуткіх стратэгіяў, што ўключалі б у сябе элемэнты ангажаваньня і абумоўленага ўзаемадзеяньня. У той жа час усе бакі адзачаюць выключную важнасьць гарманізацыі адносінаў як для Эўрапейскага Зьвязу, так і для пэрспэктываў стабільнага і дэмакратычнага разьвіцьця Беларусі. Дарма што ў сёньняшні момант Беларусь не зьяўляецца прыярытэтам эўрапейскай палітыкі, паглыбленьне адносінаў бачыцца большасьцю аўтараў непазьбежным дзеля шэрагу эканамічных і геапалітычных чыньнікаў. Аднак сярод аўтараў адсутнічае адзінства ў разуменьні, якім чынам мусіць надысьці такая нармалізацыя. Сярод магчымых прапанаваных варыянтаў — аднабаковае ангажаваньне, выкарыстаньне Расіі з той мэтай, каб яна падштурхнула працэсы дэмакратызацыі ў Беларусі, ці выпрацоўка Эўрапейскім Зьвязам шырэйшай стратэгіі ўзаемадзеяньня з усходнеэўрапейскімі краінамі, у тым ліку Ўкраінай, Беларусяй, Малдовай і Расіяй. Наагул, дыскусіі на тэму, ці паспрыяе Расія працэсу дэмакратызацыі й эўрапейскай інтэграцыі Беларусі, адведзена даволі вялікае месца ў кнізе “The EU and Belarus”. Што цікава, аргумэнты аўтараў у цэлым паўтараюць довады, якія гучаць у дэбатах, што разгарнуліся на гэтую тэму ўнутры беларускай палітычнай эліты.

Нягледзячы на ўсе недахопы абодвух выданьняў, сам факт іх зьяўленьня ёсьць вельмі станоўчым сыгналам, які дае падставы

спадзявацца, што Беларусь перастае быць terra incognita ў заходняй інтэлектуальнай думцы, а багаты канцэптуальны аналіз асноўных палітычных, эканамічных ды сацыяльных праблемаў і жывая дыскусія наконт пэрспэктываў далейшага разьвіцьця краіны дапамогуць запоўніць недахопы ў інфармацыі сярод палісымэйкераў, чыя дзейнасьць так ці іначай уплывае на сытуацыю ў Беларусі й вакол яе.

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/05/02**
[image]

Мікола Нікалаеў

Ці можа крыніца “опіюму для народу” быць крыніцаю веды?

Блинова Т. Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения. — *Гродно, 2002.*
Марозава С. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596—1839 гады). — *Горадня, 2001.*
Яскевіч А. Падзвіжнікі і іх святыні. Духоўная культура старажытнай Беларусі. — *Менск, 2001.*
Слюнькова И. Монастыри восточной и западной традиций. Наследие архитектуры Беларуси. — *Москва, 2002.*

Пасьля крызысу навуковага атэізму (зьвязанага з агульным крызысам камуністычнай ідэалёгіі) гісторыю беларускай царквы плённа вывучаў хіба толькі прафэсар Беластоцкага ўнівэрсытэту Антон Мірановіч. У постсавецкай Беларусі, акрамя перавыданьня альбомаў Надзеі Высоцкай з іканапісам і асобных артыкулаў у часопісах і малатыражных зборніках, быў зацішак. Аднак мінулы год паказаў, што над гэтай галай плённа працавалі адразу некалькі беларускіх вучоных.

МІКОЛА НІКАЛАЕЎ (нар. 1955 у Шчучыне) — супрацоўнік Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. Сябар вучонае рады РНБ. Доктар філялягічных навук, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі навук Эўразіі. Дасьледчык гісторыі культуры, мастацтва, праваслаўнай царквы ў Беларусі. Выдавецтва «Асар» рыхтуе да друку ягоную манаграфію «Книжная

У неафіцыйным змаганьні за ганаровае званьне “Мыслітэль царквы ў Беларусі” ўдзельнічаюць чатыры асобы. **Уліс Іоў** ў 2002 годзе абаранілі доктарскія дысэртацыі, за кожнай дысэртацыяй стаіць тоўстая кніжка. Гарадзенская **Кніжная школа** прадстаўленая асобамі Тамары Бліновай і Сьвятланы Марозавай (абедзьве выкладаюць на гістарычным факультэце ўнівэрсытэту), мінчанка Алена Яскевіч служыць у **Акадэміі навук Беларусі**, а беларуска Інэса Сьлюнькова робіць вучоным сакратаром Расейскай акадэміі архітэктуры й жыве ў Маскве. Прайграць у іхным спаборніцтве немагчыма, бо ўсе ўдзельніцы пішуць на розныя тэмы: Тамара Блінова — пра каталіцызм, Сьвятлану Марозаву цікавіць уніяцтва, Алену Яскевіч — праваслаўе. А Інэса Сьлюнькова прадметам сваіх навуковых дасьледаваньняў зрабіла манастырскую архітэктуру ўсіх хрысьціянскіх канфэсіяў. **Літоўская**.

Чатыры тоўстыя манаграфіі за адзін год! — такога “штурму” царкоўнай гісторыі дасюль не было. А каб за занядбаную дзялянку ўзяліся жанчыны — такое ўжо бывала: мы памятаем суцэльнае панаваньне жанчын у мэдыцыне, школе і бухгальтэрыі.

Усе ўдзельніцы асьцярожна пазьбягаюць канфрантацый. Хаця Сьвятлана Марозава, напрыклад, сьмела апісвае, як у дачыненьнях паміж канфэсіямі не абыходзілася без празэлітызму й прымусу. Праўда, пры гэтым яна не кранае пэрыяду, калі праваслаўныя і пратэстанты цярпелі ад каталікоў і ўніятаў, але падрабязна спыняецца на тым часе, калі каталікі цярпелі ад дзяржаўна-праваслаўнага ўціску. За гэтымі ўціскамі й змаганьнямі супраць уціскаў лёгка забываліся нават і пра Бога — дзе там да Бога! Аднак, пакуль не назьбіраныя факты і няма досьведу палемікі, лепш не сварыцца.

Недахоп жаночага падыходу — відавочная боязь палемікі і арыгінальных трактовак, якая часам шкодзіць асьвятленьню праблемы. Тая самая Сьвятлана Марозава піша пра створаную ў дарэвалюцыйным Пецярбургу школу вывучэньня праблемаў уніяцтва як пра нешта мэтадалягічна й ідэалягічна адзінае, хаця прадстаўнікі пецярбурскай навукі (беларусы паводле паходжаньня) Міхаіл Каяловіч, Платон Жуковіч і Пётра Баброўскі вельмі па-рознаму бачылі праблемы ўніяцтва й вялі доўгія жывыя спрэчкі…

Тамара Блінова ўзяла толькі адзін аспэкт дзейнасьці езуітаў — іх ролю ў арганізацыі адукацыі й асьветы. Ружовыя колеры. Шмат апрацаванай літаратуры. Мы даведаліся шмат новага. Спрэчныя праблемы яна абыходзіць віртуозна, быццам бы езуіты ніякага дачыненьня ня мелі да адмовы касьцёлу ад старабеларускай мовы на карысьць польскай, і сваёй апекай базыльянскіх друкарняў не “падвялі іх пад манастыр”, і не хавалі генэралаў свайго ордэну ў былым праваслаўным Спаса-Эўфрасіньнеўскім манастыры ў Полацку. Не раскрывае аўтарка і прычынаў такога арыгінальнага выпраўленьня езуітамі сваёй пэдагагічнай памылкі, як спаленьне ў 1689 годзе выпускніка Берасьцейскага калегіюму Казімера Лышчынскага, — ці яго пакутніцкая сьмерць ужо ня мае дачыненьня да “адукацыі й асьветніцтва”? Тым ня менш, і статыстыка колькасьці езуітаў у асобных гарадох Беларусі, і новая інфармацыя пра выдатных вучоных-езуітаў беларускага паходжаньня (Альбрэхт Каяловіч і інш.), і шмат усялякіх іншых зьвестак робяць кнігу выданьнем, якое ня змогуць абмінуць далейшыя дасьледнікі.

Інэса Сьлюнькова чарговы раз аддае даніну пакінутай Радзіме й працягвае дасьледаваць архітэктуру манастыроў Беларусі. Ня будзем пачынаць агляду яе кнігі з крытыкі непрафэсійных каляровых ілюстрацыяў — аўтарка сама аб’ехала помнікі, сама іх сфатаграфавала. Гэта ня мінус, гэта добры плюс. А вось з тым, што Радзіму сваю ў Сярэднявеччы Інэса бачыць усё роўна ў межах савецкіх і сталічныя (віленскія) манастыры застаюцца на пэрыфэрыі яе дасьледаваньня (за выключэньнем, праўда, праваслаўных і ўніяцкіх), мы не пагодзімся ніколі. Выдатны ілюстрацыйны матэрыял кнігі варты асобнай увагі: тут шмат архіўных здымкаў тых помнікаў, якія даўно ўжо не існуюць. Зьмястоўная манаграфія Інэсы Сьлюньковай напісаная ня толькі для архітэктараў, але для ўсіх аматараў нашай старасьвеччыны. На жаль, слабая маскоўская рэдактура прымушае нас праглынуць недарэчнасьці накшталт Лаўрышаўскага манастыра “каля Пінску” (с. 39), Беластоцкага манастыра “на Валыні” (с. 583), Веншалга замест Войшалка і шматлікія іншыя — нават сьпіс памылак друку прапануе ўжо ў першых радках выправіць “Сапрасьль” на… “Сапрасьль” (замест “Супрасьль”). Аднак кніга настолькі карысная, што

хочацца пажадаць яе хуткага перавыданьня ў перакладзе на беларускую мову.
Нельга не згадаць пра кнігу Алены Яскевіч — гэты шыкоўна выдадзены фаліянт яшчэ можна знайсьці ў некаторых менскіх кнігарнях. Летась мы моцна крытыкавалі гістарычныя ляпсусы гэтай працы, але цяпер падкрэсьлім яе дадатную ролю. Аўтарцы ўдалося спалучыць дасьледаваньне мастацтва іканапісу з вывучэньнем гістарычных традыцый праваслаўнай духоўнасьці. Праўда, без грунтоўнага гістарычнага й мастацтвазнаўчага фундамэнту А. Яскевіч ня здолела зрабіць паўнавартаснай навуковай працы. Тым ня менш, назьбіраны матэрыял і крытычныя водгукі на яго павінны стаць добрай сыравінай для далейшай работы.
Цяпер стаіць задача, прачытаўшы ўсе чатыры кніжкі, напісаць новыя, больш дасканалыя. Неістотна, зробіць гэта мужчына-гісторык ці зноў жанчына.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/04/27
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (25) – 2003**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image] [image] [image] [

ў ірляндцаў усё ў парадку, не згубіліся яны ні на 6-мільярднай Зямлі, ні ў пярэстым Эўразьвязе, нягледзячы ні на маленькую колькасьць насельніцтва, ні на пэўную блізкасьць да брытанцаў. Спытайся ірляндца: “Ты хто?” — і пачуеш у адказ: “Я ірляндзец”. Што можа быць прасьцейшым? Але спытай беларуса… Як сказаў некалі французкі пісьменьнік Рэнан, “нацыя — гэта штодзённы плебісцыт”. Але нацыя — гэта больш чым проста імя. Пасьля імя павінен паўставаць нейкі вобраз народу: дзе ён жыве, якія ў яго продкі, пэўныя культурныя сымбалі, якая рэлігія, ці мова, ці знакамітыя тэксты, таксама маленькія дробязі — напрыклад як тут звычайна апранаюцца ці што спажываюць.
Ірляндцы таксама любяць бульбу. Бульбу розную — вараную, у “лушпайках” і без, таўканіцу, фрыткі на французскі манер. Яны спажываюць бульбу ўдзень і ўвечары (зранку, трэба адзначыць, ня ўсе). Карацей, як і ў нас дома. Адзінае адрозьненьне — яны ня ведаюць дранікаў. Я нават думаю, калі будзе час і калі будзе не ляніва, запатэнтаваць дранік у Ірляндыі й зарабіць свой першы мільён. Ня ведаю, як яны дажыліся, што іхная бульбяная цывілізацыя на працягу свайго разьвіцьця ня вынайшла сакрэту драніка, але здаецца, паўплывалі нейкія няведамыя мне фактары. Ірляндзкая бульбяная цывілізацыя ў сваім разьвіцьці прыпынілася, а беларуская пайшла далей і здолела вынайсьці дранік.
У літаратуры я не сустрэў гэтаму тлумачэньня, але мая рабочая вэрсія такая: беларуская цывілізацыя больш разьвітая ў гэтым кірунку, больш бульбяная. Ірляндцаў жа ніхто бульбашамі ня кліча.

Калі сур’ёзна, у 1848—51 гадох у Ірляндыі не ўрадзіла бульба. Бульбаю жылі мільёны бедных сялян; бульба была іх хлебам, мясам і маслам. Людзі паміралі з голаду, як на Ўкраіне 30-х гадоў мінулага стагодзьдзя падчас галадамору. Пачалася масавая эміграцыя ў Амэрыку па шчасьце. Калі да 1848 году насельніцтва Ірляндыі было большым за 8 мільёнаў, дзеля сьмяротнасьці ад голаду і эміграцыі на пачатку ХХІ стагодзьдзя засталося каля 4 мільёнаў. Каб ня голад у Ірляндыі, невядома, якой была б Амэрыка цяпер, мо й не гаварыла б яна па-ангельску? Можа, гутарыла б па-нямецку ці па-польску, а мо, хе-хе, па-беларуску. Ну, гэта я так, спэкулюю. Дарэчы, цяперака

ірляндцы гавораць па-ангельску гэтак добра, што многія замежнікі лічаць, што лепш за ўсё вучыць гэтую мову ў Ірляндыі, і пасылаюць сюды дзетак па веды. Але так было не заўжды, і наконт мовы я яшчэ паразважаю ніжэй.
У нацыі ўсё ў парадку, калі кожны яе прадстаўнік можа ўзгадаць нешта з вышэйзгаданага шэрагу — ад культурных сымбаляў да бульбы на стале; калі ён ведае, што адрозьнівае яго нацыю ад астатніх нацыяў. Ня менш істотна, каб замежнікі таксама ведалі й паважалі гэта.
Паглядзім, хто вакол мяне. Вось Ліям — “Здароў, Ліям, як кратаешся?” Ліям нешта прабубнеў у адказ, я зрабіў выгляд, што зразумеў. Ліям размаўляе па-ангельску з акцэнтам жыхара з-пад Лімэрыку. Вельмі файны акцэнт, я вам скажу. Напалову гучыць як дублінскі акцэнт, астатняе — вельмі “аўтахтоннае” гучаньне, так сказаць. “R” — самае сапраўднае “р”, як у Менску, а не як на CNN ці BBC. Там “u” гучыць як “у”, не як “а”. Вось Дублін так і гучыць — як Дублін, а не як Даблін. Там яшчэ ёсьць неперадавальная інтанацыя. Мне вельмі падабаецца лімэрыцкі акцэнт. Дарэчы, ня ведаю, дзе вывучаў ангельскую мову гішпанскі амбасадар у Ірляндыі, які толькі сюды прыехаў, але на прыёме ён гаварыў зь лімэрыцкім акцэнтам — было вельмі сьмешна. Але вяртаюся да Ліяма. Ліям заўсёды апрануты ў спартовую вопратку, ці ён ідзе ў паб падчас уікэнду, ці вучыць студэнтаў палітычнай тэорыі. Але спартовая вопратка нічога дрэннага мне не сыгналіць — Ліям неагрэсіўны, добры дзяцюк. Дарэчы, калі вы першы раз ідзяце ў кампус Трыніці (Трыніці — гэта самы буйны й стары ўнівэрсытэт Ірляндыі), уражаньне, што вы апынуліся не ў адным з самых прэстыжных унівэрсытэтаў Эўропы, а ў Акадэміі фізкультуры: кожны другі — у спартовай вопратцы. Гэта першае ўражаньне. Але трэба мець моцную волю, каб змагацца супраць масавай рэклямы, — горш за БТ, я вам кажу. Я не заўважыў, як сам на тым тыдні нацягнуў спартовыя парткі й накіраваўся ў паб. А калі гэтую вопратку рэклямуе мясцовы сэкс-ідал-вобраз-Манчэстэр-Юнайтэд-форвард-знакамітасьць Дэвід Бэкхем, а вам усяго толькі 17 год? Хоцькі-няхоцькі, а ўзьдзенеш тое самае, што й Бэкхем.
Ліям вельмі палюбляе пабы, але я яшчэ вярнуся да тэмы пабу трохі пазьней. Нават калі дэкан папрасіў яго паказаць новым студэнтам кампус (а кампус велічэзны, я дагэтуль яшчэ ня даў

сабе рады яго абысьці), Ліям паказаў нам бібліятэку й сталоўку, а пасьля павёў нас у паб, дзе мы й засталіся да вечару, так і ня здолеўшы ўсяго пабачыць. Ліям любіць футбол. Першы раз, калі ён спытаў, адкуль я, я адказаў, што зь Беларусі, і падрыхтаваўся цярпліва растлумачыць, дзе гэта, а Ліям мне кажа — добра вы, хлопцы, далі галяндцам у 1998 годзе. Я аж здубікаўся — хлопец узгадаў адзіную знакавую перамогу беларускага футболу за апошняе дзесяцігодзьдзе. Ліям — шчыры хлопец, заўсёды дапаможа й растлумачыць, калі што трэба, але надта ж непунктуальны. Калі зь ім дамовіцца пра сустрэчу, наўрад ці Ліям прыйдзе ў пару. Як, на жаль, і большасьць ірляндцаў. Не разумею, чым змазаныя шрубікі “Кельцкага тыгра”, што ён так добра функцыянуе пры такіх працаўніках, як ірляндцы. Калі даць веры маім сябрам, бадай што ўсе топ-мэнэджэры ў галоўных высокатэхналягічных арганізацыях і фінансавых карпарацыях, якія разьмясьціліся ў Ірляндыі, — ці амэрыканцы, ці рафінаваныя гарвардзкай адукацыяй ірляндцы — яны й цягнуць ірляндзкую эканоміку наперад. Дарэчы, амаль усе кампутарныя праграмы й кампутары, якімі карыстаюцца ў Эўропе, з Ірляндыі — вось табе і вясковая краіна. Калі ў вас цяпер не пірацкая копія праграмнага забесьпячэньня ад «Microsoft», хутчэй за ўсё яно з Ірляндыі. Лічыцца, і нездарма лічыцца, што Ірляндыя — самая глябалізаваная краіна ў сьвеце: транснацыянальныя кампаніі амаль ня плацяць падаткаў у Ірляндыі, і капіталы валам валілі ў краіну на працягу 90-х гадоў дый цяпер лятуць, як мухі на мёд, і галівудзкія фільмы паказваюць тутака ў дзень амэрыканскай прэм’еры — добры цяпер проксі-паказьнік глябалізаванасьці, здаецца.

Ліям ня любіць Брытаніі. Ня любіць, можа, нават заслаба сказана — стаўленьне да Англіі ў Ліяма няйначай як у Пазьняка да Расеі. Хлопец лічыць Англію дрэннай краінай, ненадзейнай і каварнай. Прыкладна такое ж стаўленьне да Англіі было раней шмат у каго з ірляндцаў, якія прагнулі аб’яднаньня вострава ў адну краіну. Што зьмяніла стаўленьне, цяжка сказаць. Гэта й непасьпяховая тэрарыстычная дзейнасьць IRA, асабліва ў 70-я гады, гэта й эканамічны скачок і зьвязаны зь ім рост спажывецкай філязофіі a la Амэрыка, гэта й уступ у ЭЗ і пэўная рэвізія нацыянальнай ідэнтычнасьці.

Напэўна, апошняе было самым істотным фактарам. Хто такі ірляндзец? Ірляндзец — гэта не-брытанец. Так было раней. (Мой сябра Кен расказаў, як у Братыславе яны зайшлі ў тамтэйшы ірляндзкі паб: ніхто не гаварыў па-ангельску, але ў кутку вісеў Юніён Джэк — брытанскі сьцяг; Кен зь сябрукамі напіліся ды абхаркалі ад злосьці й расчараваньня гэты Юніён Джэк — славакі, незнаёмыя з гісторыяй брытанска-ірляндзкіх стасункаў, зьдзівіліся і дагналі Кена зь сябрукамі, але гэта для маёй гісторыі неістотна.) Аднак ірляндзец яшчэ больш, чым не-брытанец. Дык хто ён такі?

Усё пачалося з гэльскай народнасьці, якая насяляла Ірляндыю спрадвеку. У іх была свая мова, свая культура і звычаі. Гэльцы былі гэльцамі й звалiся гэльцамі. Але раптам, пачынаючы недзе з XII стагодзьдзя, пачалі прыплываць брытанцы й нарманы, і гэльцы самі не заўважылі, як пачалі дзяліць свой зялёны востраў з чужынцамі. Гэльцам не пашанцавала — іх краіна была надта блізкая да моцнай Брытаніі. Чужынцы адчувалі сябе даволі камфортна й занялі лепшыя землі й паселішчы, занялі нават Дублін (“чорнае балота” па-гэльску). Пасяленцаў і тых, хто прыняў ангельскую культуру, пачалі зваць ірляндцамі. Але гэльцы заставаліся гэльцамі, і іх не чапалі да XVI стагодзьдзя, аж раптам брытанцы зразумелі, што калі мова ірляндзкая, то, напэўна, і сэрца застаецца ірляндзкім. Пачалася жорсткая англізацыя, нават больш жорсткая, чым русіфікацыя *Северо-Западного края*. Каб выжыць, заможная кляса была вымушана пачаць размаўляць на ангельскай мове й насіць ангельскія камізэлькі. Што ні кажы, у XVI—XVII стагодзьдзях у Ірляндыі адбылася самая сапраўдная нацыянальная катастрофа.

Прыкладна ў той жа час Брытанія “апранулася” ў пратэстантызм. Гэльцы і, што цікава, большасьць даўнейшых каляністаў з Англіі, адмовіліся прыняць новае веравызнаньне й засталіся каталікамі. Пад канец XVIII стагодзьдзя ўжо меншасьць насельніцтва гаварыла па-гэльску, і звалiся яны ўжо ня гэльцамі, а ірляндцамі. Хто такія ірляндцы, ня ведалі й самі ірляндцы, бо апынуліся ў глыбокім крызысе ідэнтычнасьці: сапраўды, забяры ў людзей мову, заблытай успрыманьне саміх сябе, і людзі пачнуць камплексаваць, лічыць сябе горшымі за суседзяў ці нічым не адрознымі ад іх — так і працуе калянізацыя. Але брытанцы зрабілі адну памылку, якая пасьля

каштавала ім зялёнага вострава. Каталіцызм. Яны ня толькі не перахрысьцілі гвалтоўна ўсіх ірляндцаў у пратэстантаў, але яны нават не перацягнулі на свой бок каталіцкага сьвятарства, а хто можа быць больш ідэалягічна ўплывовым за сьвятара ў неадукаванай краіне? Хіба што старшыня калгасу, але, дзякаваць Госпаду, гэтае "дабро" Ірляндыю мінула. Нават сёньня шмат ірляндцаў пытаюцца ў ксяндза, за якую партыю ім галасаваць на выбарах. Вы ніколі не задаваліся пытаньнем, чаму такая маленькая краіна мае такі ўплыў на міжнароднай арэне? Не, памыляецеся, не праз ірляндзкія пабы (хаця гэта таксама моцны фактар мяккай дыпляматыі), хутчэй дзеля каталіцкіх місіянэраў, якія ім адным вядомымі шляхамі дазнаюцца, што адбываецца ўва ўсім сьвеце, і я не зьдзіўлюся, калі пасьля сваіх місіяў яны наведваюць адпаведныя нарады ў Міністэрстве замежных справаў. А ўявіце XIX стагодзьдзе? Але ў XIX стагодзьдзі гэльцаў ужо не было, былі ірляндцы. Няшмат ужо засталося й ад гэльскай мовы. Трэ было вырабіць, так бы мовіць, новы дызайн ірляндзкай нацыі, рабіць усё зноў. Але як? Калі правадыры нацыі ўстануць і заявяць: "Мы ірляндцы і мы вартыя большага!", трэба яшчэ адна маленькая дэталь — словы "мы ірляндцы" павінны несьці нейкае адценьне, і, акрамя таго, людзі, да якіх скіраваны зварот, мусяць кіўнуць: "Во, ета пра нас. Мы — ірляндцы". Горш, калі людзі пахітаюць галавой і пойдуць замест гэтага бульбу капаць.

Першыя спробы ўзьняць ірляндзкую нацыю посьпехам ня скончыліся. Прасунутая местачковая інтэлігенцыя кучкавалася й адчыняла розныя клюбы, але большасьць ірляндцаў успрыняла гэта, напэўна, з такой жа цікаўнасьцю, зь якой індзейцы сачылі за каляністамі ці як беларусы пазіралі на БНФ у пачатку 90-х. Нецікава ім было, карацей. Наступная спроба, але ўжо на ангельскай мове і з добра праведзенай каталіцкімі сьвятарамі "Выбірайкай", была пасьпяховай, і ірляндцы ўжо зацікавіліся. Апошняя спроба, на гэты раз удалая, прыпала на першую сусьветную вайну. Цяжка сказаць, ці выбраліся б ірляндцы з-пад Брытаніі, калі б не нямецкая зброя ды пэўныя нямецкія дарадцы й калі б Брытанія не была такая занятая зьнішчэньнем братоў-эўрапейцаў на франтох Францыі, але дакладна ня вызваліліся б, калі б брытанцы не пакаралі

сьмерцю групу паэтаў, артыстаў, публіцыстаў і проста ідэалістаў, якім “пашчасьціла” ўзяць у рукі гэтую нямецкую зброю з мэтай папужаць брытанскі браняносец у Дубліне. Цяпер гэта выглядае амаль як анэкдот: паўстанцы занялі галоўныя аб’екты ў горадзе якраз на сьвята, усе дублінцы глядзелі на іх як на дзівакоў. Паміж дзьвюма групкамі, якія сядзелі цераз раку, не было сувязі. Паслалі “сувязнога” на ровары, але ён заехаў дамоў пад’есьці і прыпазьніўся. Адзіны ваяка сярод іх, былы сэржант брытанскай арміі, загінуў у першы ж дзень, і далей ірляндцы ня ведалі, што рабіць стратэгічна. Спачатку пабаяліся ўзяць Замак, бо ня ведалі, што там толькі два брытанскія салдаты… Так пратрымаліся тыдзень, бо брытанцы не адразу змабілізаваліся і частка войска адмовілася рушыць на Дублін. Урэшце па рэчцы (вузейшай за Сьвіслач) тыя правялі браняносец і з гармат ударылі па лягеры паўстанцаў. Было шмат ахвяраў сярод мірнага насельніцтва. Пасьля той расстрэл. Як бачыце, Дублінскае паўстаньне — гэта таксама ў пэўным сэнсе гістарычны міт, створаны пасьля, а на самай справе была неарганізаваная спроба маленькай групы рамантыкаў выступіць супраць імпэрыі. І што зрушыла гэтую сытуацыю — гэта акурат расстрэл тае жменькі ідэалістаў. Бязьлітасны, нічым не зразумелы жорсткі акт усхваляваў ірляндцаў, якія нарэшце паўсталі супраць брытанцаў і атрымалі незалежнасьць. Такім чынам, ірляндзкая ідэнтычнасьць была пабудаваная вакол каталіцызму, вясковасьці, ідэі кельцкай нацыі сьвятароў-місіянэраў, якія некалі прынесьлі цывілізацыю ў барбарскую Эўропу. Новая Ірляндыя гаварыла па-ангельску, але мела моцны гэльскі сантымэнт. Нарэшце, яна мела моцную схільнасьць да дэмакратыі. Што да дэмакратыі, тут ірляндцам з брытанцамі пашанцавала хоць у адным, бо напэўна гэты фактар дакладна можна аднесьці на рахунак брытанцаў. Што дзіўна, ірляндцы ня толькі не саромеліся гаварыць на мове калянізатараў, але здолелі стварыць культурныя прадукты ня горшыя, а тое й лепшыя, чым у гэтых самых калянізатараў. Чаго вартыя імёны Б. Шоў, У. Б. Ейтса, О. Уайльда, Дж. Джойса — сусьветныя зоркі! Замест таго каб з самага пачатку прымусіць насельніцтва зноў гаварыць на гэльскай мове, ірляндзкія адраджэнцы заявілі, што паспрабуюць вярнуць мову пасьля, але спачатку трэба пабудаваць культуру на існых

культурных сымбалях і атрымаць незалежнасьць, а тым часам на мове акупантаў гучаць так, каб чуў увесь сьвет і каб ні ў кога не ўзьнікала пытаньне, што гэта за краіна такая — Ірляндыя. На жаль, ірляндцы так і не вярнулі ірляндзкай мовы ў штодзённы ўжытак — хаця гэта й абавязковы прадмет у школе і кожны ірляндзец узумее скласьці некалькі сказаў па-гэльску. Чаму так? Я запытаўся ў свайго сябрука Шэйна:
— Шэйн, скажы што-небудзь па-ірляндзку?
— Khruimbhr.
— А яшчэ?
— А больш ня ведаю, забыўся.
— Чаму так?
А Шэйн кажа: я выкладаю ангельскую мову для замежнікаў, маю 30 эўра ў гадзіну, мне нават ня трэба нікуды ехаць, замежнікі самі прыяжджаюць да мяне. Калі я еду ў Эўропу, мне ня трэба гаварыць на іхняй мове — яны ўсе ведаюць маю… Здаецца, што заняпад ірляндзкай мовы быў ужо незваротны недзе пры канцы XIX стагодзьдзя. Ангельская мова — усё ж мова міжнародная, і такой яна была нават у першай палове пазамінулага стагодзьдзя. І яшчэ, я й сам зьдзівіўся падабенству зь беларускім выпадкам: гаварыць і вучыць ірляндзкую мову было “непапулярна”.
Так, непапулярна.
Уся літаратура на ірляндзкай мове была пабудаваная вакол казак і гісторый пра сялян, падручнікі таксама бубнілі апавяданьні пра сялян XIX стагодзьдзя — у той час як ангельская мова гаварыла пра «Beatles», «Rolling Stones» ці таго ж Толкіна — я ўжо ня згадваю англамоўныя прадукты, створаныя самімі ірляндцамі. Здаецца, цяпер ужо ўлады зразумелі, у чым была памылка, і спрабуюць зьмяніць імідж ірляндзкай мовы. У падручніках замест сялян Шон і Уна разважаюць, у якое ім лепш пайсьці кіно; па тэлебачаньні ідуць прасунутыя праграмы пра прасунутую моладзь на прасунутай ірляндзкай мове. Вядома, назад сытуацыю не павернеш, як бы хто ні хацеў. Ірляндыя — гэта англамоўная краіна, але ірляндзкая мова надае пэўны калярыт і стварае істотнае вымярэньне ірляндзкай ідэнтычнасьці. Урад спрыяе вывучэньню ірляндзкае, нават замежнікі могуць вучыць калярытны “прадмет” за проста так. Нядаўна на тэлебачаньні бачыў нейкага ўкраінца, які шпарка гаварыў на ірляндзкай

мове (дарэчы, мова вельмі-вельмі складаная — не падобная ні да якай іншай індаэўрапейскай мовы), дык сказалі, што гэтага ўкраінца возяць па ўсёй краіне для прамоцыі й паказваюць ірляндцам, бы нейкі цуд, каб ім трохі стала цікава. Ня ведаю, якія матывы былі ў таго Мыхайлы, але цяпер на гэльскай мове як першай гавораць тысяч трыццаць ірляндцаў.

Краіна атрымала незалежнасьць, але ня ўсё атрымалася адразу. Да 1970-х Ірляндыя заставалася адной з найбяднейшых краінаў Заходняй Эўропы. Незалежная Ірляндыя так і ня здолела стварыць досыць моцнай праслойкі ўпэўненых і заможных прыватных прадпрымальнікаў, якія б рухалі эканамічны “воз” наперад. Ірляндыя па-ранейшаму заставалася аграрным прыдаткам Брытаніі, імпартавала двухпавярховыя аўтобусы й слухала «Beatles», экспартавала ірляндцаў у Амэрыку — эміграцыя не сьцішала тэмпаў.
У спадчыну ад Брытаніі ірляндцам засталася каляніяльная бюракратычная сыстэма з тымі ж тварамі, што і да незалежнасьці; калі нават твары і пачалі зьмяняцца пасьля другой сусьветнай вайны, сыстэма засталася гэткай жа нерухомай і нягнуткай, якой была і раней, — неадукаваныя бюракраты, якія ня бачылі далей за свой нос, не маглі прывабіць інвэстараў. Балота. Маладыя адукаваныя ірляндцы, стаміўшыся чакаць зьменаў у сыстэме, ехалі за мяжу шукаць шчасьце. Нічога не нагадвае? Нават цяпер яшчэ існуе прыказка “пашэнціла, як ірляндцу”. Цяпер гэтая прыказка, зрэшты, не адпавядае рэчаіснасьці. Ірляндцам пачало шанцаваць. Наўрад ці можна вылучыць адзін пэўны фактар, які прыпыніў заняпад, — прыйшло новае кіраўніцтва, якое адчула зьмены ў сусьветнай эканоміцы; збоку прачынаўся ЭЗ, яшчэ падлетак, але ўжо даволі выгадны жаніх; транснацыянальныя кампаніі зацікавіліся востравам з адукаваным насельніцтвам, якое да таго ж гаворыць па-ангельску (даволі важкі фактар), — Ірляндыя пачала прачынацца.
Ужо ў 1970-х жыць стала лепей, эміграцыя спынілася, ірляндцы пераселі на «мэрсэдэсы» і пачалі наведваць італьянскія рэстарацыі. Трэба нагадаць, што прыкладна ў той жа час паўстала й праблема Паўночнай Ірляндыі. Паўночныя браты ўбачылі, як іх паўднёвыя заможныя сваякі больш не зьвяртаюць

на іх увагі, а ў найлепшым выпадку абмяркоўваюць іх лёс з брытанскім прэм'ерам, у той час як самі яны, паўночныя ірляндцы, не прадстаўленыя ні ў адным самакіраваньні, таму яны ўзьняліся й абудзілі IRA (што ўжо была саснула). Але гэта асобная, дужа складаная тэма.

Ірляндцы размаўляюць, сьпяваюць (і добра сьпяваюць), сварацца і пішуць кніжкі па-ангельску, на мове сваіх адвечных прыгнятальнікаў — брытанцаў, але гэта не перашкаджае ім адчуваць сябе самастойнай, эўрапейскай, моцна адметнай нацыяй. Яны ня прагнуць далучыцца да брытанцаў, не камплексуюць, ня блытаюцца з уласнай ідэнтычнасьцю. Ірляндзкасьць — гэта й Джойсаў "Уліс", і кельцкі крыж, і казачнае піва «Guinness» (каб пакаштаваць сапраўдны «Гінэс», трэба ехаць у Ірляндыю: піва ў пляшках, я вам кажу, — гэта адстой), і "Nothing Compares to You" Шынэд О'Конар (кожны ірляндзец пакажа вам паб у Дубліне, дзе Шынэд калісьці працавала афіцыянткай, перш чым стаць зоркай), і, напэўна, самы дзейсны камісар па правах чалавека з усіх, што былі ў ААН, — Мэры Робінсан. Гэта, вядома, і Бона, якога ведаюць нават у Ждановічах. Бона з год таму пахаваў бацьку, неяк пасталеў і стаў яшчэ шчырэйшым. Ён сьпяваў на канцэрце ў Дубліне "Sunday, bloody Sunday" — песьню, зь якой U2 сталі сусьветна вядомым гуртом 20 год таму; пры канцы, пасьля песьні, ён пералічыў 28 ірляндцаў, што загінулі ў тую нядзелю, і плакаў, а зь ім плакала ўся заля. Так, ірляндзкасьць — гэта й трагедыя Паўночнай Ірляндыі: адна нацыя — дзьве краіны, тэрарызм IRA і Аранжыстаў. Праблема Паўночнай Ірляндыі — асобная праблема — прыпынілася толькі на тым, пра што мне мой гаспадар Джон распавёў неяк: "Падтрымліваў я IRA і іх справу, але да аднаго выпадку. Аднойчы я месяц працаваў у адной лёнданскай бібліятэцы, неяк уранку занядужаў і не пайшоў у бібліятэку, а ўдзень, калі прыйшоў, убачыў сотні паліцыянтаў, машыны "хуткай дапамогі": IRA ўзарвала прыпаркаваную машыну — сьцяну ў тым месцы, дзе звычайна сядзеў я, зьнесла, загінулі дзясяткі людзей. Нешта ўва мне тады зварухнулася: прабачце, падтрымліваць мо й падтрымліваў, але з такімі мэтадамі… сам мог загінуць, калі б не прыхварэў…"

Ірляндцы — эўрапейцы, але зь вельмі моцным ірляндзкім прысмакам. Нейкая частка вырвалася наперад, але большая

яшчэ не патрапіла дагнаць. Бегаюць па вуліцах, натыкаюцца адзін на аднаго, кудысьці лятуць. Трэба імчацца, рабіць выгляд, што працуеш, але большасьць ня ведае дакладна, куды яны бягуць і чаму. Асабліва гэта відаць на Грэфтан-стрыт — дублінскім варыянце праспэкту Скарыны. Вось ідзе нейкі клерк купляць гамбургер у кавярню… Нейкая гопніца ў чырвоных трэніровачных штанах і джуце — а тутака ў кожнага, літаральна кожнага ёсьць джут у гардэробе — зерыцца ў вітрыну парфумнай крамы. Вось другая дзяўчына — у чорным — з “а-я-ў-офісе-працую” выглядам на твары наткнулася на чырванаштаньніцу і лаецца матам. І што, кажаш — у офісе працуеш?.. Гітарыст стаіць і сьпявае “The One” з рэпэртуару U2. Кінуў яму манэтку — добрая песьня. Вось ідзе гастарбайтэр у скураной куртцы й па-расейску ў мабільнік лаецца — неяк ня ўпісваецца ў рамку… Шатляндцы пайшлі ў паб у кілтах — ніхто не азіраецца, кілты як кілты, што такога. Гастарбайтэр азірнуўся. Зайду і я ў паб — даўно ня быў.

Паб — сэрца Ірляндыі (напэўна, таксама і рот). Пабаў шмат, розных — вялікіх і маленькіх, спакойных і маркотных, на розны густ. Калі хто хоча пабачыць Ірляндыю, сьпярша ён мусіць адведаць паб. Даходзіць да сьмешнага: нядаўна чуў па радыё, як скардзіліся, што Ірляндыя быццам праз пабы мае “няправільны” імідж. Але калі дэлегацыя Эўракамісіі прыехала ў Дублін, ірляндзкі прэм’ер спачатку звадзіў іх у паб. Ці другі прыклад — мы на маім факультэце маем кожную пятніцу сэмінар, на якім прафэсар ці асьпірант прэзэнтуе пэўнае дасьледаваньне. Нядаўна я атрымаў электронны ліст ад куратара, што сэмінар пераносіцца на 4-ю гадзіну замест 3-й, бо а палове на шостую ісьці ў паб зарана (звычайна мы заўсёды пасьля прэзэнтацыі ідзём у паб, але такі аргумэнт ад куратара?..). Ці яшчэ: як толькі я прыехаў, мясцовы “прафкам” арганізаваў для новых студэнтаў “event”. Здагадайцеся, куды мы накіраваліся? Так, у pub crawl (поўзаць па пабах). Дзе яшчэ які прафкам здольны на такое? Нідзе. Весела ў пабе: наліваюць «Гінэс», сьпяваюць песьні, танцуюць традыцыйныя танцы — прычым не для турыстаў, а для сябе. Праўда, цяпер «Гінэс» страціў свае былыя пазыцыі: моладзь “павялася” на рэкляму «Гайнэкену» — сьветлага эўрапейскага піва. Але «Гінэс» — адзін з наймацнейшых сымбаляў

ірляндзкага сувэрэнітэту, пасьля пералічэньня “ірляндзец, каталік” звычайна ідзе “п’ю «Гінэс»”. Сур’ёзна. Усе чакаюць на канец працоўнага дня, каб пайсьці ў паб.
У пятніцу вечарам дома няма нікога, усе ў пабах, гамоняць зь сяброўкамі, сьпяваюць, глядзяць футбол, здымаюць каго-небудзь, а можна і ноч пераспаць. Ірляндыя — надзвычай каталіцкая краіна, аборты забароненыя, развод атрымаць амаль немагчыма, і, як я ўжо казаў, ксяндзы — надзвычай уплывовая кляса. Але каталіцызм каталіцызмам, а гармоны й эўраінтэграцыя бяруць сваё, і маладое пакаленьне не зважае на традыцыі. Аборты забароненыя — не праблема. Можна паехаць у Брытанію, хіба што трохі даражэй. Але ўсё роўна маладых мам з вазкамі тут можна ўбачыць больш, чым у якой іншай краіне. Ірляндыя — наймаладзейшая краіна Эўропы; здаецца, да гэтага часу большасьць насельніцтва — гэта моладзь да 25 год. Але мамы з вазкамі — звычайна нечыя сяброўкі, зусім ня жонкі. Дзіця — гэта не прыступка, пасьля якой трэба гуляць вясельле. Цікава паглядзець на дынаміку гэтай зьявы: спачатку ня можна было цалавацца да вясельля, пасьля — спаць, пасьля — мець дзетак (у Беларусі звычайна калі дзяўчына зацяжарыць, гуляюць вясельле), пасьля — мець больш за аднаго, пасьля — больш за траіх дзетак. Так, цяпер у Ірляндыі прыступка, пасьля якой абавязковае вясельле, — гэта трое дзетак, але гэта мой суб’ектыўны падрахунак. Тут нават праводзяць рэгулярныя рэфэрэндумы наконт абортаў і ня толькі.

Напрыклад, апошні рэфэрэндум летась, на якім ірляндцы прагаласавалі за пагадненьне, укладзенае ў Ніцы, што дае адмашку ўзбуйненьню Эўразьвязу й пэўнай рэструктурызацыі ўлады ў ЭЗ. Цікава, што на першым рэфэрэндуме два гады таму ірляндцы прагаласавалі “супраць” гэтага пагадненьня, а правіла такое, што, калі хоць адна краіна супраць, узбуйненьне немагчымае. Што рабіць — трэба зноў праводзіць рэфэрэндум. Прэм’ер кажа: “Не, першы раз вы не зразумелі пытаньня, вы ж мелі на ўвазе ня “не”?” — і паставілі тыя ж пытаньні на рэфэрэндум ізноў. Зялёныя, Шын Фэйн — палітычнае крыло IRA, сацыялісты й другія дробныя партыі заснавалі стан “Не”. Трэба адзначыць, што яны мелі рацыю: калі выбарцы ўжо раз сказалі “не”, дык чаму не зьмяняеце

пытаньня, ня ўносіце зьменаў у Ніцкую дамову? Што гэта за дэмакратыя — мы галасавалі за гэтую ўладную кааліцыю на апошніх выбарах, але яна карумпаваная — можа, і гэта нам яшчэ раз перагаласаваць?
Але стан “Так” на гэты раз быў разумнейшы. Па-першае, у “Выбірайку” ўклалі нашмат больш сродкаў, чым раней, — увесь Дублін быў залеплены іх постэрамі; па-другое, быў скарэктаваны “мэсыдж”. Замест тлумачэньня дэталяў зьвярталіся да пачуцьцяў. “У 1973 годзе нам далі шанец і прынялі ў ЭЗ, паглядзіце, як мы цяпер жывём. Як мы можам сказаць “не” мільёнам усходнеэўрапейцаў?” Было шмат арыгінальных постэраў, ад нейкай польскага выгляду дзяўчынкай з кветкамі й подпісам “Галасуй за яе будучыню!” да амаль аголенай пары — яна сядзіць у яго на каленях, не зусім ясна, што яны робяць, магчыма і “гэта”, — і надпіс “It is better inside” (“Усярэдзіне лепей”). Сапраўды, лепш быць усярэдзіне.
Ірляндцы прагаласавалі “так”, нашым суседзям разаслалі запрашэньні. Але нас там няма. Пакуль.
Можна было б ня ставіць гэтага “пакуль” напрыканцы гэтых нататкаў, і тады б заканчэньне мела трохі дэпрэсіўны прысмак. Але хопіць дэпрэсіі, трэба працаваць, над сабой і нацыяй.
Ня ведаю, ці згодзіцца з мною чытач, але спадзяюся, што ён убачыць маю рацыю ў гэтых нататках. Калі ірляндцы — эўрапейцы і яны здолелі выбудаваць сваю ідэнтычнасьць пасьля нацыянальнай катастрофы, горшай за нашую, пабудаваць на якасных культурных сымбалях у моўнай й геапалітычнай сытуацыі (vis-a-vis Брытаніі), падобнай да нашай; калі ў 50-я гады на дзьвярах будынкаў у Лёндане, што здаваліся ў арэнду, можна было сустрэць “No Blacks, No Irish” (“Чорным і ірляндцам забаронена”), а цяпер у Лёндане ірляндзкасьць — гэта модна і “прасунута”, дык чаму не?

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/05/01
[image]

Юлія Андрэева

Аркестар вядомы і невядомы

Неюбілейныя нататкі з нагоды 75-годзьдзя Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестру і 200-годзьдзя з часу заснаваньня першага менскага гарадзкога аркестру

Шмат што зьмянілася ў нашым жыцьці за апошнія дзесяцігодзьдзе, толькі ня мода на юбілеі. Зь якім размахам адзначалася 900-годзьдзе Барысава ці 935-годзьдзе Менску! Нават такая сьціплая дата, як 85 гадоў беларускай міліцыі, не прайшла незаўважанай. Аднак 75-я гадавіна Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестру Рэспублікі Беларусь, што прыпала на 19 красавіка 2002 году, сьвяткавалася вельмі сьціпла — ці, дакладней кажучы, ніяк не сьвяткавалася. Аркестар акурат у тыя дні зьехаў у Гішпанію — гастрольнае турнэ, як кажуць, прайшло зь вялікім посьпехам. Начальства ж барыкалася з праблемамі зусім не юбілейнымі. Канцэртная заля Беларускай філярмоніі сталася небясьпечнай і для выканаўцаў, і для публікі, і таму зачыненая на рамонт. Рэпэтыцыі аркестру цяпер адбываюцца ў кінатэатры «Сучасьнік», што на вуліцы Харкаўскай.

Але, здаецца, ёсьць і іншая, прыхаваная прычына, чаму юбілей

ЮЛІЯ АНДРЭЕВА — **музыказнаўца. Скончыла кампазытарскі факультэт Беларускай акадэміі музыкі. Загадвала музычнай часткай Магілёўскага абласнога тэатру драмы і камэдыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Апошняя публікацыя ў часопісе — эсэ «Памяці маці» («АКСІЁН» № 1 (24) 2003).**

аркестру ня быў адзначаны як сьлед. Гадавіна — гэта заўжды ўспаміны. А ўспамінаць якраз шмат чаго ня хочацца. Аркестранты саромеюцца тае валтузьні з галоўнымі дырыжорамі, што адбывалася на працягу апошніх 11 гадоў. Незалежныя музыказнаўцы, якія маюць рахункі да БССР, саромеюцца таго, што наш сымфанічны аркестар паўстаў (на іхную думку) паводле загаду Крамля. Музыказнаўцы старое савецкае школы саромеюцца таго, што гісторыя аркестру можа аказацца зусім не такой, якой яны прывыклі яе бачыць. Зашмат у гэтай гісторыі загадкавых і цёмных месцаў.
Напрыклад, пяць гадоў таму, калі сьвяткавалі 70-гадовы юбілей, кіраўніцтва Філярмоніі запрасіла найстарэйшага пецярбурскага дырыжора Ільлю Мусіна — “першага мастацкага кіраўніка гэтага калектыву” — прыняць удзел у юбілейных урачыстасьцях. Мусін, якому на той момант было 93 гады, адмовіўся, спасылаючыся на благі стан здароўя. Аднак цалкам верагодна, што гэта была не адзіная прычына. Ён ведаў, што быў ня першым мастацкім кіраўніком. Паводле біяграфіі, надрукаванай у расейскай “Музыкальной энциклопедии”, Ільля Мусін у 1930 годзе скончыў Ленінградзкую кансэрваторыю, потым працаваў выкладчыкам і толькі ў 1937 годзе, без практычнага досьведу, быў прызначаны галоўным дырыжорам сымфанічнага аркестру Беларускай філярмоніі[1]. Калі аркестар напраўдзе быў створаны 19 красавіка 1927 году[2], ён ня мог 10 год існаваць без мастацкага кіраўніка. Адсюль можна зрабіць выснову, што першым галоўным дырыжорам быў зусім ня Мусін.

[1] Нисневич И. Г. Мусин Илья Александрович. — Музыкальная энциклопедия. — Т.3. — Москва: Советская энциклопедия, 1976. — С.837—838.

[2] Гэта дата фігуравала на

Дарэчы, нашае афіцыйнае музыказнаўства называе гэтую дату даты ўзнікненьня аркестру ці ўвогуле абыходзіцца пытаньне. “Дзяржаўны сымфанічны аркестар БССР

сайце

1930 годзе”, — чытаем мы ў артыкуле Алены Раманчук, надрукаваным у Беларускай савецкай энцыклапедыі. “Аркестар Беларускага радыё быў створаны ў 1928 годзе”, гэткую інфармацыю падае расейская “Музыкальная энциклопедия” за подпісам музыказнаўцы Ісідары Шыфанівнай. “Дзяржаўны акадэмічны сымфанічны аркестар Рэспублікі Беларусі створаны ў 1928 годзе пры Беларускім радыёкамітэце”, — піша доктар мастацтвазнаўства Аляксандар Клімаў у артыкуле “Беларускай энцыклапэдыі” (ужо часоў незалежнасьці)[5]. Аднак у “Энцыкляпэдыі літаратуры і мастацтва Беларусі”, выдадзенай у 1985 годзе, Клімаў называе ўжо знаёмую нам дату — 19 красавіка 1927 года. А ў грунтоўным і вельмі падрабязным артыкуле Зміцера Жураўлёва “Музыка Беларусі”, надрукаваным у “Энцыклапэдыі Беларусі”, выдадзенай у 1995 годзе, “Саюз кампазытараў БССР”, аніякіх датаў нараджэньня аркестру ўвогуле няма. Пасьля прачытаньня артыкула складаецца ўражаньне, быццам аркестар паўстаў дзякуючы зь Беларускай філярмоніяй у 1937 годзе[7]. Гэткая “нядбаласьць” з боку добрасумленнага даследчыка выглядае вельмі падазрона. Тым болей што Зьмітрок з 1934 году граў у аркестры на кантрабасе, а пазьней гаворыцца ў тым самым даведніку, “разам з усім калектывам быў пераведзены на працу ў Белдзяржфілярмонію”[8]. Дзіўна — выглядае і непасьлядоўнасьць з боку Аляксандра Клімава. У 1981 годзе ў артыкуле “Дзяржаўны сымфанічны”, надрукаваным у часопісе «Нёман», ён спасылаецца на пастанову наконт арганізацыі “першага ў Беларусі сымфанічнага аркестру”, выдадзеную ў 1927 годзе[9]. У “Энцыкляпэдыі літаратуры і мастацтва Беларусі” канкрэтызуе гэтыя зьвесткі, паведамляючы, што аркестар быў арганізаваны “паводле пастановы Цэнтральнага праўленьня прафсаюзу работнікаў мастацтваў Беларусі ад 19.III.1927 г.”[10]. Цытату з гэтага дакумэнту можна адшукаць у кнізе Георгія Загародняга[11], прысьвечанай гісторыі Беларускай філярмоніі: “…Забясьпечыць нармальнае існаваньне сымфанічнага аркестру, а таксама рацыянальнае выкарыстаньне ў інтарэсах шырокіх масаў працоўных толькі ў тым выпадку, калі гэты аркестар будзе ператварацца юрыдычнай гаспадарчай адзінкай у выглядзе паўнапраўнага таварыства”. Аркестру ўсталёўвалася месячная норма

[1] **Інтэрнэт-рэсурсы Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестру Рэспублікі Беларусі — www.belarustoday.com/culture/music/State_orchestr/. На жаль, дадзеная старонка ўжо не існуе.**

[2] **Раскава А. Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР. Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. 4 — Мінск: Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай энцыклапедыі, 1971. С. 231.**

[3] **Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестру Рэспублікі Беларусі — www.belarustoday.com/culture/music/State_orchestr/. На жаль, дадзеная старонка ўжо не існуе.**

[4] **Шыфанівна І. Аркестр. Энцыклапедыя музыкі. Т. 1. — Маскоўскае таварыства Ю. В. Келдыш.**

канцэртных выступаў[12].

Аналізуючы гэтую пастанову, пачынаеш разумець, чаму ў ёй бянтэжыла савецкіх музыказнаўцаў. Савецкая ідэалогія зьвязвала ўсе культурныя дасягненьні ў краіне з поспехамі камуністычнай партыі і савецкага ўраду. А пастанова аб стварэньні аркестру нарадзілася не ў ЦК камуністычнай партыі, а ў ЦК прафсаюзу работнікаў мастацтваў. Яе дакумэнт наводзіць на думку, што аркестар на той момант *існаваў*, гаворка ішла пра ягоную рэарганізацыю, прычым *нематуральна* каапэратыўнай (а не дзяржаўнай) уласнасьці.

Москва: Советская энциклопедия, 1973. — С.387.

[5] Расшыфраваць гэтае выказваньне. Ці ведаюць музыказнаўцы, калі ня ведаеш загадзя, што наш сымфанічны аркестар аж да 1937 году называўся аркестрам Беларускага радыёцэнтру.

[5] Капілаў А. Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь. — Беларуская энцыклапедыя ў 18 тамах. — Т.6. — Менск: Беларуская энцыклапедыя, 1998. — С.149.

[6] Капілаў А. Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР. —

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. — Т.2. — Менск: Выдавецтва Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі, 1985. — С.311.

[7] Журавлев Д.Н. Музыка Белоруссии. — Союз композиторов БССР: Краткий биографический справочник. — Менск: Беларусь, 1978. — С.9.

[8] Цитович Г., Журавлев Д.Н. — Союз композиторов БССР… — С.97.

[9] Капилов А. Государственный симфонический. — Нёман. — 1981. — №3.

[10] Капілаў А. Дзяржаўны сімфанічны… — С.311.

Спадар Капілаў піша, што аркестар быў “арганізаваны пры Беларускім радыёцэнтры”[13]. Аднак, па-першае, радыёцэнтра як такі на той момант яшчэ не існаваў; радыёвяшчанне ажыццяўлялася сіламі акцыянэрнага таварыства

“Радыёперадача”, якое ня мела тэхнічных магчымасцяў трансляцыі музыкі. Перадачы гучалі ўсяго 30 хвілін, і было тады ў Менску 200 прыймачоў, якія разьмяшчаліся ў клюбах[14]. Насамрэч цеснае супрацоўніцтва сымфанічнага аркестру з радыёцэнтрам пачалося ў студзені 1929 году, і толькі ў 1930 годзе калектыў аркестру быў афіцыйна ўведзены ў штат радыёцэнтру[15]. Ускосным пацьверджаньнем зьяўляецца дата стварэньня аркестру, якую назваў Ігар Ракава, — 1930 год. Да гэтага часу калектыў называўся “Менскі таварыства “Менскі сымфанічны аркестар”».

У які ж год паўстаў аркестар? Канчаўся НЭП, імпэрскія сілы згортвалі беларусізацыю. Інбелкульт ператварыўся ў Беларускую акадэмію навук, каб неўзабаве страціць лепшую частку сваіх кадраў. Варта перасунуць дату стварэньня аркестру на пару гадоў пазьней, і зь дзіцяці беларускай культуры ператворыцца ў прадукт сталінскай культурнай палітыкі.

Перасоўваньне даты паўстаньня аркестру на пазьнейшы тэрмін таксама тлумачыць, як удалося сабраць дастаткова вялікую колькасьць прафэсійных аркестрантаў. Пра высокую кваліфікацыю гэтых музыкаў сьведчаць праграмы канцэртаў, што адбыліся на працягу 1927—1928 гадоў. Паводле Зьмітра Жураўлёва, праграма першага з гэтых сымфанічных канцэртаў уключала ў сябе ўвэрцюру да опэры “Руслан і Людміла” ды “Камарынскую” Глінкі, “Ноч на Лысай гары” Мусарскага, Канцэрт для скрыпкі з аркестрам Мендэльсона ды Другую вугорскую рапсодыю Ліста[16].

Адкуль узяліся высокапрафэсійныя музыкі — гэтае пытаньне не абмяркоўвалася ў савецкі час. Паводле савецкае канцэпцыі, разьвіцьцё беларускай музыкі пачалося толькі пасьля 1917 году. Пад гэтую схему, што пазбаўляла нацыянальных традыцый, і падганялі гісторыю музыкі. “На працягу стагодзьдзяў умовы жыцьця беларускага народу складваліся гэтак, што выключалася магчымасьць разьвіцьця прафэсійнага мастацтва. Здаўна вядомыя сваёй музычнай беларусы ня мелі сваёй прафэсійнай музыкі. Да рэвалюцыі Менск і іншыя буйныя гарады Беларусі наведвалі вандроўныя опэрныя трупы ды выпадкова складзеныя канцэртныя брыгады ці асобныя салісты. Самі ж сабою зразумела, што гастролі і канцэрты сымфанічнага аркестру ў той час былі зьяваю надзвычай рэдкай”[17]. Гэтым

Гастрольные выступления президиума ЦИК Белорабиса» в 29 году, и только в 1930 годзе организации симфонического оркестра в городе Минске от 19.04.1927 г.// ЦДА Рэспублікі Беларусь, ф.306, воп.1, спр.118, л.71—73.

[11] Загородний Н. Музыки высокого призвания: Исторический очерк о Белорусской государственной филармонии. — Минск: Беларусь, 1988.

[12] Загародні Н. Беларускай філармоніі спаўняецца 60 гадоў. // Літаратура і мастацтва, 1988, 2 верасня.

[13] Гл. таксама: Полтавцева Е. Из истории Белорусской государственной филармонии. // Советская музыка, 1957, № 12.

[14] Гл. таксама: Полтавцева Е. Из истории Белорусской государственной филармонии. // Советская музыка, 1957, № 12.

[15] Гл. таксама: Полтавцева Е. Из истории Белорусской государственной филармонии. // Советская музыка, 1957, № 12.

[16] Гл. таксама: Полтавцева Е. Из истории Белорусской государственной филармонии. // Советская музыка, 1957, № 12.

[17] Гл. таксама: Полтавцева Е. Из истории Белорусской государственной филармонии. // Советская музыка, 1957, № 12.

настойліва паўтараўся ў кнігах і артыкулах з гісторыі беларускай музыкі. Ужо ў часе перабудовы Аркадзь Бернер пісаў: “Амаль поўная адсутнасць музычнай адукацыі выклікала тое, што зьяўленьне таленавітых выканаўцаў было выпадковым, а калектыўная творчасць практычна не існавала. Аматары інструмэнтальнай музыкі маглі задаволіцца хіба што на канцэртах вайскова-духавых аркестраў ды зрэдку калектываў-гастралёраў, у пераважнай большасьці замежных. Кожны прыезд сымфанічнага аркестру быў нейкай экстраардынарнай”[18].

Калі б гэта было праўдай, сымфанічны аркестар у Менску мог бы ўзьнікнуць толькі як філія маскоўскага ці ленінградскага аркестру і мусіў складацца з расейскіх музыкаў. Першы выпуск Беларускага музычнага тэхнікуму адбыўся ў 1928 годзе, і ён ня мог цалкам задаволіць патрэбаў маладога аркестру (на 1 сьнеьня Беларуская акадэмія музыкі выпускае ня больш за 45 аркестравых музыкаў у год). Паявое таварыства таксама знаходзілася на гаспадарчым разьліку[19], наўрад ці магло здольнае запрасіць аркестрантаў з Расеі. Адсюль можна зрабіць выснову, што музыкі пераважна былі тутэйшыя. Здаецца, з газэтных рэцэнзій у той самай «Зьвязьдзе» сьведчыць, што выступ прафэсійнага сымфанічнага аркестру ня ўнёс нічога менчукоў нейкім дзівам.

знаўцам ейнай гісторыі.

[12] Там самым. С.13.

[13] Капілаў А. Дзяржаўны сімфанічны. — С.311.

**[14] http://by.tl/Pershy_vypusk_Belaruskaga_muzychnaga_tekhnikuma_u_1928_godze_i_yon_nya_mog_tsalkam_zadavolits_patrebau_maladoga_arkestru_na_1_sneyna_Belaruskaya_akademiya_muzyki_vypuskae_nya_bolsh_za_45_arkestravykh_muzykau_u_god_Payavoe_tavarystva_takse_znakhodzilasya_na_gaspadarchym_razliku_nauradzi_ci_magло_zdolnae_zaprasits_arkestrantau_z_Rasei_Adsyul_mozhna_zrabits_vysnovu_shto_muzyki_peravazhna_byli_tutejshyya_Zdayetstsa_z_gazetnykh_retsenzij_u_toj_samay_«Zvyazdze»_svedchyts_shto_vystup_prafesijnaga_symfanichnaga_arkestru_nya_unyos_nichoga_menchukou_nejkim_dzivam. Pershy vypusk Belaruskaga muzychnaga tekhnikuma adbyusya u 1928 godze, i yon nya mog tsalkam zadavolits patrebau maladoga arkestru (na 1 sneyna Belaruskaya akademiya muzyki vypuskae nya bolsh za 45 arkestravykh muzykau u god). Payavoe tavarystva takse znakhodzilasya na gaspadarchym razliku, nauradzi ci magло zdolnae zaprasits arkestrantau z Rasei. Adsyul mozhna zrabits vysnovu, shto muzyki peravazhna byli tutejshyya. Zdayetstsa, z gazetnykh retsenzij u toj samay «Zvyazdze» svedchyts, shto vystup prafesijnaga symfanichnaga arkestru nya unyos nichoga menchukou nejkim dzivam.

Госизд. БССР, 1961. — С.8.

[16] Тамсама. С.5.

[17] Тамсама. С.3.

[18] Берын Аркадзь. Віцебск, год 1918: З гісторыі аркестравага дырыжыравання Беларусі. — Мастацтва Беларусі. — 1989. — №1. — С.28.

[19] Загородний

Г.Н. Цыт. выд. — С.13.

1

Насамрэч, гісторыя нашага сымфанічнага аркестру сягае аж у пачатак XIX стагодьдзя. У 1803 годзе ў Менску быў арганізаваны гарадзкі аркестар (і гэта дае падставу для юбілею, толькі нашы людзі рэдка зазіраюць далей за 1917-ы).

З энцыкляпэдычнага артыкулу Аляксандра Капілава мы даведваемся, што ў 1820—1860-я гады на чале аркестру стаяў Вінцэнт Стэфановіч — старэйшы брат Дамініка Стэфановіча, першага музычнага настаўніка Станіслава Манюшкі. Што ў канцы 1860-х гадоў дырыжорам аркестру стаў Лявон Скрабецкі, а ў 1880 годзе калектыў на чале з Рычардам Пілеманам выконваў сымфоніі Гайдна і Бэтговэна, увэрцюры Расыні і Абэра, “Камарынскую” Глінкі. Што ў 1886 годзе дырыжор Генрых Мерц пазнаёміў менчукоў з творамі Вагнэра, а ў 1890—1896 гадох кіраўніком аркестру становіцца Леапольд Ступель, вучань віленскага скрыпача і кампазытара Вольфа Эбана. У той час у выкананьні аркестру гучаць Моцарт, Бэтговэн, Мэндэльсон, Шубэрт, Глінка, Барадзін, Чайкоўскі.

У кнізе Адама Мальдзіса[20] ёсьць згадка пра выступы зь Менскім гарадзкім аркестрам у 1838—1839 гадох славутага польскага скрыпача Караля Ліпінскага. У 1840—1850-х найбольш значныя музычныя імпрэзы ладзіліся ў Поляка, дзе ў 1852 годзе адбылася прэм’ера славутай Дуніна-Марцінкевіча на музыку Манюшкі. З 1865 году канцэрты даваліся пераважна ў залі Шляхецкага Аднак у нядаўна надрукаванай кнізе Аляксандра Капілава, напісанай у суаўтарстве зь ягонай жонкай Аленай Ахвердавай[22], вэрсія пра існаваньне Менскага гарадзкога аркестру ў пэрыяд 1803—1917 гадоў на сталай аснове не прапаноўваецца, дый зьнікае сама назва — “Менскі гарадзкі аркестар”. Калі чытаеш гэтую кнігу, якая ўяўляе сабой систэматычна асьвятліць гісторыю музычнай культуры Беларусі XIX — пачатку XX стагодзьдзя, складаецца ўражаньне, быццам савецкі міт пра адсутнасьць прафэсійных Менску ў дарэвалюцыйнай Беларусі быў недалёкі ад праўды. Агульная схема выглядае наступным чынам:

— спарадычныя выступы аркестру ў 1830—1840-я гады;

— працяглы антракт аж да пачатку 1880-х гадоў,

[20] **Мальдзіс Адам. Станіслаў Манюшка. — Мінск: Народная асвета, 1969. — С.110.**

[21] **Капілаў А. Падарожжа ў XIX стагоддзе: з гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры. — Мінск: Народная асвета, 1969. — С.110.**

— 1883—1915 гг. — эпоха пераважна аматарскіх аркестраў, музычных гурткоў і суполак, якія паўставалі і зьнікалі калейдаскапічнай хуткасьцю.

Гэткім чынам, нам падаюцца дзьве вэрсіі гісторыі музыкі. Першая з гэтых вэрсіяў ствараласа падчас перабудовы і рамантычнага нацыяналізму. Другая — гісторыя выключна аматарскіх гурткоў і заежджых гастралёраў — пачынаючы Лукашэнкам. Адмова ад першай вэрсіі можа азначаць адмову фактаў, якія б яе падмацоўвалі і адназначна сьведчаць пра тое, што Менскі гарадзкі аркестар як прафэсійны музычны калектыў сапраўды існаваў з 1803 да 1917 году.

[21] **Капілаў А., Сікольскі Б. — Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. — Мінск: Выдавецтва Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі, 1986. — С.540.**

[22] **Капилов А.Л., Ахвердова Е.И. Музыкальная культура Беларуси XIX — начала XX века. — Менск: Институт современных знаний, 2000.**

Новая эпоха ў музычным жыцьці Менску, падобна, распачынаецца зь вяртаньнем у Менск маладога скрыпача і дырыжора Натана Рубінштэйна (нарадзіўся ў 1883 годзе). Ён быў карэнным менчуком, вышэйшую музычную адукацыю атрымаў у Санкт-Пецярбурскай кансэрваторыі[23]. Скончыўшы яе ў 1906 годзе зь вялікім срэбным мэдалём, Рубінштэйн працягу году стажаваўся ў выдатнага скрыпача і педагога Леапольда Аўэра, а потым вярнуўся ў Менск. Менавіта Рубінштэйн быў ініцыятарам стварэньня і першым дырэктарам Менскага музычнага вучылішча, што адчынілася ў 1907 годзе. Ён праводзіў клясу скрыпкі, а таксама выкладаў тэорыю музыкі і сальфэджыё[24]. З 1909 году ў Менску ім рэгулярна праводзіліся сымфанічныя канцэрты. Беларускі музычны

[23] **У кнізе “Скрыпка беларуская” спадар Кадыраў падае, што Натан Рубінштэйн нарадзіўся ў 1904 годзе.**

тэхнікум, які адчыніўся ў Менску ў 1924 годзе, ужо
толькі падноўленую вучэльню Натана Рубінштэйна.
Музычнае жыццё вялося і ў іншых губэрнскіх цэнтрах
Беларусі. У верасьні 1915 году ў Віцебску было
аддзяленьне Імпэратарскага расейскага музычнага
таварыства (ІРМТ). Ініцыятарамі гэтага былі Фаіна
Тэйтэльбаўм — настаўніца славутай расейскай піяністкі
Юдзінай, сьпявак Васіль Кармілаў і скрыпач Аркадзь
Бясьсьмертны, якому было наканавана пазьней адыграць
вялізную ролю ў гісторыі беларускай музыкі. Усе
гадаванцамі Санкт-Пецярбурскай кансэрваторыі. Дзякуючы
іхнай энэргіі менавіта Віцебск на дзясятак гадоў стаў
музычнай сталіцай Беларусі.

У горадзе былі два тэатры ды аматарскі сымфанічны аркестар
на чале зь Міхаілам Лерманам — вучнем Леапольда Ауэра.
З 1892 году тут працавала Школа-майстэрня Юдзіны Ёсць,
адкуль выйшаў Марк Шагал. У 1915—1918 гадоў, ратуючыся
ратуючыся ад вайны, рэвалюцыі, голаду, трапілі
музыкаў — беларускіх і замежных.

У пачатку сакавіка 1918 году дэлегацыя на чале зь
дырыжорам Аркадзем Бясьсьмертным паехала ў *Петраград*
хадайніцтвам аб адкрыцьці Народнай кансэрваторыі. Згодна з
Аркадзем Берыным, у складзе дэлегацыі былі энэргічны
адміністратар гарадзкога тэатру Б. Сухадрэў і адмыслова
кампазытараў, што зьвярнуліся да рэвалюцыйнай
вучань Рымскага-Корсакава Міхаіл Анцаў[25].

З таго, што на чале дэлегацыі апынуўся Аркадзь
можна зрабіць выснову, што менавіта ён быў ініцыятарам
стварэньня віцебскага сымфанічнага аркестру. Бясьсьмертны
нарадзіўся ў Суражы ў беднай габрэйскай сям'і. Азы
асновамі прафэсіі ў Менскім музычным вучылішчы
кіраўніцтвам Рубінштэйна, а ў 1912 годзе паступіў
кансэрваторыю, у клясу Ёганэса Налбандзяна.

Што ж тычыцца адміністратара гарадзкога тэатру,
дасьледчык памыляецца: прозьвішча гэтага чалавека
Барыс Суходзьеў[26]. Гэтую ж памылку мы знаходзім
і ў "Энцыкляпэдыі літаратуры і мастацтва", дзе ў
дырыжора сымфанічнага акрестру[27] фігуруе Б. Сухадрэў.
Магчыма, адна з прычынаў гэтае апошняе памылкі
заключаецца ў тым, што галоўны дырыжор Аркадзь

каляў Міхаіла Палкіна (с.74.). У "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі" Аркадзь Бясьсьмертны сьпявак Васіль Кармілаў і скрыпач Аркадзь Рубінштэйн вучыцца ў Дзяржуючы Р. Налбандзяна. Апрача ён выдатнай судружнасьці, дух ёсьць, фактычная памылка, бо Налбандзяна закрыўся ў Петраградзе з 24 Масленікавых Школьнікаў Л. Мінскае Бясьсьмертны, цудатворца. — Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. — Т.3. — Менск: Выдавецтва Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі, 1986. С.553.

Бясьсмертны пазьней быў практычна выкрасьлены з гісторыі беларускай музыкі.

[25] **Берын Аркадзь. Цыт. выд. — С.29.**

[26] **Малько Н.А. Воспоминания. Статьи. Письма. — Ленинград, 1972. — С.22.**

[27] **Асяводскім Паэзіцкаў**

Паездка Бясьсмертнага і Суходзьева ў Пецярбург **быстродкім** плённай ня толькі ў гэтым сэнсе. Кампазытар А.**Разьніцкаў**

блізкі сваяк мастака Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, узяў мандат з подпісам Луначарскага на права адбіраць ноты, што будуць знойдзеныя на сталічных нотных складах. У выніку Віцебск атрымаў мноства партытураў заходняй класыкі, у тым ліку ўнікальныя ноты, якія ў часы вайны зьберагліся ці не ў адным экзэмпляры”[28]. Гэткім чынам утварыўся Віцебскі акруговы нотны склад, які паклаў пачатак Народнай кансэрваторыі і сымфанічнаму аркестру. Існаванне функцыяваньне аркестру было б немагчымае. Як пісаў Аркадзь Берын, пасьля распаду аркестру “фонды бібліятэкі трапілі ў выпадковыя рукі і часткова згубіліся, а большая частка была вывезена ў Менску ў пачатку вайны”[29]. Тая частка віцебскай нотнай бібліятэкі, што апынулася ў Менску, нейкі час была ў Сымфанічнага аркестру БССР. Магчыма, некаторыя рарытэты захаваліся й дагэтуль.

Найбольш яскравая старонка ў гісторыі аркестру зьвязаная з імем Мікалая Малька, якога ўвесну 1918 году запрасілі на пасаду дырэктара Народнай кансэрваторыі і галоўнага дырыжора сымфанічнага аркестру. Мікалай Малько нарадзіўся ў Браілаве Падольскай губэрні ў сям’і павятовага ўрача. Ягонымі настаўнікамі ў Санкт-Пецярбурскай кансэрваторыі былі кампазытары Мікалай Рымскі-Корсакаў, Анатоль Лядаў, Мікалай Чарапнін, а ў Мюнхене — Фэлікс Мотль. Пасьля вучобы Малько быў прызначаны галоўным дырыжорам сымфанічных канцэртаў ІРМТ, а ў 1915 — асноўным дырыжорам Мар’інскага тэатру. Але з прыходам да ўлады бальшавікоў ён вымушаны быў пакінуць абедзьве пасады. Сымфанічныя аркестры ў Маскве і ў Петраградзе былі разагнаныя, а ў Мар’інскім тэатры адбыліся выбары кіраўніцтва, якія скончыліся не на карысьць Малька. Артыстам не спадабалася ягоная патрабавальнасьць і нямецкая дакладнасьць. Паводле Аркадзя Берына, “упершыню аркестар сабраўся ў пачатку мая [1918], а праз паўтара месяца, 21 чэрвеня, на адкрытай эстрадзе ў садзе Ялагі адбыўся першы канцэрт, прысьвечаны дзесяцігодзьдзю з дня сьмерці Рымскага-Корсакава. Выконваліся “Іспанскае капрыча”, сюіта з опэры “Сьнягурка”, Шэсьце з опэры “Залаты пеўнік”, увэрцюра да опэры “Царская нявеста” і дзьве арыі Марфы (сьпявала жонка Малька, былая салістка Мар’інскага тэатру Р. Сьцяпанава)”[30].

Дзёньнікавыя запісы самога Мікалая Малька сьведчаць, што ён

музычнай культуры [Віцебску].

сымфанічны аркестар з 120 кваліфікаваных музыкаў (першынаджае дырыжор Б.Сухадрэў).

Масуніна В.Л.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. — Мінск: Выдавецтва Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі, 1984. С.639.

Там сама.

Берын Аркадзь. Цыт. паводле С.30.

прыехаў у Віцебск у кастрычніку. У іх адлюстроўваюцца таксама ягоныя першыя ўражаньні ад працы зь віцебскім аркестрам. “Віцебск, 2 лістапада, субота, 11 гадзінаў 35 хвілінаў — 1 гадзіна 50 хвілінаў… Заля Пралетарскага клюбу 1 траўня. Праграма: Бэтговэн — “Эгмонт”, Чайкоўскі — “Італьянскае капрыча”, Літольф — увэрцюра “Рабэсп’ер”. Цяжка апісаць уражаньне, настолькі яно моцнае і разнастайнае: агульная неразьбярыха, стракаты натоўп музыкаў, натоўп разявакаў, поўная неўладкаванасьць усяго, неакуратнасьць у часе, мітусьлівы Барыс Суходзьеў і пры гэтым Шуман з пытаньнем — “якую мне валторну йграць?” (зразумела, жартам). Спачатку я думаў, што нічога ня выйдзе, — какафонія, да таго ж, многіх не ставала. Потым іншыя глядзяць, як нібыта прыйшоў беларучка; я вырашыў, сьцяўшы зубы, працаваць”[31].

Само сабой зразумела, што немагчыма было стварыць аркестар “зь нічога”. Тэмп, у якім працаваў віцебскі аркестар, сьведчыць пра надзвычайную творчую энэргію і працавітасьць дырыжора — Малька — і пра наяўнасьць прафэсійна падрыхтаваных аркестрантаў. У сакавіку 1918 году (г.зн. за паўгоду да прыезду Малька) ў Віцебску адчынілася Народная кансэрваторыя.

[30] **Тамсама. С.29.**

[31] **Малько Н.А. Цыт. выд. — С.22.**

Дарма што 11 красавіка 1921 году аркестар атрымаў уласнае памяшканьне[32], гэта не затрымала Малька ў Віцебску. Грамадзянская вайна й разруха скончыліся, і ўвосень 1921 году ён зьяжджае зь Віцебску. Але аркестар захаваўся, хіба толькі зьменшыў інтэнсіўнасьць сваёй канцэртнай дзейнасьці. На чале яго стаў Аркадзь Бясьсьмертны.

[32] **Тамсама. С. 158.**

Пачынаючы з 1923 году Малько зноў рэгулярна наведвае Віцебск. Кантакты Малька зь Беларусяй скончыліся толькі калі ён заняў пасаду галоўнага дырыжора і дырэктара Ленінградзкай філярмоніі. Тутака ён ладзіць музычны фэст, прысьвечаны 100-годзьдзю з дня сьмерці Бэтговэна, выкладае ў Ленінградзкай кансэрваторыі. Школу Малька прайшоў беларускі дырыжор Марк Шнэйдэрман, які пазьней на працягу дзесяці гадоў узначальваў Дзяржаўны сымфанічны аркестар БССР, а таксама Ільля Мусін. Апошні, у сваю чаргу, быў настаўнікам многіх беларускіх дырыжораў, у тым ліку малодшага пакаленьня.

Малько мае бясспрэчныя заслугі перад беларускай музычнай культурай. Яго вучань Аркадзь Бясьсьмертны працаваў пры Мальку ў якасьці саліста і асыстэнта, а пазьней — як ужо гаварылася — зьмяніў свайго настаўніка па пасадзе дырыжора. У кастрычніку 1924 году Бясьсьмертнага запрасілі ў Менск, на пасаду дырэктара толькі што адчыненага Беларускага музычнага тэхнікуму.

Камуністычныя ўлады не давяралі інтэлігенцыі. “Інтэлігенцкая рэспубліка” ў Віцебску ўзбуджала ў іх падазрэньні. Пераезд віцебскай Народнай кансэрваторыі ў Менск разбурыў гэты вольны артыстычны асяродак і ўмацаваў статус Менску як сталіцы. Найлепшых аркестрантаў перацягнулі ў Менск на выкладчыцкія пасады ў Белмузтэхнікум. З 1925 году гісторыю і тэорыю музыкі ў тэхнікуме выкладае Юльян Дрэйзін — музыказнаўца й перакладчык. У цяжкія гады ваеннага камунізму ён знайшоў сабе прытулак у Магілёве. Пазьней ён пасяліўся ў Менску, выкладаў старажытнагрэцкую і лацінскую мовы ў Беларускім унівэрсытэце і адначасова аж да 1935 году быў скрыпачом сымфанічнага аркестру. Апроч таго, Дрэйзін выконваў пры аркестры абавязкі лектара. Пазьней гэткіх унівэрсальных людзей у аркестры ўжо не было.

Цяпер ужо цяжка з дакладнасьцю вызначыць той момант, калі паўстаў гэты новы аркестар. Як сьцьвярджае спадар Загародні,

“аркестар музычнага тэхнікуму быў арганізаваны ўвесну 1926 году, кіраўнік А. Бясьсьмертны, тады ж адбыўся ягоны першы пробны канцэрт”[33]. Вядома таксама, што сьпярша аркестар складаўся выключна з пэдагогаў, але пазьней у яго ўвайшлі й студэнты.

[33] Загородний Г.Н. Цыт. выд. — С.10—11.

Аркадзь Бясьсьмертны нядоўга быў аднаасобным кіраўніком гэтага калектыву. Увосень 1926 году ў Белмузтэхнікуме зьявіўся новы таленавіты выкладчык — Ільля Гітгарц. Бясьсьмертны з Гітгарцам былі равесьнікі і разам вучыліся ў Санкт-Пецярбурскай кансэрваторыі. Гітгарц быў вучнем Леапольда Аўэра, а Бясьсьмертны — вучнем Налбандзяна, які сам калісьці вучыўся ў Аўэра. Бясьсьмертны асабіста прапанаваў яму гэтую працу, і ўраджэнец Адэсы Гітгарц з удзячнасьцю прыняў запрашэньне. Мой родзіч Барыс Каплан, які ў 1930-я гады граў на трамбоне ў аркестры Тэатру опэры і балету БССР, узгадваў пра тое, як Гітгарц прыходзіў на рэпэтыцыі ў скураной тужурцы і галіфэ. Ён быў на той час ня толькі галоўным дырыжорам, але і дырэктарам опэрнага тэатру. У яго быў ідэальны слых, нават у масіўных аркестрава-харавых tutti ён выразна чуў голас кожнага харыста, кожную фальшывую ноту альбо рытмічную недакладнасьць.

У сакавіку 1927 году ў Менску пад кіраўніцтвам Макса Купэра была выканана Дзявятая сымфонія Бэтговэна. Як сьцьвярджае Зьміцер Жураўлёў, у выкананьні гэтага грандыёзнага твору ўдзельнічалі таксама хор і сымфанічны аркестар Першага Беларускага драматычнага тэатру (БДТ-1)[34]. Аднак гэтая зьвестка выглядае неверагоднай. Ніводная крыніца, пацьвярджае самога факту існаваньня сымфанічнага аркестра ў БДТ-1. Абмяркоўваючы гэтую тэму, нашыя музыказнаўцы часьцяком зьвяртаюцца да спрытнай маніпуляцыі фактамі. “Арганізаваны ў 1920 годзе, ён [БДТ-1] меў у сваім складзе ня толькі драматычных акцёраў, але і сымфанічны аркестар, хор, балетную трупу. Гэта дазваляла тэатру ставіць музычныя спэктаклі, рэгулярна даваць адкрытыя канцэрты”, — піша Зьміцер Жураўлёў[35]. Канкрэтных назваў і датаў у артыкуле няма, аднак з агульнага кантэксту вынікае, што музычныя

[34] Журавлев Д. Посударгеструнный симфонический… С.4.

спэктаклі з удзелам сымфанічнага аркестру адбываліся ў пэрыяд да 1924 году (бо далей ідзецца пра адкрыццё Белмузтэхнікуму ў 1924 годзе, пра першы камэрны канцэрт беларускай музыкі ў 1925 годзе і г.д.). У брашуры, прысьвечанай гісторыі Дзяржаўнага сымфанічнага аркестру, Жураўлёў разгортвае гэтую тэму яшчэ болей падрабязна: “Пачынаючы з 1920 году ў складзе БДТ-1 была харавая, балетная і аркестравая група, якая неўзабаве пераўтварылася ў паўнавартасны аркестар. Дзякуючы гэтаму ўдавалася ставіць ня толькі сынтэтычныя спэктаклі — як, напрыклад, “Каваль-ваявода” паводле п’есы Я. Міровіча, але й балеты “Фэя лялек” І. Баера, “Зачараваны лес” Р. Дрыго, “Капэлія” Л. Дэліба, а таксама опэру А. Даргамыскага “Русалка”[36]. Аднак жа дакладна вядома, што спэктакль “Каваль-ваявода” з музыкай Уладзімера Тэраўскага[37] быў пастаўлены ў 1925 годзе. Тэраўскі быў кампазытарам-самавукам і не пісаў сымфанічных партытураў. Што ж датычыць “Русалкі” Даргамыскага, дык яна ўвогуле аказалася “вольнай антрэпрызай”. Гісторыю гэтай опэры часткова выклаў на старонках “Белорусской деловой газеты” журналіст Сяргей Шапран, аднак “звышэмацыянальны” тон гэтага артыкулу стаўся прычынаю шэрагу недакладнасьцяў[38]. Па-першае, нельга называць “Русалку” Даргамыскага “першай беларускай нацыянальнай опэрай” толькі з той прычыны, што яна была першы раз пастаўленая на беларускай мове. Па-другое, нельга называць Вячаслава Селяха-Качанскага “творцам першай беларускай нацыянальнай опэры” толькі таму, што ён быў пастаноўшчыкам “Русалкі”. Творца — не пастаноўшчык, кампазытар. Памылкова апісвае Шапран і прыроду канфлікту, які выбухнуў паміж Селяхам-Качанскім і Гітгарцам. У гэтага канфлікту пастаноўка “Русалкі” адбылася толькі як прывід аркестру. Селях-Качанскі, які працаваў выкладчыкам у Беларускім музычным тэхнікуме, прапанаваў “Русалку” толькі як якасьці курсавога спэктаклю. Гітгарц не згадзіўся, бо, як вядома, што пастаноўка “Русалкі” ў якасьці “нацыянальнай беларускай опэры” і ў беларускіх касьцюмах — гэта прафанацыя. Акрамя таго ж, у “Русалцы” няма тых цяжкасьцяў, якія маглі б паставіць прафэсійны рост і творчую фантазію маладых выканаўцаў

35. **Жураўлёў Д.Н. Музыка…** **С.9.**

36. **Жураўлёў Д. Государственный симфонический… С.4.**

37. **Уладзімер Тэраўскі (1871 – 1938) — беларускі кампазытар, фальклярыст і харавы дырыжор, аўтар музычнай часткі нацыянальнай опэры “Мы і яны”, пастаноўшчык “Русалкі” Даргамыжскага, аўтар музыкі да п’есы Янкі Купалы “Прымакі”.**

“Паўлінка”. З 1917 па 1920 ўзначальваў музычную частку Першага беларускага таварыства драмы і камэдыі, у 1920—1935 быў хармайстрам БДТ-1. Пазьней быў асуджаны як “нацдэм” і ў 1938 годзе бязьвінна загінуў у сталінскіх лягерох.

[38] Шапран Сергей. Среди живших не значится. — Белорусская деловая газета. — 2000. — 14 июля.

Гітгарц надзвычай сур’ёзна ставіўся да сваёй справы. Першай ягонай пастаноўкай у опэрнай студыі быў “Фаўст” Гуно ў перакладзе на беларускую мову Юльяна Дрэйзіна[39].

[39] Маслеников В. **Школьнікаў Л. Минская музыкальная… — С. 553.**

А ў 1929 годзе пад кіраўніцтвам Гітгарца адбылася, на тэкст прэм’ера “Беларускай сюіты” Людаміра Рагоўскага, вершу Янкі Купалы “А хто там ідзе?”.

Спрэчка паміж Гітгарцам і Селяхам-Качанскім стала прычынай таго, што разрэклямаваная прэм’ера “Паўлінкі” адбылася 14 траўня 1927 году пад акампанэмэнт рояля.

Агульнае кіраваньне ўзяў на сябе Ўладзімер Тэраўскі, які быў у той час хармайстрам БДТ-1. Гэта быў першы і апошні паказ Селяхавай “Русалкі”. Калі б гэта сапраўды быў спэктакль БДТ-1 і ў складзе трупы быў сымфанічны аркестар, “Русалка” напэўна б затрымалася ў рэпэртуары. У жніўні 1927 году Селях-Качанскі быў прызначаны дырэктарам першага дзяржаўнага тэатру і стаў вызначаць рэпэртуарную палітыку. Аднак сапраўднага аркестру ў тэатры не было — прынамсі, мы ня маем аніякіх доказаў ягонага існаваньня. А калі так, дык няма й доказаў таго, што Дзяржаўны сымфанічны аркестар паўстаў “на аснове аркестраў Беларускага музычнага тэхнікуму і БДТ-1”[40].

Для чаго спатрэбілася прыдумваць нейкае аб’яднаньне аркестраў, калі цалкам відавочна, што “сымфанічны аркестар паявога таварыства” — гэта, па сутнасьці, рэарганізаваны аркестар Белмузтэхнікуму? Менавіта гэтак успрымалі яго менчукі. Напярэдадні прэзэнтацыі новага калектыву газета “Зьвязда” пісала: “6 сакавіка ў клюбе імя Карла Маркса адбудзецца першы сымфанічны канцэрт Беларускага дзяржаўнага музычнага тэхнікуму. Гэтым канцэртам адчыняецца шэраг сымфанічных канцэртаў Белмузтэхнікуму. Тое, пра што марылі нашыя музычныя дзеячы, цяпер распачынае ажыцьцяўляцца, на чацьвертым годзе існаваньня Белмузтэхнікуму мы маем свой собскі, сталы аркестар… Дырыжуе аркестрам кіраўнік аркестравай клясы Ільля Гіттарц”[41].

Выглядае на тое, што прычынаю маніпуляцыяў з пэўнымі фактамі сталася нежаданьне позьніх савецкіх ідэолягаў бачыць габрэяў Бясьсьмертнага і Гіттарца “бацькамі-заснавальнікамі”. Гэткая сытуацыя, на жаль, тыповая для нас. Прыкладам, Дзяржаўны аркестар народных інструмэнтаў РБ з 1974 году носіць імя Язэпа Жыновіча — з той нагоды, што нібыта Жыновіч быў ягоным першым мастацкім кіраўніком. Аднак у сапраўднасьці заснавальнікам і першым мастацкім кіраўніком гэтага калектыву (з 1928 да 1935 году) быў балаганны Зьміцер Захар, які асвоіў традыцыйныя беларускія інструмэнты — жалейку, ліру, старадаўнія цымбалы. Жыновіч прыйшоў у аркестар у сярэдзіне 1930-х, аддаваў перавагу рэфармаваным цымбалам.

Гэтаксама Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу імя

[40] **Кацавай А. Дзяржаўны сымфанічны…** С. 311.

[41] **«Зьвязда», 4 сакавіка 1927, № 55.**

Рыгора Шырмы заснаваў зусім ня Шырма, а Вячаслаў Селях-Качанскі, які пасьля вайны ўцёк у Амэрыку. А першым ейным музычным кіраўніком быў выдатны хармайстар і дырыжор Ізраіль Бары, які ўзначальваў гэты калектыў на працягу амаль 15 гадоў.

Для падтрыманьня савецкага ідэалягічнага міту былі патрэбныя адпаведныя героі — простыя людзі сялянскага паходжаньня славянскай нацыянальнасьці. Ані Бясьсьмертны, ані Гітгарц з Ізраілем Бары не пасавалі да гэтае схемы.

Гэта была ня новая традыцыя. Яшчэ за царскім часам у Расеі габрэі актыўна мянялі прозьвішчы, каб мець большыя магчымасьці для працы. Так, мастак Лей Хаім Розэнбэрг ператварыўся ў Лява Бакста, паэт Аляксандар Глікбэрг — у Сашу Чорнага, паэт Майсей Фрыдлянд — у Міхаіла Кальцова, пісьменьнік Веніямін Зільбер — у Веніяміна Каверына, паэт Майсей Шэйнкман — у Міхаіла Сьвятлова, рэжысэр Аляксандар Корнбліт — у Аляксандра Таірава, драматург Міхаіл Гібельман — у Міхаіла Рошчына. Нядаўні зыркі прыклад зь беларускай культуры — актор Ільля Эйдэльман, які стаўся Ільлём Курганом.

Аркадзь Бясьсьмертны да таго ж, хаця і паходзіў зь беднай сям'і, ніколі ня быў сябрам камуністычнае партыі. Не былі камуністамі й ягоныя дзеці. Сын Барыс у 1937 годзе быў асуджаны як "вораг народу" і вызваліўся толькі пасьля сьмерці Сталіна. Бяда, што здарылася з сынам, перакрэсьліла кар'еру Бясьсьмертнага як выдатнага саліста-скрыпача і дырыжора. Дзякуючы мужнасьці рэктара Белдзяржкансэрваторыі Міхаіла Бэргера, Бясьсьмертны захаваў пасаду загадчыка скрыпічнай катэдры. Аднак пра ягоныя заслугі ў якасьці першага мастацкага кіраўніка Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестру не дазвалялася гучна згадваць на працягу некалькіх дзесяцігодзьдзяў.

У 1933 годзе Гітгарц быў прызначаны дырэктарам і галоўным дырыжорам Беларускага тэатру опэры і балету. Але ў канцы 1935 году яго нечакана выкінулі з тэатру — як пляткарылі, па даносе Селяха-Качанскага, які прагнуў заняць ягоную пасаду дырэктара. Гітгарц зьехаў зь Беларусі і вярнуўся ў Менск толькі ў 1947 годзе. Ён быў прыняты на пасаду другога дырыжора Опэры, аднак у 1951 годзе, у часе "справы лекараў", яго адтуль звольнілі. Цікава, што галоўны дырыжор Дзяржаўнага

сымфанічнага аркестру Марк Шнэйдэрман захаваў тады сваю пасаду, а Гітгарцу давялося задаволіцца выкладчыцкай працай у Беларускай кансэрваторыі.

Заслугі Гітгарца і асабліва Бясьсьмертнага перад нашай культурай вялізныя. Па-першае, менавіта Бясьсьмертны сабраў вакол сябе рэшткі аркестру Малька і стварыў зь іх новы калектыў. Па-другое, ён знайшоў тую “нішу”, якая дазволіла аркестру нармальна існаваць і разьвівацца на працягу 30-х гадоў. Выбар Беларускага радыёцэнтру як галоўнага партнэра аказаўся надзвычай плённым для абодвух бакоў.
Аб’ём музычнага вяшчаньня на радыё ўзрастаў і на пачатку 1930-х гадоў дасягнуў трох гадзінаў штодзённа. Першы канцэрт аркестру, які трансьляваўся па радыё, адбыўся 13 студзеня 1929 году ў менскім Доме вяскоўца. Выконваліся творы Іпалітава-Іванава, Шубэрта, Расыні, Мусарскага, Грыга. Дырыгаваў Аркадзь Бясьсьмертны. На колішняй інтэрнэт-старонцы Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестру РБ сьцьвярджалася, быццам “свой першы канцэрт сымфанічны аркестар правёў пад кіраўніцтвам Р. Гліэра, а салістам быў вядомы аўстрыйскі піяніст Р. Готліб”[42]. Аднак гэта, мякка кажучы, недакладнасьць. Гліэр — вядомы савецкі кампазытар, улюбёнец Сталіна — упершыню выступаў з нашым сымфанічным аркестрам 31 студзеня 1931 году. Між тым як рэгулярная канцэртная дзейнасьць аркестру распачалася ў 1929 годзе. Канцэртная праграма, што выконвалася 13 студзеня, была паўтораная 22 разы.
21 кастрычніка 1929 году ў памяшканьні Белдзяржтэатру адбылося ўрачыстае адкрыцьцё першага сымфанічнага сэзону Беларускага радыёцэнтру. У праграме — “Шахеразада” Рымскага-Корсакава, “Варыяцыі на тэму ракако”, сцэна зь “Яўгена Анегіна” і сюіта з балету “Лебядзінае возера” Чайкоўскага.
Выкананьне музыкі ў жывой трансьляцыі было вялікай школай для маладога калектыву, бо патрабавала надзвычайнай дысцыпліны і дакладнасьці. Дзякуючы пэдагагічнаму дару Бясьсьмертнага і патрабавальнасьці Гітгарца аркестар хутка дасягнуў неабходнага ўзроўню прафэсіяналізму. Увосень 1930 году ўвесь калектыў аркестру быў залічаны ў штат Беларускага радыёцэнтру.

[42] www.belarustoday.com/culture/music/2_orchestr/

У 1932 годзе ў аркестры налічвалася 60 музыкаў — людзей пераважна тутэйшых. Касьцяк калектыву складаўся з прафэсіяналаў, якія пачыналі сваю кар'еру ў аркестры Малька, пазьней выкладалі ў Белмузтэхнікуме, а апошнім часам — у кансэрваторыі. Аркестравых музыкаў не ставала, і на некаторых меней значных месцах апынуліся звычайныя "лабухі" з рэстаранных ансамбляў. Дырыжорамі былі Аркадзь Бясьсьмертны і Ільля Гітгарц.
Выкрасьліўшы з гісторыі аркестру людзей, якія стаялі ў ягоных вытоках, савецкія аўтары выкрэсьлівалі цэлы пэрыяд ягонага жыцьця. Гісторыя аркестру пачалася нібыта з Ільлі Мусіна, які лепей пасаваў на ролю заснавальніка, хаця таксама быў беспартыйным інтэлігентам. Тое, што Мусін быў расейцам і пастаянна жыў у Ленінградзе, падмацоўвала афіцыйную вэрсію расейскага паходжаньня беларускага прафэсійнага мастацтва.

Зрэшты, той кароткі пэрыяд, калі галоўным дырыжорам быў Мусін, таксама багаты на белыя плямы. Мусіна запрасілі на пасаду, бо калектыў увогуле апынуўся без кіраўніка. Гітгарц зьехаў, Бясьсьмертнага адхілілі ад кіраўніцтва аркестрам. Незадоўга да таго аркестар быў уключаны ў склад Беларускай дзяржаўнай філярмоніі. У Пастанове Саўнаркаму БССР ад 28 верасьня 1936 году "Аб сетцы ўстановаў Упраўленьня ў справах мастацтваў" наконт гэтага меўся асобны пункт: "Арганізаваць сёлета Беларускую дзяржаўную філярмонію ў складзе: дзяржаўнага хору, сымфанічнага аркестру і аркестру народных інструмэнтаў. Неабходныя новыя захады па Беларускай дзяржаўнай філярмоніі прадугледзець народна-гаспадарчым плянам на 1937 год"[43]. Аднак з афіцыйным адкрыцьцём новае культурніцкае ўстановы цягнуўся ажно 25 красавіка 1937 году, хаця філярманічныя канцэрты распачаліся яшчэ ў сакавіку. Першымі сымфанічнымі канцэртамі Беларускае філярмоніі, што адбыліся 30 і 31 сакавіка 1937 году, дырыгаваў выпадковы чалавек — выпускнік Маскоўскай кансэрваторыі Эдуард Крэнскі. Мусін прыехаў позьняй восеньню — здаецца, ужо пасьля адкрыцьця новага канцэртнага сэзону. Новаму дырыжору было 33 гады, ён быў вучнем Мікалая Малька і пасьля заканчэньня Ленінградзкай кансэрваторыі працаваў выкладчыкам, дырыгаваў студэнцкім аркестрам і зрэдку — аркестрам

[43] ЦГАОР БССР, дак. №5207, с.3. — Цыт: Збородний Г.Н. Музычны выпускнік… — с.23.

Ленінградзкай філярмоніі. Умовы, у якіх працавалі ўсе калектывы Беларускай філярмоніі, былі значна горшымі ў параўнаньні з тымі, якія існавалі ў Ленінградзе. Пазьней Мусін згадваў: “Канцэртнай заляй Філярмоніі служыла памяшканьне клюбу. Няўтульнае, пустое фае, гэткая ж непрывабная заля. Замест эстрады — тыповая клюбная сцэна з анучавымі парталамі. Акустыка агідная. Няма дзіва, што гэтае памяшканьне не спрыяла прыцягненьню слухачоў”[44]. Пры гэтым клюб харчавікоў (які быў пабудаваны ў 1927—1929 гадох на вуліцы Інтэрнацыянальнай) лічыўся адным з найлепшых будынкаў у горадзе. З 1935 году тут адбываліся сымфанічныя канцэрты, а рэпэтыцыі праходзілі ў катэдральным касьцёле, адкуль вернікаў выкінулі яшчэ ў 1934 годзе. Акустычныя ўмовы ў касьцёле і ў клюбе харчавікоў былі прынцыпова розныя, і з гэтай прычыны ад рэпэтыцыяў было мала толку. На запрошчы Мусіна кіраўніцтва Філярмоніі тэрмінова замовіла ў сталяра разборны павільён, у якім сьцены былі зроблены з фанэрных шчытоў, а столь — з тканіны. Яго ўсталёўвалі ў залі клюбу харчавікоў перад пачаткам канцэртаў.

Праблема з памяшканьнем — толькі адна з прычынаў, празь якія Мусін пачуваўся ў Менску няўтульна. Ён быў занадта шчыльна зьвязаны зь Ленінградам, у прыватнасьці, з аркестрам Ленінградзкай кансэрваторыі, зь якім ён рэгулярна працаваў на працягу 1937—1941 гадоў, афіцыйна будучы галоўным дырыжорам Сымфанічнага аркестру БССР.

У той жа час пасьля перадачы аркестра на балянс філярмоніі на радыё застаўся малы сымфанічны аркестар, якім кіраваў выпускнік Беларускай кансэрваторыі Мікалай Клаўсянін. Пасьля вайны імя Мікалая Клаўса таксама было выкрасьлена з гісторыі беларускай культуры. Прычына ў тым, што падчас нямецкай акупацыі ён займаў пасаду галоўнага дырыжора Менскага гарадзкога тэатру. Клаўс пайшоў на гэты крок сьвядома, спадзеючыся выратаваць сваіх сяброў-яўрэяў, пераважна габрэяў, якія таксама не пасьпелі эвакуявацца зь Менску. Як піша ў сваім артыкуле музыказнаўца Ізраіль Брылон, ён выратаваў сям’ю Ісака Любана і старэнькую маці “беларускай перапёлачкі” Ларысы Александроўскай, пры яго падтрымцы некаторыя музыкі адыходзілі ў партызанскія атрады. Пад кіраўніцтвам Клаўса ў нялюдзкіх умовах акупацыі

[44] Запрошчы П. Н. Мусіна. — Ф. 23.

[45] Ткаченко Т. Ольга. Святой Николай. Белорусская деловая газета. 2002. 10 января.

беларускія артысты ставілі “Вясельле Фігара” Моцарта, “Кармэн” Бізэ, “Сэвільскага цырульніка” Расіні, “На Купальле” беларускага кампазытара Аляксея Туранкова. Аднак ані самаахвярнасьць дырыжора, ані ягоныя сувязі зь Менскім падпольлем[46] ня выратавалі яго ад сталінскай вязьніцы, а потым — ад забыцьця.

Між тым, Клаўс быў таленавітым дырыжорам. Тагачасная крытыка параўноўвала яго дырыжорскую манеру з манерай Яўгена Мравінскага, хіба, найлепшага вучня Мікалая Малька. Вучнем Малька быў Марк Шнэйдэрман, галоўны дырыжор з 1946 да 1956 году. Другім дырыжорам у гэты час быў Барыс Афанасьеў — вучань Шнэйдэрмана і Аркадзя Бясьсьмертнага. Наступным кіраўніком аркестру стаўся Віктар Дубовскі, які быў на пасадзе галоўнага дырыжора ў 1956—1962 і 1991—1994 гадох. А ў Мусіна вучыўся цяперашні галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестра Беларусі Аляксандар Анісімаў, а таксама цэлы шэраг беларускіх дырыжораў сярэдняга і малодшага пакаленьняў, у тым ліку Аляксандар Сасноўскі, Андрэй Васілеўскі і Міхаіл Фінберг. Фактычна Малько быў заснавальнікам беларускай дырыжорскай школы XX стагодзьдзя.

Яшчэ адзін пэрыяд у гісторыі нашага сымфанічнага аркестру, які падпаў пад ідэалягічную карэктуру, — гэта падзеі 1939—1940 гадоў. 17 верасьня 1939 году савецкія войскі ўвайшлі ў Заходнюю Беларусь. У кнізе Зьмітра Жураўлёва “Менскага ў кастрычніку 1939 году Сымфанічны аркестар Радыё выехаў у Беласток і выступіў перад дэлегатамі Народнага сходу Заходняй Беларусі. Аднак ёсьць падставы меркаваць, што перад дэлегатамі выступаў зусім іншы калектыў. У верасьні 1939 году на тэрыторыі Заходняй Беларусі апынуліся сотні музыкаў, пераважна габрэяў, якія раней працавалі ў Варшаўскай і іншых польскіх мястох. Як паведамляе беларускі даследчык Яўген Басін, “у Беластоцкай абласной дзяржаўнай філярмоніі было зарэгістравана больш за дзьвесьце чалавек — прадстаўнікоў творчых прафэсіяў. Амаль усе яны былі прафэсіяналамі ў найвышэйшым сэнсе гэтага слова”[47]. Басін таксама сьцьвярджае: “Ужо ў верасьні 1939 году тут [у Беластоку] быў арганізаваны сымфанічны аркестар, на першым канцэрце якога на пачатку кастрычніка дырыгаваў заслужаны артыст БССР Аркадзь Бясьсьмертны, што прыехаў зь Менску”[48].

[46] Як **сьцьвярджае Барыс Брыгон, у пэўнай ступені ён адбыўся дзякуючы РВ Прыляжаевым, які быў прызначаны ў Менскага гарадзкога камітэту КПБ(б) Беларусі. Прыляжаеў. Але Клаўс заставаўся ў Менску, працаваў у тэатры. Там**

Аднак у 1940 годзе сымфанічны аркестар Беластоцкай філярмоніі расфармавалі. Бээсэсэраўскія чыноўнікі ўхваліліся да Першай дэкады беларускага мастацтва і літаратуры, што мусіла адбыцца ў Маскве 5—15 чэрвеня 1940 года. У рамках падрыхтоўкі да маскоўскай дэкады вырашылі ўкамплектаваць Сымфанічны аркестар БССР высокакваліфікаванымі польскімі музыкамі. Уцекачы былі пераважна выпускнікамі Варшаўскай кансэрваторыі, сярод якіх былі такія, хто стажаваўся ў Вене, Бэрліне і Парыжы. З мэтаю адбору найлепшых музыкаў у Беластоку зладзілі музычны конкурс. У журы ўваходзілі заслужаныя артысты рэспублікі Бясьсьмертны і Бэргер, а таксама загадчыца ўпраўленьня ў справах мастацтва Дадзіёмава.

будуць карысны бізнэй” (Бэрлін, што Ольга Цытлёнак)

[47] Басин Яков. Эдди Рознер — Музыка и тьма (III). — Jazz-квадрат. — 1998. — #3—4.

[48] Басин Яков. Эдди Рознер — Музыка и тьма (I). — Jazz-квадрат. — 1998. — #1

У выніку гэтага конкурсу, а таксама некалькіх дадатковых праслухоўваньняў Дзяржаўны сымфанічны аркестар папоўніўся выдатнымі музыкамі. У іх ліку — скрыпач Ізраіль Турш, які раней іграў у квартэце Польскага радыё, а таксама Генадзь Клачко, які пазьней на працягу некалькіх дзесяцігодзьдзяў быў памочнікам канцэртмайстра першых скрыпак[49]. У гэтым складзе Сымфанічны аркестар БССР выдатна выступіў у Маскве.

[49] Гэтым часам я атрымала ад беларускай кампазытаркі Эдыты Тырманд, якая была першай удзельніцай апісаных тут падзей. Яна ўзгадала, што Ізраіль Турш ажаніўся з Эдытай Тырманд.

Па вайне аркестар фактычна зьбіралі нанава. Па-ранейшаму гэты аркестар больш адрозьніваўся ад даваеннага, чым аркестар Беларускага музычнага тэхнікуму — адзінага, што ацалеў з аркестру Мікалая Малька. Многія з новых аркестрантаў прыехалі з Расеі — як тады казалі, “уздымаць культуру”. Увесну 1946 году галоўным дырыжорам прызначылі Таццяну Каламійцаву — экстравагантную асобу, падобную да Фэрэнца Ліста, якая зь юнацкіх гадоў не прызнавала вопраткі, апрача смокінгу і нагавіцаў. Яшчэ ў 1937-м Каламійцава была дырыжоркаю Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестру СССР. Яна не была чалавекам тутэйшым і не была зьвязаная з школай Малька, Пецярбургу, вучылася ў Адэсе, у Менск пераехала ў 1944-м разам з трупай опэрнага тэатру, што пры канцы вайны апынулася ў Каўрове Ўладзімерскай вобласьці Расеі. Спачатку яна працавала ў Опэры, потым нядоўгі час узначальвала Дзяржаўны сымфанічны аркестар. Менавіта Каламійцава — пра што цяпер звычайна маўчаць — згуртавала вакол сябе калектыў і распачала рэпэтыцыі. Неабходная колькасьць музыкаў сабралася толькі ўвосень. 21 верасьня пад кіраўніцтвам дырыжоркі адбыўся першы ў Менску паваенны сымфанічны канцэрт.

Пасьля Каламійцавай галоўным дырыжорам стаў Марк Шнэйдэрман — высокаадукаваны музыка, які кіраваў аркестрам на працягу 10 гадоў. Ягоным наступнікам быў масквіч Віктар Дуброўскі. Надзвычай амбітны — першы з шэрагу энэргічных іншаземцаў, якія разглядалі наш сымфанічны аркестар як выдатную стартавую пляцоўку для далейшага кар’ернага росту. Менавіта Дуброўскі ўпершыню пазнаёміў нашую публіку з Трэцяй сымфоніяй і “Сымфанічнымі танцамі” Сяргея Рахманінава, з “Паэмай экстазу” Аляксандра

Скрабіна, з “Накцюрнамі” і “Пасьляпаўдзённым адпачынкам фаўна” Клёда Дэбюсі, з “Балеро” Марыса Равэля, з “Рапсодыяй у стылі блюз” Джорджа Гершвіна і іншымі напаўзабароненымі творамі. Разам з Дуброўскім аркестар упершыню зьведаў, што такое сапраўдная папулярнасьць.
З прыходам на пачатку 1960-х гадоў на пасаду галоўнага дырыжора Віталя Катаева аркестар працягваў арыентавацца на выкананьне сучаснай музыкі. Ён таксама быў першым выканаўцам многіх твораў беларускіх кампазытараў: Другой і Трэцяй сымфоніі Яўгена Глебава, Другога скрыпічнага канцэрту Зьмітра Камінскага, Фартэпіяннага канцэрту Генрыха Вагнэра. Пазьней Катаеў дырыгаваў першымі поставангардысцкімі опусамі беларускіх кампазытараў — Віктара Капыцькі, Аляксандра Ліцьвіноўскага, Аркадзя Гурава.

У музыказнаўчай літаратуры 1960—1980-я гады называюць як “залатая эпоха” вялікіх расейскіх гастралёраў — Давідава, Ойстраха, Рыхтэра і Гілельса, Абразцовай і Архіпавай. Для гастралёраў — расейскіх ці замежных — Менск быў балей як прыпынак па дарозе з Эўропы ў Маскву. Звычайна філярмонія наладжвала два канцэрты, а адзін з аркестрам. Найбольшым попытам карысталіся салісты на сольны канцэрт. Яны распаўсюджваліся паміж прадпрыемстваў райкамаў, загадчыкамі гандлёвых базаў, прыдворнымі і цырульнікамі. Прафэсары кансэрваторыі мусілі задавальвацца ўваходнымі квіткамі. Канцэрты з аркестрам лічыліся менш цікавымі і прэстыжнымі. Сярод менчукоў панаваў думка, нібыта аркестар толькі “псуе асалоду”. У першым аддзяленьні аркестар звычайна йграў сымфонію, а публіка сумавала ці бавіла час у буфэце. Сярод моладзі модна падкрэсьліваць сваё зьняважлівае стаўленьне да аркестру. Калі гастралёр мусіў іграць у першым аддзяленьні (бо сьпяшаўся на вакзал), сымфонія гучала ў пустым залі. У другім аддзяленьні, калі аркестар акампаніяваў салісту, многія слухачы сьвядома імкнуліся “адключыць” аркестравага гучаньня і слухаць толькі свайго куміра. Крытыка ніколі не наважвалася пра гэта пісаць. Наадварот, яна стварала міт пра тое, што спарадычныя выступы аркестру з сусьветна славутымі салістамі былі ягоным вялікім посьпехам. Насамрэч ніякага посьпеху тут не было. “Ён [Дуброўскі] з

[50] **Людміла Яфімава — народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны.**

[51] **Юры Яфімаў (1937—1991) — народны артыст Беларусі (1989), у 1966—1971 і 1971—1991 мастацкі кіраўнік**

выступалі з нашым аркестрам не з сваёй волі, а дзякуючы “Саюзканцэрту”.

Дзяржаўнага акадэмічнага сымфанічнага аркестру БССР.

Аркестранты не хацелі выконваць некаторыя творы беларускай музыкі дзеля яе нізкай якасьці. Людміла Яфімава[50] прыдумала мне, як пакутаваў ейны муж Юры Яфімаў[51], калі Міністэрства культуры БССР прымушала яго дырыгаваць “намэнклятурнымі” беларускімі сымфоніямі. Паводле трапных словаў Людмілы Яфімавай, “ён даў ім нядоўгае жыцьцё коштам свайго собскага жыцьця”. Аднак многія беларускія творы — у прыватнасьці, сымфоніі Зьмітра Смольскага — Яфімаву падабаліся, і ён быў іхным гарачым прапагандыстам. Музычная крытыка не рабіла розьніцы паміж гэтымі двума гатункамі беларускае музыкі.

На пачатку 1980-х гадоў калектыў зрабіў якасны скачок. Менавіта за Яфімавым і пры ягоным непасрэдным удзеле распачалася гастрольная кар’ера аркестру. Яфімаў здолеў карэнным чынам палепшыць рэпутацыю нашага сымфанічнага аркестру ўва ўсесаюзным маштабе, і ў ліпені 1984 году беларускія музыкі былі запрошаныя на гастролі ў Сочы. Гэтаму папярэднічала цэлая сэрыя пасьпяховых выступаў у розных гарадох Расеі. Перад аркестрам паступова адчыняліся дзьверы найлепшых канцэртных заляў былога СССР.

Зьнікаюць з памяці і імёны аркестрантаў, што працавалі зь Яфімавым, сярод якіх было нямала яскравых артыстычных індывідуальнасьцяў. Многія зь іх зьехалі на Захад. Ад былога дырэктара Беларускай філярмоніі Ўладзімера Ратабыльскага я даведалася, што цягам 1991—1997 гадоў з аркестру пайшлі прыкладна 50% музыкаў. Фактычна, традыцыя перапынілася. У гэткіх абставінах, як ніколі, ёсьць патрэба ў міце, які б вызначыў месца нашага сымфанічнага аркестру ў беларускім культурніцкім унівэрсуме. Гэткі міт можа вырасьці толькі на грунце рэальнай гісторыі. А пакуль аркестар мае праблемы з самаідэнтыфікацыяй. “Сымфанічны аркестар заўжды лічыўся адным зь перадавых расейскіх аркестраў, дзякуючы таму што шэраг выдатных майстроў спэцыяльна прыяжджалі ў Менск дзеля таго, каб дырыгаваць аркестрам…”, — чытаем мы на яго афіцыйным сайце[52].

www.belarustoday.com
culture/music/
s_orcestr/

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/04/30
[image]

Уладзіслаў Гарбацкі

Пераадоленьне гамафобіі

УЛАДЗІСЛАЎ ГАРБАЦКІ — палітоляг, выпускнік Эўрапейскага гуманітарнага ўніверсытэту. Жыве ў Менску.

Апошняя публікацыя ў часопісе — артыкул Разваг аб гейскім пытаньні (“ARCHE”-Андрэй Хадановіч).

Гартаючы прэсу, а таксама гойсаючы ў Інтэрнэце, увесь час сустракаеш артыкулы пра агрэсію супраць геяў. Безумоўна, пераконваешся ў тым, што ў беларускім грамадзтве адсутнічае нават прымітыўнае паняцьце талерантнасьці. Нават калі абсалютная балышыня беларусаў не прымае ўдзелу ў актах агрэсіі супраць геяў, іх абыякавасьць можна трактаваць як маўклівую згоду на праявы гвалту.

Таксама пераконваешся ў гераічнасьці беларускіх геяў! Сёньня быць чалавекам у Беларусі — справа складаная, тым больш чалавекам гомасэксуальным. Як бы сьмешна ні гучала, але ж сёньня быць геем у пэўнай ступені таксама цяжка, як быць шахцёрам. Сёньняшнія геі выконваюць надзвычай важную сацыяльную працу, хоць яна і ніяк ня ўлічваецца, не аплачваецца й не ўзнагароджваецца.

Яны штодзённа сутыкаюцца зь неразуменьнем, зьдзіўленьнем ці нават нянавісьцю. Проста кажучы, з гамафобіяй.

Стэрэатыпы гомасэксуальнасьці

Пачварны, карыкатурны вобраз гомасэксуала ў некаторых краінах пакрысе саступае месца бачаньню гомасэксуальнасьці

як нечага нармальнага, звычайнага. Сацыёлагі кажуць пра “баналізацыю гомасэксуальнасьці”. Гэта працэс, зь якім і ў якім жывуць заходнія эўрапейцы: ані пацалункі паміж мужчынамі, ані абдымкі жанчынаў у рэкляме, ані гомасэксуальнасьць пратэстанцкіх пастараў і пастарак, ані права пабрацца гамашлюбам больш не шакуюць галяндцаў ці швэдаў.

Геі абраныя мэрамі Парыжу і Бэрліна. На ТБ створаныя праграмы для гейнай і лесьбійскай публікі. Карацей, пачаўся працэс прызвычайваньня да гомасэксуальнасьці. Безумоўна, яшчэ далёка да поўнай і абсалютнай нармалізацыі, бо паралельна зь лібэралізацыяй нораваў паўстала праблема гамафобіі. Тым ня менш, назіраюцца гіганцкія зьмены ў галіне роўнасьці сэксуальнасьцяў. Калі ў XIX—XX стагодзьдзях чалавецтва турбавала гэтак званае “жаночае пытаньне”, роўнасьць паміж жанчынамі й мужчынамі, XXI стагодзьдзе ператвараецца ў арэну змаганьня за роўнасьць сэксуальнасьцяў.
Наша краіна пакуль не паказвае прыкметаў разбурэньня стэрэатыпаў і мітаў вакол гомасэксуальнасьці. Мэра-гея ці мэркі-лесьбіянкі пакуль няма ні ў Менску, ні, пагатоў, у Віцебску. Пакуль не відаць вясёлкавага сьцяга на гарадзкіх ратушах. Пакуль аніводны беларускі сьвятар не прызнаўся ўва ўласнай гомасэксуальнасьці. Таму нам яшчэ далёка да бурлівых зьменаў на шляху да нармалізацыі ці баналізацыі гомасэксуальнасьці.
Наадварот, як афіцыйны дыскурс, так і пабытовы (размовы на вуліцах, на кухні) насычаныя дзікунскімі стэрэатыпамі што да гомасэксуальнасьці. Іх нагэтулькі шмат, што апісаць і клясыфікаваць усе не выпадае. Паспрабуем, тым ня менш, зьвярнуць увагу на асноўныя.
1. Міт аб прымітыўнай сэксуальнасьці геяў і лесьбіянак
У беларускай мове гэты міт абслугоўвае своеасаблівы вобразны шэраг. Бальшыня маіх суразмоўнікаў зь Беларусі, зь якімі мне давялося размаўляць аб гейным пытаньні, лічаць, што мэта гомасэксуальнай асобы палягае ў “пошуку сракі” і/ці “пошуку чэлеса”. Адна кабета наагул заўважыла: “Барані божа выбраць у дэпутаты гомасэксуаліста, ён будзе толькі выглядаць прыгожых мужчынаў. Ён ня будзе думаць пра бюджэт, а толькі пра сраку”. Памылкова лічыцца, што гомасэксуальнасьць падобная да

жывёльнай сэксуальнасьці: хуткая, без пачуцьцяў, будуецца хіба толькі на часовым фізычным жаданьні. Ідэя рамантычнага гомасэксуальнага каханьня цалкам ігнаруецца.
Пэўныя пісьменьнікі малююць гомасэксуальнасьць выключна ў чорных фарбах. Іх творы навязваюць панятак “чорнай”, “вульгарнай” альбо “брутальнай” гомасэксуальнасьці. У Францыі гэтую плынь прадстаўляе Жан Жэнэ, у сучаснай Расеі — Яраслаў Магуцін. Безумоўна, гомасэксуальнасьць турмаў, прыбіральняў і спэцыяльных бараў мае месца, але ж застаецца адным з шматлікіх вобразаў сэксуальнасьці гэтак званай сэксуальнай меншыні.
Апошнім часам дасьледнікі гомасэксуальнасьці сьцьвярджаюць, што лад жыцьця велізарнай часткі геяў і лесьбіянак ня надта адрозьніваецца ад гетэрасэксуальнага: геі ці лесьбіянкі ствараюць пары, жывуць разам, дораць адзін аднаму/адна адной кветкі. І зусім не “шукаюць сракі”, калі зьвярнуцца да ўжытага выразу.

2. Гомасэксуальнасьць/садамія
У традыцыйным уяўленьні большыні гомасэксуальнасьць аўтаматычна асацыюецца з садаміяй — сэксуальнай практыкай анальнай пэнэтрацыі.
Насамрэч садамія займае далёка ня першае месца сярод сэксуальных практыкаў. Напрыклад, у Францыі толькі 36 % геяў рэгулярна практыкуюць садамію. Астатнія задавальняюцца лашчаньнямі, фэляцыяй, узаемнай мастурбацыяй ці г.зв. “сьцёгнавым сэксам”. У асноўным садамія зьяўляецца сэксуальнай практыкай паміж пастаяннымі партнэрамі.
Трэба сказаць, гетэрасэксуальныя асобы таксама досыць часта практыкуюць анальную пэнэтрацыю.
3. Гомасэксуальнасьць/пэдафілія
Міт пра тое, што “гальлівы гомасэксуаліст” шукае маладога хлапчука, таксама разьбіваецца дзякуючы дасьледаваньням псыхолягаў і крыміналістаў. Расейскі дасьледнік Ігар Кон адкідае наяўнасьць якой-кольвек сувязі між гомасэксуальнасьцю і пэдафіліяй. Згодна з дасьледаваньнямі Кона, абсалютная большыня пэдафілаў і пэдафілак — гетэрасэксуальныя асобы, якія адчуваюць сэксуальную цягу да дзяцей, непаўналетніх асобаў.
4. Гомасэксуальнасьць/Маньяцтва

Не навіна, што патэнцыйна ўсе гомасэксуалісты абвінавачваюцца ў вычварэньнях і памкненьні да гвалту. Амаль усе гучныя справы маньякаў, гвалтаўнікоў спараджаюць розгалас, пры гэтым амаль заўжды абмяркоўваецца гомасэксуальны матыў. Зноўку ж І. Кон, расейскі дасьледнік сэксуальнасьцяў, у артыкуле “Каго ж трэба баяцца ў цёмным пад’езьдзе?” на базе мэдычных дасьледаваньняў, праведзеных сярод арыштаваных гвалтаўнікоў, сьцьвярджае, што абсалютная бальшыня зь іх — гетэрасэксуалы.

5. Гомасэксуальнасьць/празэлітызм

Часта ствараецца вобраз гомасэксуаліста-місіянэра, які прапагандуе гомасэксуальны лад жыцьця, актыўна, часам нават змусам, супраць жаданьня асобы/асобаў, навязвае сябе ў партнэры. Досыць часта гэты стэрэатып трывала сядзіць у розумах нашых грамадзянаў. Абвінавачаньні геяў, і у меншай ступені, лесьбіянак у распаўсюджваньні каханьня і, галоўнае, сэксу з асобамі аднолькавага полу, у стварэньні суполак, клюбаў па інтарэсах, у выпрацоўцы вытанчаных мэханізмаў, каб загітаваць новых маладых і прыгожых асобаў на гомасэксуальны шлях, застаюцца пашыранымі і ўспрымаюцца вельмі сур’ёзна як на Захадзе, гэтак і на Ўсходзе.

У Францыі дэпутатка Крысьцін Бутэн лічыць, што легалізацыя гомасэксуальнасьці будзе азначаць легалізацыю празэлітызму. На Ўсходзе, у некаторых мусульманскіх краінах, адбываюцца суды, дзе гомасэксуалістаў абвінавачваюць акурат у папулярызацыі гомасэксуальнага ладу жыцьця.

6. Гомасэксуальнасьць/жаноцкасьць

Карыкатурны вобраз гомасэксуаліста — фэмінізаваны мужчына.

У XXI стагодзьдзі ў Беларусі ўсё яшчэ думаецца, што гомасэксуаліст — штучная жанчына. Што ён фарбуе вусны, вочы, носіць панчохі, жаноцкую бялізну. Што да сэксуальнасьці, дык тут няма сумневу, нібы гомасэксуаліст паводзіць сябе як жанчына. Як бачым, гэты стэрэатып моцна зьвязаны з паняткам сэксуальнага дэмакратызму наагул. Факт наяўнасьці двух полаў праектуе абмежаванае разуменьне сэксуальнасьцяў. Існуе стэрэатып, што роля мужчыны павінна быць актыўнаю, а жанчыны — пасіўнаю. Насамрэч усё куды складаней і інакш. Тым ня менш, гэтая “аксіёма” стварыла

вобраз фэмінізаванага гомасэксуаліста.
7. Гей-бацькоўства “шкоднае” дзецям
Зразумела, гей-бацькоўства ў Беларусі — панятак пакуль выключна віртуальны. Марыянэтачны парлямэнт не дэбатуе на гэтую тэму. Аднак гледачы ТБ і нават, у прыватнасьці, БТ даведваюцца пра падобную рэвалюцыю на Захадзе. Два гады таму, калі Францыя прыняла закон аб квазі-шлюбах для геяў і лесьбіянак, бальшыня маіх беларускіх знаёмых перажыла фрустрацыю. У адзін голас яны закрычалі: “Бедныя дзеткі!”
У заходніх краінах крытыкі гей-бацькоўства таксама спасылаюцца на неабходнасьць “абароны дзяцей”. Хрысьціянскія цэрквы змагаюцца супраць гей-бацькоўства, “шкоднага” для дзяцей.
Але ж ці “перадаецца” гомасэксуальнасьць сацыяльным шляхам? Амэрыканскія псыхолягі лічаць, што ў бальшыні дасьледаваных гомасэксуальных параў дзеці разьвіваюцца як гетэрасэксуальныя асобы.
Зрэшты, той факт, што абсалютная бальшыня сучасных геяў і лесьбіянак гадаваліся ў гетэрасэксуальных сем’ях, сьведчыць на карысьць тэзы пра мінімальны ўплыў бацькоў на сэксуальную арыентацыю дзяцей.
8. Гомасэксуальнасьць/алькагалізм, наркаманія
У адной вёсцы бабулька заявіла мне, што “храны” калі на рагах, дык сьпяць разам. Гомасэксуальнасьць, на яе думку, вынікае з алькагалізму: “П’яніцы сьпяць абы-дзе і абы з кім, от і робяць усякія дурасьці”. Таксама можна чуць, што наркаманія вядзе да гомасэксуальнасьці.
9. Гомасэксуальнасьць/СНІД
Але ж у Беларусі 80 % хворых — не гомасэксуальныя асобы, а наркаманы — сучасныя альбо ў мінулым.
Пры гэтым Міжнародная арганізацыя здароўя ў справаздачы за 2001 г. адзначыла, што апошнім часам назіраецца павелічэньне росту захворваньня сярод гетэрасэксуалаў.
Навука сапраўды амаль нічога дакладна ня ведае пра паходжаньне СНІДу, таму абвінавачаньне кшталту “Гэта празь іх (гомасэксуалістаў) на сьвет зьявіўся СНІД!” выглядае гістэрычным і крывадушным.

Гей-змаганьне і досьвед беларускага нацыянальнага руху
Гамафобія — не адзіная ў сваім родзе фобія. Гэтак, у краіне

нярэдка здараюцца выпадкі беларусафобіі. Гэтыя фобіі іншы раз накладаюцца. Напрыклад, можна ненавідзець “калгасную” беларускую мову й пры гэтым марыць аб вынішчэньні ўсіх “блакітных вычварэнцаў”. Але ж традыцыйна ў нашай краіне сутыкаешся значна часьцей зь беларусафобным дыскурсам, чым гамафобным. І ў гэтым першае адрозьненьне паміж двума гэтымі фэномэнамі: колькасна значная афішаваная прысутнасьць беларускамоўных у грамадзтве дэтэрмінуе іх вышэйшы статус з пункту гледжаньня артыкуляваньня праблемаў гэнай групы. Адмоўная рэакцыя на выкарыстаньне беларускай мовы трансьлюецца часьцей, чым адмоўная рэакцыя на гомасэксуальнасьць вось зь якой прычыны. Геі й лесьбіянкі пастаянна прысутнічаюць у грамадзтве, аднак ступень іх маргіналізацыі нагэтулькі высокая, што адкрыта праявіць сябе яны ня могуць. Калі беларусафобія — адкрытая фобія і ейныя праявы рэгіструюцца, дык гамафобія найчасьцей мае завэлюмаваную форму. Рэч у тым, што большасьць гомасэксуальных асобаў у Беларусі вымушаныя хаваць вонкавыя праявы сваёй тоеснасьці, дэманструючы афіцыйна атрыбуты “гетэрасэксуальнай нармальнасьці”, то бок вызначаную біялягічную прыналежнасьць (“мужчына”/“жанчына”).

Другое разыходжаньне паміж гамафобіяй і беларусафобіяй заключаецца ў асымэтрычным разьмеркаваньні “сілаў падтрымкі”, абароны ці проста прыхільнікаў гей-культуры й беларускай культуры адпаведна.

Не зважаючы на маштабнасьць, беларусафобія сутыкаецца з штодзённым супрацьстаяньнем з боку пэўных партыяў, рухаў, асобаў, якія змагаюцца супраць ейных праяваў і наступстваў. Беларусафобіі супрацьстаіць, урэшце, сама дзяржава, створаная беларусамі і ў якой беларуская мова мае афіцыйны статус. Гэткім чынам, беларусафобія ў пэўнай ступені абмежаваная ў распаўсюджваньні ў грамадзтве.

Гамафобія ж — паняцьце бязьмежнае, абстрактнае, бо ня мае юрыдычнай фармулёўкі. Пры гэтым ніводная партыя, ніводны палітык, ніводная палітыкеса не абараняюць правоў мясцовых геяў і лесьбіянак. Чаго няма на паперы — як бы няма й на яве. Менавіта праз гэтую “адсутнасьць”, “неіснаваньне” ў публічнай сфэры пытаньне гомасэксуальнасьці стыгматызуецца й асацыюецца ў бальшыні насельніцтва з хваробай, паталёгіяй.

Таму на адну дошку ў нас ставяць гомасэксуальнасьць і пэдафілію, гомасэксуальнасьць і алькагалізм.
Гамафобія і беларусафобія маюць розную дынаміку разьвіцьця, але іх яднае эфэкт маргінальнасьці.
Стыгматызацыя не вядзе аўтаматычна да разуменьня аднымі загнанасьці іншых. Наадварот, мы маем справу з парадаксальнай сытуацыяй, калі прадстаўнікі адной маргіналізаванай групы не разумеюць, не адчуваюць праблемаў прадстаўнікоў іншае маргіналізаванае групы.
Яшчэ Жан-Поль Сартр заўважыў парадокс у нежаданьні аднымі маргіналамі "адчуць" іншыя формы маргіналізацыі. У дадатак, часьцяком маргінал можа ператварыцца ў "аб'ект саманянавісьці": напрыклад, габрэй-антысэміт, гомасэксуаліст-гамафоб альбо жанчына, якая ненавідзіць жанчынаў.
Дыд'е Эрыбон, філёзаф і абаронца гейнай справы, у кнізе "Развагі аб гейным пытаньні" апісвае геяў і лесьбіянак, якія самі зьяўляюцца гамафобамі. Сымона дэ Бавуар, з свайго боку, у творы "Другі пол" цудоўна апісала адсутнасьць усялякай салідарнасьці паміж жанчынамі, асабліва багатымі і беднымі.
У Беларусі можна быць беларусам і беларусафобам, беларускамоўным і гамафобам, геем — што ўжо зьяўляецца стыгматай у нашым грамадзтве — і антысэмітам. На жаль, факт маргіналізаванасьці не заўжды робіць маргінала больш гуманным і адкрытым для зразуменьня маргіналізацыі іншых.

Каб ня быць галаслоўнымі, узгадаем некаторыя беларускія прыклады "падвойнай маргіналізаванасьці". Гэтак, напрыклад, улетку 2001 году Зянон Пазьняк адзначыў, што Захад зусім не цікавіцца беларускай культурай і дасылае ў Менск адкіды сваёй цывілізацыі — прафэсараў фэміністак і гомасэксуалістаў (!) [1]. Другі прыклад — заява моладзевага форуму, які не дазволіў асацыяцыі геяў і лесьбіянак "Лямбда" ўдзельнічаць у акцыі.
Зрэшты, мясцовыя геі таксама хварэюць на аднабаковасьць, ці "двайную маргіналізаванасьць". Як заўважае ў сваім эсэ Эдвард Тарлецкі, "шмат чытачоў часопісу "Forum Жаночы" не задаволеныя беларускаю мовай пэўных артыкулаў і аддаюць перавагу расейскамоўнаму кантакту".
Аналізуючы прынцыповае непаразуменьне паміж беларускамоўнымі й гомасэксуальнымі асобамі, прыходзіш да

[1] http://tbm.org.by/bak/main_topics.html/ "Хаявень 2001"

высновы, што людзі — вельмі рацыянальныя істоты, якія не жадаюць уваходзіць у дэталі праблемаў іншых, тым больш калі размова ідзе аб маргіналізаваных групах. Чужыя стыгматы палохаюць. Беларускамоўныя не жадаюць разумець, у чым сутнасьць праблемаў “сэксуальнай меншыні”, у сваю чаргу, геі й лесьбіянкі ў пэўных сытуацыях гідзяцца чытаць і чуць беларускую мову — маргіналізаваную гетэрасэксуальнай балышынёй іхнага атачэньня.

Нягледзячы на цяперашні, здавалася б, безнадзейны стан гейнага руху ў Беларусі, у будучыні ён мог бы займець магутнага хаўрусьніка ў барацьбе за свае правы. На Захадзе адстойваньне прынцыпаў сацыяльнай, нацыянальнай і полавай роўнасьці знаходзіцца ў цэнтры ўвагі партый левага кірунку. Артыкуляваньне інтарэсаў меншасных нацыянальных супольнасьцяў, менш прывілеяваных сацыяльных групаў і адначасна іншых меншасьцяў, у тым ліку геяў, як гэта робяць левыя на Захадзе, можа прывесьці да пэўных палітычных перамог. Тут трэба адзначыць асаблівую ролю сацыял-дэмакратаў, што традыцыйна лічацца першымі абаронцамі геяў і лесьбіянак.

У Беларусі сацыял-дэмакраты покуль кволыя, каб пакласьці ў кошык уласных праблемаў турботы гэтак званай “сэксуальнай меншыні”. Таму партыі маўчаць і ня робяць захадаў для падтрымкі мясцовых гомасэксуалістаў, хаця, магчыма, і “спачуваюць” з нагоды дыскрымінацыі актывістаў гей-руху краіны.

Якім шляхам яшчэ можна палепшыць лёс сэксуальнай меншыні?

Толькі праз улучэньне іх патрабаваньняў, пакуль сацыяльна-культурных, у праграмы іншых рухаў і партый — больш пасьпяховых у палітыцы. Гэта — першы крок да самасьцьверджаньня ў публічнай сфэры. У нас пакуль размова ідзе толькі пра сацыяльна-культурныя патрабаваньні (прызнаньне, недыскрымінацыя, рэабілітацыя), тады як у краінах Заходняй Эўропы геі й лесьбіянкі патрабуюць пашырэньня палітычна-эканамічных, а таксама рэлігійных правоў.

Але ж зусім неабавязкова глядзець увесь час на Захад. Дзеля легітымізацыі й пасьпяховай заваёвы публічнай сфэры гей-рух

можа карыстацца досьведам беларускага нацыянальнага руху. Гэты рух выпрацаваў салідную тэарэтычную, а таксама практычную базу для легітымізацыі беларускай культуры. Безьліч пісьменьнікаў і пісьменьніц стварылі тэксты, якія сёньня замінаюць афіцыйным беларусафобным асобам ануляваць беларускую культуру наагул. Немагчыма сьцерці з памяці энтузіястаў беларускай культуры, хай нават для кагосьці яны існуюць толькі ў назвах вуліцаў, плошчаў ці станцыяў мэтро.

Зразумела, беларускі гомасэксуальны рух ня мае гэткай маштабнасьці. Эдвард Тарлецкі — адзіны энтузіяст мясцовага гей-руху, дый тое ён вядомы амаль выключна ў Менску. Бальшыня нашых гуманітарных інтэлектуалаў у асноўным прадукуюць гетэрасэксуальныя каштоўнасьці. Маленькі твор Адама Глёбуса “Гомік”, безумоўна, ня робіць рэвалюцыі. Наагул, тэма гомасэксуальнасьці амаль адсутнічае ў беларускай літаратуры; нават калі й узгадваецца, дык усё з чорным адценьнем (прыклад — тое ж апавяданьне “Гомік” Глёбуса альбо “Ваўчыная яма” Васіля Быкава, дзе паміж іншым згадваецца тэма фізычнага гвалту ў войску).

Вось і тупік: адсутнічае тэма гомасэксуальнасьці ў нашай літаратуры, мастацтве. Як кажа адзін мой знаёмы: “Пачакай, пакуль не да гомасэксуальнасьці. Трэба сьпярша з мовай разабрацца!” Быццам змаганьне за правы геяў і лесьбіянак аўтаматычна выключае барацьбу на беларускамоўным фронце. Здаецца, усё можна рабіць блёкава, тым больш што гомасэксуалісты складаюць немалую частку нашага грамадзтва. Хай літаратура маўчыць пра гэта, хай публічныя асобы сьцьвярджаюць, што “гомасэксуальнасьць не ўласьцівая беларусам”, гамафобія якраз сьведчыць пра адваротную тэндэнцыю.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**

майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/05/02
[image]

Анатоль Сідарэвіч

Правобраз Акту 25 Сакавіка

Цяпер, здаецца, і менскія міліцыянты ведаюць, што адбылося 25 Сакавіка 1918 году. Нават афіцыйныя часопісы спрабуюць давесьці ўладам пераемнасьць паміж Актам 25 Сакавіка і Дэкларацыяй аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі 27 ліпеня 1990 г., якая набыла канстытуцыйную моц 25 жніўня 1991 году[1]. Бо як была выведзеная Беларусь 25 Сакавіка 1918 году са складу Расеі, так ужо ніколі й не вярнулася. Калі бальшавікі ў сьнежні селі ў Менску, Урад БНР знаходзіўся ў Вільні, потым у Горадні. БССР і Літбел не лічыліся складовымі часткамі Расеі, а паралельна ім працягваў дзейнасьць Урад БНР. Ён працягваў працаваць і тады, калі Літбел фактычна перастала існаваць. У канцы 1919 году БНР атрымала ажно два ўрады, але абодва яны не цураліся Акту 25 Сакавіка. Нарэшце 31 ліпеня 1920 году, калі ўрад Вацлава Ластоўскага апынуўся за мяжою, а Найвышэйшая Рада БНР практычна распалася, была абнародаваная Дэклярацыя аб абвяшчэньні незалежнасьці Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі Беларусі. Гэтую рэспубліку прызнала Нямеччына, а яе паўнамоцным прадстаўніком (і прадстаўніком РСФСР) у Бэрліне стаўся бальшавіцкі дзяяч Мікалай Красьцінскі (у 1938

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ (нар. 1948) — філёзаф, літаратуразнаўца. Сталы аўтар «ARCHE». Апошняя публікацыя ў часопісе — артыкул Вечна жывы Купала («ARCHE», №3 02).

Тэг.: Юхо Я. Вялікая дэмакратычная агульнаеўрапейская

годзе яго асудзяць на расстрэл разам зь Мікалаем Бухарыным і былым першым сакратаром ЦК КП(б)Б Васілём Шаранговічам)[1]. Паўпрэд ССРБ зьмяніў у Бэрліне дыпляматычную місію БНР. Летась пасьля скандальнае прапановы прэзыдэнта Беларусі Лукашэнка на ўвесь сьвет заявіў, што нават Сталін не дадумаўся да такога — уключыць Беларусь у склад Расеі. І Сталін, і нават Ленін дадумваліся да такога, але Акт 25 Сакавіка, імкненьне народу хоць да якое-небудзь самастойнасьці Беларусі і міжнародныя абставіны не давалі бальшавікам вярнуць Беларусь у Расею. Пакінем заяву Лукашэнкі на сумленьні тае школы, у якой ён атрымаў атэстат аб сярэдняй адукацыі, і Магілёўскага пэдінстытуту, дзе ён атрымаў дыплём настаўніка гісторыі.

Сталася гэтак, што, засяродзіўшыся на гісторыі Ўсебеларускага зьезду ды дзейнасьці абранае ім Рады і яе Выканаўчага камітэту, мы неяк забываем пра тую частку Беларусі, што да 18 лютага 1918 году была аддзеленая ад рэшты беларускіх земляў лініяй фронту (“раён старое акупацыі”; ува Ўсевалада Ігнатоўскага сустракаецца назоў “1-я акупацыя”[2]). Там таксама адбываліся немалаважныя падзеі. Там распрацоўваліся канцэпцыі дзяржаўнага быту Беларусі (Канфэдэрацыя Вялікага Княства Літоўскага, Злучаныя Штаты ад Балтыйскага да Чорнага мора, Незалежная і Непадзельная Беларусь). Там дзейнічаў нелегальны Беларускі Народны Камітэт (БНК), там у верасьні 1917 году адбылася канфэрэнцыя БНК, Беларускае сацыял-дэмакратычнае работніцкае групы (БСДРГ) і Віленскага камітэту Беларускае сацыялістычнае Грамады (БСГ).

Зь верасьня 1917 году пачалася падрыхтоўка Беларускае канфэрэнцыі, якая прайшла 25—27 студзеня ў Вільні й абрала Віленскую Беларускую Раду (ВБР).

Гістарычны часопіс. 2002. №6.

Частку дакумэнтаў, датычных гэтых падзеяў і інстытуцыяў, я ў свой час апублікаваў[3]. Дзіўна, але дасюль нанава не быў надрукаваны такі цікавы дакумэнт, як пастанова ад 18 лютага 1918 году. Няма яго і ў кнізе Андрэя Зязюлі “Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі” (Мінск, 1993), і ў зборніку дакумэнтаў і матэрыялаў, сабраных Янам Касяком пад кіраўніцтвам Радаслава Астроўскага.

[2] **Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху / Калект. праца пад агульнай рэд. А.Сташэўскага, З.Жылуновіча і У.Ігнатоўскага з дапамогай А.Смоліча, С.Некрашэвіча і Я.Пятровіча. Менск, 1924. С.201.**

[3] **Свабода. 1990. №2; Літаратура і мастацтва. 1990. 28 і 30 лістапада.**

“За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі” (Лёндан, 1960), і ў самай новай — зь вядомых мне — кнізе “История Беларуси в документах и материалах” Ігара Кузьняцова і Валянціна Мазца (Менск, 2000). Дакумэнт гэты рэдка згадваецца ў літаратуры. Тым больш істотна, што на яго зьвяртаў увагу ксёндз Адам Станкевіч[4]. Праўда, ён цытуе гэты дакумэнт усьлед за У. Ігнатоўскім, але сам праф. Ігнатоўскі некарэктны — у дадзеным выпадку — у цытаваньні й, апрача таго, не паказвае, зь якое крыніцы ўзятая цытата. Насамрэч Станкевіч у артыкуле “Вялікі Кастрычнік на Беларусі (X. 1917 — VII. 1920)” утрымліваецца пераказ пастановы ВБР, а не цытаваньне[5]. Акрамя таго, ксёндз Станкевіч даў памылковую 19-м лютага 1918 году.

Пастанова ВБР ад 18 лютага 1918 году ў пэўнай ступені была правобразам Акту 25 Сакавіка: у ёй упершыню абвяшчалася аб разрыве дзяржаўных сувязяў з Расеяй. Яна прыняла ўдзел за сем тыдняў да таго, як была абвешчаная Трэцяя Устаўная Грамата Рады БНР і амаль за тры тыдні да абвяшчэньня Рэспублікі. Ёй папярэднічалі вельмі важныя падзеі, якія Для разуменьня яе трэба мець на ўвазе геапалітычныя і геаэканамічныя погляды аўтараў. Дзеячы БСДРП, якія былі лідэрамі беларускага руху ў “раёне старой акупацыі”, імкнулі намеру абвяшчаць незалежнасьць беларускіх земляў, тых, што ў 1915 годзе апынуліся пад немцамі, і ўсяе Беларусі, наагул. Канцэпцыі Канфэдэрацыі Вялікага Княства Літоўскага і Злучаных Штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мора, якія гэта дэманструюць. Антон Луцкевіч ды іншыя вілі беларускія дзеячы не маглі ўявіць Беларусь, яе гісторыю бяз выхаду да мора. Менавіта гэтым тлумачацца іхныя заклінаньні супраць нацыяналізму — літоўскага, жыдоўскага і польскага — і заклікі да краёвага патрыятызму, да супрацоўніцтва народаў Беларуска-Літоўскага краю.

БНК жадаў, каб у будучай беларуска-літоўскай дзяржаве былі злучаныя акупаваныя немцамі землі Беларусі й Літвы, пра якія імпэрскі канцлер Тэабальд фон Бэтман-Гольвэг заявіў, што яны ніколі ня будуць вернутыя ў склад Расеі.

Важнае значэньне для наступных падзеяў мела і памылка, учыненая А. Луцкевічам на пачатку сакавіка 1917 году. Пішучы ва ўласнаручных паказаньнях пра тое, што ў лютым 1917 году ў Стакгольме мелася адбыцца канфэрэнцыя прыгнечаных

[4] **Станкевіч А. Да гісторыі беларускага пытаньня: 70 год змаганьня за вызваленьня: 1917–1987.** Нью-Йорк: Беларускі інстытут навукі і мастацтва, 1987. С. 11.

[5] **Мышэцкі Ю. Нацыянальна-вызвольны рух у Заходняй Беларусі ў 1917–1939 гг.** Менск: Беларускі кнігазбор, 1994. С. 7.

народаў, ён паведамляў, што зь Вільні ў Бэрлін выехалі трое літоўцаў — д-р Ю. Шаўліс, Антанас Сьмятона, інжынэр Сьцяпонас Кайрыс (былы муж Цёткі) — і ён сам. У Бэрлін ехалі таму, што беларуска-літоўская дэлегацыя “да выезду ў Стакгольм павінна была мець у пытаньні пра будучыню нашага краю размову зь нямецкім канцлерам”. Далей чытаем: “Але пакуль мы чакалі гэтае сустрэчы й рыхтаваліся да зьезду (канфэрэнцыі ў Стакгольме — **А. С.**), здарылася непрадбачаная падзея: у Расеі адбылася рэвалюцыя. Немцы ня бачылі ўжо патрэбы ў зьезьдзе, і ён быў адменены. Я вырашыў неадкладна вяртацца ў Вільню, літоўцы — празь некалькі дзён. Перад ад’ездам я напісаў абшырную дакладную запіску на тэму пра неабходнасьць у меркаванай “Літве” забясьпечыць беларусам парытэтныя правы зь літоўцамі й аддаў яе ў рукі барону Ропу для перадачы канцлеру. Ня ведаю, ці было гэта выканана, ведаю толькі, што, прыехаўшы ў Вільню, я зь нямецкіх газэтаў даведаўся, што назаўтра пасьля майго ад’езду з Бэрліна літоўцы былі прынятыя канцлерам адны й пры гэтым прапанавалі канкрэтны праект адносна будаўніцтва “Літвы”. Як пазьней высьветлілася, ён прадугледжваў незалежную Літву ў такіх межах, што літоўцы мелі колькасную перавагу над беларусамі ды іншымі нацыянальнасьцямі разам. Сталіцай павінна была стаць Вільня. Прапаноўвалася стварэньне ў Вільні краёвага органу ўлады “Тарыбы” (па-літоўску — Рады) у складзе 20 літоўцаў і па адным прадстаўніку беларусаў, жыдоў і палякаў. Называлі кандыдата на велікакняскі пасад Літвы: баварскага прынца Ураха (каталіка)”[6].

Дзеля таго што беларусы знаходзіліся ў палоне стараніяў геаэканамічных і геапалітычных канцэпцыяў і шляхоў, Луцкевіч не дачакаўся аўдыенцыі ў райсхканцлера, беларускае даводзілася даганяць літоўцаў, якія на першае месца ў сваёй канцэпцыю нацыянальнае дзяржавы. 18—23 верасьня ў Вільні адбылася Літоўская канфэрэнцыя, якая абрала Тарыбу, на з А. Сьмятонам. Беларусы такую канфэрэнцыю праігнаравалі, 27 студзеня 1918 году 11 сьнежня 1917 году Тарыба прыняла дэклярацыю, у якой абвясьціла пра “аднаўленьне Літоўскае дзяржавы з сталіцаю Вільняю” і пра “сяброўскія дзяржаўных адносінаў (Літоўскай дзяржавы — з народамі”[7]. Тарыба зьвярнулася да Нямеччыны і пра

[6] **Антон Луцкевіч. Матэрыялы следства ў справе ЦК КПБ. Падгот. тэксту, прадмовы і камэнтарыі В. Мяцельскага, А. Смалянчука і А. Гесь.**

падтрымку і абарону”. Літоўцам спрыяў і аб’ектыўны чыньнік: пад нямецкай акупацыяй знаходзіліся ўсе іх землі. Калі 18 студзеня 1918 году Нямеччына запатрабавала ад бальшавікоў перадаць ёй Літву, часткі Беларусі, Латвіі, Эстоніі, Украіны й Польшчы, літоўцы зразумелі: момант прабіў. Пасьля працяглых нарадаў Тарыба прыняла 16 лютага (у дзень пачатку нямецкага наступу на ўсход) другі акт пра незалежнасьць. Віленская Беларуская Рада не магла прыняць рашэньня на ўсю Беларусь. Дзеячам ВБР ужо было вядома пра Ўсебеларускі зьезд і яго разгон, пра паездку беларускае дэлегацыі ў Маскву на перамовы ў Берасьце. Але сувязі ды надзейнае інфармацыйнае дзейнасьць Выканаўчага Камітэту Рады Ўсебеларускага зьезду не было. Сябры ВБР ведалі, што палякі вядуць торг зь немцамі. Не спадзеючыся зброяй адваяваць у іх паўночныя і заходнія землі (умоўна называныя Познаньшчынаю), палякі прапаноўвалі кампэнсаваць гэтыя страты прылучэньнем да Каралеўства Польскага заходніх паветаў Гарадзенскай губэрні (Беластоцкага, Бельскага і Сакольскага). Квапіліся яны й на літоўскія землі. З другога боку, у Вільню дайшлі зьвесткі, што польскі корпус пад камандаваньнем генэрала Юзафа Доўбар-Мусьніцкага кантралюе значную частку ўсходнебеларускіх земляў і дэкляруе далучыць іх да Польшчы. Акрамя таго, было вядома, што ў сьнежні 1917 году Вялікая Брытанія і Францыя, спадзеючыся хуткае перамогі над Нямеччынай і не прызнаючы бальшавіцкага ўраду ў былой Расейскай імпэрыі, падзялілі яе тэрыторыю на зоны будучых уплываў. Польшча карысталася тайнаю і яўнаю падтрымкаю Антанты.

Рыхтуючы да паседжаньня ВБР праект пастановы, А. Луцкевіч быў у даволі складаным становішчы. Ён мусіў часткова паўтараць хады літоўцаў, якія 11 сьнежня 1917 году выказалі выключную ляяльнасьць да немцаў ды абяцалі пад імем Міндоўга II пасадзіць каралём прынца Ураха зь Вюртэмбэргу. Хоць у акце 16 лютага Нямеччына спэцыяльна ня згадвалася, літоўскія дыпляматы заяўлялі, што дэклярацыя 11 сьнежня не губляе сілы. (Заўважым у дужках: такая тактыка прынесла плён.) Пішучы праект пастановы, Луцкевіч прапанаваў разарваць дзяржаўныя адносіны з Расеяй, аднак і не ўпісаў пункту пра абвяшчэньне незалежнасьці Беларусі — ён толькі

Минск, 1997. С. 40.

7 Новый взгляд на историю Литвы. Краткий курс. 1991. С. 58.

прапанаваў заклікаць дзяржавы, якія прызнаюць прынцып самавызначэньня народаў, “а ў першы чарод” Нямеччыну, “аказаць помач у справе адбудовы дзяржаўнай незалежнасьці калішняга Літоўска-Беларускага гасударства (Вялікага Княства Літоўскага), не ўзіраючыся ў цяперашні разьдзел яго лініяй фронту”[8].

Такім чынам, жадаючы, каб беларускія раёны “старога” і “новае” нямецкае акупацыі былі аб’яднаныя ў адно, ня бачачы шляхоў жыцьця беларусаў у адзіным дзяржаўным арганізьме разам ці з Польшчаю, Луцкевіч па-ранейшаму не адмаўляўся ад ідэі Канфэдэрацыі Вялікага Княства Літоўскага, канфэдэрацыі Беларусі й Літвы. Ён ня можа ўявіць Беларусі бяз выхаду да мора.

...А. Луцкевіч ды іншыя сябры ВБР прыехалі ў Менск 23 сакавіка 1918 году. Заходнія і ўсходнія беларусы нарэшце сустрэліся. У той самы дзень Нямеччына прызнала незалежнасьць Літвы. 25 Сакавіка будзе прынятая Акт і Ўстаўная Грамата. Беларусы дасьпелі да абвяшчэньня дзяржаўнае незалежнасьці. Хто ведае, ці быў бы гэты самы акт, калі б сустрэча віленскіх і менскіх дзеячоў адбылася, скажам, 17 лютага 1918 году? Несумненна адно: Інтэрвэнцыя ад 18 лютага была першым крокам да Акту 25 Сакавіка, які быў распрацаваны фракцыяй БСГ у Радзе Рэспублікі і ўзгоднены “з групай А. Луцкевіча”[9], гэта значыць з прадстаўнікамі ВБР. Тэкст гэтага дакумэнту перадрукоўваецца з газэты “Вольная Беларусь” за 28 красавіка 1918 году.

Мае сэнс трохі запыніцца на постацях тых, хто падпісаў пастанову ВБР (трэба адзначыць, што першыя пяць подпісаў належаць сябрам прэзыдыюму Рады).

[8] Думка пра тое, што ў складзе Беларускай Літоўскай канфэдэрацыі ўсе беларускія землі, укляпатам. На яе фармальнае “Сувязі Незалежнасьці і Нетадоеальнасьці Беларусі”.

[9] Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции: Совместное

российско-белорусское исследование. В 3 ч. Ч.2-я: У истоков противостояния: Материалы и документы по истории общественных движений и политических партий Республики Беларусь. Гомель, 1992. С.113.

Зьвесткі пра А. Луцкевіча, ксяндза Ўладзіслава Талочку, Івана Луцкевіча, Яна Станкевіча і Дамініка Сямашку цяпер агульнадаступныя — яны зьмешчаныя ў адпаведных артыкулах Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі, унівэрсальнай Беларускай энцыкляпэдыі ў 18 тамох, энцыкляпэдычным даведніку “Беларусь” (1995) ды іншых даведніках. Адразу скажу, што ня маю ніякіх зьвестак пра Дульку, Мацея Радзевіча (Радзевіч) і М. Перскага. Магу толькі выказаць гіпотэзу, што Радзевіч (Родзевіч) мае нейкае дачыненьне да Леапольда Родзевіча.

Протаярэй Міхал Галянкевіч нарадзіўся ці не ў 1852 годзе ў Бельскім павеце, быў сярод тых 3-4 праваслаўных сьвятароў, якія засталіся ў раёне старое акупацыі. Браў удзел у стварэньні Беларускага таварыства помачы ахвярам вайны, Беларускае канфэрэнцыі. Як вынікае з нэкралёгу, напісанага А. Луцкевічам, памёр на 73-м годзе жыцьця ў Вільні, пахаваны 13 лістапада 1924 году[11].

Паведамленьне пра сьмерць селяніна в. Шасткі Віленскага павету Казімера Фалькевіча 28 верасьня 1922 году надрукавала газэта «Беларускі Звон». Ягонае прозьвішча можна сустрэць у працы А. Луцкевіча “Польская акупацыя ў Беларусі” (1920). Памяці К. Фалькевіча прысьвечаны нэкралёг “Дзядзька Фалькевіч”, напісаны А. Луцкевічам пад псэўданімам

[10] Сідарэвіч А. і Шах Л. Літаратура і мастацтва. 1990. 30 ліст.

[11] Сялянская Праўда. 1924. 20 лістапада.

“Яго таварыш”[12]. Пазьней у заходнебеларускім друкаванні, матэрыялы, падпісаныя псэўданімам К. Фалькевіч, крыптанімамі К. Ф., К. Ф-віч. Гэта А. Луцкевіч вырашыў унесьмяроціць імя свайго таварыша.

Імя Язэпа Туркевіча, як і Язэпа Салаўя, сустракаецца ў працах А. Луцкевіча “Дваццацілецьце Беларускае Сацыялістычнае Грамады”[13] і “За дваццаць пяць гадоў”, у пратаколах БНК, сябрам якога ён быў. Нарадзіўся ён у 1876 годзе ў в. Падбродзьдзе Сьвянцянскага павету. Вывучыўся на настаўніка, уцягнуўся ў работніцкі рух у Вільні. У 1894 годзе ён быў першы раз зьняволены. У часе першай расейскай рэвалюцыі ён актыўны у БСГ, выступаў на мітынгах па-беларуску. Падчас нямецкае акупацыі — адзін з заснавальнікаў работніцкага клюбу, работніцкае страўні й работніцкага каапэратыву ў Вільні, старшыня прафсаюзу будаўнікоў, сябар Цэнтральнага Бюро работніцкіх прафсаюзаў (год быў старшынём і намесьнікам старшыні Цэнтральнага Бюро). Уваходзіў у БСДРГ і БНК.

Як сябар ВБР у сакавіку 1918 году разам з Луцкевічам і Я. Станкевічам выяжджаў у Менск. Быў кааптаваны ў Раду БНР. Адзін з тых, хто прымаў Акт 25 Сакавіка. У 1922 годзе намесьнік старшыні прафсаюзу будаўнікоў Я. Туркевіч быў кандыдатам у паслы на Сойм Польскае Рэспублікі ад Беларускага Цэнтральнага Выбарчага Камітэту[14]. Быў ён і рэдактарам заходнебеларускіх газэтаў.

Я. Салавей, як і Я. Туркевіч, належаў да работніцкае клясы, быў прафсаюзным актывістам, сябрам БСГ і БСДРГ, БНК. Зь лета 1917 году падпісваў у друк газэту «Гоман». Рэдагаваў заходнебеларускія газэты. Памёр у 1926 годзе.

Як пісаў А. Луцкевіч, Туркевіч і Салавей “зышлі з даўнейшага свайго шляху і выракліся старых ідэалаў”[15]. Пра Салаўя вядома, што ён уваходзіў у палянафільскую Часовую Беларускую Раду Арсеня Паўлюкевіча, створаную ў 1924 годзе ў Вільні.

[12] Беларускі Звон. 1922. 7 кастрычніка.

[13] Беларуская Ніва. 1925. 5 сьнежня.

[14] Беларускі Звон. 1922. 21 кастрычніка.

[15] **Луцкевіч Ант. За дваццаць пяць гадоў: Успаміны аб працы першых беларускіх арганізацыяў: Беларуская рэвалюцыйная Грамада, Беларуская сацыялістычная Грамада. Менск, 1991. С.20.**

Ля вытокаў беларускае дыпляматыі

У складзеным Сяргеем Шупам першым томе “Архіваў БНР”, у першым выпуску гістарычнага альманаху «Адраджэньне» (Менск, 1995), у іншых зборніках друкуецца нямала дакумэнтаў, датычных замежнапалітычнае дзейнасьці БНР. Аднак нават пасьля абвяшчэньня БНР замежнапалітычнаю дзейнасьцю займалася і ВБР, пра што сьведчыць дакумэнт №2 у гэтай падборцы.

Пра тое, што ў немцаў не было намеру вяртаць Расеі раён старое акупацыі, я пісаў даўней. Яшчэ ў канцы 1917 году яны на поўным сур’ёзе разглядалі магчымасьць улучэньня заходніх беларускіх земляў у склад райху, пра што сьведчыць А. Луцкевіч[16]. У гэтым разе Нямеччына магла б свабодна распараджацца нашымі тэрыторыямі, у тым ліку прапанаваць Польшчы кампэнсацыю за этнаграфічна польскія землі, якія былі пад уладаю Прусіі. А каб беларусы ня мелі прэтэнзіяў, нямецкія ўлады намагаліся не дапусьціць скліканьня беларускае канфэрэнцыі й стварэньня Віленскае Беларускае Рады[17]. І ўсё ж канфэрэнцыя адбылася, і была прынятая і такая рэзалюцыя:

[16] Гл.: ***Жыццё і праца Івана Луцкевіча*** // ***Памяці Івана Луцкевіча*** ***першыя ўгодкі смерьці яго***

“Канфэрэнцыя пратэстуе проці дамаганьня палякаў прыпушчэньня да Польшчы Беларускія землі — або хаця бы часьцяў (Беласточчыну ці інш.) і проці ўсялякіх іншых планаў, якія ідуць Беларускай зямлёй, скуль бы яны ні выходзілі. Канфэрэнцыя пераконана, што га́леньне польскіх паноў і польскага ўраду на Беларусь, каб паняволіць Беларускі народ і захапіць беларускую зямлю для польскай калянізацыі, будзе з агідай спаткана ўсім цывілізаваным сьветам”[17].

Пытаньне аб торгу беларускімі землямі закранута і ў пастанове ВБР ад 18 лютага 1918 году. Тут перадрукоўваецца пратэст, накіраваны прэзыдыюмам ВБР райхсканцлеру, старшыні Райхстагу і генэралу Эрыху Людэндорфу, які ў той час займаў пасаду першага генэрал-кватэрмайстра штабу вышэйшага камандаваньня і фактычна кіраваў узброенымі сіламі Нямеччыны.

Упершыню гэты дакумэнт апублікаваны ў газэце «Вольная Беларусь» 14 красавіка 1918 году.

Канстытуцыйны акт БНР

Трэці ў гэтай падборцы дакумэнт, які не дачакаўся паўторнае публікацыі, — Статут Рады Беларускае Народнае Рэспублікі. Ён быў апублікаваны ў газэце «Гоман» 29 кастрычніка 1918 году. Мяркуючы па часе публікацыі, гэта тая самая Часовая канстытуцыя БНР, пра якую ёсьць згадкі ў некаторых працах і прыняцьце якое датуецца 11-м кастрычніка 1918 году[19].

Зьмест гэтага акту сьведчыць: калі ў сакавіку земствы й гарады галасавалі супраць Трэцяе Ўстаўнае Граматы, то досьвед вясны й лета 1918 году — перадусім падзеі на тэрыторыі былой ВКЛ — прымусіў многія палітычныя і сацыяльныя групы павярнуць на дзейнасьць Рады БНР. Узьнікла неабходнасьць улічваць іх прадстаўнітва ў Радзе.

Канстытуцыйны акт БНР адпавядае дэмакратычнаму духу Ўстаўных Граматаў. Прадстаўніцтва ў Радзе надавалася практычна ўсім сацыяльным, рэлігійным, прафэсійным, грамадзкім і палітычным групам. “Лишенцев” у БНР не было.

ВБР і Літоўская Тарыба: лістапад 1918 году

(20. VIII. 1919 — 20. VIII. 1920). Вільня, 1920. С.23.

17 Тамсама.

18 Mialeška J. [Luckievič A.] Biełaruś za Poznanščynu. // Homan. 1919. 1 lutaha.

19 Энцыклапэдыя гісторыі Беларусі. Т.1. С.386.

Мы ведаем, што, калі пасьля Лістападаўскае рэвалюцыі ў Нямеччыне Берасьцейскі мір быў дэнансаваны і Чырвоная Армія пачала наступ на Захад, Урад БНР пераехаў 3 сьнежня 1918 году ў Вільню. А перад гэтым ВБР правяла з Тарыбаю перамовы і дасягнула зь ёю 27 лістапада дамоўленасьцяў, на моцы якіх сталіся магчымыя кааптацыя прадстаўнікоў ВБР у склад Тарыбы і стварэньне Міністэрства беларускіх спраў Літвы. У склад Тарыбы ўвайшлі: Вацлаў Ластоўскі, Іван Луцкевіч, Ян Станкевіч, Дамінік Сямашка, ксёндз Уладзіслаў Талочка і Казімер Фалькевіч. Міністрам беларускіх спраў стаў Язэп Варонка. Пад яго кантроль пераходзіла тэрыторыя Аўгустоўскага, Ашмянскага, Беластоцкага, Бельскага, Вялейскага, Гарадзенскага, Лідзкага і Сакольскага паветаў, на якой жылі 1,9 млн. чалавек. Меркавалася, што гэта будзе аўтаномная тэрыторыя зь беларускаю ўрадоваю моваю. Акрамя таго, было прадугледжана, што беларусы будуць мець чвэрць месцаў ва Ўрадзе Літвы.

Перамовы з ВБР Тарыба спрабавала наладзіць яшчэ ў красавіку 1918 году[20], аднак беларускі бок лічыў, што яны будуць сэнс, калі іх мэтаю будзе стварэньне Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Літоўцы ж хацелі весьці гаворку толькі пра землі, якія ім перадавала пад кантроль Нямеччына, і разумелі, што самі наладзіць цывільную адміністрацыю на гэтых тэрыторыях ня змогуць. Апрача таго, яны мелі патрэбу ў саюзьніках супраць палякаў.

Дамоўленасьць паміж ВБР і Тарыбаю стала магчымасьцю таго, як зрабілася відавочна, што над Беларусяй навісла пагроза бальшавіцкае ці польскае акупацыі. Ім меркаваць, што да Лістападаўскае рэвалюцыі, якая сталася ня толькі дэнансаваньне Берасьцейскага міру, рэальная незалежнасьць Польшчы (11 лістапада), перамовы аб перамовах, пра што і сьведчыць дакумэнт № 4, першапачаткова апублікаваны ў газэце “Гоман” 8 сьнежня 1918 году — якраз напярэдадні рэвалюцыі ў Нямеччыне[21]. У гэтай рэзалюцыі заўважна тое, што ВБР схільна канцэнтраваць першапачатковае ідэі канфэдэрацыі Беларусі й Літвы, г. зн. стварэньня супольнае дзяржавы раёну першае акупацыі Беларусі й Літвы. Тут было відавочнае імкненьне засьцерагчы ад расейскае і польскае акупацыі заходнюю частку Беларусі,

[20] **Новый шлях** — Ліпень 1918 — Ліпень 1919. — С. 81.

[21] **Паўднёвую частку Гарадзенскае губэрніі (Кобрынскі, Брэсцкі, Пружанскі паветы) Нямеччына перадала пад кантроль Украіны.**

якую Расея — паводле Берасьцейскае дамовы — перадавала пад нямецкую юрысдыкцыю. У рэдакцыйным артыкуле «Гоману» за 8 лістапада было напісана: “Незалежнасьць зь Літвой болей пэўная дзеля таго, што адразае дарогу да прылучэньня да Маскоўшчыны, што вядзе да нацыянальнага і эканамічнага заняпаду беларусаў. Гэта добра ведаюць русафілы й робяць усё проціў Літоўска-Беларускага гасударства”.
У пераменлівай сытуацыі ВБР не адмаўлялася і ад намеру — пры спрыяльных умовах —ажыцьцявіць ідэал Акту 25 Сакавіка. У кастрычніку — пачатку лістапада 1918 году Надзвычайная дэлегацыя БНР на чале з А. Луцкевічам знаходзіцца ў Кіеве. Луцкевіч вядзе перамовы з старшынём СНК УССР Хрысьціянам Ракоўскім. Пры ўмове, што РСФСР прызнае незалежнасьць БНР, ён дэкляруе прыняць прынцыпы савецкае канстытуцыі.
З маганьню дзяржаўнай незалежнасьрэзалюцыі, як і з рэдакцыйнага артыкулу, відаць, што дзеячы Віленскае Рады кіраваліся прынцыпам “калі ня ўсё, дык хоць штосьці”.

№ 1
Пастанова Віленскай Беларускай Рады
Прымаючы пад увагу:

1) што бытнасьць падтрымліваных “энтэнтай” дзеля яе палітычных мэт чужацкіх войск на адвечна Беларускіх землях можа ў будучыні аказацца прэцэдэнтам для прылучэньня гэтых зямель да Польскага каралеўства, або дзеля дамаганьня тэрытарыяльных кампэнсацыяў у постаці беларускага Беластоцкага вокруга, сумежнага з Польшчай;
2) што, абвяшчаючы прылучэньне закардоннай Беларусі да Польскай манархіі, польскія войскі выяўляюць гэтак захватныя тэндэнцыі на беларускія землі, і іх чыннасьць з гэтага погляду перастае ўжо быць самаабаронай палякаў ад бальшавіцкай анархіі і прыбірае характар вялізнай палітычнай авантуры, каторая ідзе супроць інтарэсаў беларускага народу і супроць яго жаданьня незалежнасьці;
3) што расійскія войскі, каторыя па загаду расійскага ўраду аружнай сілай перашкодзілі ўтварэньню беларускай нацыянальнай арміі, самі ня здолелі ўтрымаць беларускіх земляў і блізка саўсім пакінулі іх, ня споўніўшы перад імі сваіх павіннасьцяў і абяцанак;

4) што Беларусь ад XIII-га да канца XVIII-га сталецьця была незалежна, складаючы разам зь літоўцамі асобную дзяржаву (Вялікае Княства Літоўскае), і, пасьля прылучэньня яе гвалтам да Расіі, праз сто дваццаць гадоў не пераставала дабівацца незалежнасьці нават з аружжам у руках (1812—1905 гг.);
5) што бальшавіцкі ўрад далей вёў палітыку гвалту над беларускім народам, даўшы яркае выражэньне гэтага ў разгоне Ўсебеларускага Зьезду ў Менску, —
Беларуская Рада, аб'яўляючы разарванай зьвязь між Беларусьсю і Расіяй, выказвае свае дамаганьні:
1) каб польскія войскі чым хутчэй выйшлі зь беларускіх зямель, на каторых беларускія краёвыя арганізацыі возьмуць пад сваю апеку іменьне і жыцьце жыхароў;
2) каб пакінутыя на нямілосьць долі Беларускія землі за фронтам былі ўраз жа далучаны да акупованай часьці Беларуска-Літоўскага краю дзеля арганізацыі тут незалежнага дзяржаўнага бытаваньня;
3) каб сумежныя з Польшчай спрадвечна беларускія землі (Беласток, Гродня) ні ў якім здарэньню не былі вылучаны з рэшты краю дзеля прылучэньня да Польскага каралеўства.
Беларуская Рада, апіраючыся на рэзалюцыі Беларускай Канфэрэнцыі ў Вільні 25, 26 і 27-га студз. 1918-га году (аснаўныя пункты да гэтага дадаюцца) і па пастанове разагнанага бальшавікамі Беларускага кангрэсу ў Менску 7—18. XII. 1917 г., — зьвяртаецца да ўсіх дзяржаў, прызнаючых прынцып самаадзначэньня народаў, а ў першы чарод да Нямеччыны, каторая мае найбольш супольных зь Беларуска-Літоўскім краем эканамічных інтарэсаў, з прызывам аказаць помач у справе адбудовы дзяржаўнай незалежнасьці калішняга Літоўска-Беларускага гасударства (Вялікага Княства Літоўскага), не ўзіраючыся ў цяперашні разьдзел яго ліній фронту.
Вільня, 18-га лютага 1918 году.

Падпісалі:
Прэзэс Беларускае Рады — *А. Луцкевіч,*
протаіер. *М. Галянкевіч,* ксёндз *В. Талочка, К. Фалькевіч, Дулька.*
Сяброкі Рады: *Я. Туркевіч, Я. Салавей, І. Луцкевіч, Я. Станкевіч, М. Радзевіч, М. Перскі.*

Сакратар Рады: *Д. Сямашка.*

№ 2

Прэзыдыюм Беларускай Рады ў Вільні паслаў імпэрскаму Канцлеру, Прэзэсу Райхстагу і генэралу Людэндорфу гэткую тэлеграму:

“У апошнім часе ў Бэрліне адбывалася нарада польскіх прадстаўнікоў зь вялікшасьцю Райхстагу, на каторай спрадвечна Беларускія землі разглядаліся як кампэнсацыя Польшчы за адрачэньне яе ад прэтэнзій на Познаньшчыну. Хаця нарада мела прэлімінарны характар, аднак яна атрымала значэньне паўафіцыяльнае з прычыны прыняцьця гэных польскіх прадстаўнікоў панам Імпэрскім Канцлерам і прызнаньня абапольных прэдлажэньняў Рэгенцкай Рады Польшчы.

Прымаючы гэта пад увагу, Беларуская Рада лічыць сваёй сьвятой павіннасьцю заявіць самы катэгарычны пратэст проці гэткага гібельнага для цяперашчыны і будучыні больш чым 10-мільённага Беларускага народу праекту разьдзелу Беларусі і аддачы Польшчы чыста беларускіх зямель — Меншчыны, Гродзеншчыны і Беласточчыны.

Разам з тым Рада горача пратэстуе проці выяўленага гэтым поўнага ніўважэньня бясспорнага права Беларускага народу на самаадзначэньне, каторае знайшло ўжо сваё выражэньне ў дамаганьню дзяржаўнай незалежнасьці ўсіх Беларускіх зямель.

Вільня, 17 марца 1918 г.”

№ 3

Статут Рады Беларускае Народнае Рэспублікі

Разьдзел 1.

Аб вярхоўнай уладзе Беларускае Народнае Рэспублікі.

1. Вярхоўная Ўлада ў межах Беларускае Народнае Рэспублікі належыць Народу Беларускаму і другім народам, насяляючым тэрыторыю Беларускае Рэспублікі.

2. Вярхоўная Ўлада зьдзяйсьняецца Соймам Рэспублікі, каторы выбіраецца на аснове агульнага, роўнага, патаемнага, простага і прапарцыянальнага выбарчага права, закон аб чым выдаецца Радай Рэспублікі.

3. Да выбару Сойму, Заканадаўчая Ўлада належыць Радзе Рэспублікі, а Выканаўчая Вышэйшая Ўлада — безумоўна

Народнаму Сакратарыяту ў згодзе зь ніжэйпамянёнымі артыкуламі гэтага закону.
Разьдзел 2.
Аб Радзе Рэспублікі.
4. Рада Беларускае Рэспублікі ёсьць Вышэйшая Часовая Заканадаўчая Ўстанова. Ніводзін закон ня можа мець моцы без зацьвярджэньня яго Радай Рэспублікі.
5. Рада Рэспублікі ў сваім унутраным парадку кіруецца па аснове загаду, апрацаванага і зацьверджанага Самой Радай.
6. Пасяджэньні Рады Рэспублікі бываюць чарговыя і экстранныя:
а) чарговыя пасяджэньні адбываюцца штомесяц кожнага 20 дня;
б) нечарговыя пасяджэньні зьзываюцца паводлуг патрэбы ў гэтым.
7. Пасяджэньні папоўненае Рады Рэспублікі адчыняюцца Старшынёй Рады, які прапануе Радзе выбраць Прэзыдыюм.
8. Прэзыдыюм Рады Рэспублікі складаецца: Старшыня, два яго таварышы і тры сакратары.
9. Прэзыдыюм Рады выбіраецца патаемным галасаваньнем.
10. Экстранныя пасяджэньні Рады зьзываюцца яе Прэзыдыюмам: 1) па ўласнай ініцыятыве, 2) па ініцыятыве Народнага Сакратарыяту і 3) па пісьменным запатрабаваньні гэтага ня менш як 25 сябрамі Рады.

Разьдзел 3.
Аб складзе Рады.
11. Да цяперашняга складу Рады БНР, асноўным ядром якой зьяўляюцца ўсе сябры Рады 1-га Ўсебеларускага Зьезду, далучаюцца па прынцыпе дэлегаваньня прадстаўнікі ад:
1) мясцовых Беларускіх Радаў, 2) земскіх самаўправаў ці ўстановаў, якія іх замяняюць, 3) меставых самаўправаў ці замяняючых іх установаў, 4) Радаў вышэйшых вучэбных устаноў, 5) Беларускіх рэлігійных і культурных арганізацый, 6) духавенства праваслаўнай царквы, 7) каталіцкага духавенства, 8) нацыянальных меншасьцяў, 9) прадстаўнікі земляўласнасьці і сельскагаспадарскіх арганізацыяў, 10) прадстаўнікі гандлю і прамысловасьці, 11) прадстаўнікі каапэрацыі, 12) Беларускіх палітычных партыяў, 13) сялянскіх хаўрусаў, 15) чыгуньнікаў, 16) паштова-тэлеграфных служачых

і 17) Беларускага вучыцельскага хаўрусу, — існуючых на тэрыторыі Беларусі і на аснове, ніжэй паказанай.
12. Лік прадстаўнікоў ад асобных беларускіх Радаў азначаецца ў кожным асобным выпадку Радай Рэспублікі.
13. Земскія самаўпраўленьні ці ўстановы, якія іх замяняюць, дэлегуюць у Раду Рэспублікі 10 прадстаўнікоў, выбраных на Ўсебеларускім Зьезьдзе.
УВАГА: Да скліканьня Ўсебеларускага Земскага Зьезду земская група прадстаўляецца членамі земскіх управаў, якія існуюць на тэрыторыі Беларусі.
14. Месцавыя самаўпраўленьні, ці замяняючыя іх установы, дэлегуюць 10 прадстаўнікоў, выбраных на Ўсебеларускім Зьезьдзе мест.
УВАГА: Да скліканьня Ўсебеларускага Зьезду месцавая група прадстаўляецца 5 членамі Менскае месцавай і 5 членамі Магілеўскае месцавае думаў.
15. Менскаму Праваслаўнаму Брацтву даецца права паслаць 10 прадстаўнікоў.
16. Менскай Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратычнай Злучнасьці даецца права паслаць 4 прадстаўнікоў.
17. Усебеларускі Зьезд праваслаўнага духавенства дэлегуе 4 прадстаўнікоў у Раду Рэспублікі.
УВАГА: Да скліканьня Ўсебеларускага праваслаўнага Зьезду прадстаўнікоў у Раду Рэспублікі дэлегуюць Эпархіяльныя Рады.
18. Рымска-каталіцкія Катэдральныя Капітулы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, дэлегуюць у склад Рады Рэспублікі па адным прадстаўніку па свайму выбару.
19. Польская “Рада Земі Менскай” дэлегуе ў Раду Рэспублікі 6 прадстаўнікоў.
20. Жыдоўская Абшчына дэлегуе ў Раду Рэспублікі 7 чалавек.
21. Існуючыя Губэрскія арганізацыі іншых меншасьцяў дэлегуюць у Раду сваіх прадстаўнікоў па аднаму ад кожнай.
22. Усебеларускаму Зьезду гандлёва-прамысловых арганізацыяў даецца права паслаць 3 прадстаўнікоў у склад Рады Рэспублікі.
23. Усебеларускаму зьезду земляўласьнікаў даецца права паслаць у Раду 3 прадстаўнікоў.
24. Усебеларускаму сельскагаспадарскаму зьезду даецца права паслаць 3 прадстаўнікоў.
25. Цэнтральныя Ўстановы Беларускіх палітычных партыяў

дэлегуюць у Раду 2 прадстаўнікоў.
26. Бюро работніцка-прафэсіянальных хаўрусаў дэлегуе ў Раду 3 прадстаўнікоў.
27. Хаўрус каапэратываў Беларусі дэлегуе 5 прадстаўнікоў.
28. Усебеларускі паштова-тэлеграфны хаўрус дэлегуе 3 прадстаўнікоў.
29. Беларускі жалезнадарожны хаўрус дэлегуе 3 прадстаўнікоў.
30. Беларускі вучыцельскі хаўрус дэлегуе 5 прадстаўнікоў.
31. Розныя Беларускія культурна-асьветныя арганізацыі, якія маюць дзейнасьць на тэрыторыі Беларусі, на аснове зацьверджаных статутаў, пасылаюць у Раду Рэспублікі па 1 дэлегаце.
32. Прадстаўніцтва арганізацыяў, памененых у ст. ст. 22, 23, 24, 25, 26, 27, 28, 29 і 30, часова, пакуль ня будуць выбраны правамочныя дэлегаты, даецца належным арганізацыям Менскае губэрні.

Разьдзел 4.
Аб Кворуме Рады Рэспублікі.
33. Кворум першага пасяджэньня папоўненае Рады ўстанаўляецца ў ліку 1/3 зарэгістраваных членаў. Далейшае азначэньне кворуму робіць сама Рада.
УВАГА: Праца Рады Б. Н. Рэспублікі ў існуючым складзе не спыняецца да таго часу, пакуль кворум Рады разам з новымі дэлегатамі ня дойдзе ліку, паказанага ст. 33.

№ 4

Рэзалюцыі Беларускае Рады ў Вільні

[23] **Публікацыя не даўрашчаецца да ўхіленьня.**

На сваім пасяджэньні 3 лістапада Беларуская Рада ў справе агульнае арыентацыі аднагалосна прыняла рэзалюцыю:
“Апіраючыся на тым, што абедзьве ваюючыя староны прызналі ўсім нацыям права на самаазначэньне, Беларуская Рада ў Вільні, не зыходзячы з грунту цэласьці і незалежнасьці Беларусі і пратэстуючы проціў прыпадковае дэмаркацыйнае лініі Берасьцейскае ўмовы, разьдзяляючае Беларусь на часьці, — дзеля абароны нацыянальных і дзяржаўных правоў Беларускага Народу апавяшчае сябе раўнапраўным зь Літоўскай Тарыбай краёвым прадстаўніцтвам для этнаграфічных беларускіх зямель, ляжачых на заход ад старога фронту, і жадае

найскарэйшага ўтварэньня агульнага Беларуска-Літоўскага часовага парлямэнту з дапушчэньнем прапарцыянальнага прадстаўніцтва ад нацыянальных меншасьцяй. Парлямэнт утворыць часовы ўрад.
Задачай часовага ўраду павінна быць удзяржаньне ладу і бясьпечнасьці ў краю, дзеля гэтага першай яго мэтай павінна быць арганізацыя войска і паліцыі. Урад скліча агульны Літоўска-Беларускі Ўстаноўчы Сэйм, каторы і ўстановіць форму праўленьня літоўска-беларускага гасударства і адносіны да сябе абодвух народаў.
На прыпадак, калі б у будучыні не дайшло да ўгоды зь літвінамі ў справе злучэньня абодвух народаў у адну супольную дзяржаву, Рада засьцерагае беларускаму народу, засяляючаму тэрыторыю на заход ад старога фронту, права злучэньня з рэштай назалежнае Беларусі.
У справе адносін да Літоўскай Тарыбы прынята рэзалюцыя, што Беларуская Рада пашле сваіх прадстаўнікоў у Тарыбу пры спаўненьні гэткіх варункаў:
1. Калі Тарыба стане на пункце цэласьці заходніх беларускіх граніц зь Беластокам і Бельскам.
2. Прапарцыянальнае прадстаўніцтва ад беларусаў у парлямэнце і ўрадзе.
3. Шырокая аўтаномія беларускіх зямель.
4. Беларускае войска.[23]

Зацемы

[5] Вось што мы чытаем у названым артыкуле У. Ігнатоўскага: “18 лютага Віленская Рада выдала вельмі яскравую пастанову такога зьместу: “Палякі выказваюць захопныя тэндэнцыі на Беларусі; рускія войскі не далі магчымасьці зарганізавацца беларускай арміі і самі кінулі Беларусь безабароннаю; Беларусь мае ў гісторыі доказы магчымасьці незалежнага палітычнага існаваньня; бальшавіцкі ўрад вёў гвалтоўную палітыку над беларускім народам, аб чым сьведчыць разгон Беларускага Кангрэсу ў Менску. Прыймаючы ўсё гэта пад увагу, Віленская Беларуская Рада абвяшчае сувязь паміж Расіяй і Беларусьсю парванай. Рада зьвяртаецца да ўсіх заходніх дзяржаваў, асабліва да Нямеччыны, якая мае найбольш эканамічных інтарэсаў, супольных зь Літоўска-Беларускім

краем, каб яны дапамаглі ў справе “адбудовы дзяржаўнай незалежнасьці калішняга Літоўска-Беларускага гаспадарства (Вялікага Княства Літоўскага), нягледзячы на цяперашні разьдзел яго мяжою фронту” (Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. С. 201.) Як бачым, двукосьсе ў гэтай цытаце ўводзіцца двойчы (перад словам “палякі” і перад словам “адбудовы”), але цытаты ўсё ж няма.Назад

22 У тым самым нумары «Гоману» паведамляецца, што “ў Літоўскай Тарыбы была дэлегацыя Рады Беларускае Народнае Рэспублікі” і што яна “перадала Тарыбе мэмарыял Рады Рэспублікі аб незалежнасьці Беларусі”; паведамляецца таксама, што 3 лістапада ў ВБР прынятыя новыя сябры. Гэта А. Борык, Дудзяк, К. Душэўскі, Грыкоўскі і Пазьняк. Калі Клаўдзі Душ-Душэўскі — асоба вядомая, калі пра дырэктара 1-е беларускае нацыянальнае школы ў Горадні ў час Алеся Грыкоўскага (?—1919) А. Луцкевіч піша ў сваім дзёньніку і ўжо маюцца публікацыі (напрыклад, у «Нашай Ніве»), дык пра Борыка, Пазьняка і Дудзяка я зьвестак ня маю.Назад

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/04/30
[image]

Усевалад Гарачка

Наталка

УСЕВАЛАД ГАРАЧКА (нар. 1968) — інжынэр-тэхнолаг, працуе на заводзе «Інтэграл» у Менску. Жыве ў Фаніпалі. Паэт. Ягоныя вершы апошніх гадоў друкаваліся ў газэтах «Літаратура і мастацтва», «Наша Ніва», часопісе «Крыніца». Ягоная апошняя публікацыя ў «ARCHE» — у № 1-2002.

1

Былі “Тутэйшыя”, былі (і ёсьць) ТВЛ, Бум-Бам-Літ. Але была й Наталка, былі мы.

Чаму былі, а ня ёсьць? Так, мы ёсьць, але кожны з нас ёсьць паасобку, а мы як нешта супольнае — былі, мінулі.

Мне яшчэ цяжка гаварыць пра той час аб’ектыўна, як пра манумэнт: вось ён такі, і ўсё. Таму часам здаецца, што мы яшчэ мінулі ня цалкам, мы яшчэ крышачку ёсьць.

Часта хочацца вярнуць той час — у нейкіх успамінах на паперы або ў больш натуральнай форме — проста сабрацца разам. Але й сабраўшыся разам, мы ня здольныя аднавіць мінулае, таму зьбіраемся як бы ў памяць аб ім. Разам прасьцей успамінаць.

2

(з нататнікаў)

Упершыню я пабачыў Наталку на літаб’яднаньні “Крыніца”, што існавала пры газэце “Чырвоная змена”. Спачатку яна мне не спадабалася. Сядзіць, закінуўшы нагу за нагу, нешта вяжа шыдэлкам. Насьвіствае. І пры гэтым пільна сочыць за ходам падзеяў, дае даволі рэзкія заўвагі. Пастаянна спрачаецца з

тагачасным кіраўніком літаб'яднаньня А. Масарэнкам. Асабіста мяне зь ёй пазнаёміў Кастусь Елісееў. Звычайна пасьля літаб'яднаньня мы ішлі ўтраіх піць каву. У Наталкі былі грошы, і яна нам, кажучы яе ўласным словам, прастаўляла. Час ад часу да нас далучаўся яшчэ хтосьці. Але касьцяк — гэта Наталка, Кастусь і я.
Каго можна назваць яе вучнямі? Мяне, Таню Будовіч, Патаранскага. У нейкай ступені Сьпіцына, Мілану Шушкевіч. Былі тыя, каго нельга назваць яе вучнямі, але яны былі разам з намі: Віктар Сьлінко, пазьней — Казапалянская.
Былі й тыя, хто нібыта быў яе вучнем, але потым сышоў ад літаратуры: Шкурдзя, Елісееў.

Ні для кога — можа, акрамя Патаранскага — творчасьць Наталкі не была крыніцай перайманьня. Больш таго, не выпрацоўваўся, не "выкоўваўся" адзіны голас для ўсіх, а "ставіўся" ўласны. Да таго ж не пры дапамозе нейкіх практыкаваньняў, па нейкай "тэхналёгіі", а натуральна, як бы само сабой, непрыкметна: чыталіся вершы (уласныя, клясыка), рабіліся пэўныя заўвагі. Але заўвагі не з пазыцыі нейкай "літаратурнай філязофіі", а як у музыцы: "Сфальшывіў, узяў ня тую ноту".
Не чыталіся ні Купала, ані Колас, ані хто іншы зь беларускіх клясыкаў. Можа, выключэньне складалі Караткевіч і Сыс. Чыталіся расейскія паэты: Кузьмін, Таркоўскі, Бунін, Бродзкі, Забалоцкі.
Надавалася больш увагі каве і сумеснаму паяданьню пірожных, чым літвучобе, але літвучоба ішла. І я ўпэўнены, што ёй спрыялі гэтая кава й гэтыя пірожныя.
Той сьвет, што існаваў вакол Наталкі, — вершы, паркі, кава. Для мяне ўсё гэта — мінулае (можа, нават паэзія). Буду шчырым, сустракалася ўсё: і сьветлае, і бруднае. Часам мы, вучні, не маглі трываць адзін аднаго, і тым ня менш сядзелі побач, бо ля кожнага з нас сядзела Наталка.
Вучнёўства. Мы больш жылі — хадзілі па горадзе (у нас былі свае любыя месцы), кагосьці сустракалі, расставаліся — чым непасрэдна пад Наталчыным кіраўніцтвам удасканальваліся ў вершаскладаньні. Само тое жыцьцё вучыла пісаць вершы, давала іх. Так, першай іх слухачкаю была Наталка. Яна часам і не гаварыла, дзе й што ня так. Падчас прачытаньня (або

пасьля) мы нібыта адчувалі гэта самі. Нешта было ў ёй такое. Ня нашы паэтычныя (літаратурныя) дасягненьні — я пабачыў перад сабой вобразы нямоглых людзей, якім жыцьцё — намаганьне: Наталка, Віця Сьлінко... У меншай ступені — Таня, Алесь Сьпіцын, — яны малодшыя (а можа, таму іншая прычына). Сюды трэба аднесьці й мяне.
Выпаленым дарэшты мне здаецца тое нашае жыцьцё. Але адначасова здаецца (толькі здаецца), што цяпер я, як некалі Наталка, змог бы зноў сабраць усіх нас разам і нават нейкі час жыць гэтым падманам.
Не магу разглядаць нашую творчасьць безадносна да асоб творцаў, да нейкіх вынікаў іх справаў, дасягненьняў у жыцьці (не літаратуры). А што маем: у адных распаліся сем'і, іншыя страцілі веру (ня ў Бога, у Бога па-сапраўднаму мы ня верылі). У прыватнасьці, для мяне паэзія перастала быць пуцяводнай зоркай.
Часам здаецца, што, зьбіраючыся разам, мы, можа, нават таго й ня ведаючы, генэравалі сумесна нейкія сутнасьці: нябачныя, але адчувальныя (або, можна сказаць, бачныя, але ня звычнымі вачыма). Мы стваралі гэтыя сутнасьці, і яны ўзьдзеялі на кожнага з нас ужо паасобку, зьяўляючыся крыніцай творчасьці. Ці не таму, нягледзячы на ўсю адрознасьць, у нашых вершах адчуваецца нешта супольнае.

3

Я: Некалі Калесьнік казаў прыкладна так: "Што б хто ні гаварыў пра адносіны твору і творцы, урэшце вартасьць, каштоўнасьць твору вызначаецца каштоўнасьцю асобы аўтара". А як, на тваю думку, суадносяцца творца і яго твор?
Н: Гатовая пагадзіцца. Бо варта толькі згадаць прыклад Славаміра Адамовіча. Ягоная выдатная першая кніга "Кальварыйскія клёны", твор пра рыжую векшу. Гэты твор я пачула першым зь ягоных твораў і прыслала яму тады цыдулку, што ад імя ўсіх жанчын стану перад ім на калені. І апошнія творы... Як сказалі б на Палесьсі, ёсьць чаго пяяці, ды няма чаго слухаці.
Я: Зразумела. Я чытаў не далей як сёньня адно апавяданьне. Быў падлетак, якога не прымалі ў асяродку яму роўных. І ён стварыў сабе іншы асяродак — з маладзейшых за сябе. Але так сталася, менавіта ў гэтым асяродку ён зьдзейсьніў учынак, які

па-сапраўднаму раскрыў яго чалавечыя якасьці. Ён уратаваў аднаго з сваіх падапечных. Нейкім чынам мне хочацца спраектаваць гэта ўсё на цябе. Чаму? Проста ты гаварыла мне пра пэўнае непрыняцьце цябе ў літаратурных колах. Ці не было такога, што ты стварыла вакол сябе кола малодшых, каб, навучаючы іх, нешта перадаючы ім, самасьцьвярджацца, рэалізоўваць нешта незапатрабаванае? А можа, такая праекцыя недарэчная?

Н: Я заўсёды вельмі любіла маладзейшых за сябе. Мой брат пра мяне з гэтай нагоды літаральна тваімі словамі й казаў. Што, маўляў, цябе аднагодкі не прызнаюць — ты такая, ты сякая, ты ненармальная, таму ты з малодшымі гуляеш. Але проста тады, дзіцем, падлеткам, я зразумела, што малодшыя здольныя адказаць любоўю на любоў. А цяпер — проста таму, што мне зь імі цікава. Пра што я буду гаварыць з аднагодкамі? З задастымі цёткамі, з кар'ерна заклапочанымі лысымі мужыкамі, дастатымі жыцьцём? Учора аб гэтым думала: вось пра што зь імі гаварыць? Хаця сярод іх ёсьць і іншыя. І акурат зь іншымі я гавару: зь імі цікава. Ад гадоў гэта не залежыць: я з тымі, з кім мне цікава. І да таго ж, я б сказала, што ўсе яны — лепшыя за мяне.

Я: Вось паглядзі, такі момант: ты не стварыла сваёй школы, як мастакі стваралі раней свае школы…

Н: Маўляў, "пішы як я, і толькі гэтак будзе правільна"?

Я: Так.

Н: Таму што мяне ў свой час накармілі гэтым дастаткова.

Я: Ты кожнаму дала магчымасьць разьвівацца так, як ён хоча, куды ён можа. Ты была, магчыма, ня столькі настаўніцай, што задае нейкія дырэктывы: вось так і так, колькі выдатнай слухачкаю, суразмоўцаю, што здольная пачуць таго, хто да цябе прыходзіць, хто табе чытае нейкія творы, хто да цябе зьвяртаецца. Ты ўступала з сваімі падапечнымі ў літаратурны дыялёг, і менавіта праз гэты дыялёг яны разьвіваліся. Гэта Разанаў некалі пісаў у "Гліне":

Паволі або раптоўна
Мы адхіляемся
Ад задумаў,
Якія хацелі
Спраўдзіцца намі,

Калі ня чуем,
Ці адгукаецца навакольле...
Рэдка хто можа ўтрымацца нейкай задумы, ня маючы водгуку: слухача, рэцэнзэнта, кнігі. І ці не была ты тым водгукам для маладых літаратараў, што прыходзілі да цябе?
Н: Ня знаю, можа, і была. Я аб гэтым асабліва не задумвалася. Для мяне не праблема выслухаць чалавека, не праблема зразумець яго. Для мяне праблема — настаяць на сваім, адстаяць сваё.
Я: Але ты ж не настойвала на сваім і не адстойвала свайго, чытаючы творы маладых...
Н: Ну, ня знаю. Рыба плавае, кот ловіць мышы. Так і я — рабіла толькі тое, што для мяне было натуральна.
Я: Зразумела. Такое пытаньне: ты была для людзей, што гуртаваліся вакол цябе, ня толькі настаўніцай у літаратуры, але й настаўніцай у жыцьці. Ты гэта, відаць, таксама ўсьведамляла й бачыла?
Н: Ня знаю. Апошнім часам я ў меншай ступені магу быць настаўніцай у жыцьці, таму што мае малыя пайшлі далей, яны жывуць далей. Я, у прынцыпе, стаю на месцы. Яно мяне задавальняе, але настаўніцай у жыцьці я болей не магу быць.
Я: На нейкім этапе?
Н: На нейкім этапе. Вось толькі не на тым этапе, дзе трэба выслухаць і ня зьвягаць.
Я: Далей мяне цікавіць наступнае. Перад табой разгортваліся ня толькі літаратурныя сталеньні аўтараў, перад табой разгортваліся лёсы людзей. Ты была ў такім дзіўным становішчы...
Н: Ну чаму ўсе ў гэтым бачаць нешта дзіўнае? Нічога асаблівага. Так натуральна, калі кагосьці любіш, быць у курсе ўсіх яго справаў: і літаратурных, і нелітаратурных, і калялітаратурных. Гэта абсалютна натуральна, я нават асабліва пра гэта не задумвалася.
Я: Вось ты сказала слова “любіш”. Дык асноўны твой прынцып настаўніцтва — гэта любоў да сваіх вучняў?
Н: Так яно і ёсьць. Таму, між іншага, раней і мастакі, і філёзафы — усе выбіралі сабе ў вучні строга тых, хто ім падабаўся, хто да іх цягнуўся. Астатнія адсейваліся самі.
Я: Сапраўды, так яно й было.
Н: Іначай, я ўжо пераканалася, не навучыш. Чаму зь мяне

сталася нармальная карэктарка, нармальная стыль-рэдактарка? Гэта ня толькі мае дадзеныя. Гэта таму, што мяне вучылі зь любоўю. І зь любоўю хвалілі, калі што было добра, і зь любоўю давалі па вушах, калі што было ня тое. Вось і ўсё. Не галоўнае, ці хваліш ты, ці даеш па вушах. Галоўнае — зь любоўю. Тады любоў сама падкажа — найчасьцей, хоць не заўсёды так бывае, але найчасьцей! — правільныя словы, правільныя дзеяньні. І ты нават не пасьпееш пра гэта задумацца.

Я: А я вось задумваўся над такім пытаньнем: калі зьвярнуцца да папярэдніх пакаленьняў беларускіх пісьменьнікаў, як бы я клясыфікаваў іх творчасьць? Не паводле жанраў і родаў, а паводле тых крыніцаў, што яе сілкуюць. Або пішуць пра вёску, якая загінаецца й якой так шкада, ці нават пішуць ужо стылізацыі на тэму, калі творца, можа, і ня бачыў той вёскі, а толькі чытаў творы папярэднікаў у гэтым ключы. Або воляй аўтара расейскамоўны сьвет, які ён бачыў у штодзённым жыцьці, гаворыць па-беларуску. Або такі выпадак: беларус у небеларускім сусьвеце. Вакол жа цябе, Наталка, стварыўся сапраўдны беларускамоўны сусьвет, сапраўднае беларускае жыцьцё. Калі ў папярэднікаў (“Талака”, “Тутэйшыя”) беларускасьць была часам паказная, штучная (часам іх мова была занадта беларускай — абы ня так, як у расейцаў; да таго ж адно слова зь Віцебшчыны, другое — з Палесься, трэцяе яшчэ аднекуль), дык сярод нас пра вонкавы бок беларускасьці амаль і не задумваліся, яна была натуральная.
Н: Не забывайся, што, па-першае, я недзе і ў нечым узрасла на грунце “Талакі”. Па-другое, што талакоўцам Сяргей Вітушка казаў аднойчы наступны тэкст: “Саўсім мы не павінны абмяжоўвацца лапцямі. Мы павінны і апранацца, і выглядаць лепей, і ведаць болей за небеларускую тусоўку, каб яны цягнуліся за намі”. Мяне гэта ўразіла, бо я прывыкла да сьвядомага крэну ў нейкую лапцюжнасьць. Але рэч, у прынцыпе, ня ў тым. Я нічога такога не стварала. Стваралі тыя малыя, што былі вакол мяне. Вось так. А “Тутэйшыя” былі барацьбой самалюбствaў. На іх паседжаньнях зьбіраліся, здаецца, разумныя людзі, здаецца, усе да аднаго разумныя. Дурнога там не было ніводнага чалавека. Але пра што была размова? Ад размоваў іхных мухі дохлі: “Ай, вось мяне не надрукавалі. Ай, вось мяне рэдактар пакрыўдзіў, ай, вось ён

такі-сякі, а я тут геній”.
Я: Сваёй асобы й мы не забываліся, але мы ўжо цікавіліся й іншым. Нехта нам падабаўся, і мы прысьвячалі яму вершы...
Н: Бачыш, яшчэ адзін доказ таго, што ўсё добрае бывае зь любові. Усё роўна ў якіх варыянтах. А безь любові не бывае нічога добрага. Вось і ўсё.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/05/02**
[image]

Рыгор Барадулін

Лісты ў Нямеччыну да Васіля Быкава

Лісты з Вушачы
з падстрэшша мамінае хаты
Ліст шосты
— Днее зьмярканьне, цямнее сьвітаньне,
Глухне паўдзён у сваёй глыбіні.
Цені, прывыклыя да хістаньня,
Прыцемкам дадаюць цішыні.
Цесна разьвідненасьці ў зааблоччы.
Лашчыць жуду крумкачова крыло.
Гэта старэюць нашыя вочы,
А нам здаецца —
Старэе сьвятло.
25 жніўня 2000

Лісты зь Менску
з-пад зашклёнага неба
Ліст пяты
Паветра маленства

Пахне мамаю,
Паветра храму —
Дыханьнем Богавым,
Паветра юнацтва —
Першай трывогаю.
Паветра Радзімы —
Балючае самае.
Паветра позьняй восені
Ціхае,
Паветра смутнае
Прыцемку раньняга.
Але надыхацца нельга
Выгнаньніку
Паветрам, якое
Калісьці дыхала…
30 сакавіка 2000

Ліст дваццаць другі
Нас ніхто не чакаў на зямлі,
Дый на небе ніхто не чакае.
І сюды мы ня самі прыйшлі —
Нас прыслала цікаўнасьць,
Якая
Хоча ўрэшце дазнацца сама,
Для каго мы
Часова жывыя,
Для каго нас
Даўно ўжо няма.
У печы мрой нашых
Дровы сырыя…
22 лістапада 2000

Ліст трыццаты
Яны прылятаюць
Да кожнага ў госьці,
Вяртаючы сьмех,
Даганяючы плач:
Сініца — з маленства,
Жаўрук — з маладосьці,
Са сталасьці — грак,

Зь небылосьці — крумкач.
13 студзеня 2001

Ліст семдзесят чацьверты
Гэты краў,
А гэны краўся спраўненька
У правадыры, ў павадыры.
Астудзіў усіх
Пясок сыры.
У народа памяць,
Як у страўніка.
5 кастрычніка 2002

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/05/02
[image]

Людка Сільнова

Малітва

Сукня з полымя
Ці зары,
Валасоў
Пасівелы дым…
— Паўтары мяне,
Паўтары!
Абярні маладой…
Маладым…
Гэта вогнішча
А ці стод?
Адгукніся,
Вясёлы бог!
Пакладзі
На блакітны спод
Яблык сьвету —
Клубок дарог.
І — дыхні,
Каб пачаўся рух,
Залатое —

Скрані сьвятло
І ўтвары
Чарадзейны круг:
Паўтары мяне,
Як было!..
Сукня з полымя…
Ці зары…

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/04/23
[image]

Анатоль Трафімчык

Песня

— А чаго ж вы, хлопцы, агрэсіўныя?
А чаго ж вы, хлопцы, рукі чэшаце?
А чаго ж вы, хлопцы, зубы скаліце?
Напіліся, мусі, вы гарэлачкі,
Пахляталі моцнай самагоначкі —
Сапраўды сваіх вы лык не вяжаце.
— А чаго ж нам быць неагрэсіўнымі?
А чаго ж нам быць інтэлігентнымі?
Чалавекамі добразычлівымі?
З кожным днём гібее наша вёсачка,
Наша вёсачка неперспектыўная —
Не відно праменьчыка нат кволага.
І з таго народ зусім співаецца,
І ўсё больш і больш народ нервуецца,
І шукаюць людзі вінаватага.
А як знойдзем тога вінаватага,
То яму адразу кішкі выпусцім,
Наматаем на гнілы штыкетнічак.
І свярбеці перастануць ручачкі,

Перастануць зубкі злосна скаліцца,
Заірдзіць над вёскай ясна сонейка.
Перастанем мы хлябтаць гарэлачку,
Перастанем тады ў бойках бавіцца,
Зажывём зусім тады па-новаму.
Ды не знойдзем тога вінаватага —
Бо не бачыма вачмі залітымі,
Затуманенымі век гарэлачкай.
І таму век свярбець нашым ручачкам,
Нашым зубкам заусёды скаліцца,
І заўсёды нам быць агрэсіўнымі.

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/05/02**
[image]

Андрусь Храпавіцкі

Мая Ўкраіна

Шчыра кажучы, я слаба памятаю Ўкраіну,
У адрозьненьне ад іклаў з кнотам Адамовіча.
Я памятаю Андруховіча, які еў цытрыну
Ў мяне на хаце ля Ждановічаў.
Еў павольна, моршчыў нос пры гэтым,
Пальцы гнуў, калі лічыў паэтаў,
Літаратараў, зь якімі на банкетах
Піў за мір і згоду ў гэтым сьвеце.
Памятаю дэпутата (пэўна з Кіева),
Што калісь на менскім зэбээсе
Распрагаў пра “всіх москальскіх підорів”,
Што спыняюць рухавік прагрэсу.
Памятаю, зрэшты, усё ж кавалак Львову —
Там, дзе нейкі помнік, галубы і панкі.
Памятаю, што было хярова:
Я ішоў з адной амэрыканкай,
П’яны ў дупу, улюбёны ў “суржык”
Ангельска-ўкраінскі, што тая ўжывала.
Думала — I don’t understand her language. Курча!
Я быў п’яны — яна ж не раздражняла.

Вось і ўсё — мой украінскі досьвед
Зусім маленькі. Мо было яшчэ што…
Мо таму ў канцы пастаўлю коску,
А калісь дадам да верша рэшту,

[image]
[image]

№ 2 (25) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/04/24**
[image]

Аляксей Бацюкоў

Начныя праспэкты
п’еса ў трох дзеях

Дзейныя асобы:
С т а с ь В а д а д о х і н, малады чалавек, патрульны.
Э л ь з а, журналістка.
Т р о ш а П о н і, нявеста Стася Вададохіна.
П ё т р а, сябар Эльзы.
К о н а н, сябар Эльзы.
С а н і т а р ы.
Ц е н і.

Дзея першая

Звычайны пакой. С т а с ь сядзіць за сталом. Перад ім — аркуш паперы і аловак, побач — два кубачкі з гарбатай. Нейкі час гучыць музыка.
С т а с ь (*слухаючы сьціханьне музыкі, узьнімае галаву)*. Тут нехта ёсьць? (*Пасьля паўзы.)* Хто тут? А можа, няма нікога? Гэта добра, што няма. Я спадзяюся, сёньня ўжо ніхто ня прыйдзе. Сваю нявесту я чакаў з раніцы, а цяпер вечар, і я не хацеў бы кагось бачыць. І таксама я не хацеў бы, каб хтось

бачыў мяне *(запальвае цыгарэту)*. Калі ўсё ж нехта зойдзе, гэты дым выесьць яму вочы, і ён ня ўбачыць сонечнага сьвятла. Як і я, бо я ніколі ня бачу сонечнага сьвятла. Уночы я працую, а ўдзень сплю. Я думаю, што гэта нармальна. *(Ходзіць, затым сядае. Сьмяецца, змаўкае й далей паліць.)* Я нікога не люблю. *(Сьмяецца.)*

Зноў нейкі час гучыць музыка, мяняецца асьвятленьне, белая пляма выхоплівае толькі С т а с я, ён нешта нясьпешна піша, потым асьвятленьне робіцца звычайным. За сталом, апроч С т а с я, сядзіць Э л ь з а, яна глядзіць на яго.

С т а с ь. Добры дзень, я Стась Вададохін.
Э л ь з а. Добры дзень.
С т а с ь *(мэлянхалічна)*. І вось, вы ўсё ж прыйшлі. Вы — Эльза.
Э л ь з а. Так, гэта праўда.
С т а с ь. Добра *(запытальна глядзіць на Эльзу)*.
Э л ь з а. Я, знаеце, напішу пра вас.
С т а с ь. Што?
Э л ь з а. Усё, што я пра вас даведаюся.
С т а с ь. Напішэце, як я сплю.
Э л ь з а. А як я даведаюся?

Яны крыва ўсьміхаюцца, С т а с ь няўпэўнена рухае рукой, нібыта зьбіраецца накрыць далонь Э л ь з ы.
С т а с ь. Напішэце, што я ем.
Э л ь з а. І што вы выпаражняеце *(сьмяецца)*.
С т а с ь. Ой, што вы!
Э л ь з а. Разумееце, я хацела б зладзіць нашую з вамі размову ня так, як вы чакаеце. Я не зьбіраюся браць у вас інтэрвію, бо так я пабачу вас не жывым, а такім, якім вы захочаце сябе паказаць. Уявіце, што я вашая сяброўка, — мусіць, так вам будзе зручней.
С т а с ь. У мяне ёсьць сяброўка.
Э л ь з а. Я вас у яе адбіла.
С т а с ь *(ківае)*. Ну, ну.
Э л ь з а. Ты мой харошы (*дакранаецца да ягоных рук*). Гэта як бы гульня. Ніхто ня ведае, што я да вас прыйшла. Раскажы мне што-небудзь такое…
С т а с ь. Знаеце, учора я забіў чалавека.

Э л ь з а (*сьмяецца*). Чалавека? Ах, ну як жа!
С т а с ь. Ён быў бандытам.
Э л ь з а. Ніякіх гарантыяў, што іншым днём ты не заб’еш мяне.
С т а с ь. Днём я сплю.
Э л ь з а. У вас чамусьці халодна.
С т а с ь. Я прынясу выпіць?
Э л ь з а. А што ў вас ёсьць?
С т а с ь. Гарбата. Я вельмі люблю гарбату.
Э л ь з а. Добра.

С т а с ь пасоўвае кубачкі з гарбатай.
Так. Калі мы дамаўляліся з вамі пра сустрэчу, я прасіла вас запісаць некалькі ўласных думак.
С т а с ь. Так, так, вось яны *(падае аркуш паперы)*. Тут пра маю працу і нават пра каханьне.
Э л ь з а. Навошта пра каханьне? Я не прасіла. *(Грэбліва.)* Гэта вершы?
С т а с ь. Не, проста думкі кароткія. І ў слупок.
Э л ь з а *(чытае)*. Уночы праспэкты зрынаюцца ў бруд.
Я ненавіджу бандытызм. Люблю хадзіць адзін. У мяне добры зрок. *(Перачытвае моўчкі.)* Гэта ўсё?

С т а с ь ківае.
А дзе ж тут пра каханьне?
С т а с ь. Хіба вы прапусьцілі першую фразу?
Э л ь з а *(пасьля паўзы)*. І як атрымалася, што вы забілі таго чалавека?
С т а с ь. Я пабачыў яго зводдаль і стрэліў. Пісталет мне выдалі нядаўна. Я яшчэ ня вельмі прызвычаіўся страляць у жывых людзей, таму я тады не патрапіў, а толькі спалохаў ворага. Але потым адразу ж узяў сытуацыю пад кантроль, выхапіў нож і закалоў бандыта.
Э л ь з а. Гэта што, праўда?
С т а с ь. Ну, а што?
Э л ь з а. Я ня думала, што патрульныя забіваюць людзей.
С т а с ь. Ды яны больш нічога ня робяць.
Э л ь з а *(пасьля паўзы)*. Вы заўважылі? Пад вокнамі нехта ходзіць.
С т а с ь. Магчыма, за мной назіраюць. Няма ніякіх падставаў

лічыць іначай.
Э л ь з а. Гэта жанчына.
С т а с ь. Жанчыны мяне любяць. Праўда, нядоўга.
Э л ь з а. А вы іх?
С т а с ь. А я не люблю.
Э л ь з а. А сваю сяброўку вы любіце?
С т а с ь. Цяпер вы мая сяброўка?

Бярэ ейную руку ў свае.
Э л ь з а *(працівіцца)*. Ну добра, досыць, патрымалі. Хочацца адзначыць вашую ўпартасьць.
С т а с ь *(не выпускае рук, усьміхаецца)*. Значыць, пачнём інтэрвію?
Э л ь з а *(яшчэ працівіцца, але ўсё слабей)*. Я ўжо не хачу. Ну ня трэба, падумайце пра мяне.
С т а с ь. Я ж чакаў, што хоць нехта прыйдзе. Цяпер усё.
Э л ь з а. Што — усё? За намі назіраюць!
С т а с ь. Ты мая сяброўка.
Э л ь з а. Мы ўжо на ты?
С т а с ь. Я ўключу музыку.
Э л ь з а. Ну ўключы!
С т а с ь *(цяпер увесь хіліцца да Э л ь з ы)*. Шнітке?

Зацямненьне. Музыка, на сцэне — зыркія сполахі, па якіх рухаюцца цені дваіх людзей: бегаюць адзін ад другога, сутыкаюцца, падаюць на стол, і потым бачны толькі цень нагі. Затым ізноў зацямненьне і паўза.

Д з е я д р у г а я

Тыя ж, за сталом.
С т а с ь *(устае, выходзіць з-за стала, робіць некалькі крокаў па пакоі, вяртаецца за стол)*. Эльза.
Э л ь з а (*жартаўліва)*. Стасік.
С т а с ь. Зараз сюды прыйдзе адзін чалавек.
Э л ь з а. Хто ён?
С т а с ь. Гэта дзяўчына.
Э л ь з а. Твая?
С т а с ь. Так. Мы зь ёй — жаніх і нявеста. Мне хацелася б, каб яна ня ведала пра тое, што здарылася між намі.

Э л ь з а *(папраўляе адзеньне)*. Я разумею. *(Патасна.)* Можаш быць пэўны: нават у выпадку, калі ўсё будзе йсьці супраць мяне, я не скажу пра нас.
С т а с ь *(ківае)*. Мы пазнаёміліся зь ёю ў іншым горадзе. Вельмі даўно. Яна мусіла ўжо прыехаць.
Э л ь з а *(зьдзекліва)*. Інтэрвію магло не атрымацца.

С т а с ь устае, больш бадзёра робіць некалькі крокаў па пакоі, вяртаецца, сядае, глядзіць на гадзіньнік.
Э л ь з а *(рэзка ўстае)*. Мне было... *(пачынае гучна гаварыць, але на сцэну выходзіць Т р о ш а, і Э л ь з а змаўкае).*

Э л ь з а сядае. С т а с ь ускоквае, сустракае Т р о ш у, нешта кажа ёй, паказваючы на Э л ь з у, яны абдымаюцца, садзяцца за стол.
С т а с ь *(пасьля некаторай паўзы, да Э л ь з ы, бадзёра).* Дык я працягваю. Праца патрульным па начох патрабуе ад чалавека сур'ёзных высілкаў ува ўдасканаленьні фізычнай і духоўнай формы. Я думаю, што толькі людзі з жалезнымі рукамі і душой здольныя адзіночкі патруляваць начныя праспэкты. Ты таксама так лічыш, Троша Поні?
Т р о ш а *(да Э л ь з ы).* Я Троша Поні.
Э л ь з а. Я Эльза. Журналістка.
Т р о ш а. Я прыйшла да свайго жаніха, Стася Вададохіна.
Э л ь з а. Я таксама. Да вашага жаніха.
Т р о ш а. Калі хтосьці кудысьці прыходзіць, гэта азначае, што там, адкуль ён прыйшоў, засталіся людзі, якія яго чакаюць.
Э л ь з а. Вы мне?
Т р о ш а. Якія цяпер журналісты, нічога не запісваюць.
Э л ь з а. А я ўсё запомніла.
Т р о ш а. Хіба вы тут пра нешта размаўлялі? *(Бярэ Стасеў кубачак.)* Стась, што табе перашкодзіла выпіць гарбату?
Э л ь з а. Я бачу, вам лепей застацца сам-насам *(устае)*.
С т а с ь. Зараз сыходзіце? *(Адбірае ў Т р о ш ы кубачак, расплёсквае гарбату, злуецца, грукае кубачкам аб стол.)*
Т р о ш а *(глядзіць на С т а с я)*. Вельмі прыемна было пазнаёміцца.
Э л ь з а. Гэта яшчэ што.
С т а с ь. Эльза, вы сыходзіце?

Т р о ш а. І вы ня выпілі сваёй гарбаты. Яна ўжо халодная.
Э л ь з а. Можаце дапіць.

Э л ь з а пакідае іх, гучыць музыка. Далей С т а с ь ходзіць па сцэне, часам ненадоўга сядаючы за стол.
Т р о ш а *(растапыранымі пальцамі ляпае па стале)*. Пам, пам, пам.
С т а с ь. Каторая гадзіна?
Т р о ш а. Ужо вечар. Як твая праца?
С т а с ь. Нармальна. Як ты сябе адчуваеш?
Т р о ш а. Нармальна.
С т а с ь. У мяне таксама ўсё нармальна. *(Пасьля паўзы.)* Якія ў цябе маленькія рукі.
Т р о ш а. Я купіла табе прадукты, пакінула ў калідоры.
С т а с ь. У мяне скончыліся грошы.
Т р о ш а. Я дам.
С т а с ь. Я не вазьму.
Т р о ш а. Як хочаш.

Паўза.
С т а с ь. У нашым горадзе зьявілася новае радыё.
Т р о ш а. Табе падабаецца?
С т а с ь. Так, вельмі. Хочаш, уключу?
Т р о ш а. Не, дзякуй.
С т а с ь *(пасьля паўзы)*. Чаму?
Т р о ш а. Давай лепей памаўчым.
С т а с ь *(з прытоенай палёгкай)*. Давай.

Паўза. С т а с ь сядае, але часам то выцягвае ногі пад стол, то забірае іх пад сябе, то разводзіць, то трасе.
С т а с ь. Я ўяўляю сабе, што ты цяпер думаеш. Ты лічыш, што я нехарошы чалавек. Магчыма, табе нават непрыемна са мной размаўляць.
Т р о ш а. Давай ня будзем пра гэта. Я ні ў чым цябе не падазраю. Мне гэта нецікава.
С т а с ь. І мне нецікава.

Паўза. С т а с ь сядае бліжэй.
А мы так ані разу й не паглядзелі ў вочы адно адному, як жаніх нявесьце і як нявеста жаніху. Ты разумееш, пра што я?
Т р о ш а. Перастань.

С т а с ь. Што перастань?
Т р о ш а. Раптам хто зойдзе.
С т а с ь. І яна туды. Мы амаль ужо маем права на ўсё.
Т р о ш а. Ты што, пацярпець ужо ня можаш?
С т а с ь. А чаму я павінен цярпець?
Т р о ш а. І ён туды!
С т а с ь *(падазрона).* Што?
Т р о ш а. Вось ты кажаш, давай патрахаемся, а я што, думаеш, жалезная?
С т а с ь. А ты думаеш, я жалезны? Я думаю пра цябе кожны вечар!
Т р о ш а *(іранічна)*. Я бачу.
С т а с ь. Я думаю пра твае рукі, уяўляю сабе тваю сьпіну, нібыта гэта мая сьпіна, разумееш, нібыта яна належыць і заўсёды належала толькі мне.
Т р о ш а. Ого! Ты рэдка гаворыш такімі доўгімі фразамі.
С т а с ь. Ты што, ня верыш мне?
Т р о ш а. Ведаеш, перад гэтым я мушу аб нечым табе сказаць.
С т а с ь. Ты, пэўна, хочаш, каб я нешта табе ўсё ж патлумачыў?
Т р о ш а. Не. *(Пасьля паўзы.)* Я расла ў невялікім мястэчку, усіх людзей успрымала іначай, чым цяпер, ставілася да таго, чаго яны дабіваліся ад мяне, наіўна, не разумеючы таго жаху і той брыдкасьці... Я прымала гэта як нейкую цікавую і часам, ня буду хаваць, прыемную гульню. Толькі значна пазьней, ужо пасьля заканчэньня школы, я пачала сур'ёзна ўсьведамляць тое, што адбывалася. Але спыніцца ўжо не магла. Мне падабалася і цяпер падабаецца ўсё незвычайнае, ліхаманкава хуткае і да сьлёз пяшчотнае, мне нават неабавязкова добра ведаць чалавека. Тое, што мы рабілі, называецца... ой, ледзь не прагаварылася. Я магла б заняцца цяпер гэтым з табой, я ведаю, што ты вельмі доўгі час гэтага чакаў, на гэта спадзяваўся і гэтым мроіў *(бярэ ягоную руку, прыкладае да сваіх грудзей)*, мне цікава было назіраць…

Паўза, С т а с ь падаецца ўсім целам наперад, прыкладае да яе грудзей другую руку.
Але ведаеш, мне яшчэ трэба разабрацца ў сабе *(адводзіць С т а с е в ы рукі)*.

Адну хвіліну яны сядзяць моўчкі, ня робячы выразных рухаў, затым С т а с е в ы плечы пачынаюць скаланацца.
С т а с ь *(зло)*. Я чакаў, што ты прыедзеш першым цягніком, а ты не прыехала.
Т р о ш а. Я прыехала. Я прыйшла не адразу.
С т а с ь. Ты разьбіралася ў сабе? Я дапамагу табе ў гэтым! Так, што ты сама ня радая будзеш!
Т р о ш а. Як я магу быць ня радая таму, што дасі мне ты. Гэта абавязкова будзе нешта вялікае, добрае, вечнае.
С т а с ь *(з агідай б'е кулаком па стале)*. Вялікае! Добрае! Вечнае!
Т р о ш а. Ну, ня трэба хвалявацца.
С т а с ь. Столькі доўгіх дзён хацець палаць — і наталяцца дымам; ледзь пацямнее, ледзь зойдзе сонца, зрываць зь нянавісьцю зь сябе мундзір і хадзіць за кожнай сустрэтай дзяўчынай, нават не хадзіць, а паляваць, перасьледаваць яе ў падваротні, дыхаць рот у рот, шалець ад рухаў і крычаць. Зрэшты, мяне не здавальняюць жанчыны. Апранутыя, яны падобныя да ружы, распранутыя — да пальца. Я сумую зь імі. Я верыў толькі табе.
Т р о ш а. А чаму гэта ты мне верыў? *(Цішэй.)* І што, я не жанчына?
С т а с ь. Я не магу ня верыць нікому. Я лепей памру.
Т р о ш а. Ой, можна падумаць.
С т а с ь. Альбо заб'ю цябе.
Т р о ш а *(ня надта слухае С т а с я)*. Аднойчы нас сабралася вельмі шмат у адным пакоі, усё працягвалася даволі доўга, сярод нас была Эльза.
С т а с ь. Гэта праўда?
Т р о ш а. Я магла й пажартаваць. Няма ніякіх гарантыяў, што я не пажартавала.
С т а с ь. Мне ня сьмешна.
Т р о ш а. А мне сьмешна.

С т а с ь робіць імклівы рывок да Т р о ш ы, тая ўскоквае, але С т а с ь даганяе і хапае яе за шыю й плячо, цягне да сябе, спрабуе сарваць з Т р о ш ы адзеньне. Раптам б'е гадзіньнік і чуецца крык "Поўнач!". С т а с ь адпускае дзяўчыну. Т р о ш а папраўляецца, бярэ руку С т а с я, цалуе ў далонь.
Асьвятленьне на сцэне паступова гасьне, пакідаючы адзін белы

прамень, накіраваны на Т р о ш у. Яна паціху адпускае руку С т а с я, затым сядае за стол. Гучыць радыё.
Т р о ш а. Вайскоўцы, пажарныя, куды ім да начных патрульных. Куды ім да тых, чый лёс зьвязаны з гарадзкімі праспэктамі, да тых, чые твары такія блізкія і мужчыну, і жанчыне, і нават пэнсіянэру *(бярэ паперу й аловак)*. А я зараз напішу ліст да Эльзы. Яна ўжо цяпер далёка, тая Эльза. Што ж ёй напісаць? Ай, ня буду! *(Штосілы кідае аловак.)* У мяне характар — ух! Я — двухжыльная!

Уваходзіць Э л ь з а, пляма сьвятла выхоплівае яе зь цемры. С т а с я на сцэне ўжо няма. Э л ь з а сядае побач з Т р о ш а й. Асьвятленьне — звычайнае.
Т р о ш а. Гэта ты, Эльза? Я ледзьве пазнала цябе. Ты мне прабач, калі ты сыходзіла, я не разьвіталася з табой, таму што была вельмі злая. Ты павінна мяне… нас са Стасікам разумець. Нас двое, і таму мы больш уразьлівыя.

Паўза, Э л ь з а ківае галавой.
Яму цяпер цяжка.
Э л ь з а *(паціскае плячыма)*. Нават ня ведаю, навошта я сюды вярнулася. Хацела сказаць, што забыла торбачку, але ў мяне не было торбачкі. Вось такі заплечнік ёсьць *(паварочваецца сьпінай)*, а торбачкі няма.
Т р о ш а. Ён ужо пайшоў на працу.
Э л ь з а. Так, так, зразумела. Я была каля фантанаў, каля жылых кварталаў, каля станцыі, а потым вярнулася сюды. Дзе толькі я ні была.
Т р о ш а. Ты такая мяккая *(кладзе далонь на руку Э л ь з ы)*.
Э л ь з а *(азіраецца й пасоўваецца да Т р о ш ы)*. Што ты маеш на ўвазе?
Т р о ш а. Эльза, у цябе такое прыгожае імя, яго хочацца пакаштаваць на язык.
Э л ь з а. Праўда? *(Саромеецца, ізноў азіраецца і яшчэ бліжэй пасоўваецца да Т р о ш ы)*. Ты мяне палохаеш, Троша Поні *(кладзе руку ёй на плячо і глядзіць у самы твар)*.
Т р о ш а. Палохаю?

Гучыць музыка, Т р о ш а спрабуе лізнуць Э л ь з у, тая

трымціць і ўскрыквае. Яны сьмяюцца.
Т р о ш а. Я б хацела зараз гарачай гарбаты.
Э л ь з а. Чаго раптам?
Т р о ш а. Ночы тут — зусім як на маёй радзіме.
Э л ь з а. А дзе ты нарадзілася, дарэчы, хто ты?
Т р о ш а *(адкідвае галаву назад, распраўляючы валасы, нейкі час летуценна пазірае некуды ўверх)*. Ах, не пытайся ў мяне пра гэта. Мне добра і тут, толькі хочацца гарачай гарбаты.
Э л ь з а. А хочаш, я сама скажу, адкуль ты? Твая радзіма — Быхаў!
Т р о ш а. Табе Стасік сказаў?
Э л ь з а. Хіба нам болей не было пра што гаварыць?
Т р о ш а. Адкуль я ведаю, я за вамі не падслухоўвала.
Э л ь з а. А што ты ведаеш?
Т р о ш а. А ты што?
Э л ь з а. Я ведаю, што ты з Быхава!
Т р о ш а. Сама ты з Быхава! Што я, дурная?
Э л ь з а. А што, я дурная?
Т р о ш а *(зьдзекліва)*. Не, ты не дурная, калі ты тут.
Э л ь з а. Пагавары мне.
Т р о ш а. Я пагаварыла Стасіку, ён мне і паверыў. Ён цяпер думае, што я неразборлівая, а ўсё гэта няпраўда. Я думаю, ён таксама мне лгаў, проста нам было сумна й хацелася нейкай вастрыні. Ён ілгаў, гэта дакладна. І я хлусіла, і пра цябе хлусіла. Я вельмі чыстая, ужо я сябе ведаю.
Э л ь з а. Не надакучыла табе?
Т р о ш а. Ой, можна падумаць!
Э л ь з а. Ну, я хоць не такая зануда!
Т р о ш а. Такая!
Э л ь з а. Мы з табою яшчэ разьбяромся.
Т р о ш а *(іранічна)*. Усё вырашыцца хутка.
Э л ь з а. Не люблю, калі ўсё робіцца хутка.
Т р о ш а. Дарэмна, у гэтым нешта ёсьць. Навошта думаць толькі пра сябе?
Э л ь з а. Калі я думаю пра цябе, мне робіцца млосна.
Т р о ш а. А ты выклікаеш ува мне пераважна шаленства!
Э л ь з а. Вельмі рэдка жанчына робіць камплімэнт другой жанчыне.
Т р о ш а. Ну й ня трэба.
Э л ь з а. Ты пакрыўдавала?

Т р о ш а. Так, але я трымаю сябе ў руках.
Э л ь з а. Калі я застануся тут яшчэ, я каго-небудзь задушу.
Т р о ш а. Пойдзем на праспэкты.
Э л ь з а. А там задушаць мяне.
Т р о ш а. Альбо мяне.
Э л ь з а. Альбо цябе.

Зацямненьне. Паўза. На сцэне мільгаюць агні — так, нібыта побач праяжджаюць рэдкія аўтамабілі, да гэтага дадаюцца гукі мататаў, часам віскат тармазоў і далёкая музыка. Сцэна неўзабаве асьвятляецца — на ёй запальваюцца тры ліхтары, пасярэдзіне на лаўцы сядзяць Т р о ш а і Э л ь з а. Дэкарацыі вуліцы.
Э л ь з а. Табе не здалося, што нехта прасьлізнуў? Там, за дрэвамі?
Т р о ш а. Апошнім часам я нікога не заўважаю, акрамя аднаго чалавека. Мне даўно не было так хораша. Ведаеш, ён верыць мне. Я заўсёды буду зь ім.
Э л ь з а. Ну й дурная.
Т р о ш а. Хопіць спрачацца са мной!
Э л ь з а *(махае рукамі)*. Раскамандавалася!
Т р о ш а. Ты проста невыносная.
Э л ь з а. Затое ты выносная.
Т р о ш а. Што ты хочаш гэтым сказаць, ты нешта маеш на ўвазе?
Э л ь з а. Вось я зараз дастану аловак і запішу ўсе твае словы.
Т р о ш а. Калі ты такая разумная, схадзі лепш па гарбату.
Э л ь з а. Думаеш, не схаджу?
Т р о ш а. Я б не схадзіла.
Э л ь з а. І я не пайду.

Паўза.
Э л ь з а. Паслухай, а ты да Стася з кім-небудзь была?
Т р о ш а. Я й са Стасем не была.
Э л ь з а. А я дык была.
Т р о ш а. Я бачыла.
Э л ь з а. І ты *ўсё* бачыла?
Т р о ш а. Я ледзьве стрымалася, каб не засьмяяцца.
Э л ь з а. Я таксама. Была нейкая мэлянхолія ў ягоных рухах.

Т р о ш а. Вось і я заўсёды думала: гэта ж колькі цярпеньня трэба мець.
Э л ь з а. Галоўнае — думаць пра нешта сур'ёзнае, пра такое, ад чаго хочацца крычаць.
Т р о ш а. А ты пра што думала?
Э л ь з а. Я ўявіла, што Стась — прусак.
Т р о ш а. Ого! Я б ніколі не здагадалася.
Э л ь з а. Ціха, глядзі, нехта набліжаецца.

Абедзьве глядзяць у адзін бок — зьлева ад сцэны. Сочачы за некім, паволі павяртаюцца тварам да залі.
Т р о ш а. Хто гэта?
Э л ь з а. На ім плямісты мундзір, а цераз усе грудзі — партупэя.
Т р о ш а. Можа, ён сходзіць па гарбату?
Э л ь з а. Я бачыла такіх людзей на фатаздымках ува ўрадавых газэтах. Гэта начны патрульны.
Т р о ш а. Бачыш, ён ускідвае пісталет.
Э л ь з а. Сапраўды, патрульны.
Т р о ш а. Якая трывожная постаць. Ён вельмі добра трымае зброю.

Чуваць стрэл, адзін зь ліхтароў гасьне. Дзяўчыны ўціскаюць галовы ў плечы. Э л ь з а імкнецца адсунуцца ад Т р о ш ы.
Э л ь з а. Ён баіцца, што мы ўцячом альбо схаваемся.
Т р о ш а. Ягонай працы не пазайздросьціш.

Ізноў стрэл, адначасова гасьне другі ліхтар. Дзяўчыны закрываюць галовы рукамі.
Э л ь з а. Цябе не параніла?
Т р о ш а. Не, не параніла. Я двухжыльная.
Э л ь з а. А мяне, здаецца, ледзь не параніла.
Т р о ш а. Няхай бы ён пайшоў, праўда?
Э л ь з а. Ну.
Т р о ш а. Зь пісталета цяжка пацэліць.
Э л ь з а. Яшчэ з такой адлегласьці.

Ізноў стрэл. Астатні ліхтар успыхвае і гарыць мацней.
Т р о ш а *(уздрыгвае)*. Вой!
Э л ь з а. У цябе патрапіла?
Т р о ш а. Ага.

Э л ь з а *(бярэ Т р о ш у за плечы)*. Ух ты. Ну ты нічога, трымаешся. Глядзі, ён сыходзіць.
Т р о ш а *(крыху спаўзае)*. Нарэшце.

Э л ь з а адна адсочвае сыход патрульнага — паволі вядзе позірк з залі ўправа. Т р о ш а тым часам паціху спаўзае.
Э л ь з а. Ягоная хада чымсьці нагадвае мне Стася.
Т р о ш а. Як ты так можаш!
Э л ь з а. Прабач.
Т р о ш а. Мне нешта халодна, я нібыта раблюся квадратам.
Э л ь з а. Лепей бы падумала, што цяпер рабіць.
Т р о ш а. Трэба пакінуць пра сябе памяць у людзях, так?
Э л ь з а. О, гэта вельмі важна.
Т р о ш а. Але я не хачу, каб людзі думалі пра мяне, я гэтага нават баюся.
Э л ь з а. Няхай думае хоць хто.
Т р о ш а. Ты будзеш пра мяне думаць?
Э л ь з а. Я не магу паабяцаць…
Т р о ш а. А Стась? *(Уздрыгвае.)* Ну вось, я ўжо паміраю. Трэба нешта прыдумаць. Гэтую насовачку *(дзьвюма рукамі дастае хустку)* перадай яму.
Э л ь з а. Усё? Ты паміраеш?
Т р о ш а. Здаецца, так.
Э л ь з а. О-го. Ты, пэўна, чакаеш, што я табе штосьці скажу?
Т р о ш а. Мне б хацелася.
Э л ь з а *(шчэрыцца, ірве хустку)*. На! *(Махае камусьці за кулісамі.)* На! Табе, можа, цікава будзе ведаць, што мы са Стасем сустрэліся на вуліцы апоўначы і так пагаварылі, як ты ня сьніла ніколі!
Т р о ш а. Гэта няпраўда.
Э л ь з а. Паспрабуй здагадацца, пра што мы гаварылі.

На сцэну выбягаюць тры с а н і т а р ы з насілкамі, накіроўваюцца да Т р о ш ы, кладуць яе на насілкі, накрываюць прасьціной і выносяць. Т р о ш а спрабуе ўстаць, але с а н і т а р ы прытрымліваюць яе рукамі. Э л ь з а пэўны час яшчэ сядзіць, неўзабаве павольна ўстае, расьціскае пальцы так, што рэшткі насоўкі падаюць на падлогу, і нясьпешна пакідае сцэну. Зацямненьне.

Дзея трэцяя

Эльза й Стась сядзяць за сталом, перад кожным — кубак з гарбатай. Гучыць радыё «Сталіца». Стась накрывае рукой далонь Эльзы.

Эльза. Ад моманту нашага знаёмства прайшло чатыры тыдні. Гэта быў цяжкі час. Я пахавала некалькі сяброў, выпадкова забітых на вуліцах гораду. Сьмерць ходзіць па краіне, і мне здаецца *(сустракаецца вачыма з вачыма Стася)*, я ведаю яе позірк.

Стась *(пасьля паўзы)*. Раскажы мне пра гэта.

Эльза. Лепей раскажа Троша Поні, яна мусіць хутка прыйсьці, ізноў сама не свая.

Стась. Ты што, клікала яе?

Эльза. Не. Ёй проста больш няма куды ісьці.

Стась. Ну й што? Ёй лепей нікуды не хадзіць.

Эльза. Што, калі яна ўсё чуе?

Трошын голас з-за кулісаў. Гэта няпраўда, я нічога ня чую.

Стась. Нават калі яна чуе, што ёй тут рабіць?

Эльза. Ты так заўсёды кажаш, пакуль яна ня прыйдзе.

Стась. Магу і пры ёй сказаць!

Эльза. А мне можаш такое сказаць?

Стась *(гучна адсоўвае ад сябе кубак з гарбатай)*. Якое такое?! Хто цябе тут трымае? *(Піхае Эльзу.)* Давай, пайшла адсюль.

Нейкі час яны змагаюцца. Стась спрабуе валачы Эльзу да дзьвярэй, але потым стомлена адпускае. Сядаюць за стол, Эльза неўзабаве кладзе сваю руку на Стасеву руку.

Эльза. Ну, не крыўдуй.

Стась *(скідае далонь Эльзы са сваёй рукі)*. Ня гладзь мяне! Што я, фіфа?

Эльза. Ты ня фіфа. Мне добра тут, я не хачу сыходзіць.

Стась. Я ведаю, чаму ты ня хочаш сыходзіць.

Эльза. Чаму? А ну, скажы!

Стась. Я проста ведаю, навошта казаць?

Эльза *(перадражнівае Стася)*. Удалы пэрсанаж! Вялікія артыкулы! Вялікія ганарары! Стась Вададохін! Гэтае імя гучыць! Ты сур'ёзна думаеш, што я чапляюся за цябе?

Стась *(шчэрыцца)*. А калі ты непакоішся пра мяне, чаму ня

скажаш Трошы Поні, каб яна болей не прыходзіла?

Чуецца гучны кашаль за кулісамі. Э л ь з а кідае туды позірк.
Э л ь з а *(прыклаўшы палец да вуснаў)*. Стасю, асьцярожней. *(Пасьля паўзы, шэптам.)* Я думаю, што…

Уваходзіць Т р о ш а. На ёй белая сукенка, чырвоная ружа на грудзёх і такая самая на сьпіне. Т р о ш а ня рухаецца нейкі час, затым павольна ўсіх аглядае. Праз хвіліну сядае за стол, кладзе рукі перад сабой і глядзіць на С т а с я.
Т р о ш а. Ну, Стасік, ці не забыўся ты сваёй нявесты?
С т а с ь *(сьпехам паказвае, нібыта цалуе ёй руку)*. Не-не!
Э л ь з а *(да Т р о ш ы)*. Бачыш, ён не забыўся.
Т р о ш а. Праўда не забыўся? А то глядзі!
С т а с ь. Не-не! Я не забыўся!
Э л ь з а. Ён праўда не забыўся, бачыш.
Т р о ш а. Не забывайся пра мяне, Стасік.

Паўза.
Т р о ш а *(да абаіх)*. Я вас віншую. Бачыла апошнія газэты, чытала. Вельмі добры стыль, шмат псыхалягізму, ёсьць элемэнты іроніі. Я б назвала гэта наватарскай сагай пра сучаснага героя.
Э л ь з а. Ну што ты.
Т р о ш а. Праўда-праўда. Ты вядзеш расповед ад першае асобы і сама робіш фотакаляжы, гэта рэдка цяпер сустракаецца.
С т а с ь. За тонкі творчы падыход Эльза атрымлівае значна болей, чым раней, да таго ж ёй выдзяляюць часам па цэлай старонцы.
Т р о ш а *(роблена ўзмахвае рукамі і ўздыхае)*. Як цікава!

Паўза.
Э л ь з а *(усьміхаецца)*. Троша, Стась хацеў аб нечым цябе запытаць.
С т а с ь *(разгублена)*. Што?
Т р о ш а *(чырванее і апускае галаву)*. Праўда?
С т а с ь *(хутка)*. Я хацеў даведацца, як ты лічыш, ці варта нам выпусьціць невялікую кніжку пра маю працу?
Э л ь з а. Ён хацеў сказаць: як доўга ты яшчэ будзеш прыходзіць?

С т а с ь. Ты што?!

Паўза.
Т р о ш а *(абводзіць абаіх позіркам)*. Та-ак. *(Глядзіць на С т а с я.)* Та-ак. Я ня ведаю, пра што вы тут безь мяне размаўляеце, аднак апошнім часам твае думкі, Стасю, мне не падабаюцца.
С т а с ь. Гэта сказаў ня я.
Т р о ш а. Ня ты? А хто?
С т а с ь. Гэта сказала Эльза.
Т р о ш а. Эльза? Яна не магла такога сказаць. Яна тут ні пры чым. Я нявеста табе, а ня ёй.
С т а с ь. Усё роўна гэта сказала Эльза.
Т р о ш а. Чаму ты хлусіш мне, Стасю? *(Кранае яго рукой.)*
С т а с ь *(ускоквае)*. Ай! Я не хлушу, ня трэба. Я ніколі б не запытаўся, як доўга ты будзеш яшчэ прыходзіць, мне гэта нават нецікава.
Т р о ш а. Нецікава?
С т а с ь (*адыходзіць далей ад Т р о ш ы*). Нецікава!
Т р о ш а. Нецікава. А дзе Эльза? Я хачу пабачыць Эльзу!
Э л ь з а. Я тут.
Т р о ш а. Эльза! Стасік забываецца мяне *(хавае рукі пад стол і ўціскае плечы)*, бачыш, у мяне ўжо зьніклі рукі і плечы, мне так сумна! Стасік!
С т а с ь. Што?!
Т р о ш а. Стасік!

Асьвятленьне робіцца цямнейшым, белыя плямы выхопліваюць толькі С т а с я й Э л ь з у за сталом, яшчэ пару разоў чуецца голас Т р о ш ы “Стасік!”, на які С т а с ь адгукаецца “Што?!”, затым асьвятленьне робіцца звычайным, Т р о ш ы ўжо няма.
С т а с ь *(падыходзіць да Э л ь з ы)*. Яна зноў схапіла мяне за руку.
Э л ь з а. Пакажы. (*Прыкладае далонь да шчакі.*) Якая халодная.
С т а с ь. Дапамажы мне зь ёй, калі ласка.
Э л ь з а. Хіба ты ня бачыш, як я дапамагаю!
С т а с ь. Я бачу, як ты магла падумаць, што я ня бачу. Аднак зрабі яшчэ вось што. Калі раптам яна зноў прыйдзе ўночы, скажы ёй, што ў знак нашай дружбы мы дорым ёй вось гэты пярсьцёнак *(дастае)*.

Э л ь з а *(беручы)*. Ой, Стась, які прыгожы пярсьцёнак, ён так дзіўна блішчыць.
С т а с ь. Ён спэцыяльны. Яна паспрабуе надзець яго на палец, у яе не атрымаецца, яна раззлуецца, сыдзе й болей ня вернецца.
Э л ь з а. Такі жоўты, падобны да сьлязы. Калі пайсьці па ім направа, то вернешся туды, адкуль пайшоў, а калі моцна прыкласьці яго да скуры, то застанецца круглы бледны сьлед. Такі самы пярсьцёнак я бачыла ў майго сябра Пётры.
С т а с ь. Зусім не такі.
Э л ь з а. Сапраўды, не такі. Там быў яшчэ прыгажэйшы камень. Мы ўжо некалькі дзён ня бачыліся з маім Пётрам. Цікава, як ён цяпер?
С т а с ь. Нават ня ведаю.
Э л ь з а. Ён вельмі любіў свой пярсьцёнак і ніколі зь ім не расставаўся.
С т а с ь. Вельмі прыгожы пярсьцёнак.
Э л ь з а. Ведаеш, які гэта чалавек? Што ты! Пётра — гэта такі чалавек, ого-го!
С т а с ь. Вельмі цікава.
Э л ь з а. Ён вось так возьме каго хочаш за каўнер *(хапае С т а с я)* і як крыкне!
С т а с ь. І што ён крычыць?
Э л ь з а. Ён сьпявае.
С т а с ь. Сьпявае?
Э л ь з а. Ён сьпявае песьні і зарабляе гэтак на жыцьцё.
С т а с ь. Мусіць, ты вельмі сумуеш безь яго?
Э л ь з а. Што ты, я так сумую, ого-го!
С т а с ь. Вельмі цікава. Ты ніяк ня можаш яго забыць?
Э л ь з а. А навошта яго забываць? Я яго, можна сказаць, кахаю. Ніколі ад яго не адыходзіла б, але што зробіш — праца.
С т а с ь. Вось яно як... А ён кахае цябе?
Э л ь з а. Ну канечне, кахае. Як добра, што гэтым пярсьцёнкам ты нагадаў мне пра майго сябра, я зараз жа пайду да яго, бо зусім больш не магу тут.
С т а с ь. Не хадзі.

На сцэне зьяўляецца П ё т р а ў белай кашулі, на ягоных грудзёх і сьпіне — па чырвонай ружы.
Э л ь з а *(спачатку палохаецца, затым нерашуча крочыць да Пётры)*. А вось і ён.

П ё т р а *(уздымае рукі і пачынае танцаваць да стала)*. А вось і я! *(Паказвае, нібы цалуе руку Э л ь з ы.)* Вітаю. *(Паказвае, нібы цалуе руку С т а с я.)* Я Пётра, а вы Стась, вельмі прыемна. *(Сядае.)* І вы сядайце побач. Якая ў вас прыгожая музыка.
С т а с ь. Тут няма музыкі.
П ё т р а. Як няма? *(Гучыць музыка.)* Вось музыка… *(ускоквае, кружыцца вакол С т а с я)* і танцы!
С т а с ь *(да Э л ь з ы)*. Я спадзяюся, твой Пётра ня думае, што я буду зь ім танцаваць?
Э л ь з а. А чаго ты ня будзеш танцаваць з маім Пётрам?
С т а с ь. Ня буду!
П ё т р а. Ну не сварыцеся, калі ласка!

Усе сядаюць.
Я прыйшоў, каб расказаць вам сваю гісторыю. Некалькі дзён таму я стаяў каля расчыненага акна. Ужо было вельмі цёмна, я чытаў сьвежую газэту, дзе якраз было напісана аб новым раскладзе працы начных патрульных. Спалохаўшыся, што хтосьці зь іх мяне заўважыць, я кінуўся зачыняць акно, але раптам у самыя грудзі мне ўперлася кароткая чорная руля. Чалавек, які трымаў пісталет, быў патрульны. Ён нечакана выйшаў зь цемры і сказаў: “Вы Пётра?” І пасьля таго, як я кіўнуў, ён сказаў: “Зараз вы памрацё, мая куля разаб’е вам сэрца, і вы павольна асядзеце на падлогу, уздрыгваючы рукамі, і здранцьвелыя вашыя вочы мякка паглядзяць у неба, але ніколі ўжо яны не пабачаць сонечнага сьвятла”. — “Што такое!” — закрычаў я, і тады патрульны сказаў: “Вы памрацё, Пётра, за каханьне сваёй сяброўкі Эльзы і за ейнае няўменьне яго хаваць. Нават калі мы кахаемся, — працягваў патрульны, — яна ўскрыквае вашае імя”. Тады я сказаў: “Падумаць толькі, зараз я памру за каханьне сваёй сяброўкі Эльзы! Эльза, такая мілая дзяўчына, — працягваў я, — і раптам я памру празь яе”. Зразумеўшы ўсё, я ўзяў у рукі свой любімы пярсьцёнак і сказаў: “Выратуй мяне, мой любы пярсьцёнак, я ніколі не расставаўся з табой, ты такі прыгожы, калі пайсьці па табе направа, то вернешся туды, адкуль пайшоў, а калі моцна прыкласьці цябе да скуры, то застанецца круглы бледны сьлед”. Сказаўшы такія словы, я прыціснуў пярсьцёнак да сябе, паміж руляй і грудзьмі. Пасьля гэтага патрульны мяне забіў. Потым ён крыху

пакруціўся пад акном і, мабыць, наважыўшыся, залез да мяне ды прамармытаў: “А пярсьцёнак я вазьму. Шкада, што вываліўся камень”. Вось якую гісторыю я вам расказаў.
С т а с ь. Вельмі цікава.
Э л ь з а *(праз плач)*. Ох, Пётра, як гэта было цікава! Дай я пацалую цябе!
П ё т р а. Не-не! Лепей проста аддай мне пярсьцёнак.
Э л ь з а. Дык ты дзеля гэтага прыйшоў?
П ё т р а. Так.
Э л ь з а. Я не аддам.
П ё т р а. Як не аддасі? Я прыйшоў па яго.
Э л ь з а. Аніяк не аддам. Ідзі, адкуль прыйшоў. Ты мёртвы, а пярсьцёнак патрэбны жывым.
П ё т р а *(ускоквае, ходзіць)*. Ах, так? Ведай жа, Эльза, што я ніколі не кахаў цябе і заўсёды зь цябе сьмяяўся. Ведай жа, што я нярэдка цябе падпойваў і аддаваў сябрам. Мы ўсе сьмяяліся зь цябе, а я гучней за ўсіх!
Э л ь з а *(мяняецца тварам)*. Дык гэта праўда? Я ведала пра гэта! Мне распавялі!
П ё т р а. Хто табе распавёў?!
Э л ь з а. Хто распавёў, той ужо мёртвы!
П ё т р а *(да С т а с я)*. Праўда, мёртвы?
С т а с і к *(сьціпла ківае)*. Яна надта часта пра яго казала.
П ё т р а *(да Э л ь з ы)*. Дык не аддасі?! *(Падскоквае да яе і хапае за руку, Э л ь з а крычыць, П ё т р а сьмяецца.)* А-га-га-га-га! А-га-га-га-га-га!

Э л ь з а з крыкам падае на падлогу й плача. Неўзабаве асьветленай застаецца толькі яна. Чуваць крык “Поўнач!”. Доўгі час нічога не зьмяняецца, затым асьвятленьне робіцца звычайным. За сталом сядзіць Т р о ш а. П ё т р ы й С т а с я няма. Э л ь з а глядзіць на Т р о ш у. Тая п’е гарбату і прагна заядае курыцай. На ёй тая ж вопратка.
Э л ь з а. Ты зноў прыйшла? А Стася няма.
Т р о ш а. Знаю, ён працуе.
Э л ь з а. Ты прыйшла да мяне?
Т р о ш а. Так, да цябе. Ну, і паесьці таксама. Што, дасталося табе?
Э л ь з а. А я Пётру так раней кахала. Не хацелася верыць, што ён сапраўды такі.

Т р о ш а. Гэта няважна.
Э л ь з а. Чаму гэта няважна?
Т р о ш а. Яго шмат хто кахаў, я таксама яго кахала.
Э л ь з а. Ты яго ня ведала!
Т р о ш а. Можа, ня ведала, а мо й ведала.
Э л ь з а. Можа, кахала, а мо й не.
Т р о ш а *(падумаўшы, сьмяецца)*. Ага. Болей за ўсё я кахала Стася.
Э л ь з а. А за што ты яго кахала?
Т р о ш а. А ні за што. За біцэпсы.
Э л ь з а. Я таксама люблю яго за біцэпсы.
Т р о ш а. Гэта ты за мной паўтарыла.
Э л ь з а. А чаму ты прыходзіш так часта? Табе сумна?
Т р о ш а. Мне заябіся.
Э л ь з а. Ой, ты мацюкаешся?
Т р о ш а. А то! Канечне, мацюкаюся!
Э л ь з а. Можна, я таксама мацюкнуся?
Т р о ш а. Давай.
Э л ь з а. Дупа.
Т р о ш а. Хуй!
Э л ь з а *(паказвае)*. Фак! Фак! Фак!
Т р о ш а. Фак! Фак! Фак!

Сьмяюцца.
Э л ь з а. Файна, мацюкалася б усё жыцьцё!
Т р о ш а. Ага, і я б мацюкалася! *(Спакайнее.)* Усё жыцьцё.
Э л ь з а. Так, і ты б мацюкалася. Усё жыцьцё.

Паўза. Дзесьці далёка чуецца стрэл.
Т р о ш а. Ты цяпер такая модная.
Э л ь з а. Каб ня Стась…
Т р о ш а. Стася стварыла ты. Ты зрабіла зь яго героя.
Э л ь з а. Ён ня мог ня стаць героем.
Т р о ш а. Ён ня стаў героем са мной. *(Паўза.)* А як твае сябры?
Э л ь з а. Нешта ўсіх забілі.

Паўза. Т р о ш а гучна ўздыхае, але Э л ь з а махае на яе рукой.
Э л ь з а. Ціха, тут нехта ёсьць!

Т р о ш а. Гэта няпраўда, тут нікога няма.
Э л ь з а. Няўжо ты ня чуеш?
Т р о ш а. Я паўтару, што са мной Стась героем ня стаў.
Э л ь з а. Значыць, такі ён герой.
Т р о ш а. Твой герой.
Э л ь з а. Што мы ўсё не пра тое. Троша, мы са Стасем хацелі б падараваць табе вось такі пярсьцёнак.
Т р о ш а *(ускоквае)*. Што гэта за пярсьцёнак?
Э л ь з а. Гэта табе, Троша. Ён спэцыяльны.
Т р о ш а. Я бачу. Я не вазьму.
Э л ь з а. Абавязкова бяры, Троша, мы даруем яго табе ў знак дружбы.
Т р о ш а. Мне трэба пачакаць Стася.
Э л ь з а. Табе трэба, мне трэба, ты толькі пярсьцёнак вазьмі.
Т р о ш а. Ты казала, тут нехта ёсьць.
Э л ь з а. Ну і што?
Т р о ш а. Хто тут?! Выходзьце да нас! Нікога няма? *(Глядзіць уверх і зьдзіўляецца.)* Што гэта такое?

Зьверху спускаецца К о н а н, ён падвешаны за шыю на чырвонай вяроўцы. Яго галава ляжыць на плячы, вочы вырачаныя, вусны пафарбаваныя чорным. За мэтар ад падлогі ён спыняецца.
Э л ь з а. Ой, Конан. Я ледзьве пазнала цябе.
Т р о ш а. Гэта твой знаёмы?
Э л ь з а. Што ты, гэта такі знаёмы, ого-го!
К о н а н. Добрай ночы.
Т р о ш а. Як ён прыгожа вісіць.
К о н а н. Вам бы так вісець.
Э л ь з а. Конан, а пра тваю сьмерць я нічога ня ведала.
К о н а н. Ня дзіва. Яна здарылася толькі што.
Э л ь з а. Ты вельмі пакутаваў?
К о н а н. Як звычайна. Гэта ўжо мая чацьвертая спроба самагубства.
Э л ь з а. Я б столькі не змагла.

Паўза. Ніхто ня ведае, што казаць.
Э л ь з а *(раптам крычыць, каб нечым заняць гасьцей)*. Ой, прусак!
К о н а н. Не глядзеце на мяне, гэта ня мой прусак.

Э л ь з а. Тады адкуль ён тут?
К о н а н. Яны паўсюль.
Э л ь з а. Конан, па-мойму, яны сыплюцца з твайго рота.
Т р о ш а. Не, гэта ня так, паглядзі, адкуль у яго прусакі?
Э л ь з а *(крычыць на Т р о ш у)*. Табе што?
Т р о ш а. Не крычы на мяне!
К о н а н *(раптам хлопае сябе па сьцёгнах)*. А-а-а! А-га-га-га-а-а!
Т р о ш а. Не крычы на мяне! Не крычы на мяне!
К о н а н. А-а-а! А-га-га-га-а-а!
Э л ь з а. Замаўчыце! Замаўчыце!

Усе крычаць. Узьнікаюць цені, яны паўзуць па падлозе з усіх бакоў, цягнучы рукі да Э л ь з ы, і таксама пачынаюць крычаць, звычайна называючы свае імёны і дадаючы: “Я твой сябар! Ты помніш мяне?! А-га-га-га-га-га-га!” Гучаць бубны і вельмі рэзкая музыка. Э л ь з а кідаецца па сцэне, яе хапаюць і валяць на стол, К о н а н разам зь вяроўкай саскоквае на падлогу і перацягвае вяроўкай горла Э л ь з ы. Нечакана ўсе адначасова заціхаюць і чуецца С т а с е ў голас: “Эльза!” Цені адбягаюць ад стала. С т а с ь зь пісталетам стаіць на ўваходзе й азірае ўсіх. Э л ь з а, задыхаючыся, прыўзьнімаецца.
С т а с ь. Эльза! Што тут робіцца?
Э л ь з а. Ідзі, Стась, ідзі. Табе належыць мой дзень, а ім належыць мая ноч.
С т а с ь. Я прыйшоў да цябе *(ідзе да стала)*.
Э л ь з а. Чаму ты не пакінуў пісталет на працы?
С т а с ь. Ён спатрэбіцца мне. Я сёньня вельмі шмат думаў, Эльза. Я нібыта пражыў сёньня цэлае жыцьцё.
Э л ь з а. І чаму навучыла цябе тваё жыцьцё?
С т а с ь. Яно навучыла мяне забіваць.
Э л ь з а. Забываць?
С т а с ь. Нечакана нарадзіліся словы. Я вельмі палюбіў цябе, а ты ніколі ня бачыла ўва мне глыбіні й прыгажосьці. Але ўва мне ёсьць таямніца, у мяне ёсьць сьмерць. Гэта апошняе, чаго ты яшчэ ня зьведала. Мае ночы перастануць быць пустымі *(прыкладае пісталет да грудзёў Э л ь з ы)*.
Э л ь з а. Што, цяпер?
Ц е н і, Т р о ш а, К о н а н *(разам)*. Цяпер! Ба-бах! *(Падыходзяць на крок.)*

Э л ь з а, здрыгануўшыся, скочваецца на падлогу, цяжка ўзьнімаецца, абняўшы грудзі рукамі. С т а с ь ізноў набліжаецца й прыкладае рулю да ейнае галавы.
Ц е н і, Т р о ш а, К о н а н *(разам)*. Ба-бах! (*Падыходзяць на крок.*)

Э л ь з а падае, некаторы час паўзе.
Ц е н і, Т р о ш а, К о н а н *(разам)*. Ба-бах! Ба-бах! *(Пачынаюць рухацца па сцэне, з гэтага руху нараджаецца танец.)* Ба-бах!

Э л ь з а й С т а с ь зьнікаюць за целамі Ц е н я ў, толькі часам бачна, што Э л ь з а ляжыць на падлозе і яе абнімае С т а с ь. Потым бачна, як С т а с ь прыкладае пісталет да сябе і страляе.
Музыка, танец, фаервэрк.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/05/02**
[image]

Макс Шчур

Госьць з будучага, альбо фэномэн Хадановіча

Безумоўна, Хадановіч —
Гэта вам не Багдановіч.

“Пасланьне ад беларускага пошт-мадэрніста”

Зьяўленьне Андрэя Хадановіча ў беларускай паэзіі было доўгачаканым: недарэмна некаторыя беларускія крытыкі лічаць яго адкрыцьцём канца мінулага тысячагодзьдзя. Хадановіч, без сумневу, уяўляе сабой новы тып беларускага паэта, а менавіта паэта-прадпрымальніка — у адрозьненьне ад папярэдняга тыпу, паэта-пралетара. Калі папярэдні й сёньня яшчэ паноўны тып беларускага творцы льга цалкам справядліва азначыць за сацыялістычны, дык Хадановіч — вытворца новага, чыста капіталістычнага, ці то індустрыяльнага, тыпу. Насамрэч, зьяўленьне новага тыпу творцы і абумоўленае творчым крызысам творцаў сацыялістычнага тыпу, які завёў беларускую літаратуру ў тупік і там кінуў, ня здолеўшы яе адтуль самастойна вывесьці.

Чым быў паэт-пралетар? Студэнтам-філфакаўцам вяскова-местачковага паходжаньня, носьбітам вясковай дыялектнай культуры, які ў цяжкіх умовах жыцьця прафэсійнага інтэлігента

ў вялікім месьце спакваля ператвараўся ў алькаголіка. Для савецкага рэжыму, аднак, было надзвычай істотным менавіта ягонае паходжаньне, а не ягоныя прафэсійныя якасьці. Паходжаньне ў савецкія часы было ўсім. Народнасьць патрабавалася ня толькі ад твораў, але й ад саміх творцаў — правінцыйнасьць паходжаньня лічылася гарантыяй “аўтэнтычнай беларускасьці” мысьленьня аўтара. “Калі б мы пасьлядоўна кіраваліся меркаваньнем гэтых крытыкаў, нам прыйшлося б пісаць на мове індзейцаў кераны пра паляваньне на страўса. Усё астатняе было б прыўнесеным і антынацыянальным”, — іранічна пракамэнтаваў калісьці Эрнэста Сабата падобную тэндэнцыю ў аргентынскай літаратуры. Тым ня менш, на працягу існаваньня сацыялістычнай сыстэмы беларускія пісьменьнікі былі верныя гэтаму прынцыпу вонкавай “народнасьці”. “Сьвятая прастата” была папросту наканаваная беларускім літаратарам у якасьці творчага рэцэпту, таму беларускаму інтэлектуалу заўсёды прыходзілася граць ролю прасьцячка. Трапляючы ў “вялікае” места, паэт-вясковец ператвараўся ў пралетара “разумовае працы”. Адначасова ён адчуваў сябе разгубленым: дзьверы нагору былі для яго зачыненыя. Трэ было ведаць чароўнае слова, якое б адмыкала гэтыя дзьверы. Такім чароўным словам было імя таго ці іншага знаёмага ў “вышэйшых сфэрах”, на вышэйшых прыступках сацыяльнай лесьвіцы. Адсюль — вечнае панібрацтва, зямляцтва й кумоўства ў асяродзьдзі беларускіх літаратараў. Маўляў, мы, пралетары, хлопцы простыя: ня той паэт, хто піша вершы, а той паэт, хто вып’е першы. Такі прынцып стасункаў быў прышчэплены беларускай інтэлігенцыі партыйнымі бонзамі недарэмна, а менавіта з мэтай трымаць яе ў падпарадкаваньні й стане салодкага гіпнатычнага самаап’яненьня. І сапраўды, вяскоўца-местачкоўца купіць проста: варта толькі прапанаваць яму працу й кватэру ў сталіцы. А потым усё паводле прынцыпу “ты мне, я табе”. Якая розьніца, хто як піша, дый ці піша што наагул? Галоўнае, што ўсе мы “свае хлопцы”, глядзі байку Крылова пра зязюлю й пеўніка. Аб якой якасьці літаратуры, аб якіх ідэалягічных спрэчках ільга гаварыць у сытуацыі, калі ўсялякая крытыка ўспрымаецца як асабісты напад і выклікае рэакцыю кшталту “Ты мяне паважаеш?”. На жаль, так яно шмат у чым застаецца й да сёньняшняга дня.

Тым часам як беларускія савецкія паэты ўвасаблялі сабой гэткі прафэсійны дылетантызм, беларускі постсавецкі паэт Хадановіч увасабляе сабой штосьці зусім адваротнае — дылетанцкі прафэсіяналізм. У гэтым сэнсе ягонае зьяўленьне сапраўды рэвалюцыйнае. Чаму ж, выбачайце, “дылетанцкі”, запытаецца чытач? Хіба творы Хадановіча насамрэч не вылучаюцца надзвычайнай тэхнічнай дасканаласьцю? І ці ня ёсьць сам выраз “дылетанцкі прафэсіяналізм” папросту абсурдным? Абсурднай ёсьць, перадусім, вера ў існаваньне нейкага “прафэсіяналізму” ў мастацтве. Прафэсіяналізм — фэномэн не мастацкі, а эканамічны. Ягоная спэцыфіка ў дачыненьні да мастацтва палягае ў тым, што ён ператварае ўсялякую творчасьць у вы-творчасьць і такім чынам робіць зь яе сэрыйную прадукцыю. Таму сама ілюзія “прафэсіяналізму ў мастацтве” разьлічаная на дылетантаў: ствараюць яе тыя, хто верыць у абгрунтаванасьць апазыцыі “прафэсіянал—дылетант” і, баючыся быць залічаным да другіх, падкрэсьлівае сваю прыналежнасьць да першых. Што ж, у такім выпадку не пашкодзіць прааналізаваць, у чым насамрэч палягае гэтая іхная “прафэсійнасьць”.

Паэт, паводле створанага Хадановічам уласнага вобразу, павінен нагадваць навукоўца, які паэзіяй *займаецца*, для каго паэзія ёсьць уласнай *справай* (бізнэсам), якую ён вывучае хутчэй зь пільнасьцю патолягаанатама, чымся з апантанасьцю Джэка-Трыбушэньніка, як, прыкладам, бумбамлітаўцы. Ад самага пачатку ён імкнецца заявіць аб сваім прафэсіяналізьме й “прафэсійных” якасьцях, як быццам неабходных для таго, каб заняць адпаведнае ягоным здольнасьцям месца ў “фірме”. Як ён разумее гэты своеасаблівы паэтычны прафэсіяналізм? Як штосьці, што павінна было б быць бачнае кожнаму, а таму й вызначацца паводле нейкіх “аб’ектыўных” крытэраў. Аднак ці магчымая ў мастацтве нейкая аб’ектыўнасьць? Калі нейкія аб’ектыўныя крытэры й існуюць, дык чыста *вонкавыя* — прыкладам, авалоданьне тэхнікай вэрсыфікацыі й абазнанасьць у гісторыі рамяства (“прафэсійная кампэтэнтнасьць”, “валоданьне літаратурай”, “начытанасьць”) ёсьць своеасаблівым кваліфікацыйным *мінімумам*, які *кожны* (то бок, літаральна *ўсялякі*) паэт павінен перасягнуць дзесьці яшчэ на пачатку сваёй паэтычнай творчасьці. У Хадановіча гэты

пачатак, здаецца, крыху зацягнуўся: з уласьцівым яму пэрфэкцыянізмам ён імкнецца давесьці разьвіцьцё гэтых чыста вонкавых, другасных адзнакаў паэта да *максымуму*, я б сказаў, *ad absurdum*. У гэтым яшчэ бяды няма, але мне здаецца, што нават гэтае разьвіцьцё ў Хадановіча ёсьць крыху самамэтным і стварае толькі павярхоўнае ўражаньне разьвіцьця.

Што адрозьнівае Хадановіча ад іншых беларускіх паэтаў? Перадусім тое, што ён дбайны й сумленны вэрсыфікатар. Магчыма, дзеля традыцыйнага комплексу перад “вялікай расійскай літаратурай” у беларускай літаратуры існуе своеасаблівы культ добрага вэрсыфікатара. Прыкладам, нават такі майстра вершаванага слова, як Сяржук Сокалаў-Воюш, уважае валоданьне клясычнай вэрсыфікацыяй за адну з асноўных рысаў “сапраўднага паэта” — пры гэтым ён чамусьці ня лічыць паэзіяй і не імкнецца асабліва афішаваць уласныя практыкаваньні ў гэтай галіне, якія, трэба сказаць, нічым ня горшыя за Хадановічавы што да мовы й да паэтычнага ўзроўню, а што да гумару — дык, на мой густ, і нашмат лепшыя. Аднак, у адрозьненьне ад Воюша — які ведае пра розьніцу паміж паэтам і вэрсыфікатарам і ўсё яшчэ імкнецца заставацца паэтам, Хадановіч, які таксама аб гэтай розьніцы ведае, зь нейкай прычыны імкнецца быць чымсьці зусім адваротным — вэрсыфікатарам *par excellence*.
Насамрэч, добры паэт можа быць добрым, сярэднім альбо благім вэрсыфікатарам. Напрыклад, Колас, з майго гледзішча, ёсьць лепшым і больш сумленным вэрсыфікатарам, чымся Купала; Пушкін як вэрсыфікатар быў, мякка кажучы, папросту жудасны, а такія паэты, як Уітмэн, Лёрка альбо Элюар, наагул залішне не абцяжарвалі сябе вэрсыфікацыяй. Добры паэт і адначасова добры вэрсыфікатар — зьява насамрэч выключная ня толькі ў беларускай літаратуры. На розных этапах гісторыі літаратуры гэтыя дзьве якасьці то дапамагаюць, то перашкаджаюць адна адной у разьвіцьці. Залежыць гэта ад таго, наколькі разьвіцьцё мовы адпавядае разьвіцьцю чуйнасьці, мысьленьня й астатніх рэчаў, што звычайна паведамляюцца ў гэтай мове. Звычайна ўсялякая жывая мова своечасова рэгіструе гэтае разьвіцьцё, то бок “не адстае” ад яго. Беларуская мова, з прычыны сваёй няпростай сучаснай сытуацыі, вымушаная гэтае разьвіцьцё мімэтызаваць, імітаваць,

а часам і сымуляваць. Няхай так: калі йдзецца пра актуальнае, то бок сапраўднае разьвіцьцё, нават такі спосаб ягонай рэгістрацыі ёсьць цалкам легітымным. Але ў выпадку Хадановіча йдзецца не пра разьвіцьцё ідэй альбо чуйнасьці, але пра самамэтнае разьвіцьцё самой мовы: здаецца, што Хадановіч імкнецца ня толькі дагнаць, але й перагнаць “прывід постмадэрнізму”. Аднак, парадаксальным чынам, сама па сабе тэндэнцыя чыстага й самамэтнага разьвіцьця формы ёсьць тыпова мадэрнісцкай зьявай і мае нашмат больш супольнага зь мінуўшчынай, чымся з сучаснасьцю: падобная зьместам спрэчка паміж абаронцамі сацыяльнай паэзіі й прыхільнікамі “чыстай красы” адгула ў беларускай літаратуры яшчэ на пачатку мінулага стагодзьдзя. Менавіта гэтую некалі недастаткова разьвітую ў беларускім кантэксьце ідэю “літаратуры дзеля літаратуры” імкнецца сёньня культываваць Хадановіч. Ці ёсьць такое разьвіцьцё насамрэч разьвіцьцём? Цяжка сказаць.

На сустрэчы з расійскім паэтам Яўгенам Рэйнам у 1994 годзе ў Менску нехта з публікі задаў пытаньне, ці не здаецца яму, што ягоны сябар і калега Бродзкі (тады яшчэ жывы) апошнім часам ператвараецца ў “машыну стварэньня вершаў”. Рэйн ухіліўся ад простага адказу, аднак далікатна заўважыў, што такое меркаваньне мае свае падставы і што чалавек, які задаў пытаньне, “насамрэч штосьці разумее ў паэзіі”. Я прыводжу гэты прыклад дзеля таго, каб паказаць, што Хадановічаў “творчы мэтад” зусім ня ёсьць ягонай вынаходкай. Ягоная творчасьць ёсьць працягам тэндэнцыі, праявы якой наймацней выяўляюцца ў шматлікіх расійскіх паэтаў мінулага стагодзьдзя — Бальмонта, Гумілёва, Пастарнака, Бродзкага й іншых.
Ад часоў уваходжаньня ў моду французскага сымбалізму (аматарам якога невыпадкова зьяўляецца Хадановіч) у расійскай паэзіі зьявілася тэндэнцыя да абсалютызацыі формы, якая сёньня, як можна бачыць, ператварылася ў ейны праклён: цяпер у Расіі паэтам лічыць сябе кожны, хто здольны зарыфмаваць між сабой два радкі. Такім чынам, узьнікае сытуацыя, калі “поэт в России *меньше*, чем поэт”. Сёньняшняя беларуская вершаваная прадукцыя ў расійскай мове сутыкаецца з такой самай цяжкасьцю. На Захадзе, дзе мадэрнісцкая рэвалюцыя (у Расіі й у Беларусі задушаная ў 30-я

гады) прынесла з сабой пераадоленьне сымбалізму разам зь ягонай патрэбай пошуку дасканалай формы, існуе хутчэй адваротная праблема: там паэтам лічыць сябе ледзь ня кожны, хто няздольны зарыфмаваць ані двух радкоў (што пасьля “паэтаў-ляўрэатаў” кшталту Брыджыса й Тэнісана — цалкам зразумелая зьява). Абедзьве крайнасьці, нягледзячы на сваю вонкавую супрацьпастаўленасьць, ёсьць прыкметамі сучаснага крызысу ў паэзіі, у атмасфэры якога звычайная графаманія дзіўным чынам ператвараецца з хваробы ў эпідэмію: колькасьць творцаў катастрафічна павялічваецца, якасьць твораў катастрафічна зьніжаецца (альбо папросту губляе сваю значнасьць), у выніку гэтага размываюцца самі крытэры якасьці. Ня думаю, аднак, што творчасьць Хадановіча ёсьць праявай эпідэміі графаманіі ў беларускай літаратуры: тая адгула дзесьці пры канцы 80-х — пачатку 90-х. Хутчэй, ён ёсьць ейным вынікам — своеасаблівым вірусам, які своечасова мутаваў і прыстасаваўся да новых умоваў эпохі “беларускага постмадэрнізму”, больш дакладна кажучы — Лукашэнкавай рэакцыі. Бессэнсоўна адмаўляць, што “вірус” гэты прыйшоў да нас праз расійскую паэтычную традыцыю: ягоным носьбітам уласьцівая залішняя заклапочанасьць дасканаласьцю формы й заўсёдная гатоўнасьць ахвяраваць дзеля яе зьместам.

Пачынаючы з савецкіх часоў, моўны фармалізм у беларускай літаратуры заўсёды асабліва квітнеў у вершах правінцыйных паэтаў, якія хацелі пісаць “ня горш за гарадзкіх”, гэтаксама як Хадановіч, мне здаецца, імкнецца пісаць “ня горш за расійцаў” ці там “за французаў” — што ў яго самога ня надта выходзіць. (Адзначу, што, з майго гледзішча, мэта беларускага паэта павінна палягаць у тым, каб пісаць не “ня горш”, а *лепш* за расійцаў і за французаў. У сытуацыі беларускай літаратуры, што пакуль не спарадзіла паэта насамрэч сусьветных маштабаў, пісаць лепш за астатніх — парадаксальным чынам, лягчэй, чымся для прадстаўнікоў іншых літаратураў.) Вяртаючыся да тэмы: нягледзячы на ўзьніклы ў савецкія часы культ добрага вэрсыфікатара, галоўная плынь беларускай паэтычнай традыцыі выразна адчувае розьніцу паміж паэзіяй і вэрсыфікацыяй і ў адрозьненьне ад Хадановіча здагадваецца аб тым, што пазбаўленая зьместу форма ня можа быць “бездакорнай”. Беларускі чытач заўжды аддаваў перавагу паэту

над вэрсыфікатарам: доказам могуць быць вершыкі кшталту “Пятро Глебка піша крэпка”, “Пятрусь Броўка піша лоўка” й г.д. Нават у выпадку, калі добры вэрсыфікатар ёсьць яшчэ й добрым паэтам, ягонае майстэрства вэрсыфікацыі зусім ня кідаецца ў вочы, застаецца ў цені й саступае месца сутнасьці — клясычным прыкладам гэтага можа быць Ніл Гілевіч. Менавіта таму спрактыкаванаму літаратару дастаткова кінуць адзін позірк на Хадановічавы радкі, каб пераканацца, што зьмест у яго цалкам другасны й падпарадкаваны задачы вырабу як мага больш “дасканалай” (зь ягонага гледзішча) формы. Аднак якім бы “выкшталцоным” ні было Хадановічава паэтычнае майстэрства, яго яўна не стае, каб гэта схаваць.
І ўсё-такі варта аддаць Хадановічу належнае: сярод астатніх беларускіх паэтаў ён насамрэч ня мае канкурэнцыі ў працы з мовай. Праца гэтая, аднак, стварае ў мяне асабіста ўражаньне аднастайнай, бяздушнай, мэханічнай. Адсюль паходзіць і ўражаньне сэрыйнасьці вырабу ягонай вершаванай прадукцыі, якая па сваёй сутнасьці вельмі аднастайная: ад чытаньня Хадановіча ў мяне складаецца ўражаньне, што беларуская паэзія вычарпала свае выяўленчыя сродкі і што ёй бракуе ня столькі тэмаў, колькі аўтараў і — перадусім — чытачоў.

Нягледзячы на тое, што жаданьне “пісаць нязмушана” прамаўляе ў кожным Хадановічавым радку, у кожнай рыфме, нельга не заўважыць наўмыснасьці, штучнасьці, праграмовасьці й запраграмаванасьці гэтага ягонага памкненьня. Нельга не заўважыць, што Хадановіч імкнецца пісаць па-беларуску так, як быццам па-беларуску ўсе наўкол гавораць. Вядома, калі б так насамрэч было, тады й Хадановіч сапраўды быў бы тым, кім ён хоча быць: клясычным постмадэрністам, паэтам “для ўсіх”, “народным” паэтам і г.д. Але пакуль што гэта толькі “мара”, якая знаходзіць сваё найлепшае адлюстраваньне менавіта ў цалкам ухвальным памкненьні Хадановічавай паэзіі да нязмушанасьці. Памкненьне да нязмушанасьці, аднак, яшчэ ня ёсьць самой нязмушанасьцю. Як ні круці, а “падмануць свой час” ня гэтак проста. А ліха зь ім: нельга падмануць чытача сучаснага, дык падманем прынамсі будучага. Няхай адукаваны нашчадак зьдзіўляецца, як спрытна рыфмавалі ў беларускай мове яшчэ сто гадоў таму, калі па-беларуску *яшчэ* ніхто не гаварыў. Вось такі ўтапічны футурызм. А як жа наконт

сучаснасьці? Ці, можа, у сучаснасьці паэты зусім непатрэбныя? Альбо гэта сучаснасьць непатрэбная дый нецікавая паэтам? Было б, аднак, памылкай думаць, што Хадановіч “ахвяруе” зьместам дзеля формы: паводле ўсіх прыкметаў, ён належыць да катэгорыі тых “літаратараў”, якім асабліва няма чым ахвяраваць. Я думаю, што як паэту Хадановічу папросту няма чаго сказаць і ён, хутчэй за ўсё, сам аб гэтым цудоўна ведае. Пры ўсім гэтым у Хадановіча няма нічога, чаму іншы паэт (падкрэсьліваю, што кажу, перадусім, за сябе) мог бы навучыцца толькі ад яго й ні ад кога іншага. А як казаў Вальтэр Бэньямін, “аўтар, які нічому ня вучыць пісьменьніка, ня вучыць нікога”.
Аднак тут варта крыху паспрачацца. Магчыма, менавіта дзякуючы Хадановічу калі ня гэтая, дык наступная генэрацыя беларускіх паэтаў будзе: 1) мець большую культуру мовы; 2) ставіцца зь меншым піетэтам да чыста вонкавых праяваў гэткай культуры, калі тая ператворыцца ў абавязковае правіла “добрых паводзінаў” літаратара; 3) пачне чытаць больш беларускай паэзіі й спрыяць натуральнаму ўзьнікненьню ўнутрыбеларускага (а не расійска-беларускага, як у Хадановіча) інтэртэкстуалізму. У гэтым сэнсе Хадановіч — паэт надзвычай *прагрэсіўны* (што ёсьць для яго адначасова найлепшым камплімэнтам і найлепшым азначэньнем; менавіта да гэтага ён і імкнецца). Ён ёсьць хоць і ня першай (узгадайма Бабкова, Мінкіна), але ж усё-такі ластаўкай, якая сьведчыць аб надыходзе новага культурнага клімату ў асяродзьдзі беларускамоўных творцаў. Для тых, хто лічыць паэзію кшталтам моўнага практыкаваньня й вэрбальнай гульні, Хадановіч, напэўна, будзе аднойчы неператаўзыдзеным ідалам, узорам для (не-)прыпадабненьня, архетыпам “стылягі” ад літаратуры — гэта, пэўна, пры ўмове, што ён перастане быць чыста кулюарнай зьявай у вузкім асяродзьдзі, блізкім часопісу «ARCHE», і што яго пачнуць чытаць і друкаваць іншыя.

Такім чынам, Хадановіч — ідэальны прататып будучага беларускага паэта сярэдняга ўзроўню, які ў любой дастаткова разьвітай сучаснай літаратуры ўдае сабой тло, кантэкст, мэйнстрым — тую глебу, якая неабходная для ўзыходжаньня заўсёды рэдкіх парасткаў геніяльнасьці. Таму выглядае крыху сьмешна, калі ўжо сёньня Хадановіча імкнуцца выдаваць за

прыклад таго, што, мяркуючы зь ягоных вершаў, настане яшчэ ня хутка.
Мяне асабіста пры ўсім гэтым абурае толькі адно: поўная адсутнасьць у Хадановічавых вершах пачуцьця гумару. Гумар Хадановіча — гэта, як казаў Караткевіч, “гумар шыбеніка”. Пры гэтым Хадановіч імкнецца выдаць свой “гумар” за асноўны “зьмест” сваіх вершаў, тым часам як сам карыстаецца ім выключна дзеля таго, каб хоць неяк апраўдаць штучнасьць сваіх сынтаксычных канструкцыяў, прыхаваць напружанасьць сваіх моўных пошукаў ды стварыць павярхоўнае ўражаньне лёгкасьці й нязмушанасьці, якое пасуе сапраўднаму “мэтру”. Шмат хто лічыць, што гэта яму ўдаецца. Аднак мне здаецца, што гумар і несур’ёзнасьць — ня тое самае. Пачуцьцё гумару паходзіць, бадай, не ад здольнасьці да моўнай эквілібрыстыкі, а ад здольнасьці да аналізу й да крытычнага, адстароненага стаўленьня да сябе. На жаль, Хадановічу гэтае стаўленьне ня надта блізкае. Гэта відаць з таго, як ён сабе дазваляе (ці, дакладней, яму дазваляюць) займаць у дачыненьні да астатніх маладых беларускіх творцаў пазыцыю неаспрэчнага аўтарытэта (глядзі, напрыклад, ягоную рэцэнзію на кнігу Міхася Баярына “Шалёны вертаградар” у «ARCHE-Скарына»), якая яму, мякка кажучы, не зусім пасуе. Безумоўна, гэтую ролю ён імкнецца разыгрываць з пэўнай доляй абавязковай іроніі, але да самога свайго выкананьня гэтай ролі ставіцца, наколькі мне здаецца, з усёй магчымай сур’ёзнасьцю — што ня можа не выклікаць усьмешкі, асабліва тады, калі “мэтар” час ад часу скарыстоўвае свой сцэнічны вобраз для таго, каб нагадаць сваёй аўдыторыі сёе-тое з шэрагу даўно яму й іншым вядомых банальнасьцяў, якія ён выдае за “сакрэты” паэтычнага рамяства.
З майго гледзішча, найбольш трапны эпітэт для паэтычнага фэномэну з назвай “Хадановіч” — “штучны”. Як паэт ён нагадвае мне Андэрсэнавага салаўя, што здольны сьпяваць сотняй розных галасоў, але няздольны, на жаль, сьпяваць сваім голасам, бо ня мае яго — альбо той папросту гучаў ня надта мілагучна і ягоны ўладальнік зьмяняў яго на больш разнастайны, багаты фіярытурамі й іншымі артыкуляцыйнымі штукамі голас Хадановіча. Пытаньне, ці здольны гэты штучны салавей сьпяваць па-беларуску іначай, чымся чужым, запазычаным голасам. А нават калі так, ці можам мы сёньня

патрабаваць гэтага ад Хадановіча, як у часы Лукаша Бэндэ? Ня можам, і гэта цудоўна. Мы можам толькі чытаць альбо не чытаць ягоныя вершы. Гэтаксама мы ня можам нікому забараніць хваліць альбо ганіць ягоныя творы. Аднак у сытуацыі, калі ўхваляць Хадановіча стаецца правілам “добрага” густу, карысна, бадай, зьвярнуць крытычную ўвагу на адваротныя бакі ягонага фэномэну.
Ня думаю, што сам крытыкаваны мной аўтар ня ведае, што бязмэтныя практыкаваньні ў вэрсыфікацыі прыводзяць да інфляцыі паэтычнага слова. У такой сытуацыі, я лічу, лепш за ўсё было б скарыстаць свае паэтычныя здольнасьці для перакладу чужых твораў. Сапраўды, вэрсыфікатар Хадановіч зрабіў бы беларускай літаратуры вялікую паслугу, калі б узяўся за пераклад, прыкладам, клясыкаў франкафоннай літаратуры: Віёна, Бадлера, Вэрлена, Рэмбо, Ляфорга, Вэрхарна, Віяна, Прэвэра ды іншых. Замест гэтага ён, здаецца, адпачывае на “ляўрах” і бавіць час перакладамі нейкіх сваіх украінскіх знаёмых. Не разумею, якая рацыя рабіць цяпер пераклады з расійскай, польскай, украінскай моваў? Няўжо ж сярэдні беларускі чытач паэзіі не навучыцца чытаць па-ўкраінску? Выдаць у дапамогу некалькі слоўнікаў — дый па ўсім...
“А беларусы ж нікога ня маюць” — няхай жа будзе хаця б Хадановіч...

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/04/30**
[image]

Андрэй Хадановіч

Таварышу Шчуру — паэту й вэрсыфікатару

Падчас падрыхтоўкі маёй так і ня зьдзейсьненай “постаці” ў часопісе “Крыніца” мяне раз-пораз наведвала прыемная думка: як здорава, што колькі вельмі сымпатычных табе людзей знайшлі час і натхненьне падзяліцца з чытачамі ўражаньнямі пра тваю сьціплую пэрсону! Апошнім часам памеры такой увагі нават пачынаюць мяне палохаць. Узяць хоць Пятра Садоўскага, што ў “Нашай Ніве” параўноўвае мяне з… Сальманам Рушдзі. Згадзецеся, някепская “раскрутка” для патэнцыйных арабскіх чытачоў!

І вось чарговая прыемная неспадзяванка: выказаць колькі словаў не паленаваўся Максім Шчур, адметная постаць між маладых беларускіх культурных герояў, паэт, перакладчык і эсэіст, аўтар дзьвюх кніжак (як паведамляецца ў часопісе “Правінцыя”), а таксама трох вершаваных публікацыяў — у “Нігілі”, “Крыніцы” й згаданай “Правінцыі”, — публікацыяў, што напраўду выклікаюць цікавасьць і пэўныя спадзяваньні — прынамсі ў мяне. Перакладчык Б. Грабала й С. Бэкета, А. Паса й В. Уідобра, нарэшце, ангельскага нонсэнсу — лімэрыкаў Эдварда Ліра й кералаўскай “Алесі”. Вось жа, асоба амбітная,

якая, напэўна, ня стала б марнаваць свайго часу на розныя “бздуры”. З павагі да крытыка я, мабыць, таксама павінен не пашкадаваць часу й неяк адкамэнтаваць ягоныя рэфлексіі. Пагатоў некаторыя зь меркаваньняў выглядаюць настолькі слушнымі й праўдападобнымі, што проста карціць усё гэта ўшчэнт абвергнуць. Асабліва тыя месцы, дзе сп. Шчур бярэ пад сумнеў панятак прафэсіяналізму ў літаратуры й спрабуе падзяліць творцаў на паэтаў і вэрсыфікатараў.
Паэт і вэрсыфікатар, творца й вытворца, сапраўдная творчасьць і рамяство… Напраўду, ці ня ёсьць уся гісторыя сусьветнай культуры чаргаваньнем двух больш-менш супрацьлеглых падыходаў да мастацтва: эпохаў з культам “натхненьня” і пэрыядаў, калі шанавалася перадусім “рамяство”. Для першага погляду творчасьць — гэта боганатхнёная прамова, калі творца — перадусім прарок, мэдыюм, “пэйджэр, на які прыходзяць паведамленьні ад Бога”; для другога погляду творчасьць — перадусім найвышэйшая тэхналёгія, валоданьне найтанчэйшымі таямніцамі сваёй “прафэсіі”. Першы падыход абсалютызаваўся ў рамантызьме, другі — у клясыцызьме. Колісь рамантыкі абрынуліся на клясыцызм зь яго культам “правілаў” і “добрага густу”, абвесьціўшы поўную свабоду творчасьці. У выніку стылістычная неахайнасьць (расхістваньне рытму, дэманстратыўная недакладнасьць у рымах і г.д.) пачала ўспрымацца ледзь не як вартасьць. Пра якое дбаньне пра форму можа йсьці гаворка, калі ты прарок — “пэйджэр”! Хай Той, хто скідвае паведамленьні, і дбае пра іхную дасканаласьць!

Пазьней гэты падыход быў узгоднены з новаю, больш матэрыялістычнаю эпохай, і на зьмену “паведамленьням на пэйджэр” прыйшло разуменьне: паэт — носьбіт той ці іншай вялікай ідэалёгіі, што прамаўляе праз творцу, за якім паранейшаму замацоўвалася функцыя прарока й пасярэдніка (паводле Горкага, пісьменьнік — “*чувствилище*” сваёй эпохі). Залішняе дбаньне пра форму ў творах такога “*чувствилища*” выглядала б прынамсі падазроным. Пра якія там фармальныя аздобы можа весьціся гаворка, калі сапраўдныя героі пішуць “крывёй з сваіх грудзей”! Паэту ж, неабыякаваму да “чыстай красы”, адводзілася ў найлепшым выпадку месца малодшага з волатаў на “подыюме” нацыянальных культурных герояў (Леся

Ўкраінка альбо Максім Багдановіч).
У савецкіх умовах ад беларускага “прарока” патрабавалася выражаць сацыялістычны зьмест, увасоблены ў нацыянальнай форме. Прычым форма гэтая грала відочна несамастойную, падначаленую ролю. Ці не тады ўзьнікае патрабаваньне “хаваць форму”, калі валодаеш ёю падазрона добра? (Патрабаваньне, якое нечакана рэанімаваў і агучыў мой сёньняшні апанэнт.) Згадайма, з чаго нараджаецца вобраз Майстра ў Булгакава: ізь зьняважлівага сталінскага азначэньня Мандэльштама як “майстра”, то бок “рамесьніка”. Што заставалася рабіць такім творцам ува ўмовах таталітарнага рэжыму? Бегчы альбо ў дзіцячую літаратуру, альбо — найчасьцей — у паэтычны пераклад (напрыклад, У. Дубоўка як перакладчык Шэксьпіра). Там, маўляў, і толькі там іхнае “рамесьніцтва” даравальнае. Ці не такую, дарэчы, параду робіць мне сёньня крытык? Выкарыстоўвай, маўляў, сваё “вэрсыфікатарства” на пераклад “франкафонаў” — і клямка!
Ці ж сам крытык не адчувае, наколькі анахранічна выглядае сёньня падзел твору на “зьмест” і “форму”, бо ўсякая форма аўтаматычна “значэнная”, а ўсякі зьмест — “фармалізаваны”? “Зацыкленасьць” на бінарных апазыцыях (белае/чорнае, зьмест/форма) аўтаматычна заганяе нашага крытыка ў глухі кут, бо, “шыючы” мне фармалізм а ля Бальмонт зь яго “ландыши, лютики, ласки любовные”, ён мусіць назваць фармалістам і Барадуліна зь яго “лілею млявы плёс люляе”, і Разанава зь яго “вершаказамі”, і нават абазваць пазбаўленымі “мэсыджу” трыялеты й рандо Багдановіча.

Абодва падыходы — апалёгія “натхнёнага мэсыджу” й апалёгія рамяства — канечне ж, скрайнасьці, якія сёньня існуюць хутчэй як тэндэнцыі. Разам з тым, карысна нагадаць сп. Шчуру, што ўжо ў XIX стагодзьдзі літаратары пасьпяхова пераадольвалі гэтую штучную фармальна/зьместавую дыхатамію. Ужо для Эдгара По не было, па сутнасьці, ні формы, ні зьместу, а быў твор як складаная сыстэма ўзаемна падпарадкаваных элемэнтаў. І кожны фармальны прыём — у тым ліку вэрсыфікацыйны — быў носьбітам сэнсу, бо сугестыўна (на ўзроўні ўнушэньня) нёс чытачу такія сэнсы, якіх аўтар не пажадаў выказваць наўпрост, “у лоб”. І пра якіх бы “фармалістаў” ні казала пазьней вульгарная крытыка

(пераважна савецкая), і ў Пруста, і ў Джойса, і ў Эліята з Паўндам фармальны, здавалася б, прыём быў насамперш сэнсаўтваральным. Іншая рэч, што выяўленьне такога сэнсу падчас вымагае пэўнай падрыхтоўкі, прафэсіяналізму, зь якім наш крытык, відаць, упарта змагаецца.
Ёсьць у літаратуразнаўстве (вузей — у аналізе паэтычнага тэксту) “фішка”, пра якую казаў яшчэ Ю. Лотман. “Фішка” гэтая — “прэзумпцыя асэнсаванасьці” (паводле аналёгіі з “прэзумпцыяй невінаватасьці”). Калі тэкст незразумелы табе асабіста, не сьпяшайся абвяшчаць яго “кнігай бязглузду”, як выказаўся б сам М. Шчур. Паспрабуй найперш інтэрпрэтаваць тэкст: а што калі “праблема” ня ў ім, а ў тваёй няздольнасьці да разуменьня? (Сама сабою згадваецца тэза пра адсутнасьць у мяне пачуцьця гумару. На чым яна палягае? Калі я неаднаразова чытаў свае лімэрыкі дый іншыя тэксты на самую розную публіку, гэтая самая публіка заўсёды ўдзячна рэагавала калі ўсьмешкамі, а калі й выбухамі рогату, прычым — у заплянаваных аўтарам месцах. Мо шаноўнаму крытыку ўласнае пачуцьцё гумару “праверыць”? Напрыклад, чытаючы на аўдыторыю свае пераклады лімэрыкаў Э. Ліра.)

Аднак вернемся да “прэзумпцыі”. Здаецца, што бяздоказнасьць, неабгрунтаванасьць, галаслоўнасьць — гэта асноўны “творчы мэтад” крытыка. Падчас мне хочацца самому даць веры той ці іншай думцы наконт маёй уласнай пэрсоны, ды вось цытаты ў якасьці довадаў аўтар прывесьці лянуецца — ці, можа, няздольны? Напрыклад, абвінавачаньне ў бессэнсоўнасьці, схаванай пад фармальным бляскам, у тым, што “Хадановічу няма чаго сказаць”, нічым у крытыка не аргумэнтуецца. А між іншага, робіцца такая аргумэнтацыя вельмі проста. На правох прыкладу: бяром апошні нумар “Правінцыі” з паэтычнай публікацыяй самога М. Шчура (дарэчы, найлепшая паэтычная публікацыя ў нумары!) і цытуем адну страфу, скажам, такую:

там быў прахону сьмярдзючы калодзеж,
без асьвятленьня, даволі няўтульны
катом гуляць у дарослыя гульні
(быў яшчэ дах, а інакш не было дзе ж)…[1]
Што вы скажаце пра выраз “*не было дзе ж*”, які нічым, здаецца, у тэксьце не матываваны, апроч жаданьня аўтара знайсьці як

мага дакладнейшую рыму да “калодзежу”? Калі гэта не “фармалізм”, у якім паэт-крытык абвінавачвае мяне (прычым фармалізм “лабавы”, грубасткі, які напраўду выпінаецца з тэксту й замінае ўспрымаць яго як цэлае), то, выбачайце, што ж такое фармалізм? “А судзьдзі хто?” — хочацца мне згадаць адно з тых “агульных месцаў”, якія, відаць, так раздражняюць нашага крытыка.

Дарэчы, пра “агульныя месцы”. Ня ведаю дакладна, як **Максім Чур.** вынікае гэтая заканамернасьць — ці то з адарва**Кастрычніцкай** “праскага” жыхара ад беларускага кантэксту, ці ро**волюцыі 7/** ён яшчэ ня мае / не адчувае сваёй чытацкай аўд**Прамені.** але шаноўны аўтар на кожным кроку то ідэалізуе, то **2002. № 3–4.** недаацэньвае беларускага чытача. Пачнём з ідэа**С. 165.** ы. “*Ня можа не выклікаць усьмешкі*, — піша крытык, — *калі “мэтар”* (то бок я — **А.Х.**) *час ад часу скарыстоўвае свой сцэнічны вобраз для таго, каб нагадаць сваёй аўдыторыі сёе-тое з шэрагу даўно яму і іншым вядомых банальнасьцяў, якія ён выдае за “сакрэты” паэтычнага рамяства*”. Прымаю заўвагу, часам дазваляю сабе мэнтарства й дыдактыку. Відаць, выкладчыцкая праца вінаватая: надта ж часта даводзіцца тлумачыць адно й тое самае, прычым шматлікія паўторы зусім не гарантуюць добрага выніку. Колькі ні кажы, напрыклад, што “александрыйскі верш” вымагае цэзуры пасярэдзіне, — усё на глум. Дарэчы, з трох беларускіх перакладаў “П’янога карабля” Рэмбо (а сярод перакладчыкаў такія майстры, як Барадулін і Мінкін) рэгулярнай цэзуры не захоўвае ніводзін. Дык трэба ці ня трэба час ад часу паўтараць “банальнасьці”? Альбо вось мой крытык, якому, натуральна ж, і безь мяне “вядомыя ўсе сакрэты рамяства”, піша: “*Гумар Хадановіча — гэта, як казаў Караткевіч, “гумар шыбеніка”*” (sic!). Дзякуй за камплімэнт, але дазвольце не паверыць: нічога Караткевіч пра мой гумар не казаў! Вось жа, ці ня варта пазьбягаць такіх “пэрлаў”, дбаючы пра стыль? Няўжо пошук дакладнага выразу, адпаведнага тваёй думцы, ёсьць фармалізмам?

Цяпер пра недаацэнку чытача. З чаго вынікае цьверджаньне, што я пішу так, нібы ўсе ў нас гавораць па-беларуску? Альбо што пішу для нашчадкаў, якія прыйдуць праз сто гадоў, калі ўсе будуць гаварыць па-беларуску? (Мне б, дарэчы, аптымізм аўтара!) Вядома ж, ня ўсе гавораць, але й камунікацыйных

праблемаў з адукаваным расійскамоўным чытачом у мяне звычайна не ўзнікае. Затое часам у чытача калі не ўзнікаюць праблемы, то прынамсі ламаюцца антыбеларускія стэрэатыпы. Калі не ламаць гэтых стэрэатыпаў сёньня, то ня тое што праз сто гадоў, а ўжо заўтра ніхто ня будзе чытаць ні Максіма Шчура, ні Андрэя Хадановіча. Згадваецца “Тэатральны пралёг” да “Фаўста” Гётэ, дзе паэт, актор і дырэктар тэатру да хрыпу спрачаюцца, якім павінен быць твор і на якога гледача арыентавацца: на інтэлектуала альбо на шырокую публіку, на сучасьнікаў альбо нашчадкаў? І выяўляецца, што рацыю мае кожны зь іх і праўда — недзе пасярэдзіне. Барыс Захадэр (sorry за шчэ адну расійскую цытату) трапна сфармуляваў:

А нужно так: пиши стихи и сказки
Для тех, кто и потомки, и сейчаски.
Іначай ніякай сьветлай будучыні ні літаратуры нашай, ні літаратарам “ня сьвеціць”.
Крытычны матэрыял пра мяне пачынаецца зь вершаванага эпіграфа, змайстраванага, відаць, самім сп. Шчуром. Напэўна, каб яшчэ раз зьняважыць прафэсіяналізм, аўтар ужывае “вышуканую” рыму “Хадановіч — Багдановіч”. Так, маё прозьвішча някепска рымуецца й ужо ня раз рымавалася. Серж Мінскевіч у адным з сваіх санэтаў знайшоў да “Хадановіча” дзьве рымы — “Туровіч” і “Акудовіч”. А Аляксандар Ірванец дадаў яшчэ дзьве — “Адамовіч” і “Галубовіч”. Але паэт Максім Шчур відочна пераўзышоў сваіх папярэднікаў! Мабыць, было б дарэчным і мне скончыць на паэтычнай ноце, а заадно скарыстацца нагодаю й падзякаваць за крытыку ў сытуацыі, “калі ўхваляць Хадановіча стаецца правілам “добрага” густу”. Сьвятая рацыя: трэба шукаць (і знаходзіць!) і “адваротныя бакі ягонага фэномэну”. Канструктыўная крытыка яшчэ нікому не пашкодзіла, а толькі прыносіла карысьць. Спадзяюся, што й мне ўдасца зрабіць зь яе канструктыўныя высновы. Так што прычыны сумаваць ды псаваць сабе настрою няма. Мой апанэнт раіў не перакладаць з блізкіх моваў, а даваць чытачу арыгінал. Што ж, як казаў польскі паэт Канстанты Ільдэфанс Галчынскі:
Gaudeamus igitur,
Nawet gdy w kompocie szczur!

[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/05/02
[image]

Аляксандар Фядута

Сапармурат Туркмэнбашы супраць Іскандэра Бульбашы

Вельмі патрэбная і сучасная кніга.
У. І. Ульянаў

Прапанова рэдакцыі паважанага мною часопісу «ARCHE» напісаць рэцэнзію на кнігу Сапармурата Туркмэнбашы “Рухнама” засьпела мяне зьнянацку. Рэч нават ня ў велічы асобы аўтара, чый розум узвышаецца над плыткім інтэлектам сучаснікаў, як Памір — над раўнінамі туркестанскіх стэпаў. Рэч у тым, што вялікі правадыр туркмэн замахнуўся на сьвятое сьвятых нашай Рэспублікі Бульбастан — дзяржаўную ідэалёгію. Тым часам як прэзыдэнт Іскандэр Бульбашы толькі падступаўся да стварэньня Кнігі Кнігаў народу Бульбастану, праводзіў усенародныя хуралы, на якіх прызначаныя ім старэйшыны родаў выражалі свае пачуцьці любові да Ўсенароднаабранага, вялікі Туркмэнбашы сказаў усё.

Пра што яна — Галоўная Кніга Туркмэнаў? Вялікі Туркмэнбашы прысьвяціў яе найбольш важным пытаньням быцьця Чалавека, Народу і Дзяржавы. З часоў Тамаза Аквінскага на Захадзе і Ібн-Рушда на Ўсходзе не было больш усеабсяжнай працы, здольнай навучыць жыцьцю і нас,

[1] Тут і далей тэкст Кнігі цытуецца паводле выданьня: Туркменбашы Сапармурат. Рухнама. — Менск.: УП “Светач”, 2003. У тэксьце пасьля цытаты надаецца старонка гэтага сонечнага выданьня.

сучаснікаў найвялікшага з Аўтараў, і нашых нашчадкаў, якім выпадзе шчасьце жыць у сьвеце, збудаваным паводле запаветаў вялікага Туркмэнбашы.
У чым жа сутнасьць запаветаў Бацькі ўсіх Туркмэнаў? Пачнём з галоўнага — зь Дзяржавы. Грамадзянскім патасам прасякнутая кожная старонка “Рухнамы”, і гэта патас гонару кожнага Грамадзяніна сонечнага Туркмэністану за Дзяржаву, якая дала яму магчымасьць рэалізаваць свае здольнасьці і задаволіла яму амаль усе патрэбы.
Вытокі туркмэнскай Дзяржаўнасьці вялікі Аўтар бачыць у старадаўніх часох, калі акурат туркмэны “вялі караван навукі ва ўсім ісламскім сьвеце” [1] (с. 36). Сэльджуцкія султаны і куняўргенцкія эміры пазналі веліч туркмэнскіх навукоўцаў, думаньнікаў, філёзафаў, паэтаў. Вялікі Дасьледнік адсочвае шлях міграцыі гэтых вялікіх сыноў Туркмэнскага Народу — “праз Турцыю, іншымі шляхамі ў напрамку Каўказу, Рыму, Аравіі, а адтуль праз Эгіпет… да Гішпаніі. Эўропа атрымлівае велізарны прыток сілаў у навуцы і вытворчасьці” (с. 36).

Стваральнік Галоўнай Кнігі Туркмэнскага Народу ня ставіць пад сумнеў найстаражытнейшых вытокаў Дзяржаўнасьці Туркмэністану. Для яго няма пытаньняў, з кім у супольнасьці або ў хаўрусе будавалі туркмэны сваю Дзяржаву. Канцэпцыя дзяржаўнага будаўніцтва простая і велічная ў гэтай простасьці: акурат туркмэны несьлі цывілізацыю астатняй частцы чалавецтва. Першая друкаваная кніга цюрскіх народаў, першы цюркі ўнівэрсытэт, вялікія паэты, першая цюрская Канстытуцыя (хай нават яна называлася б Статутам) — усё гэта гарантуе Яго Народу годнае месца ў Запісной Кніжцы Алага. Туркмэнбашы спасылаецца ў Кнізе на сьлед, які пакінулі ў духоўнай памяці народу Огуз хан, Горгут ата, заснавальнік Парфянскага царства Аршак, і асабліва — апошні кіраўнік імпэрыі сэльджукаў вялікі Салтан Санджар (с. 43).
Трагедыю Туркмэнскага Народу вялікі Дэміюрг Рухнамы бачыць у далучэньні рэштак Туркмэнскай Дзяржавы да братняй Расійскай імпэрыі: “Гектаэпінская вайна 1879 — 1881 гадоў наносіць страшэнны, непапраўны ўдар па палітычным, эканамічным, сацыяльным укладзе жыцьця туркмэнаў. Рушацца апошнія асновы туркмэнскай дзяржаўнасьці. Расія ўвяла на туркмэнскія землі залежнае кіраваньне, разгарнула рэлігійную

прапаганду, пачала праводзіць сваю культурную палітыку” (с. 38) Працяг палітыкі Расійскай імпэрыі вялікі Туркмэнбашы бачыць у гісторыі Савецкага Саюзу: “Сотні тысяч нашых суграмадзян… былі рэпрэсаваныя, расстраляныя, а мільёны, пакінуўшы наседжаныя мясьціны, занесены вятрамі далёка ад роднага дому. Тыя ж, што засталіся на сваёй Бацькаўшчыне (каля трох мільёнаў), забыўшы пра сваё паходжаньне, уліліся ў супольнасьць пад назваю савецкі народ і пачалі забываць і сваю родную мову, і рэлігію, страчваць нацыянальныя пачуцьці. У такім стане мы знаходзіліся 74 гады. 74 гады смутку, тугі, нявер’я ў свой заўтрашні дзень”.
Горкая гісторыя падштурхнула Туркмэнскую Дзяржаву да ўсьведамленьня дзьвюх вялікіх вартасьцяў — Сувэрэнітэту й Нэўтралітэту. Варта зазначыць, што акурат на прапанову Стваральніка Рухнамы 12 сьнежня 1995 году пры аднадушнай падтрымцы 185 дзяржаваў Генэральная Асамблея ААН надала Туркмэністану статус сталага нэўтралітэту (с. 250). Дзяржава Туркмэнскага Народу, кіраваная пажыцьцёвым Прэзыдэнтам, не ўступае ў вайскова-палітычныя саюзы, не гандлюе зброяй і — працьвітае!
Аднак памяць аб вялікіх бітвах мінулага жыве ў сэрцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Туркмэнскімі Ўзброенымі Сіламі. “Сказаўшы “бісмілла”, мы пабудавалі першы мячэт у Кіпчаку. Потым узьвялі ў цэнтры Ашхабаду велічны храм, які не саступае іншым духоўным цэнтрам ісламу. У памяць аб ахвярах Гектаэпінскай бітвы на яе месцы ўзьвялі найпрыгажэйшы зь мячэтаў” (с. 254).

Але Дзяржаўнасьць ня ёсьць толькі вынікам гістарычнага разьвіцьця. Сапармурат Туркмэнбашы разглядае яе філязофска: “Дзяржава — гэта сродак і спосаб аб’яднаньня нацыі. Нацыянальная дзяржава — гістарычны спосаб унутранага ўладкаваньня нацыяй свайго жыцьця. Толькі ў нацыянальнай дзяржаве праяўляецца жыцьцяздольнасьць нацыі, паколькі ўпарадкаваньне нацыянальнага жыцьця, яго гарманізацыя магчымы ў адным канкрэтным месцы. У сваю чаргу, здольнасьць нацыі да стварэньня нацыянальнай дзяржавы паказвае яе здольнасьць да гістарычнага жыцьця, да ўзнаўленьня сваёй будучыні” (с. 257).
Аўтар знаходзіць энэргічныя і разам з тым ляканічныя словы

для выражэньня сваіх велічных Думак, вартых быць увекавечанымі ў Кнігах Кніг кожнага з народаў, што насяляюць Сусьвет: “Дзяржава — вялікі дом для народу” (с. 258). “Як для стварэньня нармальнай сям’і неабходна, каб былі яе чальцы, пэўныя ўнутраныя і зьнешнія ўмовы, так і для станаўленьня нацыі неабходна дзяржава” (с. 258).
Разглядаючы Дзяржаву як агромністы дом для Туркмэнскага Народу, Туркмэнбашы ацэньвае й Народ як Сям’ю, абвяшчаючы сямейныя вартасьці дзяржаўнымі. Агмень — во з чаго пачынае выбудову Туркмэнскага Дому яго Вялікі Архітэктар: “Туркмэністан — адзіная дзяржава ў сьвеце, якая не бярэ з сваіх грамадзян плату за газ і электрычнасьць, соль і ваду, а зусім бедныя атрымліваюць бясплатна і муку” (с. 261). Апошняе асабліва ўражвае, калі ўлічыць, што ў іншых дзяржавах, не ашчасьліўленых кіраваньнем Стваральніка Рухнамы, увесь гэты час павышаюцца цэны на камунальныя паслугі, а колькасьць зусім бедных дасягла такой лічбы, што ніякай мукі ня хопіць.
Гаворачы пра Народ, Бацька Ўсіх Туркмэнаў, аднак, дбае ня толькі пра матэрыяльны яго дабрабыт, але і аб духоўнасьці: “Стрыжань нацыі ў яе самасьвядомасьці. Усе яе асновы, як матэрыяльныя, так і духоўныя — мова, рэлігія, культура, дзяржаўнасьць, — нанізваюцца на гэты стрыжань. Безь яго ўсё траціць сэнс, ня можа набыць неабходнага парадку і цэльнага выгляду. І тады ўсё, што складае нацыю і грамадзтва, пачынае жыць асобным жыцьцём, стыхійна, што ў рэшце рэшт вядзе да разбурэньня і заняпаду” (с. 406).
Нарожным каменем велічнага Храму Нацыянальнай Самасьвядомасьці Туркмэнбашы лічыць родную мову: “Няма мовы — няма народу”. Або: “Ідучы ў дарогу, беражы сваю мову”. Або, нарэшце: “Ёсьць у мяне мова — ёсьць мір у мяне” (с. 212).

Варта дадаць некалькі словаў пра Чалавека, як яго разумее Аўтар “Рухнамы”. Як і належыць Бацьку Народу, у якасьці прыкладу ён прапануе сваім Дзецям ўласны лёс. Цяжкое жыцьцё туркмэнскага юнака, які вырас бяз бацькі, што загінуў на вайне, які быў змушаны вучыцца на стыпэндыю ў той час, як некаторыя езьдзілі ў школу і ў інстытут на чорных “Волгах” і елі ікру, — як гэта збліжае Яго зь Яго Народам, што быў

пасынкам у савецкіх уладаў! Строгасьць ён спалучае зь міласэрнасьцю, і нават каральны меч Закону ён уручыў Жанчыне — Генэральнай Пракурорцы Туркмэністану, папярэдне запісаўшы ў “Рухнаме”: “Ніколі ня біце дзяцей і жонак па твары, — гаварыў Нух. Затое ён загадаў закрыць жанчынам раты” (с. 13).
Ужо прыведзеных намі цытат досыць, каб пераканацца ў галоўным: “Рухнама” — во тая кніга, для якой кожны народ павінен збудаваць асобны кнігасхоў, што формай нагадвае дыямэнт — гексаактоэктаэдар, дзеля чаго кожны з грамадзян з радасьцю ахвяруе неабходным. “Рухнама” — ідэалёгія сувэрэннай, нэўтральнай, сацыяльна арыентаванай дзяржавы, кіраванай адукаваным і міласэрным кіраўніком, чые паўнамоцтвы падаўжаюцца да бясконцасьці ўдзячным народам. Разам з тым, відавочна, што “Рухнама” прыходзіць у супярэчнасьць зь дзяржаўнай дактрынай Рэспублікі Бульбастан: досыць супаставіць пэўныя канцэптуальныя пастуляты вызнаваных імі (калі меркаваць ня толькі па словах, але і па справах) філязофій.

Няма ніякіх сумневаў у тым, што пераклад “Рухнамы” на дзяржаўную мову Рэспублікі Бульбастан стаў адной з найбольш значных падзеяў у культурным жыцьці народу. Вялікі Сапармурат Туркмэнбашы нацеміў бульбастанцам дарогу, якой павінен ісьці народ, каб заняць годнае і пачэснае месца сярод цывілізаваных дзяржаваў.
Аляксандар Фядута-Гіль-Віч

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/04/28**

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (25) – 2003**
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image] [image] [image] [

“Законьнік” сэрбскага цара Стэфана Душана, “Выклад чэскага земскага права” пана Андржэя з Дубы. Якраз з універсытэцкіх гадоў пачалося зацікаўленьне Мыльнікава Вялікім Княствам Літоўскім.

Пасьля заканчэньня ўнівэрсытэту на выдатна Мыльнікаў быў накіраваны на працу ў Расейскую нацыянальную бібліятэку, дзе за 20 гадоў прайшоў пасады ад бібліятэкара да загадчыка аддзелу рукапісаў. За гэты час зь яго ініцыятывы было зьдзейсьнена колькі археаграфічных экспэдыцыяў, арганізаваныя штогадовыя навуковыя канфэрэнцыі “Дэпо манускрыптаў”. Паралельна ён падрыхтаваў і пасьпяхова абараніў кандыдацкую (1958) і доктарскую (1972) дысэртацыі па багемістыцы. Тэма доктарскай дысэртацыі — “Узьнікненьне нацыянальна-асьветніцкай ідэалёгіі ў Чэскіх землях XVIII стагодзьдзя”. Працуючы ў РНБ, Мыльнікаў атрымаў унікальную магчымасьць грунтоўнага вывучэньня славянскіх, у тым ліку старабеларускіх, кніжак і рукапісаў раньняга Новагу часу.

З 1973 году да спачыну Аляксандар Мыльнікаў працаваў у Інстытуце этнаграфіі й антрапалёгіі (Кунсткамэра) Савецкай, пазьней Расейскай акадэміі навук, у тым ліку ў 1992—1997 гадох — дырэктарам славутай Кунсткамэры.

Асноўныя кірункі навуковых інтарэсаў А. Мыльнікава — славістыка, гісторыя і тэорыя культуры, этналёгія, кнігазнаўства, беларусістыка. Ён паступова пашыраў сфэру сваіх зацікаўленьняў, абапіраючыся на параўнальна-гістарычны, параўнальны й інтэрдысцыплінарны мэтады. Зыходным для яго ад самага пачатку было шматаспэктнае разуменьне аб’екту дасьледаваньня, не абмежаванае фармальнымі рамкамі асобных дысцыплінаў. Зыходзячы з названых пасылак, апошнія гады Аляксандар Сяргеевіч вывучаў пытаньне аб значэньні міжэтнічных кантактаў у працэсе разьвіцьця нацыяў і нацыянальных культураў. Ён прапанаваў тэзу пра *“мову культуры”* як сукупнасьць знакавых сродкаў выражэньня этнічнай спэцыфікі.

У 1990-я гады Аляксандар Мыльнікаў заняўся распрацоўкай новага міждысцыплінарнага кірунку — этнічнай імагалёгіі — і прысьвяціў гэтаму фундамэнтальны праект, вынікам якога стаў двухтомнік “Карціна славянскага сьвету”. Упершыню дзеля рэканструкцыі заходніх навуковых ведаў пра тагачасны

славянскі сьвет, яго народы, мовы і культуры аўтарам выкарыстаны ўнікальны комплекс малавядомых эўрапейскіх працаў, напісаных у XVII—XVIII стагодзьдзях на лацінскай, нямецкай, французскай, ангельскай і швэдзкай мовах.
У абедзьвюх частках кнігі аўтар актыўна скарыстаўся беларускай праблематыкай, выказаў шмат цікавых думак, у тым ліку наконт лякалізацыі назвы Беларусь у Эўропе, сэнсу паняцьця “ліцьвінаў” ВКЛ, Літвы як гістарычнай назвы сучаснай Беларусі. Багата спасылак на гэтую працу робяць беларускія навукоўцы. Першы том гэтай працы стаўся гістарычным бэстсэлерам у Расеі ў 1996 годзе. Трэці том, на жаль, ужо ня будзе скончаны… Усяго Аляксандрам Мыльнікавым напісана 12 манаграфіяў, больш за 500 навуковых працаў, пад яго рэдакцыяй выйшла 75 кніг, ён апаніраваў пры абароне больш за паўсотні кандыдацкіх і доктарскіх дысэртацыяў.

Як беларусіст Аляксандар Мыльнікаў большасьць уласных працаў прысьвяціў Францішку Скарыну. На асобе беларускага першадрукара сышліся яго навуковыя інтарэсы як багеміста, кнігазнаўцы і культуроляга. Аб гэтым сьведчаць назвы ягоных артыкулаў: “Зямля — дзяржава — этнас: Францішак Скарына ў кантэксьце этнакультурных уяўленьняў раньняга Новага часу”; “Францішак Скарына і чэскае кнігадрукаваньне” — усяго звыш за дваццаць артыкулаў. Першым з скарыністаў ён давёў, што чэскую Прагу наш першадрукар выбраў месцам сваёй працы дзеля разьвітай традыцыі друку і падабенства моваў. Мыльнікаў абгрунтаваў, што адным з найважнейшых стымулаў было таксама караляваньне дынастыі Ягайлавічаў у Празе, Вільні і Кракаве.
У рабоце “Эфэкт Скарыны, альбо Спэцыфіка міжэтнічных кантактаў у шматэтнічным асяродзьдзі” вучоны растлумачыў, чаму Скарына карыстаўся рознай этнічнай самаідэнтыфікацыяй (“русін”, “ліцьвін”, “паляк”). Як выявілася, зьява гэта тыповая для інтэлектуалаў раньняга новага часу, што паходзяць з шматкультурных абшараў Эўропы (напрыклад, харвацкіх гуманістаў). Менавіта таму ў Полацку Скарына дэкляраваў сябе “русінам”, адрозьніваючы ад балтамоўных “ліцьвінаў” зь недалёкіх Сьвянцянаў ці Гервятаў, якія Скарыну давялося наведаць (у Гервятах ён сьведчыў фундацыю новага касьцёлу).

У Кракаве Скарына быў “ліцьвінам”, бо прадстаўляў ВКЛ, дзе беларускамоўная шляхта і бюргеры складалі пераважную этнічную групу. Нарэшце, у Прусах Скарына рабіўся “палякам”, бо быў у падпанстве Жыгімонта Старога, асноўны тытул якого пачынаўся словамі “кароль польскі”, валодаў польскай мовай і рэпрэзэнтаваў Польска-Літоўскую фэдэрацыю.
Мыльнікаў чытаў беларускую навуковую літаратуру і добра ведаў беларускія крыніцы. За сваё жыцьцё ён сабраў унікальную гістарычную бібліятэку, сярод якой добры збор беларускіх кніжак. Частка гэтай бібліятэкі была падораная Мыльнікавым універсытэту Рэспублікі Мары-Эл. Ён любіў бываць у Беларусі, браў удзел у тутэйшых навуковых канфэрэнцыях.
Ад пачатку Пецярбурскай асацыяцыі беларусістаў (1991 год) Мыльнікаў стаўся яе старшынём і нязьменна знаходзіўся на гэтай адказнай пасадзе. Большасьць штогадовых канфэрэнцыяў “Санкт-Пецярбург і беларуская культура” прайшлі пад яго аўтарытэтным кіраўніцтвам, іх навуковы ўзровень шмат у чым вызначала атмасфэра праніклівых спрэчак і абмеркаваньняў, арганізаваных Мыльнікавым. Разам з дырэктарам Расейскай нацыянальнай бібліятэкі Ўладзімерам Зайцавым ён увайшоў у склад рэдкалегіі першага з 1917 году пецярбурскага выданьня па беларусістыцы на беларускай і расейскай мовах “Беларускі зборнік”. На старонках гэтага ж пэрыёдыку ён прапанаваў чытачам вынікі сваіх дасьледаваньняў.
Трэба падкрэсьліць ролю Аляксандра Мыльнікава як кіраўніка й дабрадзея маладых беларускіх дасьледнікаў і студэнтаў Санкт-Пецярбургу 1990-х гадоў. Калісьці, на пачатку мінулага стагодзьдзя, гэтую ролю ў горадзе на Няве выконвалі прафэсары-беларусы Браніслаў Эпімах-Шыпіла й Яўхім Карскі (былы дырэктар Кунсткамэры) і расеец акадэмік Аляксей Шахматаў (кіраўнік Марыі Косіч і Браніслава Тарашкевіча ды апякун беларускіх студэнтаў). На пачатку ХХІ стагодзьдзя замены такому дабрадзею ў Пецярбургу няма.
У асабістых кантактах Аляксандар Мыльнікаў перш за ўсё ўвасабляў пецярбурскага інтэлігента — зычлівага, мяккага і заўсёды творчага, адкрытага да новых думак і людзей, а ўжо потым — кіраўніка вялікіх навуковых установаў, сябра Навуковай рады па гісторыі сусьветнай культуры РАН, акадэміка Акадэміі гуманітарных навук Расеі, сябра Саюзу

расейскіх пісьменьнікаў.
Вучонага ня стала. Імя і працы яго застаюцца. На карысьць сусьветнай культуры і яе часткі — культуры беларускай.

Андрэй Катлярчук — вучань, сябра Пецярбурскай асацыяцыі беларусістаў, Стакгольм
Мікола Нікалаеў — калега, віцэ-старшыня Пецярбурскай асацыяцыі беларусістаў, Санкт-Пецярбург

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk** майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/05/02